БІБЛІЯТЭКА ЗАМЕЖНАЙ ПРОЗЫ

Яраслаў Гашак

ГОСЦЬ У ХАТУ



БІБЛІЯТЭКА ЗАМЕЖНАЙ ПРОЗЫ

Яраслаў
Гашак

ГОСЦЬ У ХАТУ

АПАВЯДАННІ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1984

И (Чехосл)
Г 24

Пераклад з чэшскай мовы

Укладанне Алеся Мажэйкі

Пасляслоўе Тамары Кароткай

Г $\frac{4703000000-004}{M\ 302(05)-84}$ 168—83

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1984.

МАЯ СПОВЕДЗЬ

«28 кастрычніка» ў шэрагу фельетонаў спрабуе зганьбіць мяне перад усёй чэшскай грамадскасцю. Я прызнаю: усё, што пішацца пра мяне, грунтуецца на праўдзе. Я не толькі такі нягоднік і мярзотнік, якім мяне апісвае «28 кастрычніка», але і намнога горшы распуснік.

Таму я паспрабую даць газеце «28 кастрычніка» падрабязны матэрыял да яе выпадаў, і няхай гэты матэрыял будзе маёй шчырай споведдзю перад усёй чэшскай грамадскасцю.

Дык вось, спавядаюся ўсемагутнаму богу і вам, панове дэпутат Мадрачак [1] і Гудэц [2], што я:

ужо сваім нараджэннем зрабіў вялікую непрыемнасць сваёй маці, якая не спала некалькі дзён і начэй.

Ва ўзросце трох месяцаў задушыў сваю мамку, і гэта скончылася крымінальным судом у Празе, які ў маю адсутнасць засудзіў маю маці на тры месяцы за нядбайны догляд дзіцяці.

У той час я быў ужо такі дэградзіраваны, што наогул не прыйшоў у суд, каб сказаць хоць адзінае слова на абарону сваёй беднай маці.

---

[1] Мадрачак Францішак — сенатар у даваеннай Чэхаславакіі *(тут і далей заўвагі перакладчыкаў)*.

[2] Гудэц Ёзаф — рэдактар газеты «28 кастрычніка».

Наадварот, я весела рос далей і выяўляў звярыныя інстынкты.

У шэсць месяцаў я з'еў свайго старэйшага брата і ўкраў святыя абразкі з яго дамавінкі, якія схаваў у пасцель служанкі. Яе выгналі за крадзеж і засудзілі за абкраданне нябожчыка на дзесяць гадоў турэмнага зняволення строгага рэжыму, дзе яна памерла гвалтоўнай смерцю ў бойцы з іншымі вязнямі, на штодзённай прагулцы.

Яе жаніх павесіўся і пакінуў пасля сябе шэсць пазашлюбных дзяцей, з якіх пазней некаторыя вызначыліся як гасцінічныя міжнародныя зладзеі, адзін жа стаў прэлатам у прэманстратаў [1], і вось гэты апошні, самы старэйшы, піша ў «28 кастрычніка».

Калі мне споўніўся год, не было ніводнай кошкі ў Празе, якой я не выкалаў бы вачэй або не адсек хваста.

Калі ж я ішоў са сваёй выхавальніцай на прагулку, усе сабакі абміналі мяне ўжо здалёку.

Праўда, выхавальніца са мною хадзіла нядоўга, бо, калі мне было васемнаццаць месяцаў, я завёў яе ў казарму на Карлавым пляцы і за два пачкі тытуню аддаў салдатам.

Выхавальніца не перажыла ганьбы, кінулася каля Веляславіна пад пасажырскі цягнік, які з-за гэтай перашкоды сышоў з рэек, прытым загінула васемнаццаць чалавек, а дванаццаць было цяжка паранена, паміж забітых быў гандляр птушкамі. Усе клеткі былі паламаны, а з птушак па волі божай застаўся толькі мадрачак [2] (Cuanecula suesica), птушачка з групы музыкаў [3], колер зверху шэра-карычневы, над хвосцікам святлейшы, на горле ж і грудзях пер'е ў яе блакітнае,

---

[1] Манаскі ордэн.

[2] М а д р а ч а к *(чэшск.)* — варакушка.

[3] Музыка — па-чэшску гудэц *(устарэлае)*.

з белым або ржава-чырвоным полем пасярэдзіне. Жывоцік белы. Радзіма мадрачка — Чэхія, сустракаецца, хоць не так і часта, у сырых мясцінах, парослых кустамі. Жывіцца чарвякамі і кузуркамі, якіх ловіць, варушачы хвосцікам. У няволі хутка прыручаецца і шчыра спявае. (Глядзі Отаў навуковы слоўнік, семнаццаты том, стар. 494, загаловачныя словы Мадрачак — Моджын [1].)

Калі мне было тры гады, ва ўсёй Празе не знайшлося болей за мяне разбэшчанага хлопца. У тым малым веку я меў інтымную сувязь з жонкай адной высокапастаўленай асобы, і гэты скандал узбурыў бы ўсю Прагу і вясковую перыферыю, каб стаў вядомы грамадскасці.

У чатырохгадовым узросце я ўцёк з дому, бо разбіў сваёй сястры Мані галаву швейнай машынай. Уцякаючы, я захапіў з сабою з дому некалькі тысяч залатых, якія прагуляў у пятым квартале са зладзеямі.

Калі ў мяне кончыліся грошы, я жыў жабрацтвам і кішэнным крадзяжом, выдаючы сябе за сына князя Туна (тады ён быў яшчэ графам).

Мяне злавілі і адправілі ў калонію ў Лібні, якую я падпаліў. У агні загінулі ўсе настаўнікі, якіх я замкнуў у будынку.

Зноў прыйшоў сумны час. Галадаючы, я, пяцігадовы, валачыўся па вуліцах Прагі і краў булкі ў пекараў і яблыкі ў гандлярак. Сваё становішча я, аднак, выдатна палепшыў, калі ўламаўся ў храм святога Тамаша, дзе ўкраў залаты кубак. Кубак прадаў аднаму яўрэю ў пятым квартале за залаты [2], а калі грошы прагуляў у адным доме на Нябожчыцкай вуліцы, то хадзіў шантажыраваць яўрэя, пагражаючы, што данясу на яго. Выцягваў з яго залаты за залатым, ажно на-

---

[1] Моджын *(чэшск.)* — лістоўніца.

[2] Залаты быў роўны 60 крэйцарам.

рэшце ён сам пайшоў заявіць у паліцыю, каб танней было.

Я быў вымушаны знікнуць з Прагі і выехаў у Польнае, і калі мая споведзь павінна быць шчырая і поўная, заяўляю адкрыта: тую дзеўку ў Польным забіў не Гільснер, а я! Зрабіў гэта за тры залатыя.

Вядома, заставацца мне ў Польным не было як, і я рушыў пехатою ў Вену, куды прыйшоў у шасцігадовым узросце, і, не маючы сродкаў на дарогу ў Прагу, мусіў абрабаваць банк на Герэнштрасе, папярэдне задушыўшы дзеля бяспекі чатырох вартаўнікоў, аднаго за адным.

Гэта быў сапраўды адзін з маіх агідных учынкаў, якія цяжка апраўдаць, але калі вы падумаеце, як я сумаваў па радзіме, каб убачыць зноў праз доўгі час сваіх спакутаваных бацькоў...

Але не хачу быць сентыментальным. Да Прагі я даехаў добра. Выбавіўшы па дарозе адну пажылую жанчыну на пляцоўку, я схапіў у яе сумачку, а самую піхнуў з цягніка на поўным ходзе. Калі ж яе сталі шукаць, я сказаў, што тая жанчына выйшла на апошняй станцыі і ўсім кланяецца.

Але сваіх бацькоў жывых я не застаў. Бацька праз маю разбэшчанасць месяцы два назад павесіўся з гора, а мая матуля саскочыла з Карлавага моста, а калі яе ратавалі, перакінула лодку з выратавальнікамі, і яны таксама ўтапіліся.

Рос я адзін, як палец, бо атруціў цэлую сям'ю свайго беднага дзядзькі, каб завалодаць яго ашчаднай кніжкай, у якой падрабіў лічбы, каб атрымаць болей...

Шаноўная рэдакцыя «28 кастрычніка»! Ручка мяне не слухаецца. Хацеў бы пісаць яшчэ болей і выспявядацца да канца. Але паток шчырых слёз раскаяння засцілае мне вочы. Плачу, горка плачу над сваёй маладосцю і над сваім мінулым і шчыра спадзяюся на пра-

цяг у «28 кастрычніка». Гэта ёсць і будзе дадаткам да маёй споведзі.

А для таго, каб маё пакаянне перад усім чэшскім народам было мацнейшае, прашу вас прыняць мяне ў члены вашай партыі прагрэсіўных сацыялістаў.

Абяцаю, што добрымі паводзінамі апраўдаю ваш давер.

Прашу вас паведаміць мне, калі і дзе я павінен заплаціць першы членскі ўзнос вашай партыі.

А пакуль да пабачэння!

ЯК БАЛУШКА НАВУЧЫЎСЯ МАНІЦЬ

Адной рысай вылучаўся Балушка сярод аднакашнікаў — сваім патрыятызмам. Хоць і яго аднакашнікі былі таксама сапраўдныя патрыёты, і ў вачах гэтых падскальцаў гарэлі агеньчыкі глыбокай нянавісці да сміхаўцаў, але ж ніхто з іх так шчыра не ахоўваў лаўраў правага берага Влтавы, як Балушка. Калі пачыналася славутая бойка, што паўтаралася з году ў год, як толькі Влтаву скоўваў лёд, і абодва народы гатовы былі пастаяць за сябе, калі на вуліцах разносіўся покліч «Да бою!», Балушка краў раменны бізун і рабіў прашчу. Яго прашча біла далей за ўсе. Ён заўсёды з поўнымі кішэнямі каменя і грознымі праклёнамі першы атакаваў сміхаўцаў, а калі баявыя снарады канчаліся, узяўшы ў руку рэмень з вялікай спражкай, ён налятаў на перапалоханую шайку сміхаўцаў.

І ў той незабыўнай бойцы дайшло таксама да рэменя. Адзін Балушка захапіў у палон пяць сміхаўцаў і пераможна вёў іх на свой бераг у штаб падскальцаў. Працэсія гэтая дайшла да драўлянай агароджы ў старым Падскаллі, дзе палонных перш-наперш абшукалі.

Сміхаўскія вязні былі надзьмутыя, як мышы на крупы, яны ведалі, што літасці ад такога грознага непрыяцеля, як Балушка, чакаць няма чаго. Звычайна трафеяў было няшмат: рагаткі, адзін альбо два чатырохкрэйцаравыя ножыкі, чарнільная ручка, якая пэцкала пальцы (коштам адзін крэйцар), адзін-два крэйцары, тры вінты, грабеньчык, рэмень і святая іконка, якой настаўнік закону божага блаславіў іх «на бой». Аднак яна не была ніякім амулетам, ахоўнай граматай ад непрыяцеля, бралі ж яе з сабой, каб выменяць на гумку альбо каляровы аловак. Цяпер яны былі абабраныя да ніткі. Абрабаваныя, яны стаялі тут, у акружэнні ворагаў, якія іх лаялі. Трывожна чакалі экзекуцыі, і вельмі хутка дачакаліся. Экзекуцыя скончылася тым, што Балушка наслініў чарнільны аловак, потым слінай памазаў ім ілбы і кожнаму па чарзе напісаў: «Смярдзючы сміхавец».

Пасля гэтага яны павінны былі цалаваць сцяг падскальцаў, сшыты з кашулькі Балушкавай сястры (пазней высветлілася, што кашульку ён украў), і маглі ісці дадому да сваіх сміхаўскіх саграмадзян. Ішлі пад аховай падскальскіх байцоў, якія іх праз усю дарогу штурхалі. Прывялі да моста, там адпусцілі, тыя кінуліся наўцёк. А наўздагон ім несліся крыкі падскальцаў: «Пан стражнік, не пускай праз мост!»

Гэтаксама абыходзіўся і вораг са сваімі палоннымі. Балушка адчуў гэта на сваёй скуры, калі быў захоплены сміхаўцамі за Царскім лугам.

Ніхто яго не ведаў, бо тая група ваявала асобна, на свой страх і рызыку.

У яго груба спыталіся, адкуль ён, Балушка мог зманіць ім, але ён, як мужны Гай Муцый Сцэвала, спакойна і з годнасцю адказаў: «Я — падскалец, агідныя вы сміхаўцы!»

Абражаны, абабраны да ніткі, вярнуўся Балушка да сваіх.

У яго адабралі і прашчу.

У каго не было такой прашчы, той ніколі не зможа ацаніць яго страты.

З прашчы можна было страляць па вераб'ях альбо па шапках паліцэйскіх. Прыдатнай яна была і на катоў, а яшчэ яе можна было за вялікую цану прадаць у любой школе або выменяць на самую што ні на ёсць дарагую іконку святога першай велічыні або на поўны камплект набояў, якія каштуюць дзесяць крон.

— Трэба было зманіць,— сказалі яму, калі ён скончыў расказваць пра сваю адысею,— і не застаўся б у дурнях. Сказаў бы: «Я сміхавец, бугаі вы».

— Я ж не ўмею маніць,— прызнаўся Балушка,— у мяне і дома праз гэта шмат непрыемнасцей. Адзін раз узяў я ў бацькавым кашальку нейкую дробязь, і мяне западозрылі ў крадзяжы. Я зрабіўся чырвоны як рак, і трэба было ўжо здымаць порткі. Я і прызнаўся. А ўчора зноў прызнаўся, што з'еў апошнюю булачку, якую пакінулі дзядулю.

— Аднак жа трэба навучыцца маніць,— сказаў яму вісус Вітак.— Раней я таксама, як дурны, плявузгаў абы-што, твар чырванеў, адразу было відаць, што я вінаваты. А сёння схлушу і вокам не міргну. Усё, што дома разаб'ю, звалю на сястру, тую наб'юць, а яна такая плакса, дзе ідзе, там і раве.

— Што ж, калі мне хлусня ніяк не ўдаецца,— прамовіў Балушка,— пачынаю заікацца, блытацца або гаварыць глупства, і аднойчы мне сказалі, што я з глузду з'ехаў. Неяк я незнарок падпаліў сяннік і сказаў бацьку, што гэта зрабіла маці.

Спрактыкаваны Вітак задумаўся.

— Не хвалюйся, як добра прыпрэ, дык навучышся маніць.

Прыйшла вясна. А з ёю знікла магчымасць «сустрэчы» абодвух непрыяцеляў. І таму падскальцы, каб

не гультаяваць, выступілі на падалякаў, на сваіх родных братоў.

Балушку схапілі падалякі, і ён прызнаўся ім, што ён падскалец. І паплаціўся за гэта.

Балушкаў бацька трымаў карчму ля самай рэчкі. Аднойчы прыгожым днём, калі так ласкава свяціла сонца, усе падскальцы пацягнуліся ў скалы над Вышаградам, каб знянацку захапіць падалякаў. Бацька паслаў Балушку купіць сардэлек гасцям. Сумны Балушка ішоў у Прагу.

Сэрцам ён быў са сваімі аднапалчанамі. Калі ён вяртаўся са скруткам сардэлек, у завулку заўважыў хлопца, які стаяў за плотам і свістаў на ўсю моц.

Балушка падбег да яго, а гэта быў не хто іншы, як хлопец з Завадзілкі на Падоле. Гатовы непрыяцель! Як толькі той падольскі нязваны госць заўважыў варожы погляд Балушкі, у яго адвісла сківіца і ён кінуўся ўцякаць. Але Балушка падскочыў да яго, спытаўся: «Чаго ты тут сноўдаешся?» — і пачаў яго валтузіць.

Скрутак з сардэлькамі паляцеў на зямлю і разарваўся, з яго вылецелі дзве прыгожыя сардэлькі, але Балушка, заняты прыёмам няпрошанага госця, не меў часу іх падабраць. Ён толькі ўбачыў, як з-за плота выскачыў сабака, схапіў сардэлькі і, радасна віхляючы хвастом, пабег да Эмаўзаў [1].

Балушка адпусціў ворага, падхапіў скрутак і пабег за сабакам. Дзе ты яго дагоніш! Калі нарэшце ён згледзеў сабаку, той ужо смачна аблізваўся.

Прыгнечаны Балушка вярнуўся дадому і пачаў старанна развешваць сардэлькі ля стойкі.

— Ты ўсе прынёс? — спытаўся бацька і пачаў іх лічыць.— Дзвюх не хапае,— сказаў суха, кіўнуўшы галавой на Балушку,— марш у пакой!

---

[1] Эмаўзы — манастыр у Празе.

Без душы ішоў Балушка за бацькам. Ужо нават пачаў расшпільваць порткі.

— Пачакай, даражэнькі,— сказаў бацька,— спачатку скажы, чаму ты іх з'еў?

— Я не еў!

— А хто?

— Сабака.

— Не мані!

— Іх сабака з'еў, як яны рассыпаліся,— галасіў Балушка.

— Дык ты так навучыўся маніць?! — раскрычаўся бацька.— Маці, хадзі сюды, калі хочаш убачыць, як гэты хлопец зараз заблытаецца. Я табе даўно казаў, каб ты не маніў. Зараз пачнеш выдумляць... Чырванеш, я цябе навучу. Ты прызнаешся. Будзеш кленчыць на гаросе датуль, пакуль не перастанеш маніць!

Балушка кленчыў. Адчуваў кожную гарошыну. А насупраць яго сядзела строгая маці і чытала «Святога Войцаха».

Час ад часу пазірала на яго і пыталася:

— З'еў?

— Не еў!

Калі карчма апусцела, прыйшоў бацька і грозна спытаўся:

— Не мані. З'еў?

А Балушка ўсё плакаў:

— Не еў.

Звечарэла ўжо. На стол паставілі вячэру, а Балушка ўсё яшчэ кленчыў на гаросе і плаксіва адказваў на пытанні адно і тое:

— Не еў!

Так смачна пахнуць сардэлькі з кнедлікамі, а Балушка ўсё яшчэ на каленях. Нарэшце ён больш не можа трываць і чакае, калі ж у яго зноў спытаюцца.

І тут зноў загаварыў бацька:

— Апошні раз кажу табе, каб ты не маніў. З'еў?

— З'еў! — без затрымкі адказаў Балушка.

— Ага. Цяпер скідай порткі,— дабрадушна сказаў бацька, і Балушка з радасцю перагнуўся праз бацькава калена.

Пасля ён атрымаў сардэльку з кнедлікам. Кладучыся пасля пражытага выпрабавання спаць, глянуў Балушка на абраз анёла, што вісеў над ложкам, і прашаптаў:

— Дзякуй богу, навучыўся маніць.

КАЛЕКЦЫЯНЕР АБ'ЯЎ

Дырэктар псіханеўралагічнага санаторыя доктар Шалік атрымаў тэлеграму:

«Наш сын прыедзе сёння пасля абеду да вас.

Ірак».

Гэтая тэлеграма была вынікам перапіскі пана Ірака і доктара Шаліка.

Уся перапіска ляжала на стале ў доктара.

Пан доктар перачытаў лісты, якія дасылаў яму пан Ірак.

Змест іх быў такі. Ліст першы:

«Ваша Высакароддзе!

Добрая слава пра Ваш паважаны псіханеўралагічны санаторый прывяла да таго, што я асмеліўся напісаць Вам і папытацца, ці не змаглі б Вы, Ваша Высакароддзе, прыняць майго сына Людвіка, які пакутуе ад душэўнай хваробы. Яго ідэя-фікс тая, што ён нібыта з'яўляецца калекцыянерам аб'яў для календароў, і таму ён ходзіць па розных прадпрыемствах і арганізацыях, дзе адрэкамендоўваецца як агент рэдакцыі календароў і патрабуе аб'явы.

Дазвольце звярнуцца да Вас з просьбай, Ваша Высакароддзе, напісаць мне адказ на ніжэй указаны адрас.

Застаюся з глыбокай павагай
Ян Ірак, фабрыкант са Скржэнца».

— Так, я напісаў яму,— гаварыў доктар,— што гэта будзе вялікі гонар, калі змагу вылечыць яго сына. Выпадак надзвычай рэдкі. Калекцыянер аб'яў! Ёсць сапраўды калекцыянеры аб'яў, але ж каб хто звар'яцеў ад гэтага і стаяў на сваім, што ён калекцыянер, такога яшчэ ў псіхіятрычнай практыцы не было.

Доктар узяў другі ліст ад пана Ірака, дзе было напісана:

«Ваша Высакароддзе!

Ваша згода прыняць майго сына на абследаванне вельмі мяне ўзрадавала, і я ўпэўнены, што толькі Вы зможаце вылечыць майго сына.

На Ваша шаноўнае пытанне аб прычынах гэтай хваробы адказваю: мой сын год назад, яму было тады 23 гады, моцна закахаўся ў адну прыгожую дзяўчыну з другога, але недалёкага горада. Мы далі сваю згоду на іх шлюб, аднак ён захварэў на запаленне лёгкіх і хварэў некалькі месяцаў. Вяселле, вядома, было адкладзена, і тут яго нарачоная прыслала нам ліст, што так доўга чакаць яна не можа і выходзіць замуж за аднаго агента па збіранні аб'яў.

Усё гэта моцна падзейнічала на майго сына, і спачатку ён увесь час быў нейкі задуменны, маўклівы, а пасля з'явілася гэтая ідэя-фікс, што ён і ёсць калекцыянер аб'яў.

Суцяшае мяне вельмі, Ваша Высакароддзе, што Вы ідзяце насустрач майму жаданню вярнуць розум майму сыну.

Асмельваюся Вас папярэдзіць, мой сын не павінен здагадвацца пра мэту свайго наведання Вашага сана-

торыя. І таму хачу, каб Вы, Ваша Высакароддзе, падказалі мне, якую прыдумаць падставу для яго візіту.

Адначасова хачу праінфармаваць Вас, што мой сын яшчэ мае адну асаблівасць, ён прысвойвае сабе іншыя імёны, як царкоўныя, так і мянушкі.

Чакаю Вашага хуткага адказу.

Адданы Вам з глыбокай пашанай
Ян Ірак».

— Так,— сказаў доктар, калі дачытаў гэты ліст,— я пісаў, што трэба не прагаварыцца, куды ён едзе. Пісаў Іраку, каб яго прыслалі да мяне аднаго і сказалі, што адзін вядомы доктар хоча даць аб'яву ў календары. І ён будзе тут.

Доктар узяў у рукі яшчэ адну тэлеграму і прачытаў:

«Наш сын прыедзе да Вас сёння пасля абеду.
Ірак».

Доктар устаў і пайшоў даваць распараджэнні персаналу.

Не прайшло і паўгадзіны, як у дзверы пакоя, дзе сядзеў доктар, пастукалі, увайшоў малады, гадоў дваццаці чатырох, мужчына.

«Гэта ён,— падумаў доктар,— трэба нічым не выдаць сябе».

— Чым я абавязаны, што маю гонар бачыць вас? — сказаў доктар, лагодна ўсміхаючыся.

— Дазвольце вам адрэкамендавацца,— сказаў малады чалавек,— я Ладыслаў Гаек, агент па збіранні аб'яў у календары: «Шчасце ў хату», «Правінцыя» і «Горад і вёска». Я прыйшоў да Вас, шаноўны пан, папрасіць Вашай згоды супрацоўнічаць у нашых календарах, якія выходзяць статысячным тыражом. Кожная аб'ява будзе прачытана, бо каляндар увесь год

пад рукой. Наша фірма з вялікай ахвотай ідзе насустрач кожнаму, хто дае аб'яву. Кожнаму гарантуе апублікаванне нататкі, у якой сцісла рэкламуецца аб'ява.

«Ага,— падумаў доктар,— ты зусім дурны», але спакойна запытаў:

— А колькі трэба плаціць за аб'яву, малады чалавек?

— Зусім мала, шаноўны пан,— адказаў юнак,— лічыце 80 залатых за адну поўную старонку ва ўсе тры календары, і ва ўсіх трох календарах будзе ваша нататка.

Доктар пазваніў, і калі прыйшоў санітар, сказаў яму:

— Правядзіце пана ў мой кабінет. Я хутка вярнуся, і тады мы ўсё ўдакладнім.

Санітар праз хвіліну вярнуўся.

— Ну, як? — спытаўся доктар.

— Нічога не гаварыў, пакуль мы яго ўпіхалі ў пусты пакой, а як пачалі замыкаць дзверы, толькі і сказаў:

— Відаць, тут усе вар'яты, бо што ж тут можна ўкрасці, нейкі дзіўны кабінет.

Пасля засмяяўся, і яшчэ я пачуў, як ён сказаў: «Калекцыянер аб'яў як-небудзь перацерпіць».

Доктар засмяяўся, пасля падышоў да стала, узяў аркуш паперы і нешта напісаў.

— Занясеш гэтую тэлеграму на пошту,— сказаў ён санітару.

У тэлеграме было: *«Пану Іраку, фабрыканту са Скржэнца. Усё ў парадку. Сын прыехаў.*

Доктар Шалік».

А праз шэсць гадзін пасля таго, як маладога чалавека замкнулі ў пустым пакоі і адтуль час ад часу чулася буханне ў дзверы і крыкі: «Вы што тут, усе

вар'яты, выпусціце мяне», пан доктар атрымаў тэлеграму:

«Доктару Шаліку ў Крэчаніцах. Памылка. Сын прыхварэў. Прыедзе заўтра.

Ірак».

АМСТЭРДАМСКІ ГАНДЛЯР ЧАЛАВЕЧЫНАЙ

Не могучы даць ніякай карысці чэшскаму народу, надумаўся я павышаць узровень яго развіцця. Дзеля гэтага я знайшоў выдатнага чалавека, які ўжо тройчы сядзеў на Панкрацы [1] за розныя злачынствы і меў дзівосную фантазію.

Акрамя таго, ён спрытна валодаў пяром і ўмеў сваім думкам надаць патрэбную форму, што было не пад сілу другому майму супрацоўніку, якому бракавала здольнасці арыгінальна мысліць, але які, аднак, мог разгарнуць прапанаваную тэму, звязаць і выкласці асобныя эпізоды вельмі дасціпна і займальна.

Перагаварыўшы з імі, паведаміў я абодвум шаноўным супрацоўнікам, што маю намер заснаваць выдавецкую фірму, якая будзе забяспечваць чэшскую публіку займальным чытаннем.

Я склаў з абодвума ўмову: яны абавязаліся, што за звычайны ганарар пададуць мне не пазней як праз пяць месяцаў займальны раман.

Праз пяць месяцаў у маім выдавецтве выйшаў першы выпуск рамана «Амстэрдамскі гандляр чалавечынай, ці Таямнічае забойства ў Чорнай пячоры, ці Карчма «У крывавага біскупа». Раман друкаваўся чатыры гады штотыднёвымі выпускамі па восемдзесят гелераў

[1] Панкрац — турма ў Празе.

за выпуск, усяго выйшла дзвесце восем выпускаў агульнаю вагою васемнаццаць кілаграмаў. Які ён меў поспех, сведчыць найлепей выпадак з гандляркай прадуктамі Возабавай, пра які я раскажу.

Францішак Голан, падзёншчык, меў дванаццаць дзяцей і чакаў якраз трынаццатага, калі разносчык прынёс яму першы выпуск «Амстэрдамскага гандляра чалавечынай, ці Таямнічага забойства ў Чорнай пячоры, ці Карчмы «У крывавага біскупа». Нецярплівае чаканне прыбытку ў сям'і надта здоўжылася Голану, і, каб адагнаць нуду, ён узяўся прагна чытаць першы выпуск. Чым далей чытаў, тым было цікавей. Пачатак быў цудоўны. У Амстэрдаме, каля прыстані на глухой вуліцы, дзе менш чым за год бясследна зніклі ў канале сотні чужынцаў, быў невялікі шынок, і там можна было атрымаць пакой. Да пітва гасцям, якія хацелі пераначаваць, падмешвалі соннага парашку, а потым... потым правальвалася пасцель з начлежнікам у склеп. Удар, страшны здушаны крык... Каля шынка была мясная крама. Тут секлі і прадавалі такое таннае мяса, што ў краме заўсёды было поўна пакупнікоў. Мяса мела асаблівы смак — там гандлявалі чалавечынай. Ведаеце, як гэта рабілася? У склепе сонных начлежнікаў забівалі сякераю, патрашылі, рассякалі на часткі і ўначы дастаўлялі чалавечыну ў мясную краму. «Аднак Роберт Клег вырваўся адтуль неверагодным чынам...» Гэта быў апошні радок выпуску. З тае пары падзёншчык Голан стаў купляць рэгулярна «Амстэрдамскага гандляра чалавечынай». Меўшы трынаццаць дзяцей, плаціць кожны тыдзень па восемдзесят гелераў было яму ўсё-такі цяжка. Таму кожную суботу ён пасылаў сваіх меншых дзяцей па чарзе жабраваць, а за нажабраваныя грошы купляў наступны выпуск «Амстэрдамскага гандляра чалавечынай» і з асалодаю ўчытваўся ў падрабязнае апісанне забойстваў, якія былі выкладзены гэтак адмыслова, што выпуск

заўсёды канчаўся пачаткам забойства, а дабівалі ахвяру на пачатку наступнага выпуску, у якім пад канец хапалі верхавода банды, які ў перадапошнім радку ўцякаў з турмы, спусціўшыся па громаадводзе, і перакокваў праз сцяну, падаў ад кулі вартавога, каб падхапіцца і кінуцца ўцякаць у пачатку наступнага выпуску, і на лодцы ў буру, калі вецер вырваў вёслы ў яго з рук, спаткацца ў апошняй фразе выпуску з шайкай кантрабандыстаў, у верхаводзе якой ён пазнае сваю былую каханую, зведзеную графам дэ Галуа. І гэтак далей у такім духу.

Гісторыя карчмы «У крывавага біскупа» размалёўвалася праз паўгода, і ўвесь гэты час у выпусках войска і жандармерыя марна ганяліся за ценем «крывавага біскупа».

Чатыры гады зачытваўся падзёншчык Голан «Амстэрдамскім гандляром чалавечынай», праліваючы начамі слёзы над лёсам уцякачкі — прынцэсы Галуа, няроднай сястры верхавода кантрабандыстаў, пераапранутай і спакушанай каханкі верхавода банды, які быў акружаны войскам у Чорнай пячоры, але выбавіўся з небяспекі, кінуўшыся ў вадаспад.

Дачытаўшы апошні, 208 выпуск і заплаціўшы за ўсяго «Амстэрдамскага гандляра чалавечынай» сто шэсцьдзесят крон сорак гелераў, Голан праплакаў цэлую ноч, а калі ўспомніў пра сумны канец верхавода банды, якога ў апошнім выпуску павесілі, у яго з жалю разарвалася сэрца. Голан памёр, пакінуўшы жонку з трынаццаццю дзецьмі без ніякіх сродкаў. Пасля пахавання ўдава прадала ўсе дзвесце восем выпускаў гаспадыні прадуктовай крамы насупраць, пані Возабавай, за адну крону сорак гелераў, гэта значыць, васемнаццаць кілаграмаў паперы загортваць сасіскі і падобнае па восем гелераў за кілаграм.

Пані Возабава была годная жанчына, якая мела дваякіх пакупнікоў: адны плацілі гатоўкаю, а другія

бралі на кніжку. З усімі яна трымалася ветла, адно што панечкам, якія плацілі гатоўкаю, гаварыла «васпані» і «цалую ручку», а пакупніцам другой катэгорыі проста: «што загадаеце» і «маё шанаванне». Больш ніякай розніцы не было.

Гэта шаноўная пані, купіўшы ад удавы Голанавай дзвесце восем выпускаў «Амстэрдамскага гандляра чалавечынай», сказала занесці паперу да яе дахаты, а калі зачыніла краму, задумала нарэзаць з выпускаў чвэртак. Узяла першы выпуск і ўжо хацела брацца за справу, як раптам у вочы ёй кінулася тлустымі літарамі: «А, яны прадаюць у мясной краме мяса забітых людзей!» Паціснуўшы недаверліва плячыма, яна адклала нож і пачала знаёміцца з новым відам гандлю мясам. З таго часу на яе найшоў одум. На другі дзень прачытала другі выпуск, трэці і чацвёрты і так, чытаючы ў сярэднім тры выпускі за дзень, за дзевяноста дзён прачытала ўсе дзвесце восем выпускаў. З выпуску сто восьмага яна перастала глядзець сябе і не пераадзявалася. На дзевяносты дзень яе найлепшыя пакупніцы, якія плацілі гатоўкаю, атрымалі ад яе ліст ок такога зместу: «Васпані, зрабіце ласку прыйсці сёння ўвечары да мяне дахаты. Маю вялікую навіну!»

Калі яны прыйшлі, яна пасекла ўсіх сякераю. Як толькі чутка пра гэта разнеслася па горадзе, мусіў я даць «Амстэрдамскага гандляра чалавечынай» другім выданнем.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

Камітэт пацешлівай і дабрачыннай суполкі «Шчыры дабрадзей» канстатаваў у пачатку месяца снежня, што казна суполкі складае сто дваццаць крон. Само сабою зразумела, што члены адразу сабраліся ў памяш-

канні суполкі, каб параіцца, як выдаткаваць мэтазгодна і дабрачынна гэтыя грошы, маючы на ўвазе, што надыходзяць каляды. Старшыня ад выпітага піва зрабіўся сентыментальны і стаў гаварыць прачулым голасам пра ўдоў і сірот. Пачаў маляваць сумнымі фарбамі нейкі няпэўны выпадак з беднай удавой, якая павесілася на каляднай ёлцы. Потым узяўся ікаць і заказаў сабе слівянкі. Сакратар заказаў таксама бутэльку віна, і камітэт зноў пачаў разважаць, як абысціся дабрачынным спосабам з супольнымі грашыма. Нарэшце старшыня, які пачаў ліць слівянку ў віно, падаў думку знайсці пяць удоў з дапамогай аб'явы ў газеце, у якой прапанаваць самым бедным, бездакорных паводзін мацеркам-удовам, каб яны падавалі заявы на дапамогу ў суполку, паміж пяццю і шасцю гадзінамі папаўдні. Пяці ўдовам дадуць па дваццаць крон, разам гэта сто крон. Уся ж казна складае сто дваццаць крон, застаецца дваццаць крон. Што рабіць з імі? Гэтае пытанне развязалі мудра. Да поўначы прапілі агулам грошы, з якімі не ведалі, што рабіць, і, такім чынам, закруглілі разумна суму.

Аб'ява ў аддзеле кароткіх паведамленняў пачала дзейнічаць. Старшыня сядзеў у памяшканні суполкі з пяці да шасці, піў піва і ў паніцы прымаў заявы бедных удоў. У першы дзень іх прыйшло поштаю дваццаць і асабіста было пададзена шэсцьдзесят.

Старшыня разнерваваўся і з жахам заўважыў, што ўжо больш не можа плакаць. Яго расчульвалі тыя ўдовы і сіроты, што рынуліся ў памяшканне. Яны цалавалі яму рукі, скардзіліся і плакалі. Адна ўдава прывяла з сабою дванаццаць дзяцей. Бедалага дзівіўся вытрашчанымі вачыма, як гэтыя «пазычаныя» дзеткі, падобныя, нібы блізняты, на пададзены знак страшэнна зараўлі і пачалі літаральна лізаць яму рукі. Выпацканыя, мурзатыя фізіяноміі глядзелі на яго так жаласна, што ён ужо ледзь быў не палез у кішэню,

каб з сваіх грошай надзяліць сіротак крэйцарамі, як раптам без ніякага стуку ў памяшканне ўварвалася новая працэсія — на гэты раз пяцёра дзетак, якіх вяла жанчына з маркотным выразам твару. Выраз той імгненна перамяніўся, як толькі бядачка ўбачыла першую грамаду. Яна падскочыла да маці дванаццаці сіротак і пачала даваць ёй аплявухі. «Я ўдава,— крычала яна,— а ў цябе ёсць муж, вы гусей ясце! З усяго дома збіраеш, падла, дзяцей і ходзіш жабраваць ад парога да парога».

Старшыня з жахам глядзеў на нечаканы паварот справы. Першая матка зламала яго парасон аб новую просьбітку, тым часам як дзеткі кінуліся адны на адных і высадзілі шкло ў кніжнай шафе.

Старшыня раззлаваўся. Ён пачаў грукаць кулаком па стале, афіцыянт выпіхаў фальшывую матку, карчмар вытурваў з памяшкання другую, сіроткі адно за адным выляталі на вуліцу, потым настала цішыня, толькі старшыня крычаў афіцыянту: «Прынясіце мне каньяку!»

Перад шасцю гадзінамі старшыня зваліўся з крэсла. Ён выпіў дваццаць чарак каньяку і сцягнуў на сябе абрус, а з ім і ўсе заявы на калядную дапамогу.

Калі пасходзіліся члены камітэта, старшыня спаў у суседнім пакоі на канапе, і ў іх склалася ўражанне, што тут, напэўна, разыгралася нейкая трагедыя.

Таго дня пілі ў меру і прапілі пятнаццаць крон. А пасля таго як зашклілі кніжную шафу, у казне засталося восемдзесят крон. Такім чынам, адна ўдава адпала. Толькі чатыры атрымаюць па дваццаць крон.

На другі дзень прымаў заявы сакратар. Гэта быў чалавек нервовы. Ён страшэнна разгневаўся, калі адна просьбітка пачала абдымаць яго за калені.

— Вон,— закрычаў ён,— прэч адсюль. Які жах!

Потым заявілася маладая прыгожая ўдавіца.

— Я не хачу нічога чуць,— крычаў ён,— давайце

заяву і ўсяго добрага! Зразумелі? Я не хлапец! Чорт вазьмі!

Пасля прыйшлі члены камітэта і пачалі сур'ёзна абмяркоўваць дабрачынныя мэты суполкі.

Старшыня папрасіў кампенсацыі. Ён хацеў дваццаць крон за паламаны парасон і турбацыю, звязаную з учарашнім прыёмам заяў. Яго папракнулі, што абірае суполку, што ён алкаголік.

Сакратар крычаў, што калі старшыні дадуць дваццаць крон, то няхай наогул аплочваюць выдаткі ўсім членам камітэта, якія прымалі заявы. Нарэшце ён папрасіў дзве кроны, бо заказваў сабе ў службовы час біфштэкс і тры куфлі пльзенскага.

Дэбаты разгараліся. Нарэшце ўсе сышліся на адным. Лепш хай толькі дзве прыстойныя ўдавы атрымаюць па дваццаць крон, чым каб дваццаць крон трапілі ў благія рукі.

Калі разыходзіліся, казна зноў была меншая.

Калі ж настаў шчодры дзень, у касе суполкі ляжала шэсцьдзесят восем гелераў, а на стале — трыста дваццаць заяў бедных удоў.

— Панове,— сказаў старшыня,— у сувязі з абставінамі, якіх мы не маглі прадбачыць, раздачы калядных падарункаў сёлета не будзе.

Засталося яшчэ вырашыць, што рабіць з астаткам казны, які складае шэсцьдзесят восем гелераў. Прапаную лічыць іх пачаткам сродкаў на нашы дабрачынныя мэты ў наступным годзе, якія я вітаю зычным «ура».

ПРА ШЧЫРУЮ ДРУЖБУ

Ёсць жа людзі: абы сустрэлі каго знаёмага, дык ажно захліпаюцца ад шчасця і адразу клічуць да сябе. Якое толькі драбязы тады не прыпомняць! Як, на-

прыклад, некалі разам сёрбалі каву і бачылі з акна кафэ, што насупраць упаў конь. Потым гаворка перакінецца на такія рэчы, якія ніяк не ўпрыгожваюць таго, з кім яны здарыліся, але заселі ў памяці глыбока і міжволі падштурхоўваюць, каб пра іх пагаварылі.

— Памятаеш, як мы непрыгожа зрабілі з прыгожанькай Здэнкай?

І колькі цёплых пачуццяў абудзіцца, пакуль старыя сябры перабяруць усю непатрэбшчыну, якую колісь разам тварылі! І змушаны будуць прызнаць, што за ўвесь час іх сяброўства нічога добрага не зрабілі, а той, хто запрашаў другога на госці, раптам пачне ўсё былое адмятаць ад сябе і нават заявіць, што цяпер усё інакш. Ён і жанаты, і мае двух хлапчукоў, а жонка напраўду вельмі ўзрадуецца, калі ўбачыць сведку мужавай маладосці.

Звычайна ён да гэтага дабавіць, што расказваў ёй пра яго шмат добрага.

Праўда, кожны ведае, як расказваюць дома пра сваіх прыяцеляў. Сябе ж стараюцца выставіць перад жонкай анёлкам. Сваёй жонцы дык я пра кожнага свайго знаёмага гавару, што ён жлукціць ром. Праўда, для разнастайнасці часам гавару, што некаторыя з маіх прыяцеляў бабнікі — свет не бачыў.

У гэты час я пахаджваю па пакоі і стараюся, каб як не ўчапіцца кішэняю пінжака за рог падстаўкі якой-небудзь статуэткі, бо ў левай кішэні ў мяне пляшка каньяку, а ў правай — пісулька ад адной гімназісткі.

І дзіву даешся, чаго толькі жонкі не запамінаюць пра мужавых сяброў.

Неяк шпацыруем мы з жонкаю, як раптам здароўкаецца з намі ды ідзе сабе далей нейкі мужчына, а я вазьмі ды скажы, што вось гэты мужчына — малады Крамскі.

— А, ведаю,— яна мне.— Гэта той, што колісь атруціў афіцыянтку, з якою жыў.

— Дарагая, што ты вярзеш! — здзівіўся я.

— Дык ты ж мне сам пра гэта расказваў.

Дайшло да сваркі, а калі я сказаў, што гэта ўсё лухта, то яна яшчэ і навалілася на мяне, чаго я заступаюся за ўсякіх нягоднікаў.

Вось чаму, ведаючы ўсе гэтыя агульнавядомыя акалічнасці, я не вельмі ўсцешыўся, калі прафесар Гардоўскі (знарок мяняю яго прозвішча, каб чалавеку не было брыдка за сябе) трапіўся мне ў час аднаго падарожжа па Сярэдняй Еўропе, якія я час ад часу раблю са сваім сябрам Білем, і стаў мяне пераконваць, што вельмі ж многа добрага расказваў пра мяне сваёй жонцы і яна вельмі ўзрадуецца, калі пазнаёміцца са мною і маім сябрам.

З-за гэтай нечаканай сустрэчы ён так бурліва выказваў сваю радасць, што мы і слова не маглі ўставіць, і тут жа заявіў, што мецьме за вялікі гонар бачыць нас у сябе і што інакш нават быць не можа.

Між іншым, ён мае двух сыноў, на якіх прыемна будзе нам паглядзець. Праўда, піва ў горадзе не вельмі добрае, але можна зараз схадзіць у адзін рэстаранчык, у гаспадара яго нядаўна памерла жонка. Дык ён у такім горы, што нават забывае разбаўляць піва. Сёння там увесь горад. Для прыезджага такія парады вельмі каштоўныя. У гэтым правінцыяльным шынку мой сябра Гардоўскі зрабіўся яшчэ больш гасцінны. Мы загаварылі пра тое, як я аднойчы ў Празе запатрабаваў, каб яго вывелі з адной піўнушкі, а ён успомніў, як хацеў тады жбурнуць у мяне куфлем. Выявілася таксама, што ён ведае майго прыяцеля Біля — вычытаў у навінах і нават меў з ім неяк у Брэйшкі спрэчку пра нейкую планету. За сяброўскімі размовамі мы засядзеліся далёка за поўнач, як раптам Гардоўскі пачаў гаварыць штосьці дзіўнае, быццам забыў дома

сказаць пра наш прыезд і там нічога не прыгатавана. Зрэшты, гэта дробязь: тут, на другім паверсе, ёсць пакоі для прыезджых; і гэтак нават лепш, ён зараней усё падрыхтуе. Акрамя таго, і жонка, мабыць, ужо спіць, ёй цэлы дзень нездаровілася.

У гадзіну ночы яму ўспомнілася, што мы маглі б перапалохаць бабулю, і гэта вельмі добра, што не пайшлі да яго.

— Тая бабуля, што сёння прыехала? — сказаў я нібы пра даўно вядомае.

— А ты адкуль гэта ведаеш? — спытаў ён і не пачырванеў.

— Дык гэта ж заўсёды так бывае. Старыя сваякі заўсёды прыязджаюць нечакана.

— Праўду кажаш,— пацвердзіў ён.— Дзед таксама прыехаў, але гэта не мае значэння: заўтра прыходзьце да мяне і можаце размяшчацца. А цётку мы ўжо дзе-небудзь прыладкуем, яна таксама прыязджае заўтра.

— Ды неяк жа дамо ёй рады,— мой сябра Біль гаварыў, як ледакроўны.— Люблю я старэнькіх цётак, яны заўсёды з'яўляюцца тады, як мы каго-небудзь запрашаем.

У дзве гадзіны ночы наш сябра Гардоўскі запэўніў нас у сваёй шчырай дружбе і заўважыў, што заўтра ў іх будуць бяліць. Я сказаў, што гэта нічога, што я нават люблю глядзець, як завіхаюцца маляры. У палове трэцяй ён пачаў плесці нешта пра дзядзьку, які прыехаў яшчэ пазаўчора, і зусім заблытаўся ў сваіх уяўных сваяках.

Мы яму сказалі, што гэта зусім не яго сваякі, што ён трапіў у рукі нейкіх прайдзісветаў і павінен усіх бязлітасна павыганяць.

Ён шчыра пакляўся, што так і зробіць.

Потым ён развітаўся з намі гэтак сардэчна, што ўсе выпівохі, якія яшчэ заставаліся, вельмі расчулі-

ліся. Ён і абдымаў, і цалаваў нас, цягнуў да дзвярэй ды яшчэ крычаў, колькі радасці будзе мець ад заўтрашняй сустрэчы з намі. Калі мы былі ўжо на вуліцы, да нас даляцела:

— Як толькі прачняцеся, дык зразу і шыбуйце да мяне. Мне будзе так прыемна!

* * *

Прачнуўшыся, мы адразу накіраваліся да яго. Ён жыў паблізу ад шынка, у якім мы адлежалі бакі на лаўках, бо выявілася, што Гардоўскі ад радасці, што сустрэў старых знаёмых, выдумаў bona fide[1] гэтыя пакоі для прыезджых на другім паверсе. Нам самім было трохі соромна. Як гэта мы не прыгледзеліся, не заўважылі ў цемры, што дом аднапавярховы!

Падышла адчыніць нам дзверы сама пані прафесарыха. Мы сказалі, хто такія, і хацелі пераступаць парог, тлумачачы, што нас запрасіў Францік.

Яна рашуча заступіла дарогу.

— Мой муж нічога пра вас не гаварыў, і я вас не ведаю, панове. Ён з раніцы пайшоў у горад.

Дадала яшчэ, што не ведае, калі і вернецца. Мо хіба па абедзе.

А з пакоя побач чулася знаёмае пакашліванне нашага сябра Гардоўскага. Мы ўтаропіліся туды вачыма.

— Гэта сабака там спіць,— збянтэжана прамовіла пані прафесарыха.

— Ваш муж учора нам пра яго расказваў. Яны абодва пакутуюць ад насмарку яшчэ з лета, ды нічога страшнага,— сказаў я.— А калі ўсё-такі вернецца гаспадар?

— Ён сказаў — недзе пасля абеду. А вы пабудзеце яшчэ ў горадзе ці паедзеце сёння раніцаю? У адзінаццаць ёсць цягнік.

---

[1] З найлепшымі намерамі *(лац.)*.

— Ну што вы, васпані. Мы прабудзем тут цэлы тыдзень, як і абяцалі вашаму мужу.

Было відаць, як пані прафесарыха збялела. Яе прыгожанькія вусны адкрыліся, каб ухапіць больш паветра, і, павагаўшыся, яна пацікавілася, дзе мы будзем абедаць. Калі мы адказалі, што вось тут, побач, у харчэўні, сказала, што, калі вернецца муж, яна падашле па нас каторага хлопчыка. Абодва падшывальцы нашага сябра Гардоўскага, адзін выгляд якіх, па яго словах, павінен быў прынесці нам шмат прыемнага, нізалі нас калючымі вачыма.

У такіх выпадках ніколі не трэба падаваць выгляду, што табе непрыемна ці ты не верыш у тое, што пачуў. Мы спакойна адказалі, што будзем чакаць, калі па нас прыбягуць.

Пагладзілі хлопчыкаў па галаве, ад чаго яны ашчэрыліся, нібы хацелі цапнуць нас за руку.

Пані прафесарыха пачала супакойвацца, калі ўбачыла, што мы павярнулі ісці. Каб больш дапячы ёй, я вярнуўся і сказаў, што хоць яе муж абяцаў пасяліць нас у пакоі за спальняй, але мы не вялікія паны, можам паспаць і ў кухні.

Ужо на лесвіцы мы пачулі, як з-за дзвярэй прафесаравай кватэры рвецца нам услед плач жонкі. Гэтакі віскліві з захліпамі плач, якім плачуць жанчыны ад злосці.

З-за фіранкі акна на другім паверсе, дзе была кватэра прафесара, бліснулі два шкельцы пенснэ, а потым убачыліся і спуджаныя вочы нашага мілага сябра. З такою тугою глядзелі колісь вочы хлапчукоў-хрысціян на раз'юшаных башыбузукаў, якія каралі немусульман.

Дзівак, ён быў наіўны, як страус. Праз некаторы час, калі мы сядзелі ў тым самым рэстаране, каля нашага стала ўзнік светлавалосы хлапчук — адзін з двух набыткаў нашага сябра Гардоўскага.

Узнік непрыкметна, нахабна вырачыўся і суха кінуў:

— Тата даручыў сказаць, што паехаў у Прагу.

Выпаліў і хацеў даць лататы. Але мы дагналі яго ўжо каля выхаду і прыцягнулі назад у памяшканне. Ён спачатку выкручваўся і агрызаўся, а як зразумеў, што нявыкрутка, зазіркаў вачыма вакол сябе.

— Зараз, даражэнькі, мы табе будзем рваць кіпці, пакуль не скажаш усёй праўды,— сказаў Біль.— Нам усё вядома.

— Тата паехаў у Прагу!

Мы яму зрабілі так званую «рукавіцу». Але ён, сціснуўшы зубы, цадзіў сваё:

— Тата паехаў у Прагу!

І тут мой прыяцель Біль скумекаў, што трэба зайсці з другога боку. Ён паказаў яму крону з самых дробных грошай і сказаў:

— Усё гэта будзе тваё, калі скажаш, што робіць бацька.

Душа маладога Гардоўскага ажно разрывалася ад пакут. Урэшце прага нажывы перамагла, і ён выдаў бацьку.

— Тата дома спіць,— ціха сказаў ён і заплакаў. (Цікавы псіхалагічны момант: заплакаў тады, калі мы не далі яму той кроны.) Потым сказаў, што яго завуць Карлічак.

— Карлічак хоча тую крону. Тата і без таго на вас гаварыў, калі прыйшоў ноччу дадому, што вы нягоднікі.

Вось такое пачулі мы ад гэтага хлопчыка-анёлка.

Мы пусцілі яго, але ён, як і той Іуда, пайшоў не дадому, а на рэчку. Сабраўшыся, мы пакіравалі да нашага сябра Гардоўскага.

Пані прафесарыха сустрэла нас так холадна і глянула з такім выклікам, што было відаць, як яна сама цешыцца ад сваёй прыдумкі.

— Літасцівая пані,— сказаў я,— мы прыйшлі праверыць, ці праўда, што ваш муж паехаў у Прагу.

— Яшчэ перад полуднем.

— Васпані, вы мо не ведаеце, што ваш муж ашуквае вас: ён спіць сабе тут, у кватэры, а вы пра гэта не ведаеце.

Яна збялела і сказала:

— Прабачце, але хто мог вам такога наплесці?

— Адзін ваш сыночак.

Яна заквахтала нешта такое, быццам хлопчык меў на ўвазе Карлічка, які і праўда спіць там.

— Васпані, вы зноў памыляецеся. Якраз сам Карлічак нам пра гэта і сказаў.

Толькі паспеў я гэта прамовіць, як расчыняюцца дзверы і ў прыхожую ўлятае наш прыяцель Гардоўскі, крычыць:

— Ну й падваротнік!

Крутнуўся да нас:

— Мы прайгралі, здаёмся. Праходзьце далей...— А жонцы сказаў: — Прынясі нам, Дарынка, пляшку віна.

Потым ён, апраўдваючыся, пачаў расказваць, што неяк у Пльзені адзін рэдактар паклікаў яго да сябе, а калі ён прыйшоў, то сустрэў вельмі холадна і сказаў, што проста захлынаецца ад работы і што лепш ім сустрэцца ў рэстаране «Старая пошта», дзе разам паабедаюць. І што? Змарнаваў тры гадзіны, чакаючы яго там. Вярнуўся зноў у рэдакцыю, а яму і выкладваюць, што рэдактар паехаў на выстаўку ў Лейпцыг.

— Бачыце? Гэта ж трэба дадумацца, каб такое глупства сказаць! — уздыхнуў наш сябра Гардоўскі і адышоў пад акно.

Шчыра вам скажу, калі ён павярнуўся да нас, мы ўбачылі на яго вачах слёзы — слёзы крыўды і адчаю, а можа, і злосці на сябе самога.

Я ВАРУ ЯЙКІ ЎСМЯТКУ

У мяне ёсць добрая старая цётка. Часам на гэтую асобу находзіць надзвычайная любасць да сваіх блізкіх. Пятнаццаць гадоў можа маўчаць, ніякай весткі ад яе, а пасля раптам паштальён прыносіць ад маёй цёткі пасылку, якую яна пасылае ў час чарговага такога прыпадку. Апошні раз пятнаццаць гадоў назад яна прыслала мне вялікі пірог, а цяпер, на шаснаццатым годзе пасля той урачыстасці, на пошце мне ўручылі вялікі кошык, у якім было шэсцьдзесят яек і такая пяшчотная запіска:

Любы пляменнік!

Вельмі рада, што магу паслаць табе капу яек ад маіх курэй. Я цябе, дарагі хлопчык, вельмі люблю і сама сабе думаю, што нядоўга засталося мне жыць на гэтым свеце і, магчыма, гэта апошні доказ маёй прыхільнасці да цябе. Звары іх сам усмятку і ўспамінай сваю старую добрую цётку Ганну. Няхай гэтыя шэсцьдзесят яек напомняць табе пра невялікі двор на поўначы, дзе весела кудахтаюць плімутрокі і ўспамінаюць цябе разам з тваёй цёткай Ганнай, якая горача любіць цябе.

З пашаны да цёткі я вырашыў адразу ж зварыць усе шэсцьдзесят яек усмятку.

Усю ноч не спаў. Ніколі я не думаў пра тое, як, уласна кажучы, вараць яйкі ўсмятку. Аднак, пасля доўгіх ваганняў, вырашыў, што іх трэба варыць так, каб яны зварыліся! Гэта адзіная пазіцыя і адзінае выйсце ў такой далікатнай сітуацыі, як гатаванне шасцідзесяці яек усмятку.

Я вельмі люблю яйкі ўсмятку. Але як з'есці зараз шэсцьдзесят яек усмятку? І прыйшла мне ў галаву думка іх закансерваваць.

Доўга думаў, як гэта зрабіць. Я апынуўся ў вельмі складанай сітуацыі. Ведаў, што часта ў газетах і некаторых часопісах даюцца парады маладым гаспадыням, якія не ўмеюць варыць яек усмятку, але як рабіць гэта старому халасцяку, пра гэта дасюль нідзе нічога не друкавалі, і таму я вырашыў выпісаць усе парады на гэты конт.

Перш за ўсё я купіў некалькі розных кніжак пра птушкагадоўлю, дзе меркаваў знайсці парады, як варыць яйкі.

На жаль, ні ў адным спецыяльным падручніку па птушкагадоўлі я не знайшоў адказу на гэтае пытанне. Пра яйкі было напісана шмат, напрыклад, што з яек вылупліваюцца кураняты і да таго падобнае глупства. Была там і такая парада, што яйкі трэба трымаць у сухім месцы. Далей ішло ўказанне, як выседжваць яйкі. Але ж цётка прыслала мне яйкі, каб я зварыў іх усмятку, а не сядзеў на іх. Са злосцю загарнуў кнігу.

Мне не хацелася дазнавацца ў знаёмых сем'ях, як яны вараць яйкі, і таму я надумаўся схадзіць у чытальню і праштудзіраваць «Навуковы слоўнік».

Знайшоў на літару «Я» і даведаўся, што яйкі — гэта прадукт жывёльнага паходжання і што ўсе віды птушак нясуць яйкі. Над гэтым пунктам я доўга думаў. Праўда, гэта не была мне навіна, але, тым не менш, калі я прачытаў, што было напісана чорным па белым, упэўніўся ў гэтым яшчэ больш. Гэта ўжо не народныя паданні, гэта навука пацвердзіла і прысвяціла пытанню вялікі артыкул.

Тады я пачаў шукаць, як жа варыць яйкі. Цяжка паверыць, што такое складанае пытанне навуковыя колы абышлі маўчаннем. Нават нічога прыблізнага я не знайшоў.

У «Навуковым слоўніку», аднак, адшукаў, што яйкі — гэта ежа, прыгатаваная рознымі спосабамі, але як менавіта гатуецца гэтая ежа, засталося для мяне

загадкай і пасля трохдзённага вывучэння гэтага слоўніка.

Знайшоў, аднак, нешта прыблізнае да гэтага пытання: «У Англіі яйкі ўжываюцца як сырыя, так і вараныя ўкрутую або ўсмятку. У кожнай прыстойнай англійскай сям'і гатуюць на снеданне яйкі ўсмятку. Падаюць іх у любым выпадку».

Але як гэта робіцца, каб яны ў такім стане з'явіліся на стале, я не даведаўся.

Не заставалася нічога іншага, як зрабіць спробу стварыць цэлую тэорыю гатавання яек і сваёй галавой дайсці да вываду, хоць і давядзецца дзеля эксперыменту страціць некалькі яек. Я купіў спіртоўку, пяць літраў спірту і Папінаў кацёл — як ім карыстацца, я ведаў з урокаў фізікі, яшчэ з маіх гімназічных гадоў. І ўзяўся за справу. Наліў у Папінаў кацёл вады, паклаў туды дзесяць яек і запаліў спіртоўку.

Праз чвэрць гадзіны дастаў яйкі з Папінавага катла. Аблупіў адно, яно было яшчэ цвёрдае, другое таксама. Усе былі цвёрдыя. Я іх аблупіў і зноў укінуў у Папінаў кацёл і варыў цэлую гадзіну. А яны ўсё былі цвёрдыя. Варыў усю ноч, аж да раніцы. Яны не памякчэлі.

Раніцай мяне знайшлі ў кошыку з яйкамі, куды я звалiўся ад хвалявання і сапсаванага настрою. Гэта ж трэба, за дзесяць гадзін мне не ўдалося зварыць ніводнага яйка ўсмятку.

Былі яны цвёрдыя і не памякчэлі.

ЯК Я ЎШЫВАЎ ГУЗІК У ШТАНЫ

Самай вялікай непрыемнасцю, якая можа здарыцца з чалавекам, можна лічыць тое, што ён заўважае відавочныя хібы ў сваім адзенні. У такім выпадку ён

не можа выйсці на людзі, бо яны ж не робяць розніцы паміж старым халасцяком і чалавекам жанатым і патрабуюць ад таго і другога быць заўсёды ахайнымі. Адсутнасць гузіка ў штанах выклікае ў многіх прыстойных людзей агіду. Грамадства ацэньвае гэтую справу як з псіхалагічнага, так і з практычнага боку. Яно забываецца на тое, што стары халасцяк можа быць вельмі прыстойным чалавекам, які не асмеліцца занесці штаны з адарваным гузікам жонцы свайго сябра з просьбай, каб яна зрабіла ласку давесці іх да ладу. А калі з такой просьбай звярнуцца да даслай дачкі сваёй хатняй гаспадыні, дык хто ведае, ці не абудзіцца ў пяшчотнай дзявочай душы пачуццё непрыязнасці да тваёй персоны.

Такім чынам, каб не страціць сваёй добрай рэпутацыі, старому халасцяку нічога не застаецца, як ушываць гузікі ў штаны самому.

Хто-небудзь, магчыма, скажа, што з гэтым халасцякоўскім пытаннем можна звярнуцца да краўца, які пашыў тыя штаны, але ж і гэты варыянт мае свае хібы. Ну, як тут прыйдзеш да краўца і скажаш яму: «Вось, бачыце, штаны, і тут і там не хапае гузікаў, ушыйце мне іх, калі ласка». Цябе ж адразу падымуць на смех. Ушыць гузік — справа нескладаная, як краўцу, так і астатнім людзям. Усе, хто пачуў бы, што гузік у штаны ўшываў мне кравец, напэўна, здзівіліся б. Гэта значыць, што стары халасцяк у вачах людзей выглядаў бы недарэкам, пустабрэхам, нікчэмнікам і да таго падобнае, адным словам, нічога не вартым.

З гэтых меркаванняў гузік у штаны я ўзяўся ўшываць сам.

Спачатку адарваны гузік я прышпіліў шпількай. Але аднойчы ў трамваі шпілька ўпілася мне ў цела. І тут я пераканаўся, што гузікі трэба толькі ўшываць і ніколі не прышпіляць шпількамі.

Шчыра прызнаюся, спачатку, калі я заўважыў, што гузіка няма, ніякага драматызму сітуацыі я не адчуў. Толькі ўначы, калі на ўспамін прыйшлі тыя дзіўныя позіркі, якія на мяне ўвесь вечар кідалі розныя наведвальнікі кафэ і ад якіх я не ўратаваўся і тады, калі зашпіліў пінжак, я вырашыў, што ўшыю другі гузік, які адарву ад камізэлькі. Калі камізэлька будзе і без аднаго гузіка, не так страшна. Куды горш, калі яго няма ў штанах. Камізэлька можа быць зашпілена не на ўсе гузікі, гэта часта здараецца ў старых халасцякоў, я добра ведаю з уласнага вопыту. І гэта не робіць ніякага ўражання на публіку. Зусім іншая справа з тым элементам адзення, які я маю на ўвазе.

Кіруючыся гэтымі меркаваннямі, я падрыхтаваўся ўшыць гузік у штаны. Памятаю, што ўвесь дзень я быў усхваляваны, і хваляванне ўсё расло па меры таго, як я абмазгоўваў тую справу. Спытацца, як ушываюць гузікі, я не пасмеў, бо не хацеў выглядаць дурнем, якім у гэтым выпадку, шчыра кажучы, быў.

Першае, што я палічыў неабходным зрабіць, было наведанне музейнай бібліятэкі. Там я ўзяў «Навуковы слоўнік» на літару «У» — ушыванне.

Я катэгарычна супраць думкі, што нашы навуковыя слоўнікі дакладныя і поўныя. На літару «У» не знайшоў зусім нічога, дзе было б пазначана «ўшыванне гузікаў». На літару «Г» знайшоў слова «гузік», але там было напісана вось што: «Гузік — частка адзення, ім злучаюцца два элементы. Мацуецца да адзення ўшываннем. Яшчэ старажытным егіпцянам было вядома пра гузікі, і, наадварот, грэкі і рымляне пра іх нічога не ведалі. У нас, у Чэхаславакіі, гузікі з'явіліся разам з хрысціянствам».

Пашукаў пад словам «хрысціянства» хоць якога-небудзь упамінку пра гузікі і нічога не знайшоў. Знайсці хоць бы, як старажытныя егіпцяне ўшывалі гузікі! Слова «Егіпет». «У Егіпце,— чытаю ў томе на

літару «Е»,— памерлым фараонам укладалі ў руку залаты гузік і так іх хавалі». Але як іх там ушывалі, пра гэта ні слова.

Тады я мусіў выкарыстаць свае камбінатарскія здольнасці. Трохі падумаўшы, вырашыў, што ўсё трэба рабіць паступова. Дзейнічаць па сістэме! Агледзеў гузік. Убачыў, што ён мае чатыры дзірачкі.

Спярша мне было загадкай, навошта яны, але пры далейшым даследаванні на тэму, якое значэнне маюць дзірачкі, я зразумеў, што, паводле ўсіх прыкмет, праз іх праходзіць нітка, якая працягваецца такой прыладай, як іголка.

Іголка, вычытаў я ў «Навуковым слоўніку», ёсць не што іншае, як разнавіднасць сталёвага прутка, і ў адрозненне ад парасяці ў яе толькі адно вушка. А ў мяне іх два. Такім чынам, высветліў, што трэба ўцягнуць у вушка іголкі нітку і рухам, быццам хочаш нешта ўзарваць, уздзець гузік на нітку і неяк павярнуць і пракалоць штаны.

Фантазія мая нястрымна працавала. Недзе я чуў, што сталь бывае крохкая, таму купіў два тузіны іголак. Акрамя таго, купіў тузін шпулек розных нітак, болей чорных. Белых нітак купіў на выпадак, калі не падыдуць чорныя. Былі ў мяне яшчэ і рудыя, іх я думаў ужыць, калі не падыдуць ні чорныя, ні белыя.

У краме, дзе я ўсё гэта купляў, у мяне спыталіся, ці не патрэбен яшчэ і напарстак.

Я падумаў, што гэта нешта важнае, і купіў іх цэлых дваццаць штук. Па аналогіі меркаваў, што напарстак і перст аднаго кораня, а значыць, ён мае адносіны да пальца.

Каб не памыліцца, купіў іх дваццаць, бо на нагах дзесяць пальцаў і на руках таксама дзесяць.

Калі з усім купленым я вяртаўся дадому, быў падобны да карабейніка. Дома загадаў прынесці тры бутэлькі добрага віна і, падсілкаваўшыся добрай вячэ-

рай, адшукаў няшчасныя штаны і з ахвотай узяўся за працу.

І сёння яшчэ ўспамінаю, якое гэта было жорсткае, упартае змаганне!

Раніцай мяне знайшлі на падлозе, толькі ў споднім, абкручанага чатырнаццаццю тысячамі метраў рознакаляровых нітак. Спаў я на двухстах іголках, а штаны былі прышыты да ложка; на пальцах ног і рук было дваццаць напарсткаў, а лытка мая была прышыта да дывана.

Што было рабіць? — Купіў сабе новыя штаны.

АНАНІМНАЕ ПІСЬМО

Князь Фрыдрых, уладар Вальдэцкага княства, ехаў у сваёй карэце, акружаны радасным натоўпам. Раптам яму на калені ўпала пісьмо, спрытна кінутае чыёйсьці рукой.

Князь Фрыдрых прыемна ўсміхнуўся і ўзяўся чытаць:

«Ваша высокасць! Вы найвялікшы дурань на зямлі!»

Князь Фрыдрых перастаў усміхацца.

Як пісалі на другі дзень газеты, яго высокасць адчуў недамаганне, і ўрачыстасць была адразу спынена; князь Фрыдрых накіраваўся ў свой палац. Ён прайшоў у кабінет і стаў уважліва вывучаць зняважлівае пасланне. Прачытаўшы сама меней пяцідзесяты раз: «Ваша высокасць! Вы найвялікшы дурань на зямлі!» — і запомніўшы гэта на памяць, ён здзіўлена ўсклікнуў: «Гэты нягоднік нават не падпісаўся!»

Ён хадзіў па кабінеце і паўтараў: «Ваша высокасць! Вы найвялікшы дурань на зямлі!»

Праз паўгадзіны князь загадаў склікаць дзяржаўную раду.

— Панове,— заявіў ён, расхваляваны, чатыром тайным саветнікам,— сёння, у дзень святкавання трыццацігоддзя майго княжання, невядомы зламыснік шпурнуў у маю каляску наступны ліст: «Ваша высокасць! Вы найвялікшы дурань на зямлі!»

Тайныя саветнікі спалатнелі, а барон Карла прамармытаў:

— Ваша высокасць, гэты ліст прызначаўся не вашай высокасці!

Князь Фрыдрых раззлаваўся.

— Дарагі барон,— усклікнуў ён,— я мяркую, вам вядома, што тытул «ваша высокасць» у цэлым княстве нашу толькі я адзін, і няма чалавека, які асмеліўся б гэты тытул прысвоіць! А раз у запісцы сказана: «Ваша высокасць! Вы найвялікшы дурань на зямлі!» — значыць пісьмо адрасавана мне! Я думаю, што ўсе мы сыдземся на гэтай думцы. Дзеля інтарэсаў дзяржавы неабходна адшукаць злачынца, які адважыўся зняважыць мяне, бо я лічу гэта дзяржаўнай здрадай. Я перадаю гэту справу ў вашы рукі і спадзяюся, што дзяржаўная рада таксама выкажа мне спачуванне і асудзіць на заўтрашняй сесіі ганебны ўчынак суб'екта, які не пасаромеўся парушыць спакой свайго манарха...

Да позняй ночы цягнулася пасяджэнне дзяржаўнай рады, на якое быў пакліканы і шэф паліцыі.

Назаўтра на сесіі парламента старшыня з дрыжаннем у голасе прачытаў уласнаручнае пасланне князя Фрыдрыха, які апеляваў да вернасці свайго народа. Парламент неадкладна выпрацаваў адрас з выказваннем адданасці князю, хоць ніхто не разумеў, што ж, уласна, адбываецца.

Няясная сумота вісела ў паветры. Шэф паліцыі тым часам не драмаў: ён запатрабаваў аудыенцыі і атрымаў з дзяржаўнага архіва гэта агіднае пісьмо.

— Што вы збіраецеся рабіць? — спытаўся ў яго канцлер.

Шэф паліцыі толькі паціраў рукі.

— Крыху цярпення, і вы здзівіцеся з маёй методы дазнання!

Ліст адправілі ў дзяржаўную друкарню, і ўжо апоўдні па ўсёй сталіцы былі расклеены плакаты, выпушчаныя паліцэйскай управай:

Узнагароду 1000 марак
атрымае той, хто навядзе на след злачынца,
які напісаў і кінуў у карэту найяснейшага князя
наступны ліст:

А пад гэтым паведамленнем была змешчана дакладная рэпрадукцыя пісьма:

Ваша высокасць!
Вы найвялікшы дурань на зямлі!

Да вечара кожны жыхар Вальдэцкага княства ведаў, што князь Фрыдрых — найвялікшы дурань на зямлі.

На другі дзень шэф паліцыі пайшоў у адстаўку.

ЯК ПРЫДУМАЦЬ НАЗВУ

Найцікавейшай, але і вельмі цяжкай з'яўляецца праблема назвы. Я не кажу пра назвы літаратурных і навуковых твораў. Тут усё проста. Вядома, калі не лічыць назвы зборнікаў вершаў, дзе трэба падражніць і падтрымаць у напружанні чытача, каб зборнік раскупілі. Усё залежыць ад таго, як зразумее чалавек тую ці іншую назву. Напрыклад, адно слова «Прастрэл» напэўна не будзе мець такога поспеху, як «Тут цвіце прастрэл».

Навука не ведае такіх жывых вобразаў і не імкнецца да таго, каб павысіць цікавасць да іх.

Калі нехта напіша падручнік фізікі, ён проста назаве яго «Уводзіны да фізікі», не прыдумляючы ніякіх такіх сенсацыйных назваў, як «Адкрыццё таямніц законаў прыроды». Географ напіша твор па геаграфіі і дасць яму кароткую і канкрэтную назву «Геаграфія». Не стане ён называць свой твор «Пра горы, рэкі, народы і гарады».

Толькі адну паэтычную назву ўбачыў я на кніжцы аднаго псіхіятара: «Пра ідыётаў і людзей без розуму».

Я ўжо казаў, што прыдумаць назву справа складаная, але не такая ўжо і цяжкая. Калі вы возьмеце каталог у кнігарні, дык упэўніцеся, што ў літаратурным рэчышчы адна і тая назва паўтараецца ў сотні аўтараў. Часцей за ўсё сустракаюцца «Родныя нівы», «Летнія навальніцы», «Новая песня», «Позняя кветка», «Прэлюдыі», «Паміж жыццём і смерцю», «Яе грэх» і іншыя прыгожыя словазлучэнні.

Аўтары не прыкладаюць ніякіх намаганняў, каб даць трапную назву свайму твору. Калі ўжо зусім нічога не могуць прыдумаць, тады пішуць «Жменя навел» або «Два тузіны апавяданняў», хоць у тыя «Два тузіны» ўвойдзе толькі пяць штук.

Са мной таксама аднойчы здарыўся такі прыкры выпадак. Апавяданне, у якім падзеі адбываліся на Кралаўскіх Вінаградах, я, калі ўжо зусім нічога не мог ні ўспомніць, ні прыдумаць, назваў «Жыццё ў Індыі».

Аднак у літаратуры такія рэчы дапушчальныя, бо і самая ідыёцкая назва можа каго-небудзь натхніць, таго, хто яшчэ не зусім з глузду з'ехаў. Назва дойдзе да яго душы і сагрэе яе сваёй незвычайнасцю.

Інакш кажучы, назвы кніг, апавяданняў звычайна з'яўляюцца не чым іншым, як канстатацыяй зместу. Англічанін Стэртан напісаў двухтомны раман і назваў яго «Глупства», і чытач не быў ашуканы. Француз Ла Брух выдаў раман «Нічога», і сапраўды там не было нічога.

Я вельмі люблю такія сціслыя і карысныя назвы. Вышэйпамянёныя аўтары велікадушна ставяцца да чытацкай аўдыторыі і папярэджваюць яе: «Не купляйце гэтага «Глупства».

Таксама цікавая і таксама цяжкая праблема даць назву часопісу. Маецца на ўвазе, што назва павінна адлюстроўваць змест і кірунак часопіса. І каб не існавала гэтага абавязковага правіла, часопісы раслі б, як грыбы пасля дажджу.

Я ведаў аднаго пана, які гаварыў:

— Я б з радасцю выдаваў мастацкі штомесячнік, але няма назвы.

Другі мне прызнаўся, што хацеў бы выдаваць палітычны штотыднёвік, але ж без назвы нічога не выйдзе.

Звычайна такі нешчаслівец бярэ назву, якая ўжо існуе.

Калі гэта палітычны часопіс, то павінен быць «Прагрэс», або «Варта», або «Незалежнасць».

Літаратурны альбо мастацкі часопіс назавуць «Вінаграднік», «Адраджэнне», «Сланечнік», «Баразна», «Ворыва», «Зямля», быццам іх выдаюць адны толькі земляробы.

Не лягчэйшая справа і назвы зборнікаў. Аднойчы папрасіў мяне адзін выдавец прыдумаць назву зборніка. Ён жадаў, каб у назве было «шмат жыццёвага і стыхійнага, прасякнутага духам жыцця». Нарэшце атрымалася так, як і са зборнікам Топіча. Перш-наперш напісаў прозвішча выдаўца, а пасля — «Зборнік».

Але ўсё гэта нішто ў параўнанні з тым, як прыдумаць назву новаму магазіну, прамысловаму прадпрыемству, назвы новым таварам, якія павінны з'явіцца на прылаўках і здзівіць людзей.

Тут у назву трэба ўкласці столькі свежых жывых малюнкаў, каб яны выклікалі незабыўнае ўражанне. Назва павінна быць сакавітай. Яна павінна здзівіць, загіпнатызаваць чалавека. Калі чытач прачытае рэк-

ламу «Мы пілі...», то тое, абазначанае шматкроп'ем, павінна быць такім дакладным і пераканаўчым, што чытач павінен напіцца да белай гарачкі і радня вымушана будзе адправіць яго ва ўстанову, дзе лечаць алкаголікаў.

Назва павінна быць люстэркам і жывым адбіткам прадмета, які рэкламуецца да продажу. Калі вы прачытаеце: «Кожная гаспадарка павінна мець паравы млын (назва)», дык назву трэба даць такую прывабную, каб той паравы млын абавязкова знайшлі, нават калі спатрэбіцца абрабаваць банк і прадзіравіць дом пры яго транспарціроўцы на трэці паверх.

* * *

У газеце я прачытаў такую рэкламу:

«Заплачу вялікі ганарар таму, хто прыдумае добрую назву рэчы, якая неабходная кожнай сям'і. Даведку можна атрымаць у атэлі Штэфан, пакой нумар 12 ад 10 да 11 гадзін».

Я пайшоў па ўказаным адрасе. Сустрэў мяне пан з інтэлігентным тварам і дабрадушны на выгляд.

— Мне вельмі прыемна,— сказаў ён,— што вы прыйшлі. Баяўся, што ніхто не адгукнецца на маю аб'яву. Сядайце, калі ласка, курыце. Якое віно любіце больш? Мускат або мозэльскае?

Я адказаў, што люблю і тое і другое і аддам перавагу таму, якім ён пачастуе. Ён з прыемнасцю прынёс сабе мускату, а мне мозэльскага. І калі мы пілі свае кубкі, ён паведаміў, што прыдумаў дзіцячую каляску, якую можна пераносіць з месца на месца, а калі яна часам уваліцца ў ваду, аўтаматычна ператвараецца ў човен. Каляска тая вельмі лёгкая, і калі націснуць на педалі, яна вокамгненна ператвараецца ў крэсла-качалку. Самай выдатнай якасцю яе з'яўляецца тое, што,

калі качалку перакуліць, яна можа служыць за пісьмовы стол. У сваёй майстэрні ён зрабіў ужо восемсот такіх дзіцячых калясак, і цяпер справа за тым, каб гэта вынаходніцтва было прынята ў серыйную вытворчасць. Ён сам прыдумаў назву «Дзецівоз», але яна не падабаецца яму.

У мяне мурашкі пабеглі па спіне, калі я зразумеў, з кім знаходжуся ў пакоі сам-насам.

А ён працягваў:

— Цэлы тыдзень я думаю пра назву, ночы навылёт не сплю, і нічога лепшага не прыходзіць у галаву. Ад гэтага клятага «Дзецівоза» я не магу адчапіцца ні днём, ні ноччу. З кожнага кутка чуваць толькі гэтае слова. І вы мне таксама гаворыце «Дзецівоз», «Дзецівоз». Чаму вы насміхаецеся з мяне, я ж вас бачу першы раз. Вы што, не верыце, што мая дзіцячая каляска можа ператварыцца ў човен? Вось чарцяжы.

Я стукнуў яго кулаком па скроні і паспешліва пакінуў пакой нумар 12. Нікому нічога не сказаў, няхай з ім што хочуць, тое і робяць у тым атэлі.

* * *

Не такі трагічны выпадак быў з панам Вацленам, які хадзіў у кафэ «Бярозка». Ён згуляў са мной партыю ў більярд, пасля павёў за свой столік і даверыўся мне. Яго зяць-абіўшчык вынайшаў трайны матрац, які раскладаецца, і тады ложак зусім не патрэбны. Яму трэба назваць матрац, каб можна было пусціць яго ў продаж. Каб і танна і добра. І зяць папрасіў яго знайсці каго-небудзь, хто прыдумаў бы добрую назву. І тут ён успомніў пра мяне, я ж пішу апавяданні. Калі ўжо магу пісаць апавяданні, дык што там мне прыдумаць адно слова. Зяць не хоча, каб задарма, ён урачыста прэзентуе мне свой матрац.

— Ну, і як, вы думаеце, ён павінен называцца?

Я адказаў, што мне вельмі прыемна мець такі гонар, але ж назвы не сыплюцца з рогу дастатку, тут трэба падумаць, бо кожная назва павінна быць люстэркам рэчы. Яна не мае быць простай і разам з тым занадта агульнай, на гэта мне патрэбен час.

— Тады заўтра? — сказаў ён.

— Добра.

— Ну, ёсць назва? — спытаўся ён назаўтра, падпільнаваўшы, калі я ішоў у кафэ.

— Учора вечарам прыехаў да мяне брат,— адказаў я,— і мне давялося весці яго ў тэатр на оперу, вечара як не было. Заўтра я вам абавязкова прынясу назву.

— Ну, дык як, ёсць назва? — мучыў ён мяне і на другі дзень.

— Не ведаю яшчэ, бо прыдумляць назву рэчы, якой і ў вочы не бачыў, мне здаецца справай несур'ёзнай.

— Добра,— сказаў ён,— заўтра матрац будзе ў вашым пакоі.

Прызнаюся, што мне зусім няблага спалася на матрацы, сапраўды, і танна і добра.

А пану Вацлену, які ад тае пары перастаў хадзіць у «Бярозку», я напісаў, што вырашыў, каб назва не была крыклівай, але поўнасцю адпавядала сутнасці прадмета, назваць яго «трохтомны матрац».

Пан Вацлен цяпер распускае пра мяне чуткі, што ніякі я не пісьменнік, а балбатун і ашуканец.

* * *

За год я атрымаў шмат прапаноў прыдумаць розныя назвы самым розным прадпрыемствам і рэчам, якія пазбавілі мяне спакою.

Адзін хацеў, каб я прыдумаў назву чэшскай мачанкі, якую ён пачаў гатаваць у вялікай колькасці.

Адзін фабрыкант, які вырабляў кандытарскія машыны, хацеў, каб я ахрысціў яго кішэнны агрэгат для прыгатавання марожанага.

Бандарня заказала мне назву для ляжачых кадушак за 100 гелераў.

Адзін гусіны пастух пажадаў мець назву пер'я для нявесцінага пасагу.

Кантора для абсталявання канцылярый хацела, каб у назве ўстановы пераважала думка, што рэгістратура з'яўляецца душой прадпрыемства.

Адзін пекар прасіў, каб я ахрысціў яго рагалікі з мармеладам.

Акцыянернае таварыства будаўніцтва кругавых цагельняў жадала мець такую папулярную назву, каб людзі толькі і гаварылі пра іх кругавыя цагельні.

Давялося пакруціць мазгамі над адпаведнай назвай і для эканомных пячных юшак.

З усіх прапанаваных мною назваў была ўхвалена толькі адна. І ўхваліў яе фабрыкант кандытарскіх машын. Перахрысціў-такі я кішэнны агрэгат для вырабу марожанага. Назваў яго Эмілем, уласным імем фабрыканта, ад чаго той быў вельмі ўзрадаваны. Усё здзіўляўся, як мне прыйшла ў галаву такая трапная назва.

Былі адхілены назвы: «Затаўка», «Бочкалеж», «Пасагпер», «Рэгістрадуш», «Мармелпек».

Пра кругавыя цагельні і эканомныя юшкі я нічога не прыдумаў.

Думка ўсіх фірмаў пра мяне, выключаючы толькі Эміля, была ідэнтычная меркаванню пана Вацлена. Ніякі я не пісьменнік, звычайны балбатун.

* * *

Аднак надарыўся выпадак, калі я мог і рэабілітавацца. Аднойчы прыбег па мяне ў кафэ мой сябар Апачынскі і сказаў:

— Сёння вечарам прыходзь у «Капманку», там будзе прадстаўнік адміністрацыі новай піваварні ў Пльзені. Ён шукае назву свайму піву. Хоча быць канкурэнтам пльзенскаму «Праздрою». Ён ужо ездзіў у Маю, але і там нічога людскага ніхто не прыдумаў. Расказваў пра свае прыгоды. Ва ўсім Пльзені не знайшлося ніводнага чалавека, каб што-небудзь прапанаваў яму. Цяпер апошняя надзея на Прагу, бо няўдача ў Маі яго зусім збіла з капытоў. Здаецца, што ён можа накласці на сябе рукі. І таму я запрасіў яго ў «Капманку».

Прадстаўнік адміністрацыі сапраўды быў падобны да самазабойцы. Ён расказаў і пра Пльзень, і пра Маю і дадаў, што ў Празе ён ужо другі дзень і з-за той назвы паспеў паканфліктаваць з паліцыяй. У адной піўнушцы пазнаёміўся з маладым чалавекам, даверыўся яму. Малады чалавек сказаў, што ў яго ёсць сякая-такая думка, але патрэбна яшчэ натхненне. Без натхнення ён як вол.

— Паіў я, паіў яго,— уздыхнуў прадстаўнік адміністрацыі,— а ён як выпіў дзесяць бутэлек віна, закрычаў: «Ёсць! Ваша піваварня размяшчаецца ў Пльзенцы. Калі ў Пльзені піва «Пльзенскае», дык свайму піву дайце назву «Пльзенецкае».

І тут я, пане, не стрымаўся. Скруціў яго ў бараноў рог. Паклікалі паліцэйскага, і канфлікт гатоў.

Прасядзелі мы да ночы. Усе думалі, але, нічога не прыдумаўшы, адзін за адным пакідалі тую піўнушку. Нарэшце засталіся мы ўдвух, я і прадстаўнік адміністрацыі.

І, паверыце, бываюць жа ў жыцці такія моманты, калі на цябе находзіць праясненне. Усё жыццё будзеш думаць, шукаць, а тут раптам такое азарэнне.

Назва прыйшла сама сабой. Мой суразмоўнік ужо задрамаў, і мне давялося будзіць яго.

— Ёсць назва вашаму піву,— сказаў я,— даклад-

ная і гатовая зламаць карак пльзенскаму «Праздрою» і зрабіць піва новага піваварa вядомым на ўсім свеце.

Твар дэлегата прасвятлеў.

— Гэта ідэя,— ускочыў ён з крэсла,— гэта як гром з яснага неба. Разаб'ём іх піва ўшчэнт, а наша лавінай абрынецца на свет.

Ён яшчэ доўга гаварыў, ужываючы ўсё новыя і новыя вобразы, але вянцом яго сентэнцый быў зварот да няшчаснага Сахаркі.

— Пане рэстаратар, ці няма ў вас часам раскладу цягнікоў?

— Мы паедзем экспрэсам у Пльзень у 6 гадзін 20 мінут,— звярнуўся ён да мяне, гартаючы старонкі чыгуначнага даведніка,— вы — геній. У Пльзені не маглі нічога прыдумаць, у Маі таксама, Прага атупела, і, нарэшце, у дзве гадзіны ночы вы робіце вынаходніцтва. Едзем у Пльзень.

Да таго ж ён некалі ўдзельнічаў у гуртку самадзейнасці і таму, плацячы па рахунку, з пафасам усклікнуў:

— Падарожжа скончана, з гонарам еду дадому.

— Са шчытом, любы мой, са шчытом,— гаварыў ён, дапамагаючы мне злезці з высокага крэсла,— верыце, я ўжо страціў быў усялякую надзею. Вы ж не ведаеце таго, што мы ўжо квартал назад абвясцілі конкурс на лепшую назву, і за ўвесь час атрымалі толькі адну прапанову ад нейкага настаўніка-пенсіянера. Ён нам напісаў, што найлепшым адказам на пльзенскі «Праздрой» будзе пльзенскае «Прапіва».

Той настаўнік закончыў свой ліст тым, што прэмію за назву мы павінны выслаць яму адразу, як толькі атрымаем яго ліст, інакш ён вымушаны будзе звярнуцца да адваката.

Мы нанялі рамізніка і да шасці гадзін ездзілі па розных начных рэстаранах. Праз усю дарогу мой субя-

седнік нічога больш не рабіў, як толькі натхнёна гаварыў пра назву. Захапленнем іскрылася кожная яго фраза, а як мы ўжо сядзелі ў экспрэсе, ён адрэкамендаваў мяне нейкаму незнаёмаму пану, якога і сам не ведаў:

— Вось з гэтым панам я не пабаяўся б і вавілонскую вежу будаваць.

Каб пацвердзіць яго думку, ужо пад'язджаючы да Пльзеня, я сказаў, што «Градчаны» і «Петршын» — вось тыя дзве назвы, якія я прыдумаў. Ён ужо драмаў і толькі прабурчаў:

— Я ведаю, чуў ужо пра гэта.

У Пльзені мы перакусілі ў рэстаране на вакзале і паехалі фіякрам адразу да канцылярыі новай піваварні, там умомант паслалі па старшыню таварыства.

Калі той з'явіўся, мой хаўруснік пераможна сказаў:

— Ёсць назва, незвычайная, такая, якой яшчэ не было. Назва, якая заткне за пояс пльзенскі «Праздрой», назва, якая зверне на сябе ўвагу.

Мой хаўруснік рассыпаўся дробным макам:

— Гэты пан пісьменнік, вядомы пісьменнік пан... пан... пардон, я забыўся, як ваша прозвішча?.. Ну, бачыце, такое лёгкае імя, але калі не спаць ноч, а раніцай прыехаць цягніком... Пан старшыня, назву прыдумаў пан пісьменнік. У Маі нічога не маглі прыдумаць, Прага або маўчала, або прыдумвала розныя глупствы, аж пакуль не дайшло да гэтага пана. Назва казачная.

— Ну, дык скажыце мне яе,— перапыніў старшыня майго хаўрусніка.

Замест адказу член адміністрацыйнай рады разгублена закруціўся на месцы і звярнуўся да мяне:

— Дык якая назва? Я... я забыўся.

Я аслупянеў. Як я ні намагаўся, а ўспомніць не мог. Я нагадваў чалавека ў той сітуацыі, калі ён забыўся, як яго завуць, дзе нарадзіўся, дзе жыве. Як і той, стаяў я перад старшынём з разяўленым ротам...

— Вы ўспомніце,— сказаў пан старшыня,— прыходзьце пасля абеду.

Адміністратар, які прывёз мяне з Прагі, сардэчна запрасіў мяне да сябе ў кватэру, паклаў на ложак, каб я выспаўся.

Перад абедам мяне разбудзілі. Сітуацыя не змянілася. Ні да вечара, ні да раніцы я нічога не мог успомніць. Думалі, што гэта дзеянне алкаголю, і давалі мне піць падэбрадскую мінеральную ваду.

Я быў там цэлы тыдзень і нічога не ўспомніў. Раніцай сёмага дня я ўцёк праз акно і пешкі пайшоў у Прагу, бо мой партфель адміністратар здаў у камеру хавання, каб адрэзаць мне шляхі адступлення ў Прагу, спадзеючыся, што я ўсё ж такі ўспомню сваю фенаменальную назву. Прыдумаць назву — праблема найцікавейшая і найцяжэйшая...

ГІД ДЛЯ ЧУЖАЗЕМЦАЎ

Не ведаю нічога больш няўдзячнага, чым каментарыі гіда да грудаў старой вапны, цэглы і друзу, якія называюцца зруйнаванымі замкамі.

Няшчасны гід намагаецца пачціва расказаць вам пра ўсё, што некалі вычытаў у кнігах. І таму хутка і рашуча тлумачыць:

а) якая раней тут была прыгажосць;

б) як гэта сталася, што цяпер так мала засталося ад былой красы;

в) каму гэта замінала;

г) як адбылося зруйнаванне;

д) і падобнае.

Не кожны чалавек можа вытрываць, калі гід з натхненнем завучана гаворыць: «Мы з вамі знаходзімся на невялікім узгорку ў дварэ замка, зарослым хмызняком і ельнікам».

— Глядзіце, чалавеча,— сказаў я аднаму гіду, выкарыстаўшы зручны выпадак і паказаўшы яму кулак,— каб я не паведаміў пра гэта ў лясную ўправу. Ці ж гэта парадак, каб елка расла не ў лесе, а на нейкім двары? Лес ахоўваецца законам. А тут елкі ў двары. Няўжо двор існуе на тое, каб на ім елкі раслі? І, нарэшце, пытаюся ў вас, што вы зрабілі для таго, каб ачысціць двор ад хмызняку і ельніку? У Празе нельга нават курыцы трымаць, а вы тут цэлы лес развялі.

Ён крытычна агледзеў мяне і, нібы ў сне, працягваў: — На другім баку двара мы бачым цёмныя сцены з байніцамі і ў думках вяртаемся да тых часоў, калі тут жылі высакародныя, мужныя рыцары і лес быў весялейшы, бо гукі фанфараў склікалі паляўнічых на здрадлівых мядзведзяў, незлічоных ваўкоў і дзікоў...

— Пан,— сказаў я строга,— вы страшэнна памыляецеся, што лес бывае весялейшы ад таго, што замест вавёрак і зайцоў там будуць лазіць мядзведзі, ваўкі і дзікі. Акрамя таго, вы павінны ведаць, што мядзведзь зусім не здрадлівы звер, як вы сцвярджаеце; мядзведзь — звер добры, прыемны і ласкавы. Вы бачылі мядзведзя?

— Бачыў.

— Дзе?

— У Хрудзіме з ім хадзіў адзін чалавек.

— Калі?

— Пятнаццаць гадоў назад.

— А што вы рабілі пятнаццаць гадоў назад у Хрудзіме?

— Быў там на кірмашы.

— Так, а чаго вы, уласна кажучы, пятнаццаць гадоў назад хадзілі на той кірмаш? Што вам там трэба было? Якой дарогай хадзілі?

Я выцягнуў з кішэні блакнот і самапіску.

Гід паглядзеў на мяне і імгненна, скачучы па ка-

мянях над глыбокай прорвай, апынуўся на тым баку зруйнаванай вежы.

Ён скакаў, як сарна, і далёка ў прылеску была відаць яго кепачка. Нарэшце ён знік. А я ўвесь час, пакуль ён уцякаў, крычаў яму наўздагон: «Бачу руіны аднапавярховага замка, спераду нізкая крапасная сцяна, за ёй магутныя сцены замка, злева круглая вежа з байніцамі. Так ці не?»

Ён нічога не адказаў, а я разлёгся на двары і падумаў, што можна добра абысціся сярод гэтых руін і без гіда, хоць паўгадзіны назад адміністратар мяне папярэджваў, што руіны можна аглядаць толькі з гідам.

Я ўспомніў, як гід праз усю дарогу даймаў мяне пытаннямі: «Жадаеце ўбачыць найпрыгажэйшы куток свету? Хочаце паглядзець на веліч прыроды?»

— Хацеў бы,— адказаў я, і ён змоўк, аж пакуль тут наверсе не выдаў завучанага: «Увайшоўшы ў замак, мы бачым...»

Звалі яго Марак. І тую скалу над прылескам, дзе знікла яго кепачка, мясцовыя жыхары называюць цяпер Маракавай скалой. Яшчэ не так даўно на адным з уцёсаў скалы матляўся на ветры кавалак яго порткаў...

Згадзіцеся цяпер, што сапраўды няма нічога больш няўдзячнага, як быць гідам.

* * *

Аднак гэтая справа мае і адваротны бок, трапляюцца і такія актыўныя і цікаўныя наведвальнікі руінаў, якім хочацца даведацца больш пра тое, хто ж усё-такі зруйнаваў замак, і пра іншыя акалічнасці.

Я адчуў гэта на сваёй скуры, і дасталося мне, пакуль я пазбавіўся ад іх.

Было іх чацвёра. Два паны і дзве пані. Было гэта ў замку Ліпніцы ля Нямецкага Броду. Здалёк тыя руі-

ны падобныя да пачварнага лакаматыва, бо ад замка засталася частка адной вежы, якая імкнулася да неба з просьбай, каб які гром або ўраган разбілі яе ўшчэнт, бо не можа яна больш чуць таго, што яе трэба рэстаўраваць. Яна ўжо чуе гэта пятнаццаць гадоў і са злосці сама скідае камяні ўніз на школу, на якую вось-вось абрынецца.

Я цяпер жыву якраз пад самым замкам у добраахвотным выгнанні, вывучаю мясцовыя норавы і чакаю, «калі што мяне тут схопіць».

Тут гарэлкай паліты край. Усюды ў палях стаяць самотныя крыжы як памяць аб тым, каго некалі на гэтым месцы прыхапіла.

У далёкай ацалелай частцы замка, дзе яшчэ стаяць сцены і дагэтуль захавалася на першым паверсе скляпенне, цяпер музей. Шмат стагоддзяў назад тут жыла абслуга замка. Былы ўладар усё рэстаўраваў. Два дубовыя сталы, лаўка і печ. Тут у цішыні добра пішацца. Мясцовы ляснічы даў мне ключы ад замка. Восеньскія вятры гатовы аднесці мяне разам з замкам аж да Нямецкага Броду. Зрэдку падаюць са сцен замка камяні, аж сцены дрыжаць. У даліне пасвяцца козы. І чатыры цікаўныя чалавекі падняліся на гару якраз у той час, калі я пачаў пісаць раздзел пра трапезную.

— Мы былі ўнізе ў замку,— сказаў старэйшы пан у пенснэ,— і там нам сказалі, што крэпасць адчынена, бо ў вас ёсць ключы. Мы прасілі б вас, каб вы паказалі нам крэпасць.

Астатнія тры наведвальнікі, пан і дзве пані, не толькі разглядалі скляпенне, а проста елі яго вачамі.

— Як жадаеце,— сказаў я,— але перш за ўсё, калі ласка, адрэкамендуйцеся.

Яны здзіўлена пераглянуліся.

— Калі ў вас няма дакументаў,— працягваў я,— дык нічога не атрымаецца з аглядам замка.

Я пачуў, як адна дама вельмі выразна сказала:

— Дзіўныя паводзіны.

— Вы памыляецеся,— сказаў я падкрэслена,— мае паводзіны нармальныя. Я ж не ведаю, хто вы такія, чаму вам хочацца бачыць замак, якое дачыненне вы маеце да руінаў замка Ліпніцы.

Я сядзеў і не думаў уставаць, тады пан у пенснэ, які ў час усёй размовы трымаў капялюш у руках, сказаў, што яны з ахвотай адрэкамендуюцца мне. Ён — настаўнік такі-та, другі пан — архітэктар са Славакіі, а пані — выкладчыцы такога і такога ліцэя. Яны разам падарожнічаюць па Чэхаславакіі і хочуць напісаць новую манаграфію пра гэты і іншыя чэшскія замкі. У Седлачака [1] шмат заган, а яны ж гісторыкі...

— Добра,— сказаў я,— вы гісторыкі з прызвання ці як? Ці сапраўдныя вы гісторыкі, ці толькі дзеля спартыўнага інтарэсу, як гэта называецца, дылетанты?

Я заўважыў, як той другі пан сумна паглядзеў на мяне, і я нібы прачытаў яго думку: «Ты вол». Усе маўчалі, тады я ўстаў і прапанаваў ім ісці за мной.

Мы выйшлі на падворак замка.

— Паны і дамы,— сказаў я пераможна.— Усё, што вы тут бачыце, і ёсць руіны. Ёсць усе падставы меркаваць, што на гэтым месцы быў замак. Пра гэта сведчыць ужо тая акалічнасць, што месца гэта называецца руінамі замка Ліпніцы. Вядома, некалі гэтыя руіны былі заселеныя. Тут была зімовая рэзідэнцыя караля Фрыдрыха Пфальцкі. Ён жыў тут зімой і таму называўся Зімовы кароль. Калі б ён жыў тут летам, мы б называлі яго...

— Прабачце,— сказаў пан у пенснэ,— вы памыляецеся, гэта рэзідэнцыя Трчкаў.

— Я ведаю, выбачайце, усё наваколле,— завёўся я.— Трчкі жылі пад Мелехавам у леснічоўцы. Праўда,

---

[1] Седлачак Аўгуст (1843—1926) — чэшскі гісторык.

ёсць і яшчэ адзін Трчка, але той цяпер у Чаславе ў кулямётным цэху.

— Ліпніцы належалі старым Трчкам,— сказала адна пані.

— Старым Трчкам не належала нічога, шаноўная,— адказаў я,— была ў іх халупа ў Кейжліцах, і тую стары Трчка падпаліў, за што і трапіў у турму.

— Пане,— сказаў настаўнік у пенснэ, хапаючы мяне за гузік на камізэльцы,— памятаеце вы, што адзін з тых Трчкаў быў забіты разам з Вальдштэйнам? [1]

— Гэтага не памятаю,— адказаў я,— сёння ж спытаюся ў мясцовага старога жандара, дайце мне ваш адрас, і я напішу вам, калі, зразумела, ён што ведае. Пакуль што ён ніколі пра гэта не гаварыў.

Кампанія здзіўлена пераглянулася, але той старэйшы пан зрабіў спробу даведацца яшчэ што-небудзь.

— Ці няма тут дзе-небудзь старых фрэсак на сценах?

— Былі,— сказаў я,— але я загадаў саскрэбці іх, бо былі яны там на першым паверсе, а мы вырашылі іх зафарбаваць, каб турыстам было дзе ставіць свае подпісы.

Нехта ўздыхнуў. Гэта быў архітэктар са Славакіі.

— А старая студня ёсць? — спыталася ў мяне адна жанчына.

— Мы яе засыпалі,— сказаў я,— каб хто часам не ўваліўся туды. Летам тут бывае шмат турыстаў, і кожны нагінаецца праз край, тут і да бяды недалёка.

— Тут недзе павінна быць катавальня,— не здаваўся пан у пенснэ.

— Была тут,— адказаў я,— але ж цяпер ужо нікога не катуюць, мы павыкідвалі адтуль усе прылады, а цяпер там бульбу трымаем.

---

[1] Вядомы нямецкі палкаводзец часоў Трыццацігадовай вайны. Па нацыянальнасці чэх.

— А рыцарская зала? — пачулася ціхае пытанне пана архітэктара.

— Нам трэба было выбрукаваць тратуар у горадзе,— адказаў я,— вось і прыдалася рыцарская зала. Але матэрыялу не хапіла, давялося разабраць і апошнюю вартаўнічую вежу.

— Дык што, тут не засталося ніякіх помнікаў?

— Ёсць,— адказаў я з гонарам.— Калі ласка, ідзіце за мной.

Я павёў іх да старога скляпення ля засыпанага люка.

— Калі ласка, здыміце капелюшы.

Абодва паны знялі капелюшы.

— Панове,— сказаў я ўрачыста,— тут перад самай вайной замуравалі двух цікаўных настаўнікаў. Маё шанаванне, панове!

І, насвістваючы, я памалу падаўся да свайго музея, каб зноў узяцца за працу, ад якой яны мяне адарвалі.

Я бачыў, як паны, моўчкі нацягнуўшы капелюшы на галовы, накіраваліся з дамамі да брамы.

Пад імі зарыпеў драўляны масток праз замкавы роў, а я зноў быў адзін у замку. Партрэт старога Трчкі, які вісеў на сцяне ў трапезнай, здзіўлена пазіраў на мяне.

СІРОТКА І ЯЕ ТАЕМНАЯ МАЦІ

Кранальная гісторыя мяшчанскай прэсы

Раздзел І
СІРОТКА З БЛАКІТНЫМІ ВАЧЫМА

Яе звалі Тонічка, і аднойчы яна страціла цяпло матчынай ласкі і бацькавай любові. Потым яна трапіла да аднаго гандляра. Туды хадзіла па пакупкі служанка рэдактара адной мяшчанскай газеты.

Потым настаў мёртвы сезон. Не было пра што пісаць.

У той Тонічкі былі блакітныя вочы...

Ад слёз у мяне выпала з рукі ручка...

Раздзел II
ПАШТАЛЬЁН З ГРАШЫМА

Лёгкай паходкай увайшоў паштальён з грашыма Ян Громада (45 гадоў, маральна ўстойлівы, католік, жанаты, прыпісаны да Лібіц, павет Колін пад Лабай. Асаблівая прыкмета: радзімы знак пад пупочнай ямкай) у краму, дзе служыла сіротка.

— Ці Тонічка ёсць? — спытаўся ён дрыжачым голасам, бо прачытаў тое, што было напісана на бланку пераводу.

— Ёсць,— адказаў дрыжачым голасам гандляр, калі паштальён голасам, які ажно тросся, дадаў: «Нясу ёй сто крон».

На пераводзе было напісана: «Мілае дзіця! Даруй, нічога не магу зрабіць, больш ужо не магу хаваць гэтага. Я твая маці і ўжо з табою гаварыла. Сэрца ў мяне разрываецца. Будзь руплівая і спадзявайся на бога. Бог цябе не пакіне. Пакуль што вось табе сто крон. Твая маці».

Калі гэта чыталі Тонічцы, яна выпусціла з рук трохлітровую пасудзіну са спіртам, які разліўся па падлозе. Яна магла гэта зрабіць, у яе было сто крон.

Раздзел III
МУЖНЫ ЎЧЫНАК ПЕНСІЯНЕРА ПАЎЛІКА

У наступны момант у краму зайшоў шасцідзесяцігадовы пенсіянер Ёзаф Тэадор Паўлік. У руцэ ён трымаў з а п а л е н у ю ц ы г а р у. Убачыўшы, што ў кра-

ме разліты дэнатураваны спірт, ён мужна выкінуў запаленую цыгару праз адчыненае акно — на галаву нейкаму чалавеку, які якраз там ішоў. Учынак гэты варты вялікага захаплення як сведчанне незвычайнага валодання сабой і адвагі. Інакш спірт, магчыма, загарэўся б, а таму, што ў краме быў яшчэ вялікі балон з бензінам, нельга было б працягваць гэтую кранальную гісторыю. Яна скончылася б абвугленымі трупамі ў згарэлай краме. Акрамя таго, учынак пенсіянера тым больш разумны, што дзякуючы гэтаму дзяржаве быў захаваны паштальён з грашыма.

Міністэрства гандлю гаворыць гэтаму мужнаму чалавеку: «Няхай вам бог дасць здароўя!»

Калі пенсіянер Паўлік выйшаў з крамы, то не знайшоў сваёй выкінутай цыгары. Яе выкурыў той чалавек, якому яна ўпала на галаву.

Раздзел IV
КАМЕРЦЫЙНЫ ЎЧЫНАК ГАНДЛЯРА

Праз чвэрць гадзіны пасля таго, як Тонічка атрымала сто крон, гандляр выйшоў з крамы. Ён купіў білет на трамвай і паехаў у рэдакцыю газеты, рэдактарам якой быў пан, служанка якога хадзіла купляць у краму гандляра, што якраз ішоў з візітам да таго рэдактара. Як бачыце, добра ўсё гэта разгортваецца.

Ён гаварыў больш за гадзіну з панам рэдактарам. Рэдактар ажно зіхацеў. Такая кранальная гісторыя якраз цяпер, калі мёртвы сезон у самым разгары.

— Заўтра гэта будзе ў газеце,— сказаў на развітанне рэдактар гандляру,— дамо там, вядома, ваша поўнае імя.

Потым гандляр пайшоў у рэкламны аддзел, дзе заказаў на заўтрашні дзень аб'яву на добрым месцы.

У той дзень ён гандляваў як звычайна.

Раздзел V
ВЫНІКІ АРТЫКУЛА «ТАЕМНАЯ МАЦІ»

Рэдактар стрымаў слова. На другі дзень у газеце з'явіўся артыкул «Таемная маці». Ён займаў больш як тры калонкі. Жаллівы ўступ быў скляпаны з Марлітавай, Карленавай, Шварцавай і з іншых слязлівых айчынных пісьменніц. Потым ішло прозвішча цяперашняга апекуна Тоніч кі: гандляр Вацлаў Зэман, вуліца Камінскага, дом 18.

Унізе ж у рэкламнай частцы была аб'ява: «Вацлаў Зэман, гандляр бакалеяй, вуліца Камінскага, дом 18, прапануе шаноўным чытачам сваю краму з багатым асартыментам тавараў. Сыры, кілбасы, мясныя і рыбныя кансервы. Цудоўнае віно, чырвонае і белае, літр 1 крона. Выдатная кававая сумесь за 2 кроны 20 гелераў, цукар недарагі. Літр рому ад 80 гелераў і вышэй. Заўсёды свежае масла вышэйшага гатунку».

У той дзень вінаградскія [1] кабеты і дзяўчаты хацелі ўбачыць Тонічку і паплакаць з ёю ў краме.

Плакалася там ад рання да вечара. Тонічка ўжо не магла плакаць, дык мусіла ў пакоі нюхаць цыбулю, каб вочы слязіліся.

І яшчэ — некалькі старых мужчын шчыпалі яе за шчаку. Тут няма нічога кепскага, бо ёй было толькі пятнаццаць гадоў. З усеагульнага плачу чуліся выкрыкі: «Мне дайце кілаграм кавы!», «Мне пяць кілаграмаў цукру!», «Літр рому!», «Пляшку віна!»

Вацлаў Зэман не спраўляўся абслугоўваць пакупнікоў. Ён быў вымушаны наняць памочніка. Яго жонка таксама аблівалася потам. Вінаградскія кабеты і дзяўчаты накуплівалі прадуктаў на цэлы тыдзень.

---

[1] Вінаграды — раён Прагі.

Увечары, каля дзесяці гадзін, калі зачынялі краму, прыйшла яшчэ адна заплаканая кабета. Аж аднекуль з Моджан. Ужо не было чаго ёй прапанаваць, дык прадалі старую масянжовую гіру.

Нумара газеты з артыкулам «Таемная маці» было прададзена на дзесяць тысяч экземпляраў болей.

Раздзел VI
ГЛУХАНЯМАЯ СЛУЖАНКА

Гэтая гісторыя стала яшчэ цікавейшая, калі было выяўлена, што жанчына, якая нарадзіла Тоніčку ў радзільным доме, запісала яе на дакумент адной глуханямой служанкі, якая жэстамі клялася, што яна не Тоніччына маці. Тое, што яна глуханямая, моцна засмуціла таго рэдактара, бо ён, натуральна, не мог з ёю ніяк паразумецца. Справа ў тым, што ён рыхтаваў для пастаяннай газетнай рубрыкі «Сіротка і яе таемная маці» калонку пад назвай «Размова з непраўдзівай, несапраўднай маці».

Некалькі вінаградскіх кабет і дзяўчат даслалі глуханямой служанцы паштоўкі.

Пракуратура абвінаваціла глуханямую служанку ў падмане ўлад, бо яна не нарадзіла, хоць нарадзіць павінна была, на сваё прозвішча ў радзільным доме.

Замест таго каб узяць абаронцу, глуханямая служанка выправілася на Святую Гару, пакінуўшы дома лісток, які ўсіх моцна здзівіў і быў адразу прынесены ў рэдакцыю.

На лістку было напісана: «Еду спавядацца!» На падставе гэтага паліцэйскае ўпраўленне паслала да глуханямой служанкі двух дэтэктываў, пераапранутых ксяндзамі.

Раздзел VII

НОВЫЯ ЛІСТЫ, НОВЫЯ АДКРЫЦЦІ І НОВЫ ГАНДАЛЬ

Тонічка штодзень атрымлівала новыя лісты ад «таемнай маці». Пан Вацлаў Зэман добрасумленна заносіў лісты ў рэдакцыю, якая іх друкавала з адпаведнымі ўздыхамі. Пяць выдаўцоў паштовак палявалі з фотаапаратамі на яе.

Жанатыя мужчыны глядзелі з падазрэннем на сваіх жонак і выпытвалі ў іх, патрабавалі паклясціся, што да іх тыя не мелі ніводнага кахання.

Адзін муж недалічыўся ў касе ста крон і, падазраючы сваю жонку ў тым, што яна паслала іх Тонічцы, узяў брытву, пагаліўся і пайшоў дамагацца разводу.

Тым часам на імя Тонічкі прыйшло ўжо агулам чатырыста крон, і дворнічыха пачала гаварыць Тонічцы: «Цалую ручку, паненачка!»

Тонічцы захацелася насіць доўгую сукенку, і яна плакала, калі не ўдалося набыць яе.

Адразу пасля таго яна атрымала новы ліст ад сваёй таемнай маці: «Любая Тонічка, ведаю, што ты плачаш, і не магу даць рады. Спадзявайся на пана бога і будзь паслухмяная, пасылаю табе 30 крон. Твая нешчаслівая маці».

Ліст гэты таксама быў надрукаваны. Зайздросныя людзі казалі: «За чатырыста крон і я прыкідваўся б сіратою».

Адзін былы ляснік аб'явіў сябе даверанай асобай Тонічкі і даў у газеце аб'яву: «Алень не хварэе на сухоты, бо знаходзіць у лесе траву, якая з'яўляецца галоўнай часткай ляснога чаю і лекавых зёлак, што выраблюе былы ляснік Шумінскі, які жыве па вуліцы Камінскага, дом 26. Шмат падзяк з Амерыкі, Аўстрыі, Новай Зеландыі, з востраваў Корсіка, з Міхляў, Лондана, Парыжа і Падзебрад».

Раздзел VIII
ПАРАДЫ І МЕРКАВАННІ

У рэдакцыю газеты з пастаяннай рубрыкай «Сіротка і яе таемная маці» прыходзіла мноства лістоў. За чатырнаццаць дзён іх прыйшло 1256. У пісьмах былі часткова парады, часткова меркаванні, папярэджанні, напаміны, засцярогі. Раілі Тонічцы быць пільнай, каб яе не выкралі. Адзін пісаў, што ён перакананы: Тоніч-ку хочуць давесці да вар'яцтва. Якую мэту гэта мела б — не паведаміў.

Урэшце газета надрукавала важны заклік. Просьбу да таемнай маці, каб яна адкрылася. Просьба гэтая была прачулая. Яна была складзена пры дапамозе журботных раманаў і слязлівых гісторый. Паспісвалі цэлыя сказы.

На вуліцах з'явіліся натоўпы заплаканых людзей. Шэсць чалавек звар'яцелі ад шкадавання і плачу.

Трыццаць вінаградскіх дзяўчат і кабет аслепла. Па ўсёй Чэхіі плакалі жанчыны. Маткі тулілі сваіх сынкоў, сваіх дачушак да сэрца. Было задушана ў мацярынскіх абдымках пяць хлопчыкаў і шэсць дзяўчынак.

Адзін здольны аўтар прымітыўных песенек стварыў новы бязглузды духоўны прадукт. Песеньку пра сіротку. Спявалася на матыў «Сініх вачэй».

Вінаградскія кабеты і дзяўчаты хацелі, каб тую песеньку іграў аркестр у Вінаградскім тэатры. Пра таемную маці спявалася цэлымі днямі. Жанчыны, што спявалі, да паўсмерці збілі нейкага чалавека, які, чуючы гэта, не плакаў.

Нарэшце ў рэдакцыю прыйшла давераная асоба Тонічкі, той, хто знайшоў лясныя зёлкі для аленяў і людзей.

Газета ж звярнулася з заклікам да таемнай маці: «Няхай яна прыйдзе на кватэру да вынаходніка лясно-

га чаю. Поўная таямніца забяспечана. Былы ляснік дае слова гонару маўчаць. Таемную маці не прымушаюць купляць яго лясныя зёлкі».

А праз пару дзён выйшаў спецыяльны выпуск іншай газеты, якая таксама публікавала розныя сенсацыйныя паведамленні.

Раздзел IX
ТАЕМНАЯ МАЦІ ВЫЯЎЛЕНА І ТАЯМНІЦА ЗАХАВАНА

Спецыяльны выпуск вячэрняй газеты. Таемная маці прыйшла, адгукнуўшыся на зварот вынаходніка лясного чаю, да яго на кватэру. Поўная таямніца захавана. У газеце было: «Нас абавязвае слова гонару, і таму мы захоўваем таямніцу. Толькі тое можам сказаць, што гэтая дама, якая з'яўляецца маткай Тоніч кі, удава і ў яе некалькі дзяцей. Мы не называем тут яе імя, бо абяцалі гэта. Можам дадаць яшчэ толькі тое, што выяўленая маці — уладальніца дома, які знаходзіцца зусім блізка ад Тоніч кі. Нас абавязвае дадзенае слова, што мы захаваем пра яе поўную таямніцу, таму мы не можам сказаць нічога, акрамя таго, што ёй 35 гадоў і што яна хоча зноў выйсці замуж. Як яна паведаміла нам, Тоніччын бацька жывы, ён чыноўнік, жанаты і ў яго таксама некалькі дзяцей. Сказаць болей нам не дазваляе наша абяцанне захаваць у гэтай справе поўнае маўчанне. Можам сказаць толькі, што гэты мужчына — рыхтык Тонічка, і мы надрукуем заўтра яе здымак у нашай ілюстраванай газеце поруч з малюнкам шчаслівага спаткання маці з дачкою».

Таямніца была поўнасцю захавана, а вячэрняй газеты прададзена шэсцьдзесят тысяч экземпляраў.

Раздзел X

БАЦЬКА ВЕЛЬМІ ПАДОБНЫ НА ТОНІЧКУ

Публікацыя фотаздымка Тоніčкі ў ілюстраванай газеце мела сваім вынікам тое, што цырульнікі пачалі адразу ў першай палове дня добра зарабляць.

Жанатыя чыноўнікі, якія мелі па некалькі дзяцей, прыходзілі і прасілі адрэзаць бароды, іншыя — перайначыць вусы.

Дзвесце жанатых чыноўнікаў, што мелі па некалькі дзяцей, старанна хавалі ад жонак газету з фотаздымкам Тоніčкі.

Трыста жонак патрабавалі разводу, даказваючы мужаву здраду яго дзівосным падабенствам з Тоніčкай.

Дзевяноста мужоў прызналася ў бацькоўстве.

«Ну, вам добра, у вас жонка ў вёсцы, а я падобны на Тоніčку!»

Потым пачалі прыходзіць у рэдакцыю лісты з пагрозамі.

Было прададзена больш за сто тысяч экземпляраў газеты.

Кожная жонка чыноўніка ў Чэхіі купіла сабе адзін экземпляр.

Бог ведае як гэта скончыцца... Ніхто не ведае — як, але адзін наборшчык мне сказаў, што ў іх прыгатаваны шапкі ў газету: «Тоніччын бацька развітаўся з жыццём», «Таемная маці скончыла жыццё самагубствам».

— І мы зноў на гэтым заробім,— з усмешкай сказаў наборшчык.

ЧАГАН-КУРЭНСКАЕ АПАВЯДАННЕ

У мангола Сахаджы з племя халхасаў у Чаган-Курэні было пяць вярблюдаў, дванаццаць коней, васемнаццаць валоў і пятнаццаць бараноў. Быў у яго і свой

бог: Уісан-Тамбу. Ён стаяў на драўлянай падстаўцы перад кібіткай. У бога была п'яная морда. Па абодва бакі ад вялікага ідала стаялі два маленькія ідалы з высалаплеными языкамі. Аднойчы з поўначы прыйшла вялікая вада і знесла з сабой і бога Уісан-Тамбу, і двух вярблюдаў, трох коней, пяць валоў і чатырох бараноў.

На нейкі час Сахаджа застаўся без бога. І вельмі добра абыходзіўся без яго, сам з'ядаючы міску смажанага проса, якую дагэтуль штодня ахвяроўваў Уісан-Тамбу. Раней яе з'ядаў стары лама, царкоўны служка, якога жабрацкая доля вадзіла па кібітках. Ён услаўляў бога Уісан-Тамбу, краў у таго проса і карыстаўся агульнай павагай.

У той час па Чаган-Курэні падарожнічаў місіянер Піке. У адзенні мангольскага пастуха, з залатой шышачкай на шапцы, ён ездзіў па даліне ракі Пага-гол, прапаведаваў каталіцкую веру і цярпеў мукі ад насякомых пад назвай «ту-лакцы», ці, інакш, ад чырвоных вошай, якія моцна дакучалі яму ў яго місіянерскіх справах.

Прытым ён збіраў не толькі сапекі — драбязу грубай чаканкі,— перападалі яму і унцыі срэбра ад усіх тых, каму ён прапаведаваў новае вучэнне. Акрамя таго, ён меў поспех і ў гандлі сабалінымі скурамі, а з даручэння буйных гандляроў у Пекіне выконваў функцыі «яачанг-ці», гэта значыць, «вымагальніка падаткаў».

На даходы ад малебнаў ён адкупляў даўгі пастухоў у гэтым багатым травой краі і на падставе імператарскіх законаў нажываў працэнты з працэнтаў. Акрамя таго, ён займаўся рознымі інтрыгамі, спрытна спалучаючы сапраўдную веру з заходнімі малітвамі.

У той час, калі самым вялікім драпежнікам, якія рабавалі мангольскі народ, не ўдавалася садраць са сваіх ахвяр і трохсот працэнтаў, высокашаноўны Піке браў не менш як пяцьсот, бо акрамя падаткавых плаця-

жоў ён прыплятаў сюды і новага бога, у гонар якога звінела срэбра.

Яго красамоўства было надзвычайнае. Некалькі гадоў назад у краіне артушаў на яго напалі разбойнікі. Высокашаноўны Піке схіліў іх да хрысціянства і ababраў да апошняй сапекі, уласнаручна павесіўшы кожнаму з іх на шыю медны крыжык. З тае пары артушскія рабаўнікі пачалі нападаць на караваны ў імя новага бога.

Пазней, калі місіянер Піке, пакінуўшы даліну ракі Пага-гол, з'явіўся на зямлі Халхаса, дзейнасць яго была не такой удалай. Ён хацеў зноў вярнуцца на поўдзень, але рэчка разлілася і адрэзала яму шлях у запаветны край, прымусіла застацца тут, дзе ўжо да яго з'яўлення панавала шалёная канкурэнцыя сярод служак культу. Кітайскія свяшчэннікі і ламы з Сок-па-мі абчысцілі краіну на год наперад, і ў ёй, мабыць, не засталося ніводнай кібіткі, дзе можна было б пажывіцца хоць бы адной сапекай. Толькі ў заслоненую ўзгоркамі даліну Габіль-хану пасланцы бога Фо і бога Самчымпчэбату яшчэ не наведваліся. Вось там якраз і жыў Сакаджа без бога.

Калі ў гэтую даліну прыйшоў высокашаноўны Піке, гасцінны Сакаджа запрасіў яго ў сваю кібітку і пачаставаў чаем з аўсянымі праснакамі, печанымі ў попеле.

— Барані цябе бог,— сказаў місіянер, добра падсілкаваўшыся,— мір і шчасце твайму дому.

— У мяне няма бога,— адказаў Сакаджа,— мой бог Уісан-Тамбу сплыў ад мяне ў паводку. Але я прадам каня і куплю сабе новага бога ў Блакітным горадзе.

— Сын мой,— запярэчыў Піке,— Уісан-Тамбу бог не сапраўдны, таму яго і знесла вадой, так распарадзіўся ўсявышні і ўсемагутны бог. Аднак без бога жыць нельга, і ты добра зробіш, калі прадасі не аднаго, а трох коней і набудзеш сабе больш магутнага бога, чым

Уісан-Тамбу. Такой ахвярай ты дагодзіш Найвышэй шаму.

І яшчэ доўга, да самай ночы, аж пакуль не крыкнула на возеры начная птушка кэн, размаўляў высокашаноўны Піке з Сакаджам, даводзячы марнасць жыцця на гэтым свеце.

Калі раніцай яны ўсталі з вярблюджых посцілак і Сакаджа адбіў зямны паклон Спрадвечнаму, гэта значыць Сонцу, Піке пачаў размову з другога боку:

— Любы сын мой, уначы ты казаў мне, што пасля паводкі ў цябе засталося дзевяць коней. Навошта яны табе, калі ў цябе няма пакорнасці і шчырасці да адзінага сапраўднага бога, які паслаў табе знак перасцярогі ў выглядзе паводкі, якая знесла ад цябе твайго несапраўднага бога. Каб у цябе было і тысяча коней, ці быў бы ты шчаслівы, калі над табой няма літасці боскай. Але ў цябе іх толькі дзевяць, прадай іх, сын мой, а выручанае срэбра даручы мне, бо грэх прагнуць уяўнага багацця. Адвярні сваё сэрца ад спраў зямных, прыгарніся душой да бога і выпраўляйся з коньмі ў дарогу. Я паеду з табой у Блакітны горад, сам ператвару коней у грошы, каб не ўводзіць цябе ў грэх.

Коней прадалі, грошы Піке засунуў сабе за пазуху, а як вярнуліся з горада, Сакаджа папрасіў яго паставіць новага бога на пусты слуп.

— Яшчэ рана, сын мой любы,— запярэчыў высокашаноўны айцец,— ты яшчэ не вызваліўся ад сваіх зямных жаданняў. У цябе ж яшчэ засталіся тры вярблюды. Збірайся заўтра ў дарогу, каб прадаць вярблюдаў, сыне любы. Няхай вочы твае не будуць захоплены сузіраннем, і хай не поўняцца вушы іх тупатам.

І вярблюдаў прадалі ў Блакітным горадзе. Піке ж, хаваючы унцыі срэбра за пазуху, на пытанне Сакаджы, ці паставіць той сёння новага бога на пусты слуп, адказаў:

— Устрымайся ад празмернай цікаўнасці, бо гэтым ты ўгнявіш бога. Ведай, сын мой любы, што яшчэ не настаў час: ты ж хваліўся ў карчме «Ля трох дасканаласцяў», што ў цябе яшчэ ёсць трынаццаць валоў. Нават самыя добрыя валы — марнасць і пыха.

Ты гадуеш іх у стэпе і стараешся, каб яны былі тлустыя і спраўныя. У тваёй душы яшчэ затоена столькі ганебных жаданняў, што табе неабходна ачысціць яе пакаяннем. І адпусціць бог твае грахі. Не ўскладай надзей на рэчы зямныя, прадай сваіх валоў, сын мой, бо хто шануе бога, той абыякавы да ўсялякіх жыццёвых радасцей.

Прадалі і валоў, і засталося ў Сакаджы толькі адзінаццаць бараноў.

— Я перахрышчу цябе, сын мой,— урачыста сказаў Піке,— і, як толькі з'ямо бараноў, я пайду далей прапаведаваць праўдзівую веру.

І Сакаджа быў перахрышчаны. Кожны дзень яны елі бараніну і гаварылі пра новую веру.

— Святы айцец,— аднойчы сказаў Сакаджа, паказваючы на драўляны крыж, які Піке, выканаўшы абрад хрышчэння, паставіў на пустым слупе,— ты гаворыш, што гэта толькі знак божы, які ты мне, як яго пасланец, паставіў на пустым слупе. Я — вялікі грэшнік, і мне мала гэтых дзвюх скрыжаваных дошак. Я хацеў бы, каб ты назаўсёды застаўся ў мяне як божы намеснік. Каб у маёй кібітцы было больш гэтай новай веры.

— Гэта немагчыма, сын мой: паўднёвая краіна Хіа-ха-па і У-фу-цьвен да гэтай пары пазбаўлены радасці ад новай веры.

— Святы айцец,— засмучана сказаў Сакаджа,— я не магу без цябе. Мне мала мець бога толькі на слупе, трэба, каб ты як яго пасланец быў побач са мной.

Ноччу, калі высокашаноўны Піке заснуў, набожны Сакаджа задушыў яго і закапаў перад сваёй кібіткай пад слуп са знакам новай веры, якая перапаўняла яго

мангольскую душу. За пазухай у Піке ён знайшоў у пяць разоў больш унцый срэбра, чым высокашаноўны айцец выручыў за яго вярблюдаў, валоў і коней.

І кожная тая унцыя была бласлаўлёная.

Набожны Сакаджа купіў у пяць разоў больш вярблюдаў, коней і скаціны, чым меў да прыходу высокашаноўнага Піке; ён спакойна сядзеў ля слупа, пад якім закапаў божага пасланца, каб той заўсёды быў пад рукой, і вельмі хутка набіраў вагі, прыняўшы новую веру. Ён біў вошай, чаго не рабіў раней, калі верыў у перасяленне душ.

Толькі аднаго ён не мог зразумець. Чаму місіянер, які прыехаў праз год пасля пахавання высокашаноўнага Піке пад тым слупам, так хутка заспяшаўся на поўдзень, калі Сакаджа, ззяючы ад радасці, выйшаў яму насустрач са словамі:

— Святы айцец, пачуй маю просьбу і зайдзі да мяне ў кібітку. У мяне вось пад гэтым слупам ужо ёсць адзін божы пасланец.

Святы айцец, аднак, не зразумеў гэтай сяброўскай прыхільнасці набожнага Сакаджы і ніяк не адгукнуўся на яе, а Сакаджы не ўдалося збіць яго з каня.

Так і застаўся Сакаджа пры адным толькі божым пасланцу.

ГОСЦЬ У ХАТУ

Цудоўная ў рускіх прымаўка: «Госць у хату — бог у хату!» І як адрозніваецца ў гэтым Усход ад Захаду. На Беларусі, напрыклад, калі вы трапіце ў госці, то можаце смела хадзіць у халаце гаспадара, ваш гаспадар не можа дашукацца сваіх пантопляў, бо яны ў вас на нагах, а калі вы завялі амуры са служанкай, то ён будзе толькі моўчкі прыглядацца да вашых выды-

ганняў. Ва ўсім вы маеце прывілеі: вам даюць чаго толькі пажадаеце — і паесці і выпіць; вы можаце загадаць запрэгчы коней і паехаць куды ўздумаецца; можаце пачаць перабудову хаты; а калі вам не спадабаецца поліўка, то кідаеце талерку на галаву гаспадару і выганяеце са службы яго чалядзінкаў; карацей кажучы: «Госць у хату — бог у хату...»

У нас, на Захадзе, наадварот: госць бесперастанку адбівае гаспадарам паклоны і адпускае кампліменты, цалуе ручкі гаспадыні, з крывой усмешкай на вуснах есць усё, што падаюць, нават такое, чаго не зносіць страўнік; госць паслухмяна выконвае ўсё, што толькі прыйдзе ў галаву гаспадару.

А калі нарэшце вы ўсім гэтым нацешыліся ўволю, можа здарыцца, што гаспадар проста загадае выкінуць вас з дому. А потым па горадзе папаўзуць плёткі, што вы жуяце тытунь, што па два тыдні не мяняеце шкарпэтак, што ніколі не выціраеце носа, а калі ўжо вельмі прыспічыць, то не іначай як абрусам, што вы пазычылі ў служанкі крону, што прыехалі абы толькі паесці і выпіць за чужы кошт, што заляцаліся да гаспадаровай дачкі, хоць ужо даўно жанаты і маеце восем незаконных дзяцей.

Люблю я ўспамінаць свае паездкі ў чэшскія вёскі. Часам, праўда, мяне адшуквалі стражнікі і вярталі ў Прагу сілком, але потым яны пакінулі мяне ў спакоі, і мне засталіся адны мілыя, прыемныя ўспаміны пра маю высакародную дзейнасць у розных кутках каралеўства.

Ведаеце, не вельмі яно лёгка — зачапіцца дзе-небудзь надоўга, выдаючы сябе за госця. Тут трэба мець крыху смеласці і нахабства, разважлівасці і дыпламатычнасці — словам, тое, што называецца ўменнем жыць.

А як прыгожа там увосень! Хто жыве ў горадзе, той не ведае, што гэта такое — шырокі, як вокам сягнуць,

далягляд і ўсюды — гармонія самых разнастайных барваў. Лясы, схілы гор... Ах, прабачце, я, здаецца, загаварыўся.

Я хацеў пра нешта зусім іншае. Восень — гэта яшчэ і гусі, зайцы, курапаткі, фазаны... Хай сабе каляровыя лісты спакойна падаюць на самотныя сцежкі, мы будзем любавацца смажанай гуссю. Хай ападае золата з дубовых і букавых гаёчкаў, але ж восеньскай меддзю адліваюць і бакі смажанай гусі, прычым прыемнае тут удала спалучаецца з карысным. А заяц у смятане ці з цыбуляй! А цудоўны пах поліўкі з курапаткі! А салодкі водар каштанаў, запечаных у фазане! Усё гэта — шчодрыя дары восеньскай вёскі. Дык хто ж не будзе любіць вёску, хто не будзе цягнуцца да яе красы! Асабліва ў такі сезон.

Галоўнае, аднак, у тым, каб падшукаць сабе гаспадара. Даведаўшыся, што ўсе гэтыя жывёлінкі, якія робяць восень такой узнёслай і прывабнай, водзяцца ў неверагоднай колькасці на Чэшска-Мараўскай раўніне, я выбраў з населеных пунктаў гэтага краю адну мясцінку — даволі заможнае мястэчка, дзе спадзяваўся знайсці такога гаспадарыка, які мяне пракорміць.

І вось я на плошчы мястэчка. Агледзеўшы старадаўнія будынкі, я пачаў дзейнічаць па сістэме. Спачатку вывучыў шыльды. Найболей мне спадабалася адна з іх: «Карал Лаблер, аптовы гандляр». Дом, самы вялікі на плошчы, рабіў надзвычай прыемнае ўражанне.

Я накіраваўся ў бліжэйшую карчму і пачаў размову з яе ўладальнікам.

— Відаць, пану Лаблеру шанцуе. З таго часу, як ён яшчэ з маім бацькам...

— О-о, гэта адна з самых заможных сямей. Каля 200 000 крон маёмасці. Ды яшчэ ў брата ў Боўсаве столькі ж.

— У Ёзафа?

— Ага, у Ёзафа. (Проста дзіва, што я ўгадаў!) Гэта

той, што ажаніўся з Хаўзеравай са Ждзяра. У яе там крама была. А брат яе — Ян — застрэліўся на манеўрах у Венгрыі.

— Бедны Ян,— уздыхнуў я,— яму так да твару быў ваенны мундзір. Толькі Ян заўсёды быў нейкі дзівакаваты. Помню, аднойчы ён гаворыць маёй маці: «Цётачка, мне прыснілася, што я пазнаёміўся з грэчаскай прынцэсай». Але пан Лаблер мяне, відаць, ужо не памятае, колькі часу не бачыліся.

Як толькі карчмар некуды адышоўся, я занатаваў сабе, каб не зблытаць:

Карал Лаблер.

Ёзаф (брат), Боўсаў.

Хаўзерава са Ждзяра (жонка).

Ян (брат, застрэліўся ў Венгрыі).

— Гэта трагедыя,— сказаў я карчмару, калі ён зноў з'явіўся.— У нас ва ўсёй сям'і так. Мой пляменнік з другога калена ў пяць гадоў напароўся на плот, а стрыечная сястра цёткі маёй маці без дай прычыны звалілася ў склеп.

Карчмар спытаўся, ці ведае пан Лаблер, што я прыехаў.

— Не ведаю,— махнуў я рукой.— Наўрад ці будзе яму прыемна — мы сваякі далёкія, ды я і сам не люблю дакучаць.

— Што вы, ён будзе рады. Я зараз пашлю дачку.

Праз нейкі час у карчме з'явіўся пажылы пан з рыжаватымі валасамі, у акулярах і радасна кінуўся да майго стала. Схапіўшы мяне за рукі, ён загалёкаў:

— З сямейства Лаблераў? Так? З матчынага боку?

Кожны чалавек — з матчынага боку, таму я кіўнуў галавой і давай сыпаць пра Ёзафа з Боўсава, Хаўзераву са Ждзяра і Яна з Венгрыі, які зрабіў «бабах» на манеўрах. Памятаю як сёння, што мы абодва плакалі мінут пяць.

Потым пачаліся ўзаемныя роспыты. Я пацікавіўся, як ідзе гандаль вугалем. Ён мяне паправіў — аказваецца, ужо даўно перайшоў на збожжа і сена. Я пахваліў яго і сказаў, што сена — вельмі важны прадукт. Болей чым паўгадзіны я плёў розную лухту, і яна яму спадабалася. Потым ён запытаў, што, уласна кажучы, я тут раблю. Мне ў той момант нічога лепшага не прыйшло ў галаву, і я выпаліў, што хачу напісаць манаграфію пра старыя скляпы горада, бо некалі ў іх хаваліся шведы. Ён шведаў спалохаўся і спрабаваў быў мяне адгаварыць ад тэмы, але праз нейкі час паабяцаў, што заўтра мы зазірнём у яго скляпы, якія нібыта цягнуцца пад усёй плошчай аж да самага суда. Ды і наогул, у горадзе шмат скляпоў — можна радавацца. Толькі сям-там стаіць вада, давядзецца паплаваць. Але я магу не баяцца — ён пазычыць мне начоўкі.

Нарэшце я спытаўся, у якім атэлі ён параіў бы мне спыніцца. І тут жа пашкадаваў аб гэтым, бо ён завёў:

— У нас тут шмат добрых атэляў: «У Кубанкаў», «На пошце», «У Мараўцаў»...

Я затаіў дыханне.

— ...«У Стэльцаў», «У Будзінскіх»... Але навошта гэта вам, вы будзеце жыць у мяне, пакуль не аблазіце ўсіх вашых скляпоў. Гэта вельмі важна?

— Я думаю прысвяціць ім усё сваё жыццё.

Яшчэ з гадзіну мы гутарылі — пра скляпы і скляпенні, і я пераканаў яго, што ніхто яшчэ не даследаваў скляпоў, што гэта вялікі недагляд навукі, а потым размова перакінулася на пячоры і вежы галоднай смерці. Апошняя тэма абудзіла наш апетыт, і мы пайшлі абедаць.

Пачалося новае жыццё.

Я заваяваў сімпатыі ўсяго мястэчка. Ніколі яшчэ не бачылі тут суб'екта, які піша манаграфію. Акруговы інспектар школ выказаў жаданне пазнаёміцца са

мной і, калі я згадзіўся, заявіў, што будзе памагаць мне чым толькі можа, бо скляпы даўно цікавяць і яго.

Пан Лаблер, мой гаспадар, зззяў ад захаплення. Дзе б ён ні быў, усюды заводзіў гутарку пра мае заняткі, тлумачыў, што скляпы бываюць нізкія, высокія, глыбокія, плыткія, кароткія, доўгія, светлыя, цёмныя, сухія, мокрыя.

Мяне запрашалі ў розныя дамы, каб я паглядзеў скляпы. Я прыходзіў заўжды ў дзесяць гадзін раніцы і з вялікай дакладнасцю абвяшчаў, што пасля абеду я буду працягваць даследаванні.

Ну, вядома, у кожным такім доме мяне запрашалі на абед. Ах, якія гэта былі абеды! У іх была ўся краса восені, пра што я ўжо гаварыў. Пасля абеду я клаўся адпачыць на канапе, а пад вечар вяртаўся да свайго гаспадара, які памалу пачаў траціць розум. Начамі ён са свечкай у руцэ блукаў па хаце, лез у склеп, садзіўся на сходках каля самай вады і нешта крычаў у цемру.

Першы тыдзень ён знаходзіў у гэтым нешта прыемнае, але на другі — засумаваў, асабліва калі я намякнуў, што гарадок мне вельмі падабаецца і пабыць тут у такую пару, калі восень канчаецца, а зіма не пачалася,— надзвычай карысна для здароўя. Я абяцаў вярнуцца ў Прагу, як толькі там пачнуць катацца на каньках.

Ён не вымавіў у адказ ні слова, толькі збялеў, як сцяна. Прайшло нямала часу, пакуль ён нарэшце адазваўся:

— Я ўсё разумею.

Добры чалавек, ён пачаў разумець, што мне прыйшлася даспадобы яго кухня. Раніцай я падганяў гаспадыню хутчэй ісці ў краму і прасіў яе: «Шаноўная пані, сёння варта згатаваць тое і тое, бо я гэта люблю». Пад канец трэцяга тыдня бедны пан Лаблер пачаў рабіць далікатныя намёкі, у тым ліку і наконт нашага

сваяцтва. Нарэшце ён адважыўся сказаць адкрыта:

— Прыяцель,— і ўсміхнуўся з горыччу,— а што, калі вы мне зусім і не радня? Я прыгадваў розныя рэчы і факты, але ніяк не магу прыпомніць, каб хтонебудзь з нашай сям'і насіў ваша прозвішча.

— Ваша праўда,— адказаў я спакойна,— у мяне таксама ўзнікалі сумненні, калі вы пачалі расказваць пра сваіх блізкіх. Сапраўды, мне здаецца, што мы не сваякі. І я нават рад гэтаму, бо магу цяпер выказаць сваю ўдзячнасць куды болей шчыра, чым калі б аказаўся вашым сваяком. Блізкія звычайна думаюць, што ваш абавязак іх карміць і паіць, і зусім не думаюць пра ўдзячнасць. А чужы чалавек, вось як я, напрыклад, разумее гэта інакш — як выяўленне найглыбейшага сяброўства.

Я гаварыў яшчэ доўга і памятаю, што мы нарэшце абняліся і пацалаваліся. Я пачуў, праўда, нейкі дзіўны гук — нібы нехта заскрыгатаў зубамі.

У той жа дзень гаспадар паехаў у суседні горад. Пакуль яго не было, я вырашыў выправіць некаторыя непарадкі ў доме і заявіў гаспадыні, што трэба будзе перастаўіць мэблю. Пані Лаблерава замкнулася ў сваім пакоі і праплакала цэлы дзень.

Суму і слёз я не люблю. Выйшаўшы на вуліцу, я сустрэў некалькі маладых людзей, з якімі пазнаёміўся ў першыя дні майго побыту ў мястэчку, і запрасіў іх да Лаблераў на чарку каньяку. Мы выпілі ўвесь запас.

Пані Лаблерава плакала цяпер галасней.

На другі дзень пан Лаблер зайшоў да мяне са стрэльбай.

— Вы ўмееце страляць? — спытаўся ён нявінным тонам.

— Не,— адказаў я, бо мне здалося, што ў яго ў вачах пабліскваe нейкі злавесны агонь.

— Нічога,— супакоіў ён мяне,— навучыцеся, пойдзем на курапатак.

— Ну што ж,— уздыхнуў я,— спадзяюся, што са мной нічога не здарыцца.

— Калі будзеце асцярожна абыходзіцца са стрэльбай, то ўсё будзе добра. Вы сапраўды не ўмееце страляць?

— Сапраўды!

Ён зноў так дзіўна засмяяўся, што я мог прачытаць у яго вачах: «Будзе, будзе няшчасны выпадак. Застрэліцца наш госць!»

І мы пайшлі.

Доўга нам нічога не траплялася пад руку. Гаспадар усё ўгаворваў мяне перабегчы цераз бульбянішча і папярэджваў, каб я не спатыкнуўся. Я прыкідваўся, што не ўмею абыходзіцца са стрэльбай, а ён крычаў: «Што-небудзь ды падстрэліце, я тут бачыў два вывадкі».

Раптам я сапраўды падняў вывадак — бах-бабах! — і чатыры курапаткі зваліліся да маіх ног. Я нанізаў іх на вяровачку, прымацаваў да папругі і пайшоў далей. Ён крычаў мне наўздагон:

— Мае ўладанні толькі да ручая, далей не ідзіце!

Я хутка згубіў гаспадара, настраляў у яго ўладаннях дваццаць курапатак і з гонарам вярнуўся ў гарадок, дзе ўсе дзесяць пар прадаў па корчмах. У адной карчме разгаварыліся, і я заявіў, што вымушаны прадаць трафеі, бо ў гасцях цярплю голад і холад.

Госць у хату — бог у хату!

У самым лепшым настроі я прыйшоў дадому і аддаў стрэльбу гаспадару.

— А дзе курапаткі?

— Я іх прадаў, усе дзесяць пар. Так добра купілялі, шчыра вам дзякую,— гаварыў я спакойна.

Ён збялеў, неяк страшна зарагатаў і кінуўся ламаць мэблю.

Сёння яго здароўе значна палепшала. І хоць яго ўсё яшчэ не выпускаюць з бальніцы, але ён больш не буяніць, апатычна ўзіраецца ў наваколле і, тупа ўсміхаючыся, шэпча:

— Госць у хату — бог у хату.

Толькі часам у яго прарываецца шаленства, і тады ён крычыць:

— Дзе той пан з маімі курапаткамі?

ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ ДОМА, НА ВУЛІЦЫ, ВА ЎСТАНОВАХ, У МАГАЗІНАХ, У ТЭАТРАХ, НА АЭРАПЛАНЕ І НА ФУТБОЛЬНЫХ МАТЧАХ

Гэты артыкул прызначаны тым, каму няма калі хадзіць на лекцыі пані Лаудовай-Горжыцавай, каму няма часу чытаць катэхізіс грамадзяніна Гута ці бегаць на курсы перад ад'ездам дэлегацыі пражскай гарадской рады ў Парыж.

Гэты артыкул сапраўды ўносіць нешта новае, і яго можна са спакойным сумленнем рэкамендаваць усім. У ім вы знойдзеце шмат парад і падказак, якіх не вышукаеце ні ў Лаудовай-Горжыцавай, ні ў Гута, ні на вышэйназваных курсах.

Я мяркую, што назваў артыкул вельмі трапна: «Як паводзіць сябе дома, на вуліцы, ва ўстановах, у магазінах, у тэатрах, на аэраплане і на футбольных матчах».

Калі хто-небудзь захоча ведаць, як паводзіць сябе ў іншых месцах, напрыклад у парламенце, то хай звяртаецца да мяне пісьмова, я не хачу, каб пра такія рэчы ведалі ўсе.

Мой дапаможнік і ўказанні кароткія, практычныя і лёгка запамінаюцца. Мне здаецца, што гэтыя парады трэба вывучаць як уводзіны да правіл прыстойных паводзін. Акрамя таго, звярніце ўвагу, як далікатна я выкладаю свае погляды, не склікаючы людзей на лекцыі, як гэта робіць пані Лаудова-Горжыцава. Чытачы прачытаюць мой артыкул, і ніхто іх нават не пракантралюе, у той час як на падобных лекцыях кожны слухач думае пра другога: «Бач ты яго, ён таксама не ведае, як паводзіць сябе дома, на вуліцы, ва ўстановах і да т. п.». А хіба не гэтак з тым катэхізісам Гута? Купляеш яго ў магазіне, а ўсе адразу ведаюць, які ты недавыхаваны цюхця.

Іншая справа артыкул. Ён зусім выпадкова апынуўся ў кнізе, ніхто нават і ведаць не будзе, што ты чытаў яго, каб трохі падвучыцца, як сябе паводзіць.

Само жыццё падказала, што трэба мець такія правілы. Яны і на макава зярнятка не высмактаны з пальца. Варта пазнаёміцца з імі, і не ўтрываеш ад радасці: цяпер мне лягчэй будзе жыць на свеце.

ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ ДОМА

Дома трэба паводзіць сябе прыстойна, каб і сабе не нарабіць шкоды, і сваім блізкім. Выхаваны чалавек ніколі не будзе трушчыць свой набытак ноччу, каб не парушыць сну свайго суседа. Ён будзе ламаць мэблю ўдзень ды яшчэ і грамафон завядзе, каб ніхто не разабраў, чым ён займаецца. Калі мэбля ўзята напракат, то ён не забудзе яе застрахаваць у страхавым агенцтве. Увогуле, робіць усё вельмі сур'ёзна.

Калі ён б'е талеркі ці бутэлькі, то кідае іх на дыван, каб не чуваць было, як яны дзынкаюць, і каб жыхары ніжэйшых паверхаў не хапаліся за галаву. Праўда, калі яго кватэра знаходзіцца на першым па-

версе, то можна біць талеркі проста аб падлогу, але папярэдне трэба даведацца, ці не пайшоў хто ў падвал па вугаль.

Са сваімі гасцямі ён трымаецца па-сяброўску, а калі ўжо дойдзе да канфлікту, то вытурвае госця далікатна, каб не папсаваць дзвярэй. Калі захоча яшчэ і слоўцам краяноуць, то трэба гэта рабіць толькі па-французску ці па-англійску. Калі гаспадар не ведае гэтых дзвюх моў, то няхай лепш выпэнджвае госця моўчкі. Сапраўдны джэнтльмен ніколі не будзе рваць каўняра ці камізэлькі таму, каго выганяе. Ён проста хапае яго праваю рукою за кісць левай, закручвае назад і, прыпадняўшы яго праваю рукою за штаны, выносіць з кватэры, папрасіўшы, каб ён вольнаю рукою адчыніў сабе дзверы. Калі справа дойдзе да боксу, гаспадару не варта пры госцю здымаць пінжак. І кепска, канечне, калі ў госця прападае гадзіннік ці кашалёк.

Дома кожны павінен дбаць пра парадак і старацца не пляваць на падлогу ці ў столь. Наш дом павінен быць для нас нечым святым.

ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ НА ВУЛІЦЫ

Кожны павінен памятаць, што вуліца існуе для ўсіх, а не толькі для цябе. Правілы прыстойнасці патрабуюць, каб вы не штурхалі людзей, што ідуць па тратуары, не прыставалі да незнаёмых кабет ці паноў, не чапляліся па дарозе да паліцэйскіх. Гэта можна рабіць у пад'ездзе. Гэтак жа непрыстойна і сорамна галёкаць на прахожых і высалопваць язык тым, хто праязджае міма ў трамваі, у экіпажы, на аўтамабілі. На прагулянцы вы павінны сачыць за тым, каб не рэзнуцца ў вітрыну, не прапаліць папяросай ці цыгарай спіну тых, хто шпацыруе паперадзе, не шлэпнуць на чужога сабаку і не соўгаць руку ў чужую кішэню.

Калі ж усё-такі гэта здарыцца, трэба сказаць: «Пардон, прабачце, калі ласка, не варта гневацца!» Вы павінны прасіць прабачэння як мага больш ветліва, глядзіш, і не дойдзе справа да суда. У таго, хто прымае прабачэнне, павінен не сіняк ззяць, а ўсмешка ад сустрэчы з джэнтльменам. Я не хачу сказаць, што на вуліцы трэба быць сентыментальным: калі будзеце ўкленчваць перад кожнай спадніцай, то гэта можа зрабіць прыкрае ўражанне, бо выхадны касцюм не павінен быць зашмальцаваны на каленях. Адзенне і абутак трэба трымаць у чысціні: шмараваць на тратуары чаравікі ці выпыльваць адзенне недапушчальна. На вуліцы трэба зачароўваць усіх бездакорным выхаваннем. Крый божа з'яўляцца на вуліцы, калі ў вас штонебудзь не зашпілена або целяпаюцца тасёмкі ў нагавіцах ці шнуркі ў чаравіках. Зусім непрыстойна падстаўляць нагу якому пану ці пані, якія старэйшыя за вас гадамі і ідуць насустрач. У кожным асобным выпадку гэта трэба рабіць непрыкметна, каб не было крыўды. Трэба паважаць старэйшых і здароўкацца з усімі, хто старэйшы за вас, капялюш прыпадымаць ветліва, усміхацца зычліва. Калі вы не ўпэўнены, што сустрэчны пан ці пані старэйшыя па ўзросту, то падыдзіце і далікатна пацікаўцеся, колькі ім стукнула. На вуліцы заўсёды трэба быць прыязным і ветлівым. Валяцца на тратуары недапушчальна.

ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ ВА ЎСТАНОВАХ

Заходзячы ва ўстанову, вы здароўкаецеся з усімі прысутнымі і ветліва махаеце ім рукою. Потым, ідучы ад аднаго да другога, доўга-доўга распытвайце ў іх пра здароўе, адкуль яны родам, якое жалаванне атрымліваюць, пакуль вас не папросяць адчапіцца і не лезці сляпіцаю ў вочы. Тактоўнасць вам падкажа нікому не назаляць. Нельга на вачах ва ўсіх частаваць

чыноўнікаў папяросамі або цыгарэтамі. Гэта неяк ненатуральна. Падкупляць чыноўнікаў трэба вельмі далікатна. Грошы засоўвайце ў ружовы канверт, хай думаюць, што справа пахне любоўнай інтрыжкай.

Калі ўчыніце ва ўстанове скандал, то старайцеся даць дзёру неўпрыкмет. Ну, а калі дойдзе да бойкі, пазбягайце недазволеных прыёмаў. Не ўздумайце пахкаць ва ўстанове з рэвальвера. Паліцэйскага кладзіце на лапаткі па ўсіх правілах джыу-джыцу. Што б ні здарылася, вы не павінны забывацца: толькі прыстойнымі і абыходлівымі манерамі можна дабіцца добрага ўражання ў чыноўнікаў. Красці паліто ва ўстановах недапушчальна.

ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ Ў МАГАЗІНАХ

Зайшоўшы ў магазін, вы ветліва, з павагаю распытайце, якія цэны на тавары, але ў гэты час не шчыпайце прадаўшчыц за шчокі і не паляпвайце прыказчыка па плячы, як свайго прыяцеля. Затым кіруйце да гаспадара ці дырэктара магазіна, падайце яму сваю візітную картачку і прасіце дазволу закурыць. Нетактоўна тут жа распытваць, колькі ён зарабляе на тым ці іншым тавары. Пакалякаўшы з ім, паціснiце яму сардэчна руку і вяртайцеся ў магазін, дзе можна расказаць прадаўцам і пакупнікам некалькі нескаромных анекдотаў. Калі ж вас папросяць урэшце пакінуць іх у спакоі, ідзіце прэч мужна і з годнасцю сапраўднага джэнтльмена. Раскланьваючыся з усімі і паціху задкуючы да дзвярэй, старайцеся не знявечыць кагонебудзь з тых, што нападаюць на нас. Калі ж вы расквасіце каму нос, то потым, калі вас выпусцяць з паліцыі, папрасіце ў яго пісьмова прабачэння.

Недапушчальна скарыстоўваць паніку для таго, каб абчысціць касу.

ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ Ў ТЭАТРЫ

Калі вы хочаце, каб тэатр памог вам расці над сабою, не заяўляйцеся на спектакль «пад мухай». Калі ж усё-такі насмакталіся і прыцягліся ў тэатр, старайцеся не зваліцца з галёркі ў партэр, каб не парушыць ціхамірнага ходу прадстаўлення. Нельга ўголас сварыцца са сваімі суседзямі, чытаць моцна ў час спектакля газеты, а ў оперы падпяваць артыстам. Калі вы лупіце ў тэатры апельсін, то лушпінне не шпурляйце ў партэр, а хавайце пад крэсла. Калі вы захапілі з сабою на прадстаўленне пляшку піва, трэба пастарацца адкаркаваць яе ціхенька. На сцэну коркам не цэльцеся. Калі ўзялі напракат бінокль, не забудзьце аддаць яго білецёрцы, калі ж занеслі яго ў ламбард, то квітанцыю перашліце па пошце, наклеіўшы на канверт марку. Калі вы курыце ў час спектакля, то глядзіце, каб не нарабіць пажару. Калі выклічуць паліцэйскага, то ў глядзельнай зале не пачынайце сваркі, можна ж выйсці і ў калідор. Калі пашанцуе прабрацца за кулісы ў дамскую прыбіральню, лепш за ўсё схавацца пад стол, бо актрыса, пераадзяваючыся, можа ўбачыць чужога чалавека і перапужацца.

ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ Ў АЭРАПЛАНЕ

Сапраўдны джэнтльмен нават на вышыні шасці тысяч метраў не будзе брыдкасловіць. Перад палётам ён пашле сваім крэдыторам сяброўскія запіскі, у якіх развітаецца з імі і папросіць дараваць яму, што адважыўся на такое небяспечнае падарожжа. Выпаўшы з аэраплана, ён павінен прыняць усе захады, каб не бухнуцца каму на галаву. Як бы там ні было, ён у сваю візітную картачку ўпіша перад палётам: «Прабачце, калі ласка!»

Пляваць з аэраплана на зямны шар недапушчальна.

ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ НА ФУТБОЛЬНЫХ МАТЧАХ

Прапорваць суддзю ржавым нажом недапушчальна.

ПАСЛЯСЛОЎЕ

Хоць пералічаныя парады і пажаданні не могуць ахапіць усіх выпадкаў і шмат чаго тут прапушчана, я перакананы, што кожны лёгка іх засвоіць і запамятае. Гэты кароткі дадатак да правіл прыстойных паводзін павінна займець кожная сям'я, і я прашу шаноўны школьны савет і міністэрства асветы, каб выхоўвалі навучэнцкую моладзь згодна з маімі парадамі і павучаннямі. Прапаную таксама ўключыць мой артыкул у школьныя падручнікі. Ад ганарару я адмаўляюся на карысць згалелых джэнтльменаў.

НЯМЕЦКІЯ АСТРАНОМЫ

Нямецкі вучоны Вольфганг Гюбер займаўся на дачы ў мястэчку Шпіцдам у Альпах вылічэннем адлегласці да невядомай планеты паміж арбітамі Марса і Юпітэра. На сваю працу ён атрымліваў дапамогу ад германскага ўрада і ад аднаго багатага гандляра вугалем, якому не абыходзіла ні лішняя зорка, ні лішняя капейка.

Вольфганг Гюбер хацеў узбагаціць нямецкую навуку. Абсерваторыю ў Шпіцдаме пабудаваў за свой кошт адзін заможны мяснік, які ведаў з астраноміі толькі тое, што на небе ёсць Вялікі Воз, які нагадвае сваімі абрысамі той самы воз, на якім ён возіць на станцыю парасят. Але справа зводзілася да таго, што немцам трэба было адкрыць якую-небудзь новую зор-

ку, а потым і цэлае сузор'е, каб усю гэту галактыку магла акупіраваць адна германская раса. І вось Вольфганг Гюбер вылічваў зорнымі начамі адлегласць да невядомай планеты, убачыць якую было б немагчыма нават праз самыя моцныя тэлескопы. Ён шчыраваў ужо шэсць гадоў, але да гэтага часу не меў падставы сказаць: «Невядомая зорка, якую я шукаю і якую нельга ўбачыць нават праз тэлескопы, знаходзіцца на адлегласці столькі і столькі мільярдаў кіламетраў ад самай далёкай планеты, адкрытай французскімі астраномамі, і на адлегласці столькі вось мільярдаў кіламетраў ад самай далёкай зоркі, адкрытай амерыканцамі, шведамі і англічанамі».

Нарэшце, вымераўшы невядомую вось вярчэння невядомай планеты, Гюбер, узяўшы за аснову нейкі «х», за наступныя два гады вылічыў, што ззаду за найдалейшымі зорнымі сістэмамі, за самым далёкім святлом існуе зорка, якой ніхто не бачыць, і што яна знаходзіцца ад найдалейшай вядомай чалавецтву зоркі на адлегласці 687 мільярдаў больёнаў 999 993 мільёны 846 823 тысячы кіламетраў 500 метраў 82 сантыметры і 1,348956732246 міліметра.

Пасля гэтага ўсе нямецкія газеты надрукавалі паведамленне пра тое, што вядомаму нямецкаму вучонаму Вольфгангу Гюберу ў выніку шматгадовых назіранняў, вылічэнняў і вымярэнняў удалося адкрыць на самым канцы бясконцага сусвету невядомую зорку, пра існаванне якой ніхто раней і не здагадваўся.

Праз паўгода прафесар Гюбер дакладна вылічыў перыяд абарачэння, нахіл экватара і экліптыкі, а таксама сціск зоркі, якую назваў «Планета кайзера Вільгельма II». Такім чынам, імя Вільгельма II даляцела да самага канца бясконцага сусвету, і нямецкія настаўнікі сталі гаварыць дзецям на ўроках фізічнай геаграфіі: «Сусвет пачынаецца нашай планетай, над якой уладарыць кайзер Вільгельм Другі, і канчаецца

зоркай, нябачнай нашаму воку, якая называецца «Планета Вільгельма Другога»; нават да гэтай зоркі на самым канцы сусвету далятае нямецкае слова і нямецкая песня. Сапраўды, мілыя дзеткі, «Deutschland über alles» [1].

Прафесара Гюбера сталі ганараваць як найвялікшага апостала ідэі германізму.

Але, на жаль, і ў яго знайшоўся праціўнік. Гэта быў таксама вучоны, які, аднак, меў хібу — дамагацца славы нават цаной зрывання лаўраў са сваіх паноў калег.

Прага славы гэтага чалавека была такая вялікая, што ён аднойчы заявіўся ў Гейдэльбергскую абсерваторыю і стаў сур'ёзна дыскутаваць з дырэктарам абсерваторыі наконт таго, ці ўсё ў вылічэннях прафесара Гюбера правільна. Ён, вядома, не сумняваецца ў існаванні «Планеты Вільгельма II», бо немцы, безумоўна, маюць поўнае права на панаванне ў сусвеце, але ён перакананы, што прафесар Гюбер мог вельмі лёгка дапусціць памылку ў вылічэнні доляў міліметра.

Кожны астраном зразумее, што гэта значыць. Калі такі астраном, які апублікаваў падлікі з памылкаю, хай сабе толькі на нейкую мільённую долю міліметра, сумленны чалавек, ён неадкладна застрэліцца, як толькі яго памылка будзе даказана, таму што ўсё роўна ён скончаны чалавек і нават апошні бядняк не будзе з ім вітацца на вуліцы.

Такім чынам, калі вучоны пан Ота Дзінгльс сцвярджаў, што яго калега Гюбер змыліўся ў вылічэннях, ён мусіў быць у гэтым добра перакананы.

І ён быў перакананы, бо праз паўгода пасля таго апублікаваў артыкул пад назваю «Крыху праўды астраноміі!»; у гэтым артыкуле быў зроблены вельмі грубы выпад супраць Вольфганга Гюбера як вучонага.

---

[1] Германія найвышэй за ўсё *(ням.)*.

Цытую гэты выпад даслоўна: «Прафесар Вольфганг Гюбер памыліўся на 0,00003205109812 міліметра, што я і дакажу ў самым хуткім часе сваімі падлікамі. Вельмі шкада, што даводзіцца пералічваць пасля свайго шаноўнага калегі, але праўда мне даражэй, чым пачуццё калегіяльнасці».

Гэта выхадка выклікала ў астранамічных колах вялікае ўзрушэнне.

Прафесар Вольфганг Гюбер неадкладна выправіўся ў Гейдэльберг, каб асабіста запатрабаваць ад свайго калегі Ота Дзінгльса тлумачэнняў і доказаў, якім чынам той знайшоў памылку на 0,00003205109812 міліметра.

Такія пытанні немцы любяць найлепш вырашаць у рэстаране, за куфлем піва.

Вольфганг Гюбер і Ота Дзінгльс, прыкметна ўсхваляваныя, пайшлі разам у рэстаран «Zur Stadt Dresden», дзе прасядзелі за півам дзве гадзіны, не прамовіўшы ні слова.

Першы загаварыў Ота Дзінгльс:

— Шаноўны калега, вы яшчэ не мелі ласкі заказаць сабе нічога на снеданне? Паверце мне, кухня тут цудоўная. Дазвольце заказаць вам біфштэкс.

— Калі ласка, пане калега!

У глыбокім маўчанні яны даелі снеданне, пасля Гюбер прамовіў:

— Дазвольце мне разлічыцца, а потым мы можам пайсці ў кавярню, дзе і абмяркуем нашу справу.

— Калі ласка, пане калега. Тады падлічым: два біфштэксы па адной марцы трыццаць пфенігаў. Двойчы адна марка трыццаць — будзе тры маркі шэсцьдзесят. Потым мы выпілі па пяць куфляў піва, кожны па дваццаць восем пфенігаў; пяць памножыць на дваццаць восем будзе: пяць на восем — трыццаць пяць і двойчы пяць будзе дзесяць, ці не так, пане калега? Дадамо тры — атрымаецца трынаццаць. Калі я не па-

мыляюся, то дваццаць восем пфенігаў памножыць на пяць роўна адной марцы трыццаці пяці пфенігам. Будзьце ласкавы праверыць.

Пан Дзінглс узяў аловак і стаў лічыць. Два біфштэксы па адной марцы трыццаць пфенігаў роўна: двойчы нуль будзе нуль, двойчы тры будзе пяць, двойчы адзін — два. Выходзіць дзве маркі пяцьдзесят, а не тры маркі шэсцьдзесят, пане калега. Потым пяць куфляў піва па дваццаць восем пфенігаў; дваццаць восем на пяць будзе: пяць на восем — сорак восем, пяць на два — дзесяць. Дзесяць марак сорак восем пфенігаў...

Так яны сядзелі, схіліўшыся над паперай, і блыталіся ў лічбах, пакуль нарэшце, стаміўшыся, не паклікалі афіцыянта, які ўсё ўмомант падлічыў. Адыходзячы ў кавярню, Вольфганг Гюбер заявіў:

— А цяпер я вам дакажу, што вы памыліліся ў падліках на 0,00003205109812 міліметра.

Афіцыянт пасмяяўся ўслед вучоным — пры такім нязначным заказе ён аблічыў іх на дзве маркі.

ГІСТОРЫЯ З ТРЫМА КРОНАМІ

У мяне добрае сэрца, і я не змог не пазычыць яму, калі ён папрасіў у мяне крону. Гэта быў стары пан Зэман, дасужы і бурклівы, і не пазычыць яму азначала б абавязкова апынуцца ў няёмкім становішчы, бо ён быў вялікі майстар зганьбіць каго хочаш. А так усё абышлося даволі ціха, і толькі пасля ўжо, стоячы на скрыжаванні праспекта Фердынанда і Спаленай вуліцы, пан Зэман грамавым голасам крычаў у людскі натоўп наўздагон мне:

— Дык крону тую праз тыдзень!

Той, хто чуў гэтыя словы, напэўна, мог падумаць,

што не ён, а я даўжнік. Але чаму мяне павінна гэта трывожыць? Супакоіўшыся, я пайшоў далей, радуючыся, што выратаваў добрага пана Зэмана з бяды, бо ён даверліва прызнаўся, што прапіў крону, якую дала яму жонка, каб купіў залатую рыбку за 20 гелераў, за 6 гелераў іголак, за 8 аплікоў, за 30 стужку на спадніцу, за 30 імбіру і за 6 гелераў канапель.

У вушах у мяне і цяпер гучаў яго мяккі, тужлівы голас: «Спачатку я прапіў рыбку, пасля іголкі, аплікі, стужку, а ўрэшце і той імбір з каноплямі».

Слухаючы яго, я яшчэ раз пераканаўся, што праўду казаў Талстой: «Кіпцюрок ушчаміўся — усёй птушцы прапасці».

Праз тыдзень мы сустрэліся зноў. Пан Зэман кінуўся да мяне.

— Вось дык прыемная нечаканасць,— крычаў ён яшчэ здалёк,— я і не спадзяваўся, што ўбачу вас, я думаў, што вас увогуле няма ў Празе.

І ён адразу растлумачыў, чаму так думаў.

— Я думаў, што вы некуды паехалі, таму і не ўзяў з сабою кроны. Першыя два ці тры дні я ўвесь час насіў яе ў кішэні. І кожны раз, не сустрэўшы вас, расходаваў яе. Пасля я падумаў, што вы ж не павінны марнаваць свой час у Празе, і перастаў дарэмна траціць тыя кроны. Адным словам, цяпер я бяру з сабою толькі на цыгару. Інакш я зусім залез бы ў доўг праз тую пазычаную крону. Вы толькі падумайце, я спачатку штодзень расходаваў тую крону, якую хацеў аддаць вам, ды яшчэ і павінен быў пазычаць у карчме, дзе я гэтую крону прапіваў, дзве-тры кроны, каб мець штонебудзь на расходы. Карацей кажучы, тыя першыя тры дні, калі я насіў з сабою вашу крону, каштавалі мне адзінаццаць крон. І ведаеце, шаноўны, што я зрабіў, каб разлічыцца са сваімі шматлікімі даўгамі? Сёння я разбіў жончыну гліняную скарбонку і забраў ад-

туль усе грошы. Але, але, часам я бываю вельмі жорсткі. Ці не маглі б вы пазычыць мне яшчэ крону? Я куплю за яе такую самую скарбонку і алавяныя гузікі. Гузікі кіну ў скарбонку, каб жонка не здагадалася пра маё злачынства.

Ён так і сказаў «куплю за яе», значыць, ён напэўна ведаў, што крону я яму дам. І я папраўдзе даў, бо мне не хацелася, каб яго красамоўнасць і намаганне стварыць цэлы раман пра сваё гора, злачынства і падман аказаліся марныя.

На развітанне ён мне сказаў, што на гэтым тыдні знойдзе мяне і аддасць тыя дзве кроны.

Сустрэліся мы з панам Зэманам зноў аж праз чатырнаццаць дзён.

— Любы сябар,— радасна пачаў ён,— я вельмі рады, што сустрэўся з вамі. Тых дзвюх крон у мяне цяпер няма, але я вам іх аддам другім разам. І ўсё ж я вам скажу, што чалавек заўсёды бывае шчаслівы, калі сустракае сваіх знаёмых, якіх даўно ўжо не бачыў. Я стары ўжо чалавек, і ў мае гады часта здараецца, што вось жыве нехта, жыве, а пасля раптам — гатовы, няма яго...

Нават голас яго памякчэў.

— Сябры правядуць чалавека на Альшанскія могілкі, і ўсё, канец. Ніколі больш не ўбачыць ён знаёмых твараў сваіх сяброў, якія ў ліхую часіну былі побач і памагалі яму, дбаючы, каб ніхто не мог пра яго слова благога сказаць пасля смерці. Вядома, жыццё — цяжкая барацьба. І вось калі я падумаю, што крамнік Мэцлік з нашай вуліцы пасля маёй смерці будзе ўсюды крычаць, што я ўзяў у яго напавер на крону віна, каб падлячыць свой стары хворы жывот, дык слёзы ў мяне нагортваюцца на вочы. Любы сябра, а ці не пазычылі б вы мне напаследак яшчэ адну крону, каб я мог кінуць яе ў морду таму прайдзісвету і сказаць: «Дык напіся ж крыві, якой ты так прагнеш!»

Дзве слязы, якія скаціліся яму на руку, былі вартыя той трэцяй кроны. Пасля ён шчыра дзякаваў, гаварыў нешта пра восень, пра лісце, якое падае на зямлю, пра занядбаныя магілы і пра тое, што аддасць мне тры кроны адразу, як толькі мяне ўбачыць. Сустрэліся мы аж праз тры тыдні.

Радасць яго была бязмежная. Ён сардэчна сціснуў мне руку, патрымаў яе хвілінку ў сваёй, ажно сяброўскае цяпло разлілося па руцэ, а пасля сказаў урачыста:

— Я вам вінаваты тры кроны, вы ўжо даволі начакаліся, дык я вам, калі сустрэнемся другі раз, аддам шэсць крон.

Такая высакароднасць расчуліла мяне.

— Але чаму гэта вы будзеце аддаваць шэсць крон, калі вінаваты вы мне толькі тры, дый наогул кінем гаварыць пра гэта.

— Але я вам дам шэсць крон, і годзе.

Я адгаворваўся, кажучы, што мяне ў такім разе будзе мучыць сумленне.

— Ды што сумленне, якое сумленне, у каго яно цяпер ёсць, тое сумленне. Цяпер вас абкрадзе ваш найлепшы сябар!

— Гэта было б не па-людску з майго боку.

Ён зазлаваўся:

— Як гэта не па-людску? Цяпер трэба пільнавацца, каб вас не абакралі нават свае, разумееце, цяпер нельга нікому спачуваць. Ганіце кожнага, калі ён хоча ад вас чаго-небудзь. Бо гэта ўсё нягоднікі, верце мне.

— Але ж я вам пазычыў тыя грошы з ахвотаю.

— Ды што вы тут даказваеце пра ахвоту,— крычаў пан Зэман так, што аж людзі прыпыняліся каля нас,— якая там ахвота. Калі што-небудзь каму-небудзь пазычаеце, дык трэба думаць, што таксама хочаце мець з гэтага нейкую карысць. Я вам дам шэсць крон.

Кожны крэйцар дарагі цяпер чалавеку, асабліва калі ён яму лёгка дастаецца.

— Я даваў па-сяброўску.

— Плюньце вы на сяброўства. Якраз паміж сяброў знойдзеце вы тых найвялікшых здраднікаў. Урэшце, вам яны таксама патрэбны,— крычаў стары на ўвесь бульвар,— з вас жа таксама грошы не падаюць. Я вам дам шэсць крон, і кончым на гэтым.

— Ну што ж, дзякую вам у такім разе.

— Няма за што,— адказаў ён, паціснуў мне руку і пайшоў.

Мне і напраўду не было за што дзякаваць.

Наступнае наша спатканне адбылося амаль праз чатыры тыдні. Ён, калі ўбачыў мяне, вельмі засмуціўся і сказаў:

— Не думайце, што я забыўся пра тыя шэсць крон, я іх аддам вам, як толькі ўбачу вас. У чалавека цяпер столькі розных спраў, што няма калі думаць пра тое, каб узяць з сабою грошы. А ў мяне цяпер адны турботы і непрыемнасці. Якраз іду тэлеграфаваць цётцы, каб прыслала грошай, ды вось не ўзяў з сабою кроны. Добра, што вас сустрэў. Вы мне дасце крону, а я пры нашай наступнай сустрэчы аддам вам сем крон.

— Але ў мяне няма кроны.

У пана Зэмана заблішчалі вочы:

— Ну вядома, у вас няма кроны свайму даўняму сябру. Я разумею, што ў вас не будзе, пакуль вам адразу за тую крону не дам дзве.

Тут ён удыхнуў поўныя грудзі паветра, і палова Вацлаўскай плошчы чула цяпер, што ён мне гаварыў:

— Ліхвяры вы паганыя. Калі чалавек пазычае ў вас тры кроны і павінен аддаць шэсць, дык вы тады згаджаецеся, а калі я хачу, каб вы мне з тых трох вымантачаных крон адну вярнулі, вы адразу адгаворваецеся, нібыта ў вас няма з сабою.

І, аглядаючыся на натоўп, які абступіў нас, ён з гонарам працягваў:

— Пакіньце вы яе сабе, тую праклятую крону. Пакіньце, пакіньце, яна і так ужо ліпкая ад поту тых, з каго вы знялі апошнюю світку, як вось з мяне. Урэшце, пра гэта мы пагаворым у судзе.

Пасля адышоў пераможна, калі ўбачыў, як адзін грамадзянін з абуранага натоўпу, што сабраўся вакол нас, плюнуў на мяне.

І хоць з таго часу прайшло ўжо чатырнаццаць дзён, я чакаю, што ўсё ж, нарэшце, апынуся ў судзе за ліхвярства.

ЗМЕНА ПРОЗВІШЧА

«Сакратару міністэрства фінансаў Ярославу Выжралеку земскім палітычным кіраўніцтвам дазволена надалей насіць прозвішча Блатэнскі».

«Народная палітыка» ад 18 студзеня 1922 г. Рубрыка «Справы асабістыя і сямейныя».

Я не ведаю сакратара міністэрства фінансаў Яраслава Выжралека, і ўвогуле на ліха ён мне спатрэбіўся б, каб не трапіла на вочы тое паведамленне з «Народнай палітыкі», якое я працытаваў вышэй. Чалавек служыць сакратаром міністэрства фінансаў і цэлыя дзесяцігоддзі называўся Выжралекам, як раптам у адзін цудоўны дзень спахапіўся і прысвоіў сабе паэтычнае, як у вершатворцаў часоў будзіцеляў [1], прозвішча Блатэнскі, такі чалавек — з'ява ўвогуле выдатная, а калі ён займае і службовае становішча, то тым больш.

[1] Маюцца на ўвазе паэты эпохі эканамічнага і культурнага нацыянальнага ўздыму Чэхіі (канец XVIII —пачатак XIX ст.), якая атрымала назву чэшскага Адраджэння.

Як не заўважыш такога чалавека, які адмовіўся сам ад сябе, і як не запатрабуеш, каб дзеля грамадскага парадку земскае палітычнае кіраўніцтва сурова пакаралі і каб яно больш не дазваляла мяняць прозвішчы людзям, якія так блізка ўладкаваліся каля міністэрскіх крэслаў, а завуцца Выжралек, Выжранда, Выжырка, Выжырач і да т. п. Бо кожны падумае, быццам яны ў чымсьці прызнаюцца.

Я хачу параіць міністру фінансаў: надалей пазбягаць такіх ганебных гісторый і не дапускаць на гэткія высокія пасады ў міністэрстве ніякіх Выжралекаў, бо іх nomen-omen [1] як знарок падштурхоўвае людзей думаць пра іх абы-што. На такія пасады трэба адразу прызначаць сакратароў, якія спрадвеку носяць паэтычныя імёны. Цяпер ужо нічога не паправіш, бо позна, і ў міністэрстве фінансаў будзе сядзець нейкі Блатэнскі, але ж сядзецьме пасля таго, як там доўгія гады працiраў штаны Выжралек, пра якога цяпер трубяць усе газеты.

Ва ўсёй гэтай трагедыі больш за ўсё засмучае тое, што гэты чалавек сам пусціў погаласку па свеце, як яго нудзіць ад гэтага прозвішча Выжралек (працуе ж не абы-дзе, а ў міністэрстве фінансаў!). А от каб пакінуў усё як ёсць, то ніхто б і ўвагі не звярнуў на такі збег акалічнасцяў.

Пан міністр фінансаў, я спадзяюся, вы накладзяце дысцыплінарнае спагнанне на свайго сакратара за тое, што ён так нечакана і без прычыны ўзбаламуціў грамадскасць.

У міністэрстве фінансаў ёсць яшчэ два чыноўнікі з падазронымі імёнамі. Аднаго з іх завуць Ліс, а другога — Прэс. Цяпер нам толькі і застаецца чакаць паведамлення ў газетах аб тым, што пан Ліс з міністэр-

---

[1] Імя, якое адлюстроўвае характар паводзін чалавека *(лац.)*.

ства фінансаў атрымаў дазвол земскага палітычнага кіраўніцтва звацца Вінаржыцкім [1], а пан Прэс — Яблонскім [2]. Блатэнскі ў вас ужо ёсць, значыць, цяпер міністэрства фінансаў можа выдаваць паэтычны альманах, які будзе бясплатна рассылацца ўсім плацельшчыкам падаткаў, каб яны крыху адпачылі душою ад уплаты падаткаў і не шалелі канчаткова ад падатковага прэса і іншых прыдумак фінансавай інквізіцыі.

* * *

Пан Яраслаў Выжралек не разжыўся з гэтага нічагенькі. Калі ён думаў, што цяпер усё ў парадку, то крышачку памыліўся.

У тую хвіліну ён выглядаў як чалавек, які хацеў ураз падхапіцца на ногі, але не адзержаўся — плясь на зямлю.

Калі раней у вузкім коле сяброў яго сустракалі словамі: «А, вунь ідзе пан міністэрскі сакратар, пан Выжралек», то вымаўлялі гэтае прозвішча без усякага націску, як звычайна, між іншым,— Выжралек тое, Выжралек сёе. Ніхто нічога падумаць на яго не мог. А сёння? З якім смакам яго бліжэйшыя сябры будуць разжоўваць слова *Выжралек*, колькі пачуццяў укладуць у кожны склад, слібізуючы — *Вы-жра-лек*, якім тонам скажуць «Добры дзень, пан Выжралек,— пардон... пан Бла-тэн-скі!»

А на вуліцы, дзе ён пражывае, будуць паказваць на яго пальцам і гаварыць: «Гэта той блатэнскі Выжралек з міністэрства».

І швейцар у міністэрстве, які раней гаварыў: «Вам ёсць пісьмо, пан міністэрскі раднік», сёння дадасць з

---

[1] Вінаржыцкі Карал Алоіз (1803—1869) — чэшскі паэт, перакладчык, філолаг.

[2] Яблонскі Болемір — псеўданім чэшскага сентыментальнага рамантыка Карала Эўгена Тупы (1813—1881).

дзіўнай ухмылкай: «пан міністэрскі раднік... Блатэнскі».

І нават міністр памыліцца і па-сяброўску скажа ў тэлефон:

— Паслухайце, Выжралек...

А Выжралек, заікаючыся, прамармыча:

— Дазвольце звярнуць вашу ўвагу, пан міністр, на рубрыку «Справы асабістыя і сямейныя» ў «Чубічцы» [1] ад васемнаццатага студзеня бягучага года...

І міністр Новак закашляецца ад смеху:

— Я ўжо ведаю, пан Блатэнскі, хе-хе-хе... Але я чуў, хе-хе-хе, што ў вас узніклі некаторыя цяжкасці, хе-хе-хе.

Бачыце, да чаго даводзіць ваша неабачлівасць, пан Выжралек-Блатэнскі! Нават гэтае спалучэнне прозвішчаў напамінае нешта заалагічнае.

* * *

Ну, а калі вас усё-такі называюць «пан Блатэнскі», то і ад гэтага вы не выйгралі ні чуцельку, таму што ў прозвішча Блатэнскі не вельмі прыгожы гістарычны хвост. Нейкі Вацлаў Блатэнскі ў 1520 годзе служыў чыноўнікам у Роудніцы і быў чацвертаваны за кражу гарадскіх пячацяў. Астанкі вашага новага продка, як шынкі, вэндзіліся на гарадской браме аж да 1541 года.

Зікмунд Блатэнскі, уладальнік Літамержыцкай крэпасці Ішцірбы, быў павешаны ў 1528 годзе ў Літамержыцах за тое, што рабаваў тамтэйшых купцоў. А пра Іржыка Блатэнскага вы прачытаеце ў архіве наступнае (можаце паслаць туды кур'ера з міністэрства): у 1589 годзе, у Празе, ён, калі пачалі катаваць, прызнаўся, што атруціў сваю сястру Ганну, удаву Міку-

---

[1] Літаральна — сучка, тут у сэнсе «Брахалаўка», як у народзе звалі газету «Народная палітыка».

лаша Свяцецкага з Чэрніц. І гэты ваш новы продак скончыў сваё жыццё на пласе.

Ці вось яшчэ. Зусім нядаўна нейкі Блатэнскі забіў бабульку ў Светаборжыцах, у Маравіі.

Праўда, у гэтым апошнім выпадку становішча можна паправіць. Напішыце проста ў «Народную палітыку»: «Сакратар міністэрства фінансаў пан Яраслаў Блатэнскі паведамляе, што ён не знаходзіцца ў сваяцкіх адносінах з рабаўніком і забойцаю Блатэнскім, пра якога нядаўна пісала наша газета».

І ўсё будзе чыста-гладка.

А ўвогуле, што пнём саву, што саву аб пень. Вам ані трошачкі не палепшала ад таго, што ваша прозвішча не Выжралек, а Блатэнскі.

Жыхары Блатны гавораць пра сябе:

Я родам з Блатны,
Ні на што не здатны...

То добрай вам ночы, пан Блатэнскі!

ЖЫЦЦЁВЫЯ ПАРАДЫ

Цікава, што людзі патрабуюць самых розных парад для жыцця і што большасць з іх чакае, каб хто іншы даў ім рады. Дазвольце мне таксама прапанаваць некалькі парад, і ўбачыце, што атрымаецца, калі будзеце іх пільнавацца.

1. ЦЕШЦЕСЯ І РАДУЙЦЕСЯ!

Калі нам самім нічога радаснага не засталося, няма ні малой, ні вялікай радасці, парадуемся з радасці іншых. Калі хто купіць новы капялюш або новую сукенку, мы павінны павіншаваць яго, нават тады, калі

бачым чалавека першы раз. Падыходзім да яго на вуліцы, адрэкамендоўваемся, ідзём з ім побач і бесперапынна гаворым пра сваю радасць, цешымся, як яму да твару гэтая абнова. Калі ён выказвае неспакой і трывогу, тлумачым, што вельмі нетактоўна з яго боку не дазваляць падзяліць з ім радасць. Мы павінны мець радасць з усяго: з кветак, з сіняга неба, з воблакаў, з вітрын, з усмешак людзей, што ідуць побач,— і дзяліць гэтую радасць з іншымі. Спыняем кожнага на вуліцы і гаворым яму: «Прабачце, пан (альбо шаноўная), якое сёння ласкавае сонейка.— І будзьце ўпэўнены, васпане, што мяне ўзрадаваў вунь той кот, што лазіць па даху.— Васпане, дазвольце паведаміць, што сёння раніцай я спаткаў аднаго пана з раскошнай барадой, белай, як малако. Мяне сапраўды ўзрадавала яго барада, дазвольце падзяліцца сваёй радасцю з вамі».

Калі вас зацягнуць у каталажку і надзенуць утаймавальную сарочку, вы павінны прыкінуцца вельмі задаволенымі, каб не псаваць радасці іншым.

2. НЕ СМЕЙЦЕСЯ З ЧУЖОГА НЯШЧАСЦЯ

Вельмі часта бывае, што мы з'яўляемся сведкамі чужога няшчасця. У такім выпадку мы павінны быць чулымі. Напрыклад, убачылі, што трамваем адрэзала некаму абедзве нагі, не трэба смяяцца і пытацца ў яго, чым ён цяпер будзе гуляць у футбол! Трэба ўстрымлівацца ад смешных заўваг. Грузавік раструшчыў некаму галаву, мы не павінны браць яе ў рукі і ўзважваць. Праўда, уражліваму чалавеку такая раструшчаная галава часта прыносіць надзвычайныя пакуты. Старайцеся ўстрымлівацца і пазбягаць суровых заўваг. Пакуты вашага суайчынніка не павінны выклікаць у вас смех. Калі вы бачыце, як нехта топіцца і робіць пры гэтым розныя грымасы, не рагачыце на ўсю моц.

Калі ж не можаце стрымацца, лепш адыдзіцеся дзе ўбок. Не смейцеся са здарэнняў! Калі гарыць тэатр, усе заўвагі пакіньце пры сабе. Сапраўдны інтэлігент не будзе смяяцца з апухлага твару чалавека, у якога баляць зубы, ці строіць жарты з пахавання або катастрофы на чыгунцы.

3. НЕ ЛЕЗЬЦЕ ЎНАЧЫ Ў ПАКОЙ СЛУЖАНКІ

Калі вы чалавек жанаты, дык будзьце ўпэўнены, што ніводная жонка не даруе начнога паходу ў пакой служанкі. У выпадку сутыкнення з жонкай варта заўсёды мець у запасе якую-небудзь адгаворку, хоць жонка ўсё роўна не паверыць. Сказаць ёй, што хадзіў пракантраляваць служанку,— глупства. Сказаць, што зблытаў пакой служанкі са сваёй спальняй,— крэтынізм. Адгаворвацца тым, што вы лунацік,— значыць, што вы з глузду з'ехалі. Самая лепшая адгаворка, я лічу, калі сказаць, што вы забыліся там насоўку.

4. НЕ ЛАЙЦЕСЯ!

Грубая лаянка вельмі раніць. Трэба памятаць, што лаянкай можна абразіць чалавека. Такія словы, як «вол» альбо «карова», у гутарцы не маюць права на існаванне.

Цяперашняе меркаванне аб брыдкасловах не зусім дакладнае. Вы ж не думаеце, што калі каму-небудзь у вочы гаворыце, што ён дурань, дык той толькі паслухае і ніяк не адрэагуе на вашы словы. Па праўдзе кажучы, ёсць такія людзі, якія столькі абраз чулі ў сваім жыцці, што сталі таўстаскурымі, але ж гэта выключэнне і датычыць у асноўным паслоў, палітыкаў і дзяржаўных дзеячаў. Большасць з іх прызвычаілася да лаянкі ў парламентах. Аднак трэба ўсвядоміць,

што жыццё — ніякі не нацыянальны сход, дзе лаянка падобная да палітычных дэбатаў. Збочыць з парламенцкай ды на простую жыццёвую дарогу сведчыць пра няпэўную інтэлігентнасць. Акрамя таго, трэба прызнацца, што ў лаянцы бывае шмат безгустоўнасці. Звычайна мы задавальняемся самай простай лаянкай, ляпнем, што прыйдзе на язык, не зважаючы на тое, што і ў лаянцы можа быць сапраўдная элегантнасць і што тое-сёе можна сказаць далікатнымі словамі. Навошта казаць: «Вы дурны як пень», калі можна зрабіць гэта больш далікатна: «Мне здаецца, што вам бы лепш бараноў пасвіць». Прапаную пазбягаць звычайнай лаянкі, а гаварыць афарызмамі, якія даюць магчымасць аблаяць больш поўна і дакладна. Афарызмам лягчэй аблаяць, бо на яго цяжка адказаць, і перамога ў лаянцы на вашым баку. Сказаць некаму: «Гляньце, дзе цясляр пакінуў дзірку» не так элегантна, як ужыць словы філосафа: «Лепш бы вам было зусім не з'яўляцца ў абсягу нашай сонечнай сістэмы, а пашукаць, ці няма дзе-небудзь якой іншай гнілой планеты».

Праўду кажучы, некаторым вельмі цяжка адвыкнуць лаяцца. Паспрабуйце адвыкаць, як пры лячэнні хваробы таблеткамі мыш'яку. Пачынайце з трыццаці і канчайце адной.

5. НЕ ХАДЗІЦЕ ПА СВЕЦЕ З ЗАСМУЧАНЫМ І КІСЛЫМ ТВАРАМ

Калі б кожны гэта добра памятаў, дык не трэба было б фатографу напамінаць нам усміхацца. Трэба ўсвядоміць, што няма нічога больш агіднага, як хмурны твар, калі вас напаткае няшчасце. Заўсёды трэба ў благім знаходзіць і добрае. Калі паглядзіш на рэч з вясёлага боку, будзеш шчаслівы і не будзеш нікому надакучаць тым, што ад цябе ўцякла жонка. Страціш

маёмасць, смейся аж да слёз. Павядуць цябе на шыбеніцу, расказвай папу анекдоты, смейся і трымайся спакойна. Сваё шчасце мы павінны выхоўваць, дык будзем спакойнымі і тады, калі трэба смяяцца на ўвесь свет, і тады, калі сэрца крывёй абліваецца.

6. НЕ КУПЛЯЙЦЕ ЗАЙЦА Ў ТОРБЕ

Заяц не такое ўжо палахлівае стварэнне, як мы прывыклі думаць. Калі яго раздражніць, ён кусаецца, фыркае і кідаецца наўцёкі. Таму трэба асцерагацца, калі купляем зайца ў торбе, каб ён нас не пакусаў, як будзем выцягваць яго з торбы. Заяц з яго зубамі можа быць вельмі небяспечны для здароўя чалавека. Акрамя таго, сам працэс упіхання зайца ў торбу ёсць не што іншае, як тыранія звяроў, не кажучы ўжо пра тое, што вы можаце быць ашуканымі і ў торбе замест зайца будзе кот.

7. ЧЫМ БОЛЬШ ГАВОРАЦЬ ДА ЦЯБЕ, ТЫМ МЕНШ ГАВАРЫ САМ

Калі, напрыклад, бацька даруслай дачкі, з якой ты сустракаешся, захоча патокам слоў прымусіць цябе жаніцца, ты павінен ведаць, што салідны гандляр многа не гаворыць. Ты павінен тут жа падумаць, якую вялікую страту будзеш мець ад свайго неабдуманага рашэння, толькі на падставе бязглуздай балбатні таго пустазвона. Бяры капялюш і, не сказаўшы ні слова, ідзі прэч і больш ніколі сюды не вяртайся. Глядзі на такога балбатуна, які навязвае табе сваю дачку, зусім спакойна. Чым больш гаворыць бацька, тым менш гаварыць сам. Такім чынам паводзь сябе і з жонкай. Няхай яна гаворыць да знямогі і выдаткуе ўсю сваю энергію. А ты хадзі па пакоі і насвістваі якую-небудзь арыю з оперы. Не паддавайся націску жончыных слоў.

Не нападай на яе, яна сама стоміцца. Не гавары нічога. А калі табе гэта надакучыць, зрабі так, як і ў першым выпадку. Вазьмі капялюш, і... бывай.

У судзе многа не гавары. Памятай, што язык мой — вораг мой. Шмат каго пасадзілі за тое, што многа гаварылі.

8. АДКЛАДЗІ РАШУЧЫЯ ДЗЕЯННІ, ПАКУЛЬ ТЫ ЗЛОСНЫ

Ёсць людзі, якіх вельмі лёгка ўвесці ў злосць, і не кожны з іх можа яе стрымаць, калі з акна на галаву зваліцца вазон, калі памылкова выплюхнуць у твар цэбар з памыямі ці памылкова збабэшаць бізуном. Не забывайцеся прыдумаць, як імгненна і нечакана патрабаваць задавальнення. Бывае, напрыклад, так: выпадкова наступіць вам на нагу які-небудзь атлет. Доўга не думаючы, вы хочаце яму адплаціць, і пасля вас застаецца на гэтым свеце мокрае месца. Не распускайце рук, не будзьце жорсткімі. Памятайце, што нядобра думаць: «Я павінен забіць яго», і, што яшчэ горш, рабіць розныя захады да выканання свайго намеру. Заўсёды майце на ўвазе, што нашы органы суда і пракуратуры працуюць на высокім узроўні.

9. НЕ РАСКАЗВАЙ СЯБРАМ ПРА СВАЕ ХАТНІЯ КЛОПАТЫ

«Ведаеце, пан прафесар учора напіўся і яго збілі ў рэстаране, а як прыйшоў дамоў, пані не пусціла яго ў кватэру, і ён да самай раніцы валяўся ў калідоры. Сёння ён сам мне расказваў»,— паведаміў мне добры сябар пана прафесара. Я не вытрымаў, каб не падзяліцца навінай яшчэ з адным знаёмым, і ўжо пра гэта ведаў увесь горад. Так яно заўсёды бывае, калі мы расказваем сваім сябрам пра свае хатнія клопаты. Ні-

колі не рабіце гэтага і маўчыце пра тое, што было з вамі ўчора. Толькі такім чынам вы пазбегнеце таго, чаго не пазбегнуў пан прафесар.

10. НЕ ДАПАМАГАЙ, ПАКУЛЬ ТОЙ, ХТО ЖАДАЕ ДАПАМОГІ, МОЖА САМ САБЕ ДАЦЬ РАДЫ

Я ведаў аднаго чалавека, які, гуляючы ў карты, пазычаў грошай свайму партнёру, супраціўніку, а пасля страшэнна дзівіўся з таго, што павінен быў прайграваць іх, а ён выйграваў.

* * *

Парад для жыцця ёсць шмат. Тут толькі некалькі прыкладаў таго, што колькі хочаце можна раіць і ніколі не вычарпаеце ўсіх парад. Як з бяздоннай крыніцы мудрасці. Жыццё ж рознабаковае і шматграннае. Кожны чалавек лічыць сябе знаўцам і ментарам.

Чалавека трэба за каўнер прыцягнуць да друкаваных твораў і прымусіць чытаць парады для жыцця. Мы павінны быць вынаходлівымі ў сваіх парадах, і тады можам быць спакойнымі, што жылі недарма і параілі тысячам, як ім належыць жыць.

СУДОВЫ ПРАЦЭС ПА СПРАВЕ ХАМА, СЫНА НОЯ

У Арубашу пад гарой Арарат надзвычайную цікавасць выклікаў судовы разбор справы Хама, Ноевага сына, пра гэты выпадак у свой час мы пісалі даволі падрабязна.

Аднак мы хочам, каб і тыя чытачы, якія прапусцілі інфармацыю пра той выпадак, ведалі, пра што ідзе гаворка, і таму коратка напамінаем:

прабацька Ной, вядомы мецэнат, пасля патопу першага кастрычніка на сваім каўчэгу прыплыў да Арарата і там у мясцовых улад купіў зямельны ўчастак, на якім з улікам апошніх дасягненняў земляробскай навукі пачаў закладаць вінаграднікі. Аднойчы, было гэта летась, 12 кастрычніка, у тры гадзіны дня, Ной са сваімі трыма сынамі, Сімам, Хамам і Яфетам, пайшоў у свой вінны склеп спрабаваць віно.

З гэтай нагоды ён быў вымушаны выпіць вельмі многа віна, якое пачало дзейнічаць, як толькі ён выйшаў са склепа. Дзень быў гарачы, сонца паліла на ўсю моц, і ў паветры стаяла парнасць. Ной пайшоў у гародчык за сваёй хатай і прылёг у цяньку пад ігрушай. У гэты момант прыйшоў яго сын, свавольнік Хам. Ной быў у адной сподняй кашулі, і Хам пачаў яе сцягваць з яго праз галаву. Якраз у гэты час падышлі Ноевы сыны Сім і Яфет, і Хам кінуўся наўцёкі. За плотам каля гародчыка сабраліся амаль усе суседзі, былі тут і жанчыны, якія з абурэннем глядзелі на гнюснае відовішча. Праз гадзіну выкліканы жандар арыштаваў свавольніка Хама і завёў яго ў жандарскае ўпраўленне, адтуль пасля допыту яго накіравалі на папярэдняе зняволенне за амаральны ўчынак. Учора, сёмага студзеня, адбылося паседжанне Сената пад кіраўніцтвам судовага саветніка Мелехенаха.

Працэс адбываўся ў зале прысяжных засядацеляў, таму што памяшканне Сената не магло змясціць усёй публікі, сярод якой было шмат жанчын.

Двое канваіраў увялі падсуднага Хама. Папярэдняе зняволенне ніякім чынам не пашкодзіла Хаму, і, як сказаў Ной судовым рэферэнтам у пакоі для журналістаў, яго распуснік сын хутчэй патаўсцеў, чым схуднеў.

Працэс старшыня Сената пачаў з допыту абвінавачанага, які на ўсе пытанні адказваў гучным голасам.

Выявілася, што абвінавачаны ўжо быў пад судом яшчэ перад патопам — за святатацтва. Ён украў ахвярнага быка і з'еў яго са сваімі таварышамі. Другі раз яго судзілі год назад за знявагу. Яго абаронца прапануе, каб было запісана ў пратаколе, што Хам з маленства быў акінуты і дрэнна выхаваны.

Ной пратэстуе супраць гэтага. Сапраўды, у час патопу яму не было калі займацца выхаваннем хлопца, як бы яму хацелася. Тым не менш ён стараўся рэменем убіваць яму правілы маралі.

На жаль, пасля патопу Хам апынуўся ў благой кампаніі. Сябраваў з усялякімі басякамі, якія засталіся жывыя пасля патопу, і ўжо ў чатырнаццаць гадоў гаварыў непрыстойнасці і брыдка лаяўся.

На пытанне, як ён лаяўся, Ной адказаў, што звычайна той абзываў усіх свіннямі, свінапасамі і падобнае. Затое Сім і Яфет былі прыкладнымі дзецьмі.

Пасля абаронца яшчэ спытаўся ў Ноя, ці пасылаў ён Хама да школы.

Ной адказаў, што не мог гэтага зрабіць з-за патопу. Дарогі яшчэ не высахлі, і, акрамя таго, усе настаўнікі пачатковых школ патанулі. Толькі адзін застаўся ў горадзе, і той з глузду з'ехаў.

А б а р о н ц а. Чаму ж тады, пане сведка, вы не нанялі хатняга настаўніка?

Н о й. Усе хатнія настаўнікі таксама патанулі. *(Узрушэнне ў зале.)*

А б а р о н ц а. Як чалавек інтэлігентны, вы самі павінны былі навучыць яго правілам маралі.

Н о й *(павышаным тонам)*. Прабачце, шаноўны суд! Думаецца, усім вядома, колькі ў мяне было працы, пакуль я ратаваў чалавецтва ад вынішчэння, колькі начэй я правёў, молячыся, колькі дзён збіраў роз-

ных звяроў у свой каўчэг. *(Звяртаючыся да абаронцы.)* Думаеце, так лёгка насіць тыграў у каўчэг? І яшчэ займацца выхаваннем гэтага лайдака?

Хам *(крычыць бацьку).* Стары п'яніца!

Старшыня суда яго папярэджвае, і той сядае на месца, цынічна ўсміхаючыся.

Старшыня *(звяртаецца да Ноя).* Добра, пан Ной, нас цікавіць яшчэ адна рэч, ці не заўважалі вы ў абвінавачанага прыкмет парушэння псіхікі?

Ной. Магу вас запэўніць, што Хам з зусім здаровага роду. Яго дзед Мафусаіл у шэсцьсот семдзесят гадоў у поўным розуме перайшоў праз Гімалаі. А што да маёй жонкі, дык яна нарадзіла яго ў трыста восемдзесят гадоў таксама пры поўным розуме і ў добрым здароўі.

Пасля гэтага быў працяг допыту Хама.

Старшыня Сената. Паслухайце, абвінавачаны, чацвёртая божая запаведзь яшчэ не такая старая, каб вы маглі забыцца яе. Паліцыя ж вывешвала плакаты з дзесяццю божымі запаведзямі. На папярэднім допыце вы прызналіся, што ўмееце чытаць, гэтаму вас навучыла ад нечага рабіць матка *(узрушэнне ў зале)*, а цяпер круціце нам мазгі, што чацвёртай запаведзі вы не чыталі. Наогул гаворыце бог ведае што. Адказвайце коратка: вы сцягвалі кашулю з бацькі праз галаву?

Хам. Так, я рабіў гэта, бо бацька непапраўны алкаголік! *(Вялікае ўзрушэнне ў зале.)*

Ной *(закрыў твар рукамі і стогне).* Пашкадуйце маю сівізну, панове!

Старшыня. Паслухайце, абвінавачаны, калі б пан Ной быў нават зусім чужы чалавек, вы не мелі б права называць яго алкаголікам, а ён жа ваш бацька. *(Узрушэнне ў зале.)*

Пані Ноева *(крычыць з галёркі абвінавачаному).* Нягоднік!

Старшыня. Абвінавачаны, растлумачце нам. Што вы, уласна кажучы, думалі ў той момант, калі сцягвалі кашулю з бацькі праз галаву?

Хам. Нічога.

Старшыня. Слухайце, абвінавачаны, так проста ні з чога роднага бацьку не распранаюць. Вы гэта рабілі з пэўным намерам. Шчыра прызнайцеся, што вы думалі тады, і дапамажыце сабе. Нельга нават падумаць, што вы ні з таго ні з сяго ўзяліся сцягваць з соннага бацькі кашулю праз галаву.

Дзяржаўны абвінаваўца. Вы ведалі, што побач ходзіць шмат людзей?

Хам. Ведаў.

Абаронца. Паслухайце, пан Хам, можа, вы былі п'яны тады?

Хам. Не! Затое бацька быў п'яны. Гэта бывае з ім часта, а я баяўся, каб вецер не сарваў з яго кашулі, і таму сам хацеў сцягнуць яе. *(Смех!)*

Старшыня. Абвінавачаны, тут не месца строіць жарты. Ваш бацька ўсім сваім жыццём не заслужыў такой ганьбы. Вы павінны ганарыцца сваім бацькам.

Ноева жонка *(крычыць абвінавачанаму)*. Пачытай біблію, мярзотнік!

Абаронца *(звяртаецца да Сіма і Яфета)*. Панове, скажыце мне, чаму вы кінулі бацьку пад дрэвам. Калі вы бачылі, што ваш бацька спіць навідавоку ў людзей у адной толькі кашулі, трэба было яго накрыць, а калі б ён раскрыўся, прыкрыць хоць насоўкай. Аднак вы пакінулі пана Ноя распранутым аж да прыходу судовай камісіі. *(Узрушэнне ў зале.)*

Сведка Сім. Не было ў нас насовак, бо мы былі таксама толькі ў кашулях, як прыйшлі з віннага склепа.

Абаронца. Дзіўны парадак.

Яфет. Пан доктар, не трэба нам рабіць заўваг.

Нашы ўмовы не дазваляюць купіць яшчэ адных порткаў, і таму ў будні дзень мы не апранаем святочнага адзення!

Сведкі выходзяць, Хам іранічна ўсміхаецца.

Дзяржаўны абвінаваўца. Не смейцеся, абвінавачаны, гэта сур'ёзная справа. Даказана, што вашы браты — прыстойныя людзі, якія стараюцца звесці канцы з канцамі. А вы, што таксама даведзена, жывяце не па сродках. Так, напрыклад, у вас ёсць трое споднікаў, і носіце вы іх штодзень. Вы легкадумны, ужо дзвесце пяцьдзесят гадоў вы ходзіце без працы і чатырыста гадоў знаходзіцеся на ўтрыманні бацькі, ён вас корміць. У час патопу вы ўпотай дапамагалі вялікім грэшнікам трапіць у каўчэг, і, каб даць ім месца, вы выкінулі некалькі пар рэдкіх дагістарычных жывёлін, якія так і загінулі. Акрамя таго, жандармерыя і мясцовыя ўлады выдалі вам вельмі кепскую характарыстыку. Гаворыце розныя непрыстойнасці, чапляецеся да ўсіх дзяўчат.

Пасля быў прачытаны пратакол судова-медыцынскай экспертызы, дзе гаварылася, што Хам — тып антысацыяльны, схільны да сексуальнай разбэшчанасці.

Абаронца. Беручы пад увагу гэта заключэнне судова-медыцынскай экспертызы, прапаную пана Хама накіраваць у псіхіятрычную бальніцу.

Дзяржаўны абвінаваўца адхіляе гэтую прапанову.

Ноева жонка *(крычыць з галёркі)*. Пасадзіце яго, мярзотніка!

Суд выходзіць на нараду і вяртаецца праз паўгадзіны. Старшыня Сената паведамляе, што суд прымае прапанову абаронцы і прыгавор адкладаецца на нявызначаны час.

Так скончыўся гэты цікавы працэс, да якога мы яшчэ будзем вяртацца. Напамінаем яшчэ вось пра што: у інтарэсах аховы здароўя слухачы судовых спраў не павінны пляваць з галёркі ўніз, каб тыя, хто

сядзіць унізе, не прыносілі бацыл дадому на сваіх валасах.

Мяркуем, каб пазбегнуць гэтага, варта ўсюды паставіць плявальніцы.

ФІЯЛЕТАВЫ ГРОМ

Фіялетавы гром быў у 1596 годзе ў Рыме, на саборы кардыналаў, які абвясціў, што ўсе блюзнеры будуць каралца громам нябесным.

І як гэта было яго прафесійным абавязкам, Фіялетавы гром, як кажуць, з чыстага неба, з'явіўся на сабор.

Вярнуўшыся на неба, ён шкадаваў, што вельмі хутка ўляцеў паміж кардыналаў і двух з іх цяпер давядзецца хаваць. Упамянуў, што яму б хацелася прысутнічаць на тым пахаванні, бо яно мае быць вельмі шыкоўным. Святы Пётра затраціў шмат часу, пакуль растлумачыў яму, што гэта нядобра, калі ў час пахавання здарыцца няшчасце. Вось каб хавалі якога-небудзь тайнага ерэтыка, дык тады было б яго непасрэдным абавязкам падаць свой голас.

Фіялетавы гром фанабэрыста пазіраў з неба на зямлю. Пляваў на малыя грамы, якія гулялі, сваволілі пад ім. Гэтыя ж смаркачы не былі ў Рыме на саборы кардыналаў.

Пасля яго паклікалі да бога. Адтуль ён вярнуўся зусім прыгнечаны. За свой учынак на кардынальскім саборы ён атрымаў шэсць тыдняў хатняга зняволення. І гэта якраз у сезон летніх навальніц.

Дарэмна ён даводзіў, што сабор прагаласаваў за тое, каб усіх блюзнераў пабіла громам, і што гэта тычылася яго абавязкаў.

Архангел Гаўрыла ў размове з Фіялетавым громам сказаў:

— Не пашанцавала вам, бо забілі вы самага тлустага кардынала, які найбольш імпанаваў веруючым, вы пра гэта ведаеце? Глупства нарабілі.

З тае пары Фіялетавы гром усю сваю ўвагу накіраваў на тое, каб зноў не зрабіць якога глупства.

Аднойчы да яго на хмару сеў нейкі святы, якога ён ведаў толькі з выгляду, і разгаварыўся з ім. Расказваў, як яго смажылі жыўцом у алеі і як ён пахнуў.

Надакучыла Фіялетаваму грому слухаць святога:

— Прабачце, але мне абрыдла ўсё гэта. Сёння раніцай я сустрэў пяць мучанікаў, і яны таксама расказвалі мне пра свае пакуты, пакуль не трапілі сюды. Нам гэта ўжо прыелася. Спярша было цікава, бо ўсё новае цікава, але слухаць пятнаццаць стагоддзяў запар пра адно і тое ніякай нябеснай радасці няма.

— Выбачайце,— сказаў мучанік,— я яшчэ нікому нічога не расказваў, бо не мог успомніць, які быў алей, а сёння ўспомніў. Гэта быў канапляны алей.

— Адчапіцеся,— раззлаваўся Фіялетавы гром,— каму трэба гэта слухаць.

— Але ж гэта вельмі цікава,— стаяў на сваім мучанік,— як вы думаеце, каторая нага раней падсмажылася ў алеі, правая ці левая?

Фіялетавы гром не мог больш трываць гэтай балбатні і, каб пазбыцца дакучлівага субяседніка, зляцеў зверху ўніз. Ляцеў па прамой лініі і, як апынуўся над нейкім храмам, не змог стрымаць свайго руху, прабіў дах і грымнуўся на амбон. Ён хацеў папрасіць прабачэння ў прапаведніка, затрымацца на хвіліну, але, убачыўшы, што прапаведнік гарыць, кінуўся наўцёк і, прайшоўшы скрозь нейкую жанчыну да зямлі, раптоўна знік.

Пасля, калі зноў ляцеў на неба, ледзь не плакаў. «Божа літасцівы,— стагнаў ён,— што я нарабіў. Так паспяшаўся. Хаця б каму там унізе прыйшло ў галаву, убачыўшы спаленага прапаведніка, абвясціць, што гэ-

та па яго прыслалі з неба вогненны воз, як тады па Ілью. Гэта таксама была справа маіх рук. Добра, што на зямлі тады ўсё так удала затушавалі. Але цяпер,— уздыхнуў гром,— прапаведнік з'явіцца на небе, адразу ж пачне скардзіцца на мяне, і зноў ганьба. Можа, будзе на небе раней, чым я».

Аднак хваляванні Фіялетавага грому не апраўдаліся. З пякельнай канцылярыі паведамілі: «Тут з'явіўся адзін езуіцкі прапаведнік. Ён вельмі ўзрушаны, таму не мог яшчэ даць ніякіх паказанняў».

— Хм,— сказаў Пётра, пачуўшы навіну,— страцілі яшчэ аднаго абанента.

Фіялетавы гром узрадаваўся, што ўсё так добра абышлося, і, усміхаючыся, увесь дзень слухаў апавяданне аднаго дзядулі, які з натхненнем расказваў, як з яго выцягвалі кішкі. Вядома, ён перабольшваў, бо гаворка ішла нешта пра трыста семдзесят два метры.

Пасля з пекла прыйшло паведамленне, што прапаведнік даў паказанні і ён гаворыць, што спапяліў яго Фіялетавы гром.

Нечакана гром нібыта і пахвалілі: «Не варты вы таго, блазен, падрываеце аўтарытэт царквы, але зроблена чыста,— сказалі яму пры аўдыенцыі,— цяпер можаце спадзявацца на лепшую пасаду. Будзеце граміць блюзнераў».

— Згодна з пастановай рымскага сабора,— дадаў Фіялетавы гром і паляцеў на разведку.

Ён знайшоў даволі-такі вялікую хмару, з якой добра было відаць, што робіцца на зямлі, да таго ж там была выдатная акустыка. Кожнае слова знізу можна было пачуць.

«Ага,— падумаў Фіялетавы гром, прыслухаўшыся і ацаніўшы сітуацыю,— тут хутка будзе што рабіць».

Унізе ў адной хаціне на ложку ляжыць руды хлопец, а побач сядзіць нейкі мужчына, з выгляду ці то ксёндз, ці то поп.

— Макоўн, пастарайцеся выправіцца, бачыце, як вас пакараў бог, вы не можаце нават паварухнуцца.

— Нешта ўпала ў крыж, і ногі адняліся.

— І вы яшчэ лаецеся.

— Няхай яго пярун заб'е, хіба ж гэта жыццё? Сто д'яблаў і тысячу громаў на яго!

Фіялетавы гром не вытрымаў і рынуўся на рудога хлопца.

Грымнуў на хаціну, бух, тая абвалілася. Па нечым гладкім на ложку сыходзіць уніз, хоча затрымацца і хапае за руку прападобнага айца. Той валіцца, а Фіялетавы гром, апанаваны жахам, уцякае ў хлеў, адтуль ляціць на неба, пазіраючы, што ён натварыў. Прападобнага айца вынеслі і зазванілі ў званы, а Макоўн ходзіць па хаце і радуецца:

— Да д'ябла, мне ўжо адпусціла.

Калі Фіялетавы гром расказаў пра гэта аднаму спрактыкаванаму святому, той сказаў:

— Вы што, не ведалі, што той, хто ляжыць на пярынах, можа лаяцца? Што пярына кепскі праваднік электрычнасці, а ксёндз — добры?

— Але ж Макоўн устаў і ходзіць!

— Чаму ж яму не хадзіць, калі вы наладзілі яму такую электрычную лазню,— нервова адказаў стары спрактыкаваны святы.

І тут Фіялетавы гром заплакаў.

ЯК Я РЭДАГАВАЎ ЧАСОПІС «ДАЛЯГЛЯДЫ ЧЭШСКІХ ЖАНЧЫН І ДЗЯЎЧАТ»

Зайшоў неяк да мяне шэф-рэдактар часопіса «Далягляды чэшскіх жанчын і дзяўчат» і пасля доўгага вагання растлумачыў прычыну свайго візіту.

У інтарэсах часопіса ён вымушаны ажаніцца з даўняй падпісчыцай. Ён мяркуе гэтай сваёй жаніцьбай паправіць фінансавыя справы і павялічыць тыраж часопіса. І каб узяць шлюб, ён вымушаны пакінуць Прагу, бо яго нявеста жыве ў Аламоўцы, дзе гадоў трыццаць назад пахавала сваіх старых бацькоў і старэйшага за сябе на дзесяць гадоў брата. Справа ў тым, што ён упэўнены, што мне зусім не цяжка будзе пры яго адсутнасці адрэдагаваць наступны нумар часопіса. Пісаць мне нічога не трэба, рукапісы ўжо ў друкарні, аж на два нумары наперад. Адзінае, што ён мяне просіць, прасачыць карэктуру і вёрстку, каб рубрык не пераблыталі.

Я падаў яму руку і сказаў:

— Дзеля вас я зраблю ўсё. Ваш часопіс ідзе па слядах нашай мілай Вольгі Фостэравай з «Народнай палітыкі», і таму ён мне імпануе.

Рэдактар «Даляглядаў чэшскіх жанчын і дзяўчат» паехаў у Аламоўц, а я пайшоў у друкарню рыхтаваць новы нумар, выпраўляць рукапісы.

Яны мне не спадабаліся. Сярод артыкулаў, падрыхтаваных да друку, былі такія: «Практычныя пялёнкі для дзяцей», «Культурнае значэнне вечароў танцаў», «Чаму кухоннае начынне павінна быць белае і пакрытае лакам», «Ці можна спажываць карпа ў розныя поры года», «Абавязкі жаніха», «Як зарэзаць труса».

Артыкулы былі расплывістыя, без глыбокага зместу і размаху.

Я сказаў наборшчыку, што ўсе рукапісы забіраю з сабой, бо ніводзін з іх нічога не варты, і што новы нумар напішу сам.

Спачатку я адзначыў факт жаніцьбы рэдактара-выдаўца з даўняй падпісчыцай. Я напісаў, што маладой шэсцьдзесят гадоў і яна мае 1 500 000 крон, а таксама напісаў, што пасля пагашэння доўгу 500 000 крон, які

мае часопіс, можна будзе ўзяцца за павелічэнне фармату і тыражу часопіса. А каб гэты шчаслівы дзень застаўся ў памяці падпісчыкаў, выдавецтва зніжае падпісную цану на чвэрць.

Яшчэ я выступіў супраць артыкула Вольгі Фостэравай з «Народнай палітыкі» «Як сервіраваць святочны стол», які яна надрукавала ў «Жаночым аглядзе». Я напісаў, што «Народная палітыка» прапануе святочныя сталы для спекулянтаў, бо, як піша Вольга Фостэрава, на кожнага госця трэба не меней як 70 см месца за сталом, прыборы павінны быць сярэбраныя і вось такое меню: суп, рыба, мяса варанае і смажанае, птушка, сыр, садавіна, салодкае і цукеркі. З пітва: лікёр, чэры-брэндзі, малага, французскія віны. Я закончыў пажаданнем усім спекулянтам і ўсёй рэдакцыі «Народнай палітыкі» абжэрціся і лопнуць пасля такога гасцявання.

Пасля гэтага я напісаў трактат пра кухню, у якім даводзіў, што кухня павінна быць асобна ад пакояў і перанесена куды-небудзь на задворкі, каб кухонныя пахі не даходзілі да пакояў. А калі немагчыма перанесці кухню за горад або ў іншую будыніну, бо кухня яшчэ ж ёсць асяродак цяпла ў час паліўнага крызісу, прапанаваў перанесці ў кухні спальні. Аднак рашуча пратэставаў супраць знішчэння ў кухні прусакоў, бо з іх жа можна зварыць адмысловы суп. І далей такі рэцэпт.

Суп хуткага прыгатавання з прусакоў

180 г. прусакоў прамыць халоднай вадой, заліць паўлітрам халоднай вады. Пакуль загусцеюць, мяшаць, каб не прыліплі да дна. Як толькі прусакі развараццца, паставіць на невялікі агонь, каб яны павольна мякчэлі; іх можна варыць і на пары. Як толькі яны зробяцца зусім мяккія, а варыва загусцее, укіньце кавалак масла велічынёй з какосавы арэх, можна

ўпусціць дзесяць жаўткоў і старанна перамяшаць. Пасля гэтага заліць булёнам і падаць на стол, асцерагаючыся, каб не разліць і нікога не абварыць. Калі ж усё-такі каго-небудзь абварыш, натры таго льняным алеем, пасып парашком з сухіх вараных шкарлупак з ракаў і вязі ў бальніцу. Мяса ракаў не выкідаць, пасекчы яго, дадаць зялёнай пятрушкі, заліць куранят прыгатаванай ракавай падлівай і занесці хвораму ў бальніцу. Калі ён часам памрэ, наведайся да пані Вольгі Фостэравай і парайся, якое трэба пашыць жалобнае адзенне, каб табе было да твару. На пахаванні не плач, каб не змыць з твару пудры і не выглядаць намаляванай лялькай.

Пасля гэтай універсальнай парады напісаў яшчэ артыкул «Раздзяленне працы ў сям'і і кароткія парады маладым гаспадыням».

Асновай спакою і ладу ў сям'і ёсць разумнае размеркаванне часу і паслядоўнасць у выкананні працы. Калі каторая гаспадыня ведае, што нейкая страва вымагае болей часу, дык трэба рыхтаваць яе раней. Напрыклад, зажадалася табе ў нядзелю накарміць сваіх супам з фрыкадэлькамі з пячонкі, пачынай працу за тыдзень. У панядзелак змялі ў мясарэзцы кавалак ялавічнай пячонкі, у аўторак прапусці праз сіта. У сераду распусці на патэльні кавалак масла якіх хочаш памераў. У чацвер пасалі і ўсып перцу і тоўчанага маярану, у пятніцу дадай часнаку і два жаўткі. У суботу перамяшай усё і зрабі фрыкадэлькі велічынёй з арэх. У нядзелю купі ў бліжэйшым рэстаране ялавічнага булёну, укінь туды фрыкадэлькі і падавай на стол. Бачыце, колькі часу можна сэканоміць за цэлы тыдзень.

Разам з тым адной з найважнейшых якасцей кожнай гаспадыні з'яўляецца яе ашчаднасць і ўменне разумна выдаткоўваць грошы, рабіць так, каб выдаткі

не перавышалі прыбытку. Таму прапаную гаспадыням карыстацца крэдытам. У выпадку суда за ашуканства наша рэдакцыя, якую добра ведаюць у міністэрстве юстыцыі і на Градчанах, даб'ецца адтэрміноўкі пакарання. Катэгарычна не раім плаціць за ўсё адразу, бо заўсёды трэба памятаць пра будучыню, каб аднойчы па злой волі лёсу не апынуцца перад расчыненымі дзвярамі Панкраца.

Кухарка павінна памятаць, што, каб целу ішло на карысць, неабходна абавязковая змена страў. Таму не забывайцеся кожны дзень мяняць мяса. У панядзелак ужывайце кумпяк, у аўторак галавізну і пасечаны хвост, у сераду левую галёнку, у чацвер правую, у пятніцу ныркі, у суботу хвост, у нядзелю жылістае мяса. Калі ў вас госці, трэба, каб яды было столькі, што яшчэ засталося б. Таму лепш за ўсё палічыць на аднаго госця аднаго вала, як гэта робіцца на дыпламатычных прыёмах. Калі ж госць ужо больш не можа есці, завядзіце яго ў пусты пакой, усуньце яму два пальцы ў рот і вядзіце яго зноў да стала, гэта самае прапануюць спецыяльная літаратура і найлепшыя дактары.

Пры афармленні стала трэба памятаць, што вельмі радуюць вока жывыя кветкі і госці бываюць уражаны, калі самай зімой убачаць яркія палявыя кветкі, нарваныя вамі. Такое ўзрушыць кожную далікатную душу, прасветліць чалавека, згоніць смутак, і павесялее твар у кожнага застольніка.

Пасля гэтага артыкула я змясціў роздум: «Ці павінна быць дзяўчына нявіннай?» У гэтым артыкуле я ўшчэнт разбіў уяўленне аб нявіннасці і прывёў прыклады, як робяць кар'еру многія «ягадкі» ў рэспубліканскіх міністэрствах.

Наступны быў артыкул «Жаніх і нявеста» — урыўкі з кнігі галоўнага гігіеніста доктара Шыльмана з Ліпска.

Нарэшце я напісаў верш «Шчасце сямейнага ачагу».

Новы нумар выйшаў раней тэрміну, я сам праверыў, каб у адміністрацыі не было ніякай затрымкі з яго распаўсюджваннем, а сёння ў газеце прачытаў, на здзіўленне:

«Учора ў дзесяць гадзін раніцы перад друкарняй братоў Карасёў застрэліўся вядомы шэф-рэдактар часопіса «Далягляды чэшскіх жанчын і дзяўчат». Ён толькі ўчора ўначы прыехаў з Аламоўца. Уся трагічнасць гэтага выпадку ў тым, што самазабойца тыдзень назад ажаніўся. Апошні нумар часопіса дае падставы лічыць, што ён быў не ў сваім розуме!»

РАЗМОВА З ЦЭНЗАРАМ

Упраўленне паліцэйскай цэнзуры ў Качабамбе [1]. На сталах параскіданы акты. Над сталом начальніка паліцэйскай цэнзуры вісіць нацыянальны сцяг, які складаецца з трох гарызантальных палос рознай шырыні, сіняй зверху, жоўта-залацістай пасярэдзіне і зялёнай знізу. Над дзвярамі ўпраўлення партрэт генерала Санта Круса, які аб'яднаў Чылі з Балівіяй, даў ход мноству срэбных манет, абвясціў свабоду друку і ўстанавіў ваенны суд (corte mareial) за парушэнне закону аб друку. За пісьмовым сталом сядзіць начальнік паліцэйскай цэнзуры Хасэ Марыя Лінарас. Ля стала на крэсле насупраць начальніка цэнзуры сядзіць Марыяна Мельгарэя. Няшчасны напісаў спехам тры тэатральныя п'есы. Паліцэйская цэнзура яшчэ хутчэй канфіскавала іх, а тэатр, дзе іх хацелі ставіць, зачыніла. Пан Марыяна Мельгарэя цяпер мае размову з

[1] Качабамбе — горад у Балівіі.

цэнзарам, бо прыйшоў сюды спытацца пра лёс тэатра і сваіх п'ес. Сам ён лічыць п'есы самымі бяскрыўднымі на ўсім свеце.

Хасэ Марыя Лінарас. Вялікі вам дзякуй, пан Мельгарэя. Пан паліцэйскі прэфект і я, дзякуючы вашай п'есе, апынуліся ў непрыемнай сітуацыі. Карамба! Так нам далі па носе там наверсе, у Ла Пазе [1]. Як толькі вам прыйшло ў галаву параўнаць дзяржаўнага міністра генерала Пласіда Іянэса з печчу? Чаго круціцеся? Думаеце, што мы адразу не зразумелі, як прачыталі назву п'есы «Печ і вугаль», што пад печчу вы мелі на ўвазе Пласіду Іянэса, а пад вугалем — міністра ўнутраных спраў генерала Чусіягу?

Марыяна Мельгарэя. Пан падпрэфект, будзьце ўпэўнены, што я нават і не думаў пісаць нешта супраць пана генерала Пласіда Іянэса альбо супраць міністра Чусіягі. Я паспрабаваў напісаць нешта зусім новае. Там сапраўды гаворыцца пра печ і вугаль. Звярніце ўвагу на тое, што я ўжо быў у вар'яцкім доме. Мая п'еса апявае перамогу мёртвай матэрыі над іншымі існасцямі. Ведаеце казку Эдмунда Дзюлака, гэтага знаўцы культуры старой Англіі, дзе размаўляюць ракавіна краба з скальным уцёсам? А ў мяне гавораць печ і вугаль. *(Сам да сябе: «Бог мой, як гэта давесці такому ёлупу?»)* Пан падпрэфект, вы ведаеце бразільскага паэта Іларыёна Дазу? І яго эсэ пра лесвіцу? Дзе ён піша, што змаўкае, калі бачыць лесвіцу, таму што яна гаворыць да яго так голасна, што яго перакрыквае. А што, пан падпрэфект, калі б вы толькі ведалі, як можа гаварыць кол, да якога прывязваюць каня на пашы. Мая п'еса «Печ і вугаль» таксама пабудавана на размове нежывых рэчаў. Прабачце, пан падпрэфект, але ніхто ва ўсёй Паўднёвай Амерыцы, прачытаўшы назву маёй тэатральнай п'есы «Печ і ву-

[1] Дом Урада *(заўв. аўтара)*.

галь», не скажа: «Вось дык печ! Гэта ж пан дзяржаўны міністр Пласіда Іянэс, а вугаль гэта ж не хто іншы, як міністр унутраных спраў Гаранцізадар Чусіяга». *(Разгублена смяецца.)* Вось каб я напісаў драму «Газа і кнот»...

Хасэ Марыя Лінарас *(перапыняючы).* Паклаўшы руку на сэрца, каго б вы там мелі на ўвазе, пан Мельгарэя?

Мельгарэя *(зноў разгублена смяецца).* Але, пан падпрэфект...

Хасэ Марыя Лінарас. Карацей, не лашанцавала вам, пан Мельгарэя. Раскусілі мы вас. *(Пераможна.)* За пяць хвілін раскусілі вас. Цэнзура не такая дурная, як вам здаецца. Як толькі я прачытаў «Печ і вугаль», адразу зразумеў усё. Цяпер скажыце мне, адкуль вы даведаліся, што бацька генерала Пласіда Іянэса быў крамнікам у Югаве, а маці міністра ўнутраных спраў Гаранцізадара Чусіягі гандлявала вугалем у Біркесе ў дэпартаменце Патасійскім. «Печ і вугаль». Гэта ж занадта ясна. Ва ўсёй п'есе печ паглынае вугаль. Адкуль вы даведаліся, што генералу Пласіду Іянэсу прыдадуць яшчэ міністэрства ўнутраных спраў, якое цяпер узначальвае генерал Гаранцізадар Чусіяга? Ну, бачыце. Цяпер зразумелі. Выкрылі мы ваша нутро. Паспяшаліся, мілы пан Марыяна Мельгарэя, друкаваць афішы. Яшчэ шчасце, што мы ў апошні момант забаранілі іх друкаваць, бо і так нам там наверсе, у Ла Пазе, добра намылілі галаву. Пішыце без усялякіх палітычных выкладак і нічым не будзеце рызыкаваць. Але ж напісаць такое: «Печ і вугаль»...

Мельгарэя. Дазвольце вам сказаць, пан падпрэфект...

Хасэ Марыя Лінарас. Нічога не трэба мне тлумачыць. Усё гэта дарэмна. Захацелі мець палітычны скандал з той вашай печчу і вугалем. Мы, галубок, не далі вам гэтага. У той час, калі на біржы ў Монтэ-

відэо курс нашай валюты кожны дзень паднімаецца, няма сэнсу ўзрушаць грамадства нейкімі скандаламі. А ваша другая п'еса — «Кабель з Пернамбуку ў Лісабон»? Цяпер, калі ўлада аддае надзвычайную ўвагу сродкам сувязі. Дзе ваша галава, пан Мельгарэя? Пра што вы думалі?

Мельгарэя. Гэты выпадак, пан падпрэфект, дазвольце сказаць, абуральны.

Хасэ Марыя Лінарас *(смяецца)*. Гэта вам пашанцавала, пан Мельгарэя. Выпадак абуральны, а самі публічна зганьбілі дзяржаўны кабель. Як гэта? Так, мілы пан Мельгарэя: пяць разоў у вашай п'есе «Кабель з Пернамбуку ў Монтэвідэо» ідзе гаворка пра задніцу. Вы забыліся, відаць, на тое, што кожная задніца і кожнае г... павінны прайсці праз рукі дэпартамента нашай цэнзуры ў Качабамбе. Сённяшняя палітычная сітуацыя патрабуе больш культурнага чытання. Так, як вы пішаце ў вашых тэатральных п'есах, гаварылася ў часы Гансалеса Пісара, калі ішоў са сваімі індзейцамі на нас Тупак Амару.

Мельгарэя. Я думаў...

Хасэ Марыя Лінарас *(усміхаючыся)*. Вы думалі... Гэта нешта новае. Пан Мельгарэя! У час, калі заграніца наладжвае з намі адносіны, за намі ўважліва сочаць пасланнікі чужых дзяржаў, кожная ваша задніца ёсць, як вы толькі што сказалі, абуральная. Якая культурная дзяржава падпіша з намі ваеннае пагадненне?

Мельгарэя. А якія прычыны канфіскацыі маёй трэцяй п'есы, пан падпрэфект?

Хасэ Марыя Лінарас. Зусім простыя. Калі я канфіскаваў першую і другую п'есы, з'явілася жаданне канфіскаваць і трэцюю. Вось у чым справа, пан Мельгарэя. Мяркую, што дзеля нашага агульнага спакою. Не збіцеся з дарогі. Адсюль направа, пасля праз дзверы налева і тады зноў направа. Калі пойдзеце

проста, дык траціце ў паліцэйскую турму. Будзьце ўважлівы!

«Пра што ж пісаць,— падумаў пан Марыяна Мельгарэя.— Перайду на навуковыя артыкулы».

І напісаў, як прыйшоў дадому з упраўлення паліцэйскай цэнзуры ў Качабамбе, артыкул «Пра глупства, дурасць і нястачу разумовых здольнасцей».

Падзяліў усю дурасць на дурасць прыродную, дурасць у старасці і дурасць ад высокай пасады.

Паліцэйская цэнзура ў Качабамбе ўвесь артыкул канфіскавала.

МУЖЧЫНА І ЖАНЧЫНА Ў ШЛЮБЕ

Выкладчык геаметрыі Гендрых стаяў за гімназічнай кафедрай, як цар, як бог, як самая найвышэйшая істота.

З выразам найвялікшай дасканаласці ён глядзеў на аўдыторыю, чытаў лекцыю гімназістам, што сядзелі ўнізе за школьнымі партамі.

— Прамая можа перасякаць крывую і будзе называцца сякучай альбо можа датыкацца да крывой, і тады яна называецца датычнай. Прамая, якая злучае два канцы крывой, называецца хордай.

І, падышоўшы да дошкі, дзе крэйдай былі намаляваны ўсе гэтыя лініі, з гонарам праказаў:

— Гэтыя прамыя S, S_1 ёсць, як вы бачыце, сякучыя, прамыя t, t_1 — датычныя, а прамыя AB і CD — хорды.

Ён быў прыгожы ў сваёй вялікасці, павольна адняў руку ад дошкі і паглядзеў на школьныя парты. Тады хутка зрабіў два крокі ад дошкі. Цяпер ён нагадваў ужо бенгальскага тыгра, які гатоў скочыць на адзінокага падарожніка ў даліне Ганга.

І ўжо цішэй спытаўся:

— Халаўпецкі, ці можа датычная да акружнасці адначасова перасекчы крывую?

Ніякага адказу. Выкладчык Гендрых прыдаў моцы свайму голасу і спытаўся гучней:

— Халаўпецкі, можа хорда перасекчы крывую?

Магільнае маўчанне. Выкладчык Гендрых аж падскочыў. Умомант ён быў ля першае парты і закрычаў:

— Халаўпецкі, як называецца хорда, якая праходзіць праз цэнтр акружнасці?

Мёртвая цішыня. Усе з першых партаў павярнуліся назад, дзе на перадапошняй парце сядзеў Халаўпецкі. Правільней кажучы, не сядзеў, бо відаць была толькі яго спіна, якая вытыркалася з-пад парты, як бурак на градзе або страус, што схаваў галаву ў пясок і думае, што яго не бачаць.

Велічна падняўшы руку, выкладчык загадаў:

— Падніміце яго!

Суседзі штурхнулі Халаўпецкага, і на паверхні з'явіўся чырвоны твар гімназіста. Ён глядзеў на выкладчыка, а той прыкмеціў, што як паднімалі Халаўпецкага, дык нешта падобнае да кнігі звалілася пад парту.

Халаўпецкі здаваўся зусім спакойным і ўпэўненым.

— Што ты рабіў пад партай, Халаўпецкі?

— Чытаў.

— Што чытаў?

Халаўпецкі азірнуўся на клас і з гонарам сказаў:

— «Мужчыну і жанчыну ў шлюбе». Дзюбуа.

— Што гэта за кніга, Халаўпецкі? Раман, ці што?

І зноў пераможна гледзячы на клас, Халаўпецкі адказаў з гонарам:

— Гэта прыродазнаўства і дапаможнік для жанатых, прычым вельмі падрабязны. Новая тэорыя, пан прафесар, пра вызначэнне полу дзіцяці, імпатэнцыю, бясплоднасць. Яшчэ ёсць дадатак, асабістая гігіена

цяжарнай жанчыны і нованароджанага. Вось толькі што дачытаў апошнюю старонку.

Ён сагнуўся пад парту, дастаў кніжку і, пад зайздраслівымі позіркамі класа, панёс яе выкладчыку, аддаў яму, падышоў да дошкі, як непрызнаны герой, якога ўзвялі на гільяціну.

Твар яго свяціўся спакоем. Ён ведаў, што цяпер выкладчык Гендрых сядзе за стол, будзе гартаць кнігу і чытаць яму натацыю, а пасля запіша ўсё гэта следства ў класны журнал і паведаміць яму, што аддае справу ў рукі найвышэйшай інстанцыі, надзвычайнаму суду гонару, жахліваму інквізітарскаму трыбуналу, педагагічнаму савету, старшынём якога будзе сам дырэктар гімназіі.

Ён ведаў, што загінуў, што савет прызнае яго амаральным і выключыць з гімназіі. Але ж не было ў яго часу прачытаць кніжку дзе-небудзь у садзе, у заціш-ку. Кніжку даў яму знаёмы з другой гімназіі толькі да абеду. А ён паабяцаў прачытаць яе за ўрокі чэшскай, фізікі і геаметрыі. І даказаў. Цяпер палавое пытанне стала яму зразумелым і ясным, а гэта ж важней за нейкую там прамую або крывую. Пасля хоць патоп. Сёння ж вечарам ён усё растлумачыць Мані з жаночага вытворчага аб'яднання. Аднойчы ўжо яна давала яму пятнаццаць крон, каб купіў даведнік па палавым пытанні, а ён тыя грошы прайграў на більярдзе.

Усё адбылося так, як ён і прадчуваў. Выкладчык Гендрых сеў за стол, разгарнуў класны журнал і «Мужчыну і жанчыну ў шлюбе» Дзюбуа і, гартаючы старонкі, пачаў:

— Халаўпецкі, ты заўсёды быў амаральным тыпам. Курыў у прыбіральні, а летась ля ракі скочыў на мяне, класнага кіраўніка, дзіва яшчэ што не павалiў мяне. І сёння мне яшчэ здаецца, што ты хацеў мяне ўтапіць...

— Сабака,— аднекуль у класе пачуўся здушаны голас.

— Ручку,— загадаў выкладчык і важна сказаў: — Мне ўсё роўна, хто гэта крыкнуў. Высвятляць не буду, увесь клас запішу ў класны журнал. Усе за аднаго, адзін за ўсіх.

— Правільна,— зноў азваўся той самы голас, і ўвесь клас выбухнуў смехам. Калі кончылі смяяцца, выкладчык працягваў:

— Заўсёды вы былі бяздарным, і сёння гэта працяг вашай бяздарнасці, а таксама амаральнасці. Вы былі самым нядбалым вучнем ва ўсім класе. Вы не ведалі, што непаралельныя прамыя маюць розныя напрамкі, але з вялікім апетытам прачыталі ў гэтай кніжцы разважанні аб шлюбе, і яшчэ вы падкрэслілі «Існаванне і прадаўжэнне жывых істот грунтуецца на плоднасці, якая ўзнікае пры савакупленні полаў». Педагагічны савет выб'е вам з галавы тую плоднасць, і ніякі чорт вам не дапаможа. У той час, як я тлумачу, што такое сякучая і датычная прамыя, вы пад партай чытаеце, што шлюб у фізіялагічных адносінах ёсць савакупленне двух полаў для дасягнення такой мэты як трывалае захаванне пароды.

— Правільна,— зноў абазваўся той непазнаны голас у класе, але тут жа дваццаць галасоў гаркнула:

— Змоўкні, бо атрымаеш. Не раздражняй пана выкладчыка.

Запанавала мёртвая цішыня. Каб у гэты момант з'явіўся самы строгі інспектар, дык, напэўна, сказаў бы выкладчыку: «Віншую вас, ваш клас самы прыкладны. Нідзе школьнікі не выяўлялі такой цікавасці».

— Халаўпецкі,— працягваў выкладчык,— за шэсць школьных гадзін вы засвоілі толькі простыя вуглы і выкінулі з галавы вуглы вострыя, тупыя, разгорнутыя. І вам не зразумець, што такое дзявочая чысціня і

стрыманасць і што бурныя жаданні патрабуюць задавальнення і робяць мужчыну і жанчыну задумлівымі і нешматслоўнымі. Вазьміце вугламер і начарціце мне вугал 75°, Ну, бачыце, Халаўпецкі, і гэтага вы не ўмееце, а чытаць на ўроку геаметрыі пра венерын паясок — гэта вам важней, чым ведаць, што такое радыус, і ўткнуцца носам у апісанне чалавечага цела вам больш патрэбна, чым зразумець, што авал, гэта фігура, падобная да эліпса, складаецца з кругавых дуг. Скажыце мне, што такое эліпс? Што, не ведаеце?

Выкладчык змоўк, старанна перагарнуў кніжку і прагаварыў:

— Але калі б у вас нехта спытаўся пра якія-небудзь эратычныя афекты, дык я ўпэўнены, і ні хвіліны не сумняваюся, што вы б расказалі пра гэта вельмі падрабязна.

Гледзячы ў кніжку, ён спытаўся ў Халаўпецкага:

— Скажыце мне, напрыклад, што такое эратаманія?

Запанавала такая цішыня, што чуваць было, як цікае кішэнны гадзіннік Матушкі, які сядзеў за першай партай.

А Халаўпецкі хутка і гучна адказаў:

— Эратаманія — гэта эратычнае шаленства, якому падлягаюць абодва полы без выключэння.

— Не, Халаўпецкі,— паправіў яго выкладчык,— глядзіце, што напісана ў тэксце: «Не падлягаюць, а якое ахоплівае». — Гэта вялікая розніца, хлопцы,— звярнуўся выкладчык да класа.— Эратаманія ахоплівае абодва полы без выключэння, а падлягаць эратаманіі яны не могуць. Прадаўжайце, Халаўпецкі, ці больш вы нічога ўжо не ведаеце?

Халаўпецкі ўпэўнена авалодаў прадметам размовы і працягваў:

— Эратамана ахоплівае пачуццё да прадмета, сапраўдны ён ці ўяўны; яму сняцца сны пра каханне,

шчасце, салодкую раскошу, і ён гарыць агнём, кідаецца, няспынна рвецца да прадмета свайго палкага пачуцця. Эратаман цнатлівы ў сваім пачуцці, як пра гэта гаворыць наступны прыклад.

— Хопіць, Халаўпецкі.

Выкладчык уткнуўся ў кніжку і праз некалькі хвілін пры поўным маўчанні класа звярнуўся да Халаўпецкага:

— Скажыце нам, Халаўпецкі, а што такое афрадыстыка?

— Пад словам афрадыстыка,— адказваў без вагання Халаўпецкі,— маюцца на ўвазе розныя спажыўныя лекавыя сродкі, якія ўжываюцца, каб агонь кахання не тлеў, а гарэў. Часцей за ўсё рэцэпты гэтых сродкаў складаліся з рэчываў больш-менш непажаданых і агідных. Шматлікія факты, якія прыводзяцца ў старых і новых выданнях, гавораць пра гэта без усялякага сумнення.

— Не трэба абагульняць, Халаўпецкі,— усхваляваўся выкладчык,— ад чаго ашалеў, напрыклад, Калігула, рымскі імператар, якое любоўнае зелле дала яму Несонія?

Халаўпецкі, які дагэтуль быў спакойны, захістаўся. Праз увесь час вучобы ён непрыязна ставіўся да гістарычных фактаў, таму і не ведаў іх.

Яму не хапала паветра, і ён запытальна паглядаў на першыя парты, чакаючы падказкі. Але дзе там. Тыя самі чакалі адказу, як божага збавення.

— Дык я вам скажу, Халаўпецкі, яна дала яму выпіць навару з сатурэі, мяты перцавай і садовай пастушкі. Запомніце, хлопцы. Гэта было якраз тое, ад чаго ашалеў імператар Калігула. Відаць, Халаўпецкі, вы гэта прамінулі.

Выкладчык перагарнуў яшчэ некалькі старонак, пасля, паглядзеўшы ў блакнот, падышоў да Халаўпецкага і забіў яго напавал наступным пытаннем:

— Якая бывае даўжыня нованароджанага? Ціха там!

Узняўся гармідар.

Халаўпецкі быў знішчаны. Да лікаў ён меў такую самую непрыязнасць, як і да гістарычных фактаў. І пра гігіену нованароджанага прачытаў па дыяганалі.

— Не ведаеце гэтага,— буркнуў выкладчык,— і, напэўна, не ведаеце, колькі грамаў можа важыць нованароджанае дзіця?

Гул у класе нарастаў. Усе быццам ажылі.

Халаўпецкі маўчаў.

— Стаўлю вам шасцёрку [1], сядайце.

Халаўпецкі дайшоў да сваёй парты, школьны званок абвясціў канец урока і паклаў канец гэтаму цікаваму выпадку.

Вялікі дзякуй пану школьнаму вартаўніку.

ЯК ПАН МАЗУХА ПОМСЦІЎ ЗА СВОЙ ЗНЯВАЖАНЫ МУЖЧЫНСКІ ГОНАР

Пан Мазуха быў чалавек вельмі разважлівы. Калі нарэшце ён здагадаўся, што жонка здраджвае яму з нейкім панам Хаберам з Чорнае вуліцы, дом № 8, ён вырашыў адпомсціць за зняважаны мужчынскі гонар.

А як чалавек ён быў разважлівы, дык абдумваў свой намер два тыдні і прыйшоў да высновы, што задавальненне мусіць атрымаць без пралівання крыві і як найболей далікатным спосабам. А яшчэ два тыдні ён думаў, ці ўжыць яму высакародна бізун, ці паспадзя-

---

[1] «Шасцёрка» — найгоршая адзнака, прыраўноўваецца да нашай «адзінкі».

вацца толькі на свае рукі. Урэшце ён вырашыў заляпіць пану Хаберу на вуліцы пры людзях аплявуху. Гэта быў найдзешавейшы спосаб атрымаць задавальненне, бо не патрэбны ніякія фінансавыя ахвяры, як тады, калі мусіў бы купляць кавалерыйскі бізун.

Яшчэ тыдзень сплыў — пан Мазуха высочваў, куды ходзіць пан Хабера на прагулянку. Падпільнаваў, што ў чатыры гадзіны, калі не было прызначана спатканне з паняй Мазуховай, пан Хабера ідзе ў кавярню «Уніён» на праспекце Фердынанда, дзе бывае да паловы сёмай, а потым, пасля прагулянкі, ідзе ў рэстаран «Глаўбіц» на Малой Старане.

Сёмага лютага выйшаў пан Мазуха помсціць за свой зняважаны мужчынскі гонар. Пайшоў проста ў кавярню і, папытаўшыся, дзе сядзіць пан Хабера, прысеў за столік насупраць яго і пачаў збянтэжана разглядаць атлетычную постаць пана Хаберы. Такіх шырокіх плячэй ён не ўяўляў. «І мускулы ж у яго»,— сумна падумаў Мазуха і загаварыў да пана Хаберы як найлагадней, калі той адклаў нейкі французскі часопіс:

— Даруйце, часопіс вам болей не трэба?

— О, калі ласка.

«Ах ты паганец,— падумаў пан Мазуха.— Каб ты ведаў, хто перад табою!»

«Каб ён гэта ведаў,— разважаў пан Мазуха далей, засланіўшыся часопісам,— дык, напэўна, раззлаваўся б. А такі бамбіза, калі ўжо асмеліўся разбіць маё сямейнае шчасце, не пабаіцца пабіць на галаве маёй паднос з графінам і шклянкамі. Але я не магу гэтага так пакінуць, я павінен хоць маральна прынізіць падлюгу!»

З робленаю пагардаю пан Мазуха паклаў часопіс на крэсла каля сябе і голасна вымавіў:

— У гэтых французскіх часопісах скрозь сямейныя здрады. Маркіза дэ Бело мае сувязь са скульпта-

рам Ваё. І чаму гэты маркіз не надае гэтаму нягодніку па мардасах? Фу! Я падпільнаваў бы падлюгу на бульвары і даў бы яму пару аплявух. Так трэба караць распусту! Навошта купляць рэвальвер!

Калі госці пачалі аглядацца, пан Мазуха змоўк і загаварыў пан Хабера:

— Няма патрэбы хадзіць па прыклады ажно ў Парыж, у самой Празе робяцца такія рэчы, ад якіх валасы дыба становяцца. Я, пане, мог бы расказаць!

— Я таксама,— шматзначна заявіў пан Мазуха, не саўладаўшы з сабою. Аднак яго разважлівасць адразу ўзяла верх, і ён дадаў: — Я таксама не сумняваюся ў гэтым. Тым не менш мне гэта здаецца непрыемнаю акалічнасцю, шаноўны пане, нашы законы не дужа строгія. Найлепей расквітацца асабіста...— Тут ён зноў захваляваўся.— Стаць твар у твар з такім паганцам, даць перад людзьмі аплявуху і сказаць: «Вы разбілі маё сямейнае шчасце, а цяпер кладзіце сабе на твар халодны кампрэс!»

— Гэта не так лёгка,— важна запярэчыў пан Хабера.— Я за сваё жыццё досыць гэтага зведаў. Калі быў я ў Брно, закахалася ў мяне адна пані дырэктарыха. Пазней уцякла ад свайго мужа з некім другім і з'ехала ў Румынію. Але той пан дырэктар, яшчэ калі быў я звязаны з ёю, знайшоў нас аднойчы за горадам на прагулянцы. Зачаў са мною сварку, стаў чапляцца да мяне, але жонка выратавала яго. Яна кінулася перада мною на калені, і я даў яму спакойна пайсці. Быў ён, між намі кажучы, чалавек недарэчны, абмежаваны ў самым шырокім сэнсе слова. Потым я расшукаў яго ў Брно, трымаўся ён, як пакорлівая авечка. Прынёс я яму пенснэ, якое збіў тады з носа. Але кажу вам, калі б не было яго жонкі, якая мяне гэтак прасіла, мала б яму не было. Я яму ўваліў бы колькі трэба. Такія вось справы. А вы жанаты?

— Я не жанаты,— няцвёрда адказаў Мазуха.

— Даруйце,— ветліва сказаў пан Хабера,— я яшчэ не назваўся: тэнар Хабера.

— А я... я...— выціснуў з сябе пан Мазуха,— мяне завуць Войцах Славічак.

А калі пан Мазуха плаціў за кубачак кавы і за рагалік, капнула сляза на крону, і ён у роспачы выйшаў, паціснуўшы пану Хаберу руку.

ПРА ПАЛІЦЭЙСКАГА САБАКУ І ЖОНЧЫНУ ЗДРАДУ

Пры цяперашняй разбэшчанасці і распусце не дзіва, што я меў сувязь з жонкаю свайго прыяцеля, жандарскага вахмістра Пацака, якога баялася ўся акруга.

Аднойчы, вярнуўшыся са службовай паездкі ў галоўную жандарскую ўправу ў Празе, Пацак увечары зайшоў да мяне і папрасіў, каб я пайшоў разам з ім у лес і пабыў з ім на абходзе. Усю дарогу ён панура маўчаў. А калі мы апынуліся каля дзевяці крыжоў у глыбіні лесу між скаламі, загаварыў:

— Мне трэба вам нешта сказаць.

Мы селі на адну з дзевяці старых магіл.

— Ведаеце што? Мяне ашуквае жонка.

— Свая ці чужая?

— Свая.

— Гэтага не можа быць, я ведаю вашу жонку.

Ён горка ўсміхнуўся.

— У мяне ёсць доказы.

І дастаў з кішэні запальнічку, якую я падараваў ёй пазаўчора.

— Я знайшоў гэтую запальніцу ў яе ў скрыначцы, яна забылася выняць ключык.

Я спакойна ўзяў запальніцу і паклаў сабе ў кішэню:

— Дзякую вам, нарэшце я яе знайшоў. Згубіў быў нядаўна ў лесе. Вось дык праява!

— Вось дык праява! — паўтарыў ён за мною і дастаў з кішэні пісьмо. Гэта было тое пісьмо, якое я з тыдзень назад укінуў праз акно ў яе пакой і ў якім было напісана: «Прыходзь заўтра ў Воўчы дол у тры гадзіны».

— Гэтае пісьмо я таксама знайшоў,— сказаў ашуканы муж.

Я ўзяў пісьмо і стаў разглядаць яго зусім абыякава.

— Напісана мужчынскаю рукою.

— Несумненна мужчынскаю рукою,— сказаў жандарскі вахмістр,— а почырк падобны да вашага.

— Рыхтык мой,— сказаў я,— толькі я пішу іначай «п» і, акрамя таго, не гэтак закручваю «з», бедны дружа. Гэта звычайны беглы почырк гандляра.

Пацак уздыхнуў:

— Я знайшоў яшчэ валасы.

Яна выстрыгла ў мяне гэтыя валасы тры месяцы назад. Яны былі звязаныя ружовай стужкаю.

— Гэта ўжо занадта! — усклікнуў я.— І хто б мог падумаць на вашу жонку. Гэта не дзіцячыя валасы. Гэта грубыя мужчынскія. Бачыце, ён брунет.

— Валасы такога колеру, як у вас,— сказаў мой няшчасны прыяцель.

Я выскуб некалькі сваіх і параўнаў:

— Колер якраз такі. Ён брунет, я ж гаварыў.

Крыху памаўчалі. Ён паглядзеў на мяне засмучана, узяў мяне за руку і сардэчна сказаў: «Парайце, што мне рабіць, я знайшоў яшчэ нешта». І выняў з нагруднай кішэні фатаграфію. Я падараваў ёй сваю картку — тры тыдні назад, калі мы купаліся ў рацэ, сябар сфатаграфаваў мяне, як я сяджу ў плаўках на плыце.

— Гэты пан, здаецца, мне вельмі знаёмы,— усклікнуў я.— Я яго напэўна недзе бачыў.

— Я таксама яго ўжо недзе бачыў,— згадзіўся мой

няшчасны прыяцель, закінуў стрэльбу за плячо і ўстаў. Рушылі далей уздоўж ручая. Ён ішоў, апусціўшы галаву, і ў вачах у яго былі слёзы.

— Каб толькі я ведаў, хто ён!

Глядзець, як плача жандарскі вахмістр, вельмі цяжка. Я суцяшаў яго як толькі мог, даводзіў, што выпадак з яго пані Лідкай нельга ўспрымаць сур'ёзна і што нават гэта ўсяго толькі бяскрыўдны жарт. Ды небарака не супакойваўся:

— Але ж гэтыя валасы, гэтая фатаграфія, гэтае пісьмо. Ну і зрабіла яна мне, а я ж яе гэтак люблю.

Ён спыніўся і падаў мне руку:

— Дружа, вы мяне разумееце, я.. я... я на вас спадзяюся, што вы мне... што вы мне паможаце знайсці таго прахвоста.

Мы выйшлі з лесу і падаліся полем да вёскі. У вечаровай цішыні тахкалі між залатых жытніх каласоў два сэрцы, адданыя пані Лідцы. На канцы вёскі мы прыпыніліся ў карчме. Калі выпілі па некалькі шклянак, Пацак сказаў, што цяпер мы з ім пяройдзем на «ты» і будзем, як брат з братам: што маё, тое і тваё. Пасля ён пазычыў пяць крон, а на развітанне запэўніў, што будзе ўсю ноч думаць, як дакапацца да сутнасці справы.

Раніцай ён прыйшоў да мяне і сказаў:

— Таго прахвоста мы знойдзем з паліцэйскім сабакам.

Яшчэ ў той самы дзень ён паехаў у Кладна і прывёз адтуль аўчарку Яга.

Паліцэйскія сабакі ў наш час адыгрываюць вялікую ролю ў крыміналістыцы. Сабакі шляхетнай пароды аўчарак, пакуль яны на службе, ахоўваюцца службай бяспекі як асобы афіцыйныя. Выцяць такога сабаку — злачынства публічнага гвалту. І ў судовай практыцы паліцэйскія сабакі апошнім часам лічацца за важных сведак, і ўжо недалёка той дзень, калі суд

пастановіць, што яны могуць быць прыведзены да прысягі. Самае галоўнае ў іх — нюх. Такая службовая аўчарка абнюхвае запалку, нядбала кінутую на месцы здарэння, і ідзе па слядах злачынца, ловячы ў паветры найдрабнейшыя часцінкі паху, які счула пры абнюхванні. І не сыдзе з тых слядоў — калі, праўда, часам не змыліцца і не кінецца з радасным брэхам да свайго былога гаспадара, які прадаў яе жандарам,— і тады можа быць толькі адно: арыштуюць і пасадзяць таго, каго паліцэйскі сабака высачыць сваёю хітрасцю, на каго навядзе сваім чуйным нюхам.

Дык вось, калі мой бедны прыяцель прывёз Яга, я адразу зразумеў, што справы дрэнь. Ён дасць сабаку панюхаць маю фатаграфію, мае валасы, звязаныя ружовай стужкай, пісьмо і іншую драбязу, і гэты славуты сабака адразу мяне выкрые, тым болей што я мушу быць пры гэтым, каб, як паабяцаў, памагчы ашуканаму мужу. Настаў час эксперыменту. Сабака сядзеў прывязаны на дварэ. Я быў гатовы да ўсяго. Жандарскі вахмістр пайшоў pro corpora delicti [1], каб даць іх панюхаць Яга, і тут я дапусціўся да подласці. Я напхаў сабаку глыбока ў ноздры прыколкаю нітак.

Калі праз хвіліну прыйшоў ашуканы жандарскі вахмістр з маёю фатаграфіяй, маімі валасамі і маім пісьмом і даў іх панюхаць Яга, бедны сабака падцяў хвост і, жаласна заскавытаўшы, вылецеў з двара і кінуўся да сажалкі. Мы выбеглі за ім і ўбачылі, як ён скокнуў у сажалку і як метраў за дваццаць ад запруды нырнуў і знік у зялёнай вадзе — утапіўся з гора, што страціў нюх і прыйшоў канец яго кар'еры.

Цікава, што яшчэ прыдумае мой бедны прыяцель, каб нарэшце знайсці таго, хто заляцаўся да яго жонкі.

Тут: па рэчавыя доказы (*лац.*).

ШТО-НІШТО
ПРА СУДОВЫХ ЭКСПЕРТАЎ

Як толькі я чую гаворку судовых экспертаў, то заўсёды ўспамінаю пана Шпалу, судовага эксперта ў галіне газы і круп.

Усе, хто хадзіў у адну кавярню з ім, былі супраць яго. Ён пазіраў на іх з пагардай, звысоку. Яны былі для яго нікчэмнымі зямнымі чарвякамі, бо не разбіраліся ў газе. Ён глядзеў на іх як на абмежаваных тыпаў, ледзь не ідыётаў, бо яны нічога не разумелі таксама і ў крупах.

Усіх гэтых людзей ён лічыў нулямі без палачак, зусім непатрэбнымі істотамі, над якімі ён стаяў так высока, як Гімалаі над Ржыпам [1].

Ён не сыходзіўся блізка з людзьмі, якія яго акружалі, для яго гэта была процьма невукаў, над якімі ён зіхацеў, як сонца. Позірк яго быў халодны, як лёд. Ён разумеў, што такі выдатны чалавек, які ўзнімаецца над сваім асяроддзем, не можа па-сяброўску, шчыра ўсміхацца ўсім іншым, бо мае ў кішэні візітныя карткі: «Вацлаў Шпала, судовы эксперт у галіне газы і круп, камерцыйны дарадца і ўласнік».

Што такое веды і мастацтва ў параўнанні з газай і крупамі?

А калі ў зале суда ён даваў сваё заключэнне, голас яго гучаў натхнёна, узнёсла: «Прапанаваная мне газа — гэта, як выявілася, празрыстая, светлая вадкасць, калі ўзяць на язык — з горкім прысмакам бензіну».

Потым ужо я разумеў яго меланхалічны выгляд. Калі ён, служачы справядлівасці, павінен лізаць газу...

А як усхвалявана грымеў ён у судовай зале, робячы экспертнае заключэнне пра крупы:

— Прапанаваныя мне крупы былі навобмацак мас-

---

[1] Р ж ы п — базальтавы груд у Паўночнай Чэхіі.

ляныя, гэта тлумачылася недастатковай сушкай. Агледзеўшы крупы больш уважліва, я вызначыў, што яны пасечаны, здробнены, а значыцца, наўмысна абясцэнены.

Вось гэткі быў пан Шпала. Пазней ён страціў памяць і аднойчы, даючы сваё экспертнае заключэнне пра крупы, сказаў:

— Прапанаваныя мне крупы — гэта, як выявілася, празрыстая, светлая вадкасць, калі ўзяць на язык — з горкім прысмакам бензіну.

Паважаны суд, аднак, нічога не заўважыў і асудзіў абвінавачанага за падробку прадуктаў.

Але пан Шпала чым далей, тым болей страчваў памяць, і яго апошняе экспертнае заключэнне гучала так:

— Гэтыя крупы не знаходзіліся ў закаркаваных бутэльках, і на іх не было надпісу «Для асвятлення».

Другі судовы эксперт, якога я добра ведаў, быў пан Гавал. Па волі лёсу ён стаў судовым экспертам у галіне кіналогіі. І, такім чынам, належаў да людзей, якія з'яўляюцца выключнымі спецыялістамі па часці сабак. Той пан уваходзіў у лік так званых прарокаў-экспертаў, празорцаў, і ў Белай пад Бездзезем гэта выявілася надзвычай яскрава, моцна здзівіўшы прысутных. Справа датычыла спрэчкі паміж двума суседзямі. Яны гулялі ў карты, і — нешчаслівая выпадковасць! — у аднаго з іх выпала карта з рукава.

Сяброўства паміж імі было парушана, і гэта зайшло так далёка, што адзін з іх застрэліў на сваёй дзялянцы сабаку таго няўдалага гульца. Пацярпелы заяўляў, што яго сабака каштаваў трыста крон, і пана Гавала праз тры гады пасля таго здарэння выклікалі як судовага эксперта. Ён з'явіўся ў суд, загадаў выкапаць косці сабакі. Мінула шмат часу, пакуль знайшлі месца, дзе сабака быў закапаны. Судовы эксперт хутка агледзеў рэшткі касцей і сказаў:

— Сабака гэты быў выдатнай пароды, сенбернар, чыстакроўны, бела-жоўты і называўся, як бачым...

— Дзякую,— сказаў суддзя,— гэта ўжо ёсць у пратаколе.

Бываюць, вядома, і не такія натхнёныя судовыя эксперты. Адзін судовы эксперт у галіне падпалаў, як юрысты жартоўна кажуць, заявіў, выступаючы з экспертным водгукам:

— Я не магу з чыстым сумленнем сказаць, што гэтую стадолу падпалілі саломай, палітай бензінам, бо, як высветлілася, не было знойдзена ніводнай пустой бутэлькі з-пад бензіну, а па-другое, было высветлена, што ў стадоле ніякай саломы не было, а па-трэцяе, як я чуў, у яе ўдарыла маланка...

Ёсць і такія эксперты, якія ні за што не хочуць маўчаць і лічаць сваім абавязкам шмат чаго сказаць слаўнаму суду і грамадскасці.

У час слухання справы ў судзе прысяжных судовы эксперт почырку даказваў, што абвінавачаны бясспрэчна падпісаў гэты вэксаль, бо ў літары «б» круглы жывоцік.

— У вас таксама круглы жывоцік, але вы не «б»! — адпарыраваў абвінавачаны, абцяжарваючы сваё становішча ў вачах прысяжных.

І часта даходзіць да спрэчак паміж судовымі экспертамі, з аднаго боку, і абвінавачанымі і іх юрыскансультамі, з другога.

Здаецца, што абавязак адваката — заўжды сумнявацца ў сур'ёзнасці судовых экспертных водгукаў. Найбольш хібаў знойдзена ў заключэннях пра почырк. У абаронцаў тут лёгкая работа. Пры гэтым яны спашлюцца, напрыклад, на вялікі венскі працэс (1897), калі толькі праз два гады пасля асуджэння абвінавачанага добраахвотна з'явіўся злачынца і заявіў, што на самай справе гэта ён напісаў ліст, за які адзін чалавек быў засуджаны на дваццаць гадоў турмы.

Тады справа датычылася забойства. Ахвяра была лістом заваблена на месца злачынства, а эксперты почырку дружна згадзіліся, што ліст пісаў нявінна асуджаны.

Адзін адвакат паставіў пад сумненне слушнасць судовых экспертыз почырку і з такога боку:

— Справа ў тым, што цяпер усюды ў школах, асабліва гандлёвых, ужываецца аднолькавая сістэма пісьма. Больш як 50 працэнтаў людзей маюць аднолькавы почырк. Далей даказана, што 20 працэнтаў людзей не маюць пэўнага почырку і кожную хвіліну пішуць інакш.

Адзін судовы эксперт почырку заявіў, што пісала маладая разнервараная дзяўчына. А як выявілася, гэта пісаў яе дзядуля.

Нядаўна на разглядзе адной справы судовай калегіяй здарылася памылка. Запрасілі судовага эксперта почырку; ліст, які датычыўся гэтай справы, быў надрукаваны на пішучай машынцы.

Што было рабіць небараку? Паведаміў, памятаючы пра сваю прысягу, што ліст надрукаваны на пішучай машынцы, а гэтай сістэмы ён не знаўца і што ён не ведае, ці ўмее абвінавачаны друкаваць на машынцы.

(Суд паверыў абвінавачанаму, што той не ўмее друкаваць на пішучай машынцы, бо ён скончыў чэхаславацкую гандлёвую акадэмію.)

Цікавыя бываюць водгукі судовых дактароў. Ад іх заключэнняў у 90 працэнтах выпадкаў залежыць лёс абвінавачанага.

Надзвычай дзіўна, калі судовы эксперт-доктар у адзін дзень дае такі водгук: «Абвінавачаны быў незвычайна спакойны, гэта адразу было заўважна», а праз чатырнаццаць дзён у іншым выпадку: «Абвінавачаны быў незвычайна неспакойны, гэта адразу было заўважна».

Але часам гаворацца такія рэчы, ад якіх у слухачоў валасы на галаве ўстаюць дыбарам.

Я ведаю аднаго судовага доктара, на выгляд вельмі лагоднага чалавека, які, аднак, сказаў нядаўна, даючы заключэнне:

— З уласнага вопыту ведаю, што пасля ўдару сякерай н е к о ж н ы а д р а з у ў п а д з е...

НЕПРЫСТОЙНЫЯ КАЛЕНДАРЫ

I

Начальнік паліцэйскага ўчастка Алеш сумаваў з дзевяці гадзін вечара, калі прывялі ў выцвярэзнік апошняга п'яніцу, аж да гадзіны ночы. Думаў, як гэта выседзець над актамі і журналамі да шасці гадзін раніцы, калі яго зменяць. Не пашанцавала яму сёння. Ніхто з дзяжурных не ўмеў гуляць у прэферанс, і яму не было з кім згуляць.

А пакуль ён лёг на ложак, закурыў люльку і павёў гаворку пра палітыку. У такія моманты ён быў строгі. Ні даць ні ўзяць аўстрыйскі Катон, цвёрды і непахісны. Ён не паддаваўся ніякім сумненням. Лаяў Італію, выказваючы ёй свой недавер.

Дзяжурныя, лежачы таксама на ложках, слухалі яго з вялікай павагай, бо яны не мелі такой пэўнасці пазіцый.

«Няхай ніхто і не думае, што Траісты саюз утрымаецца. Катэгарычна заяўляю, што толькі Трэнта і Трыест дадуць клопату». Ён уздыхнуў і пачаў шукаць запалкі. Запаліў люльку і працягваў: «У Мілане, Турыне ды і ў Рыме італьянцы спальваюць аўстрыйскія сцягі. Толькі ім гэта будзе дорага каштаваць. Гэтыя тры мярзотнікі дачакаюцца новай Кустоцы».

Яго хваляванне дасягнула найвышэйшага пункту, а тут малады дзяжурны Павэлка заснуў і захроп.

Начальнік пабудзіў яго і раскрычаўся, што інтрыгана выганіць вон. Калі ты аўстрыйскі грамадзянін...

І тут у дзвярах з'явіўся дзяжурны Дэкл, які вярнуўся са свайго паста на вуліцы і пачаў дакладваць.

Пан Алеш неахвотна ўстаў з ложка, каб прыняць рапарт.

— Дазвольце далажыць, пан начальнік, нічога новага. Толькі канфіскавалі пікантныя календары. Адабраў сто дваццаць экземпляраў.

У гэты момант з твару Дэкла сышла сур'ёзнасць, і ён, усміхаючыся, пераможна абвясціў: «Вялікае паскудства, пан вахмістр, але надта прыгожыя рэчы. Малюнкі такія пікантныя, што аж сэрца млее».

Ён паклаў на стол скрутак. І ўмомант з начальніка сум як рукой зняло.

— Давай сюды паскудства!

Паліцэйскі разгарнуў скрутак і падаў начальніку адзін экземпляр канфіскаванага календара. Начальніка абступілі ўсе дзяжурныя.

— Бог мой,— сказаў адзін, разглядаючы малюнак на тытульным лісце,— вось гэта сцягно!

— Глядзіце,— абураўся начальнік,— што наша моладзь можа ўбачыць. Падлеткі, школьнікі!

Голас яго пакрысе мякчэў:

— Паночкі, а на гэтым малюнку другая, каб яе чорт пабраў, яна ж зусім голая.

— Панове,— сказаў паліцэйскі Дэкл,— далей будуць яшчэ лепшыя малюнкі.

— І цяпер неблагія!

— Не скажы, чалавеча,— у параўнанні з гэтым малюнкам тыя больш жывыя і прыгожыя. Па-першае, у той жанчыны круглейшыя бакі, і яна лепш ляжыць на канапе. Прахвосты! Трэба ж такое намаляваць!

— Прачытайце, пан вахмістр, гэты вершык пад малюнкам, ён таксама неблагі.

— Добры. Але двухсэнсоўны. Не саромеюцца людзі, што напішуць, тое і аддаюць друкаваць! Дзеці ідуць у школу і глытаюць гэтую, згінь ты, як яна называецца.

— Парнаграфія, пан вахмістр,— падказаў дзяжурны Павэлка.

— Жахлівыя рэчы, але ж цікава,— прагаварыў дзяжурны Мікі,— глядзіце, як панталоны добра вымалеваны. І подпіс някепскі: «У панталонах ці без іх, як я табе больш падабаюся, даражэнькі?»

— Думаю, што без панталонаў, а вы як мяркуеце? — весела звярнуўся начальнік да дзяжурных.— І чаго толькі тыя свінтухі не навыдумлялі.

— Раю звярнуць увагу на перадапошнюю старонку, пан вахмістр, на тую балерыну ў ванне, дзе слуга падае ёй прасціну.

— Гэта добра, але скажу, што трэба бязлітасна канфіскоўваць такія рэчы. Мне думаецца, што калі паездзіць па кіёсках, дык можна знайсці яшчэ больш такіх і іншых твораў мастацтва. Вось заўтра ўзрадуецца камісар Пераўтка!

II

— Маю гонар давесці да вашага ведама, пан камісар, што ўчора з майго загаду былі канфіскаваны ў кіёсках календары непрыстойнага зместу. Я прынёс вам адзін экземпляр. Асабліва раю звярнуць увагу на перадапошнюю старонку, балерыну ў ванне. Пасля на тую жанчыну на канапе. Ды і малюнак на тытульным лісце таксама амаральны, але думаю, што ён спадабаецца пану камісару. Раю занесці адзін экземпляр вышэйшаму начальству. Калі ласка, звярніце ўвагу на непрыстойнасці, падкрэсленыя сінім алоўкам. На гэта

варта паглядзець. Найбольшыя непрыстойнасці вы знойдзеце не шукаючы, я ўсюды заклаў тыя старонкі. Самыя пікантныя на трыццатай старонцы. Таксама цікавая серыя «За сценамі гарэма»; тут не толькі парнаграфічны тэкст, але і выдатныя малюнкі. Магаметанскія дзяўчаты ляжаць на тыгравых скурах, а за імі наглядае еўнух.

— Чалавеча,— сказаў камісар Пераўтка, праглядзеўшы каляндар,— усё гэта вы павінны паказаць таксама нашаму міністру. Ён любіць такія рэчы.

III

Календары мелі вялікі поспех. Два забраў вярхоўны паліцэйскі камісар, а тры пан міністр. Па адным узялі супрацоўнікі міністэрства. Астатнія разышліся ў паліцэйскім участку.

Паліцэйскія заўзята сачылі за з'яўленнем непрыстойных календароў.

Ужо дзякуючы таму, што гэтая чытаніна не трапіла ў рукі прыватным асобам, была захавана маральная ўстойлівасць грамадства.

СПАДЧЫНА ФРАНЦІШКА ШАФРАНКА

Пасля дакладнага падліку высветлілася, што ўся спадчына Францішка Шафранка складаецца роўна з сямі гелераў. Па смерці гэтага добрага чалавека больш нічога не засталося. Аднак ва ўсёй гэтай справе найгорш было тое, што не было ніякіх нашчадкаў, каб перадаць спадчыну, і дзяржава мусіла ўзяць тыя сем гелераў і пералічыць іх на дэпазіт. Як толькі дзяржа-

ва паклапацілася вырашыць гэтую прыватную справу, адпаведныя ведамствы пачалі пошук спадчыннікаў. І шукалі іх настойліва.

Натарыяльная кантора распачала бурную дзейнасць. Перш за ўсё прызначылі кіраўніка спадчыны Францішка Шафранка, пасля ў адміністрацыйным парадку ў розных часопісах змясцілі паведамленні, за якія заплацілі па тарыфных стаўках на аб'явы. Не забыліся даць кароткую інфармацыю і ў мясцовыя газеты, каб спадчыннікі — калі яны знойдуцца — маглі заявіць пра сябе:

«17 чэрвеня ў гарадской бальніцы памёр шасцідзесяцісямігадовы падручны печніка Францішак Шафранак, паводле анкетных дадзеных нежанаты. Усіх, хто можа прэтэндаваць на спадчыну, просім звярнуцца ў натарыяльную кантору акруговага суда».

Словам, кіраўнік спадчыны пан Камейка, як бачыце, энергічна ўзяўся за справу і стараўся адшукаць блізкіх нябожчыка з такім імпэтам, на які здольны толькі аўстрыякі.

Пан Камейка, судзейскі чыноўнік невысокага рангу, тое-сёе ўжо зрабіў, але дагэтуль яшчэ не меў гонару быць судовым выканаўцам па справах спадчыны, а тут яму падкінулі справу Францішка Шафранка.

— Зраблю ўсё магчымае,— сказаў ён,— усіх чарцей падыму на ногі, пакуль не дабяруся да сутнасці.

Пакуль пан Камейка нястомна працаваў, сямігелеравая спадчына Францішка Шафранка спакойна адпачывала ў сейфе дзяржаўнага банка пад аховай узброенага салдата.

Пан Камейка не ленаваўся. Неўзабаве ён ужо мог пахваліцца, што апублікаваў каля пяцідзесяці аб'яў у пражскіх і правінцыяльных часопісах і гэта каштавала дзяржаўнай казне шэсцьсот крон. Сакратар Шміт быў па макаўку загружаны пісаннем лістоў да ўсіх магчымых Шафранкаў, якія, як снег на галаву, атрым-

лівалі позвы ў суд. Толькі ў Празе жыве пяцьдзесят восем Шафранкаў.

З такім матэрыялам ужо можна працаваць і мець асалоду ад пакут тых небаракаў, якіх вы выклікаеце ў суд і строга і падрабязна дапытваеце.

Ну і напакутаваўся ён з тымі Шафранкамі! Некаторых трэба было нават прыводзіць, ці, як гэта міла называецца на канцылярскай мове, дастаўляць сілай. Так было з Алойзам, Бенонам, Артурам, Вілемам, Карлам і Антанінам Шафранкамі, з Фулуменай Шафранкавай (гэтая баба страшэнна раўла, калі ў шэсць гадзін раніцы па яе прыйшлі стражнікі). Двум Шафранкам, Міхалу і Багуславу, гэта каштавала пасады, бо па іх прыйшлі на працу і кіраўнік быў вельмі абураны.

Аднак усё гэта дробязь, абы толькі была адпаведным чынам выканана юрыдычная працэдура.

Сярод жыхароў горада Пльзеня пан Камейка, узброены адраснай кнігай, выявіў дваццаць Шафранкаў. У Клатаве знайшоў іх дзесяць.

У хуткім часе ўсе суды ў Чэхаславакіі толькі і займаліся справай Шафранкаў. У Младзе-Баляславе былі разгледжаны чатыры, у Коліне восем, у Горжыцах адна.

«У Высокай Мыце няма ніводнага Шафранка!» — гаварыў пан Камейка. А аднойчы, прыйшоўшы дамоў, пераможна абвясціў жонцы: «У Будапешце ёсць восем Шафранкаў!»

Правесці допыт ён даручыў мясцовым судовым органам і паўтараў: «Я ўсіх чарцей падыму на ногі, пакуль не дабяруся да сутнасці».

За лета ў акруговым судзе было заведзена 629 новых папак, і спатрэбілася цэлая скрынка ў каталогу на літару «Ш».

Давялося набыць яшчэ адну шафу і павялічыць штат на адзінку сакратара.

Увосень ён пераключыўся на Маравію. Дзейнічаў з натхненнем.

— Мы не маем права дарэмна траціць ні хвіліны,— гаварыў ён сваім падначаленым.— Цяпер мы бяром курс на Брно, пасля на Аламоўц, і ўсё пойдзе як па масле. Адну за адной апрацуем мараўскія акругі, а пасля на чарзе Сілезія. Так, панове, з судовым апаратам можна рабіць грандыёзныя справы.

А тым часам у рэгістратуры на літару «Ш» з'явілася яшчэ 566 актаў. Следчым пачалі сніцца Шафранкі.

Аднаго дня пан Камейка сказаў пераможна:

— Сёння мы едзем у Вену. Папросім дапамогі ў паліцыі. Нельга траціць ні хвіліны. Трэба тэлеграфаваць ім, ці не жыве ў Вене які-небудзь Шафранак.

Знайшоўся-такі.

Венская паліцыя ахвотна накіравала ў гарадскі суд аднаго Шафранка, пасля яшчэ аднаго Шафранка і аднаго Шафрана. Выпадак выключны, бо ўсе яны былі паважанымі камерсантамі і бясконца здзіўляліся, за што іх ноччу арыштавалі і на другі дзень павезлі ў Прагу. Гэта было, вядома, абскарджана імі ў імперскай радзе.

Пан Камейка ззяў. «Усё ідзе як па масле,— хваліўся ён,— вы ўбачыце, што я ўсё-такі знайду спадчыннікаў Францішка Шафранка. Цяпер яшчэ толькі папросім дапамогі ў консульствах».

І зноў з'явіліся 172 новыя акты. Консульствы прынялі блізка да сэрца гэтую справу, і такім чынам пан Камейка за тры кварталы мог пахваліцца станоўчымі вынікамі.

У Германіі знайшлося трыста чатырнаццаць Шафранкаў, у Францыі — два, у Англіі — дзевяць, у Расіі — трынаццаць (выяўлены і адпраўлены ў Сібір), у Турцыі — толькі адзін Шафранак-бей, у Іспаніі — ніводнага, затое ў Амерыцы — восемдзесят. З Аўстраліі адказу не атрымалі, у Пекіне шукаць адмовіліся, з То-

кіо ветліва адказалі, што з такім прозвішчам у іх нікога няма.

— Панове,— сказаў радасна пан Камейка сваім падначаленым,— усё пачынае прасвятляцца. Убачыце, што і двух гадоў не пройдзе, як мы знойдзем спадчынніка, аднак нельга ўвесь гэты час забывацца пра справу. Трэба зноў звярнуцца ў некаторыя суды, высвятляць, шукаць без спачыну. Выдаткі пакуль склалі толькі адзінаццаць тысяч крон, гэта нішто ў параўнанні з важнасцю юрыдычнай працэдуры.

І высвятлялі, і шукалі, аж пакуль аднойчы не прыйшоў пан Камейка, святочна апрануты, у канцылярыю і не сказаў следчаму Шміту:

— Калі ласка, завядзіце на мяне пратакол па справе спадчыны Францішка Шафранка. Не смейцеся, калі ласка, я не здурнеў, панове. Будзьце ласкавы дапытаць мяне для фармальнасці. Ваша прозвішча? Адказваю: Ян Камейка. Ці былі вы якой раднёй нябожчыку Францішку Шафранку? Адказваю, панове: быў... Я бачу ваша ўзрушэнне. Так, панове, нарэшце мы дабраліся да сутнасці. Мая маці ў дзявоцтве насіла прозвішча Шафранкава. Толькі ўчора я, праглядаючы нашы сямейныя запісы, даведаўся пра гэта. У яе быў брат Францішак Шафранак, якому не пашанцавала ў жыцці, і ён пераехаў ва Унецічы. Брат быў шмат маладзейшы за яе, па прафесіі пячнік, ідэнтычны нябожчыку Францішку Шафранку, які пакінуў спадчыну. Я прэтэндую на гэтую спадчыну і прашу завесці на мяне пратакол!

Прайшло яшчэ пяць гадоў, пакуль выконваліся розныя фармальнасці, і нарэшце пан Камейка атрымаў спадчыну. У дзяржаўным банку яму выплацілі тыя сем гелераў, якія ён аддаў пазалаціць і аж да самай смерці насіў замест бірулькі да гадзінніка.

СУМНАЯ ГІСТОРЫЯ З КАТОМ

Аднойчы пан Густалес, спрачаючыся са сваім суседам Кржычкам, сказаў:

— Ваша партыя — дзіўная партыя. Як толькі якому-небудзь злодзею ўдаецца выкруціцца ад шыбеніцы, вы адразу выстаўляеце яго кандыдатам у дэпутаты ад вашае партыі.

Пан Кржычка на тое адказаў:

— Мы з вамі, пане Густалес, яшчэ сустрэнемся.

Пан Густалес меў апрача палітычнай празорлівасці вялікага чорнага ката, які заўсёды сядзеў на парозе яго крамкі. Усе ў наваколлі вельмі любілі і паважалі таго ката за яго выхаванасць і вясёлы нораў, бо гэта, як вядома, зарука здароўя. Нікому і ў галаву не прыходзіла, што самы злосны вораг гэтага далікатнага звярка жыве побач і што ён не хто іншы, як Кржычка, які пасля згаданай сваркі з панам Густалесам сказаў свайму васьмігадоваму сыну Ёсіпу:

— Пепічак, як толькі ўбачыш ты чорную пачвару таго дурня Густалеса, наступі на хвост.

Якое дзіця не выканала б такога даручэння?

Пепічак пайшоў, наступіў кату на хвост ды яшчэ аплявaў усяго. У аднае бабулі, што бачыла ўсё гэта, сэрца рвалася на кавалкі.

Потым Пепічак уцёк. Кот у першы момант не ведаў, што гэта значыць, але падумаўшы, зрабіў вывад, што хлапчук прычыніў яму боль, а калі пырскаў на яго з рота вадкасцю, было непрыемна. Да вечара кот пераканаўся канчаткова, што яго зняважылі, і вырашыў хлапчука асцерагацца.

За мужнасць Пепічак зарабіў у бацькі крэйцар, і яшчэ абяцаў бацька даць два крэйцары, калі будзе рабіць ён і далей гэтаксама, бо ў Густалесавым кату Кржычка бачыў усю варожую партыю, кот быў уласнасцю яго палітычнага праціўніка.

Такім чынам Пепічак наступіў на хвост не кату, а ўсёй варожай палітычнай партыі і наплявaў не на ката, а на ўсіх палітычных прыхільнікаў гэтай партыі, членам якой аказаўся і чорны кот.

Пепічак ішоў на палітычны бой вясёлы.

Кот сядзіць перад дзвярыма і нібыта дрэмле. Аднак на самай справе ён прытвараецца. За гэта ніхто не асмеліцца яго папракаць, бо ён не хадзіў у школу і не ведае, што прытварацца грэх...

Дык кот нявінна прытвараецца, і Пепічак наступае яму на хвост і плюе на галаву. Раптам кот ускоквае і ўпіваецца Пепічку ў нагу. Потым ён кідаецца Пепічку на галаву, дзіка мяўкае і вурчыць, кусае за вуха, саскоквае, урачыста задраўшы хвост, уцякае ад хлопчыка, які галосіць, спакойна садзіцца на парог крамкі і мурлыкае.

Калі Пепічак вярнуўся дахаты абадраны і акрываўлены, Кржычка закрычаў: «Нарэшце ты мне папаўся, пане Густалес!» — і павёў Пепічка ў паліцэйскі камісарыят, дзе паліцэйскі доктар, агледзеўшы яго, склаў пратакол і загадаў схапіць ката і аддаць на ветэрынарны агляд.

Два паліцэйскія выправіліся па ката і арыштавалі яго імем закону. Кот спрабаваў уцячы, фыркаў і драпаўся, таму паліцэйскія мусілі пасылаць па казённую скрынку і ў яе заперлі ката, які перад гэтым учыніў гвалт — укусіў аднаго паліцэйскага за палец. Апрача таго, фырканнем кот яўна зневажаў прадстаўнікоў улады, хоць і не ўдалося вызначыць, што іменна хацеў ён сказаць.

Прывезлі тады ката ў ветэрынарнае аддзяленне, і паліцэйскія падалі на яго рапарт:

«Калі мы па яго прыйшлі, ён фыркаў, драпаўся і кусаўся. Мы вымушаны былі заперці яго ў скрынку, бо ён шалёна супраціўляўся. Дый ён спрабаваў сарваць з нас рэвальверы...»

Пратакол быў падпісаны і пасланы дзяржаўнаму пракурору.

Пракуратура ўбачыла ў паводзінах Густалеса злачынства — недастатковую апеку жывёлы. Яго вінавацілі за тое, што кот не быў прывязаны на ланцуг і хадзіў без намордніка.

Было гэта ў час выбараў, калі жывёла можа лёгка заразіцца шаленствам.

І яшчэ, між Кржычкам, хлопчыкавым бацькам, і Густалесам, уладальнікам чорнага ката, які напаў на Кржычкавага сына, даўно ўжо былі нацягнутыя адносіны на палітычнай глебе. Пракуратура лічыць даказаным, што кот пана Густалеса зрабіў напад наўмысна, каб пакалечыць сына палітычнага праціўніка свайго гаспадара, і гэта яму ўдалося. Паколькі, паводле дзейнага ў Аўстрыйскай імперыі закона ад 8 студзеня 1801 года, катоў належыць залічаць да неразумных асоб, за якіх адказвае сваёю маёмасцю і сваім жыццём іх уладальнік, дык уся віна падае на Густалеса.

Тым часам у ветэрынарным аддзяленні быў даследаваны душэўны і цялесны стан ката, і пратаколы гэтага даследавання паступілі дзяржаўнаму пракурору. У дакументах гаварылася:

«Пан Францішак Густалес № 2145/65.
Даследаваны мае моцныя косці, добра ўкормлены, хварэе на запаленне надкосніцы, так што яго ўкусы могуць быць небяспечныя жыццю.
З гэтай прычыны пажадана, каб даследаваны быў знішчаны.

Д-р М. Кашпарак».

Дзяржаўная пракуратура паслала гэтую паперу на выкананне ў паліцэйскі камісарыят, дзе яна была зарэгістравана і падшыта да справы Густалеса.

Тым часам ката аддалі гаспадару. Але як жа здзівілася няшчасная Густалесава сям'я, калі ў пяць гадзін

раніцы чатыры паліцэйскія прыйшлі ў хату, арыштавалі бедалагу і павялі з сабою. На паліцэйскім участку ў пана Густалеса, не вельмі далікатна прыведзенага туды, строгі паліцэйскі прыстаў папытаўся:

— Вы Францішак Густалес?

— Я, шаноўны пане.

У аднаго маладзенькага паліцэйскага нагарнуліся на вочы слёзы.

— Дайце сюды справу Францішка Густалеса і не хныкайце.

Падалі яе.

— Выслухайце, Густалес, загад граданачальніка ад 15 чэрвеня 1911 года за №75289:

«Францішак Густалес, паводле ветэрынарнага заключэння за № 2145/65, падлягае неадкладнаму знішчэнню. Гэтае рашэнне, адпаведна § 5 закона аб эпідэміях жывёлы ад 12 лютага 1867 года, абскарджанню не падлягае.

Граданачальнік Ванічак».

— Як бачыце,— сказаў няшчаснаму чалавеку паліцэйскі прыстаў,— нічога змяніць нельга. Напішыце сваё завяшчанне і не хвалюйцеся. Загад будзе выкананы, як толькі прыйдзе з Вены пацвярджэнне і распараджэнне, якім спосабам рабіць умярцвенне.

Хацеў бы я ведаць, як пан Густалес з таго выблытаўся.

ДАРАГАЯ МАЯ СЯБРОЎКА ЮЛЬЧА

I

Далібог, я не ведаю істоты больш прывабнай, чым сабакагаловы павіян! Таму мяне надта дзівяць і леапарды, якія чамусьці яго баяцца, і нябожчык Брэм, які

ўзвёў на яго паклёп, назваўшы страшыдлам. Праўда, пры першай сустрэчы ён сапраўды можа здацца вам нейкім звярugам з апакаліпсісу ці з малюнкаў спірытаў. Але калі да яго прывыкнуць, то заўважаеш, што ў гэтага д'ябла даволі ласкавы характар і што страшыдла з сабакагаловага павіяна зрабілі толькі тыя, хто яго не разумее.

І няхай мне таксама будзе дазволена як чалавеку, што займаецца заалогіяй, адзначыць, што сабакагаловы павіян — гэта адзіная малпа, поўсць якой не смярдзіць. За гады сваёй практычнай дзейнасці гандляра жывёламі я быў вымушаны цярпець мноства папрокаў ад сваіх кліентаў з-за агіднага паху малпаў розных парод.

Менавіта таму я магу словамі майго служкі Чыжака сказаць:

— Дазвольце, шаноўныя, рэкамендаваць вам сабакагаловага павіяна!

II

Гэтага сабакагаловага павіяна звалі Юльча. І была Юльча прыгажуня незвычайная... З прадаўгаватым носам, серабрыста-бурай поўсцю, ад якой патыхала мускусам, з карымі вачамі і маленькім інтэлігентным хвосцікам, такім кароткім, што можна было спадзявацца на поўную страту гэтага прыдатка прадаўжальнікамі Юльчынага роду. Да нас Юльча трапіла дзякуючы дзіўнаму збегу акалічнасцей. Нейкі дрэсіроўшчык малпаў купіў яе ў Штэлінгене пад Гамбургам у Хагенбека. Дрэсіроўшчык трымаў цэлы малпавы пансіён. Юльча атрымала грунтоўнае выхаванне. За два гады яна навучылася сама нацягваць на сябе нейкі зашмальцаваны балёвы туалет з даўгім шлейфам і цірольскі касцюм з пяром на капелюшы. Яшчэ яе навучылі катацца на маленькім веласіпедзе па крузе, есці нажом і відэль-

цам, піць з бутэлькі. У гэтым жа пансіёне яе навучылі даволі трапна плявацца чарэшневымі костачкамі ў мішэнь. Адным словам, паненка Юля рабіла поспехі ва ўсіх навуках, і можна было спадзявацца, што яна адвучыцца лавіць блох пры людзях, чухацца ззаду, а таксама шукаць уяўных вошай у галаве ў свайго настаўніка і ўсіх наўкола.

Нарэшце самаахвярны настаўнік вырашыў паказаць сваю вучаніцу ў пражскім вар'етэ. Перад гэтым, дзеля рэкламы, ён хацеў адрэкамендаваць яе ў рэдакцыях штодзённых газет. Аднак калі Юльча ўжо ў першай рэдакцыі з'ела важны артыкул, які павінен быў пайсці ў вячэрні выпуск, а галоўнага рэдактара абліла чарнілам, давялося ад такога намеру адмовіцца. У рэдакцыі ж пасля гэтага візіту зразумелі, што выкінуць за дзверы дрэсіроўшчыка малпаў куды лягчэй, чым сабакагаловага павіяна. Юльчын настаўнік даўно ўжо быў у калідоры, у той час як Юльча ўсё яшчэ знаходзілася ў рэдакцыі. Яна сядзела на шафе з кнігамі і, праглядаючы геаграфічны атлас, які ўзяла са стала, са смакам выдзірала адзін ліст за другім. Галоўны рэдактар з двума рэпарцёрамі замкнуліся ў тэлефоннай будцы і раіліся, што ім рабіць з гэтым д'яблам на метр з лішкам росту і са страшэннымі сківіцамі. А д'ябал між тым сарваў унутраны тэлефон і выкідваў праз акно розныя рукапісы са стала галоўнага рэдактара. Потым Юльча з годнасцю адчыніла дзверы ў калідор і, абняўшы свайго настаўніка за шыю, спусцілася з ім у аўтамабіль, на якім яны прыехалі.

З таго часу пан Гардзі не хадзіў па пражскіх рэдакцыях і са страхам чакаў, як пройдзе выступленне Юльчы ў вар'етэ. Атрымалася не бліскуча. Вывеўшы яе ў цірольскім касцюме на сцэну, пан Гардзі пакланіўся (добра выхаваная Юльча паўтарыла), а потым звярнуўся да публікі з кароткай прамовай, у якой назваў Юльчу восьмым цудам свету. Спачатку Юльча была без-

уважная да ўсяго навакольнага, потым зірнула ўніз, у аркестр, і знікла сярод музыкантаў. Але з аркестра яна неўзабаве вынырнула і з'явілася паміж пярэднімі столікамі ў зале ўжо са скрыпкай у руках, уселася на стол перад нейкім пажылым панам, які з перапалоху пачаў разглядаць яе ў тэатральны бінокль. Падумаўшы, што гэта ўваходзіць у праграму выступлення, публіка пачала апладзіраваць. Задаволеная першым поспехам, Юльча стукнула паважнага пана скрыпкай па галаве і забрала яго бінокль. Потым пачала скакаць са стала на стол, разадрала на адной пані блузку, запусціла біноклем у обер-кельнера і ўскараскалася на балкон, адкуль узялася шпурляць у партэр капелюшы. Гледачоў ахапіла паніка.

Дарэмна пан Гардзі гучным голасам упрошваў са сцэны, каб яны не баяліся, бо гэта вельмі добрая рахманая малпа і што праз хвіліну ён публіку за ўсё ўзнагародзіць: пакажа ціхамірнага дрэсіраванага тыгра. Зала пусцела з неверагоднай хуткасцю. Урэшце наверх, на балкон, узлезлі капельдынеры і пасля працяглай напружанай барацьбы звязалі Юльчу. Пры гэтым аднаго з іх яна сваімі моцнымі зубамі пакусала так, што яго ў карэце «хуткай дапамогі» завезлі ў бальніцу. І калі ўсё было прыведзена ў парадак і паліцыя адцясніла ад нас натоўп, які бурліва патрабаваў вярнуць грошы за білеты, пан Гардзі, не трацячы часу на лішнія разважанні, палічыў мэтазгодным пратэлефанаваць мне.

— Алё, мне стала вядома, што вы ахвотна купляеце розных дзіўных жывёлін. Вельмі хвалю! Лічыце мяне сваім лепшым сябрам, які ні ў якім выпадку не хоча вас ашукаць. Вы калі-небудзь бачылі малпу, якая выцірае сабе нос насоўкаю?

Я адказаў, што бачыў, бо аднойчы мне самому ўдалося навучыць гэтаму самца з пароды малпаў рэзус. Той нават увесь час насіў насоўку пры сабе, у зашчоч-

ных мяшках. Калі яму трэба было выцерці нос, ён проста вымаў насоўку з рота, смаркаўся, а потым спакойна засоўваў яе назад у рот. Я прадаў яго адной баранесе, у якой з-за гэтай дзівоснай малпы пачаўся катар страўніка.

— Алё,— працягваў пан Гардзі,— я пачынаю якраз з таго, чым вы закончылі дрэсіроўку. Вы бачылі малпу, якая есць нажом і відэльцам?

— Бачыў, пан імпрэсарыо. У нас нават быў такі развіты магон бясхвосты, што гэтыя нажы проста глытаў. Мы паслалі яго на анатаміраванне і атрымалі назад поўны набор на шэсць персон.

— Алё,-- пачуўся ў трубцы другі голас (гэта быў ужо дырэктар усёй фірмы),— алё, давайце бліжэй да справы! Гаворка ідзе пра вельмі рахманы экземпляр сабакагаловага павіяна. Ведаеце, гэта тая самая Юльча, той цуд, які быў на афішах. Яна катаецца на веласіпедзе, п'е з бутэлькі, апранае балёвы ўбор са шлейфам, цірольскі касцюм і ведае шмат іншых антрэ і смешных трукаў. Мы вам яе саступім з усім яе дабром за дзвесце крон. Нам вельмі не хочацца з ёй расставацца, але Юльча не прывыкла да публікі. Зрэшты, праз хвілінудругую мы ў вас...

Яны далі адбой проста мне ў вуха і праз чвэрць гадзіны прывезлі Юльчу на аўтамабілі, звязаную вяроўкай, нібыта злодзея. Пасялілі мы яе ў кухні на ніжнім паверсе, дзе гатавалася страва дваццаці сабакам і тулілася некалькі шчанят. Тыя са страху забіліся ў кут і, жаласна павіскваючы, пачалі чакаць, што будзе далей.

Мы сышліся з панамі ў цане. Яны аддалі Юльчу за сто шэсцьдзесят крон, бясплатна пакінулі ў прыдачу яе туалеты і падазрона хутка са мной развіталіся. Пасля іх ад'езду я паклікаў свайго слугу Чыжака і распарадзіўся развязаць сабакагаловага павіяна. Чыжак упаў перада мной на калені і забажыўся, што ў яго на

руках старэнькая маці (гэта была няпраўда, бо ён ужо даволі даўно ўцёк з дому). Убачыўшы, што гэты нумар не пройдзе, Чыжак запатрабаваў авансам у лік свайго жалавання пяць крон, тлумачачы гэта тым, што перад такім сур'ёзным і небяспечным прадпрыемствам варта падсілкавацца. Задаволіўся ён, аднак, і дзвюма, атрымаўшы якія адразу ж пайшоў набірацца адвагі.

Вярнуўся Чыжак праз тры гадзіны. Я бачыў, як ён адчыніў брамку і, прайшоўшы праз двор, схаваўся ў доме. Нейкі час унізе быў чуцен шум, потым усё сціхла. Я праверыў, ці заплацілі мы за Чыжака страхоўку ад няшчасных выпадкаў, і, пераканаўшыся, што заплацілі, усё ж такі занепакоены, спусціўся ўніз і асцярожна расчыніў дзверы ў кухню.

Па ўсім было відаць, што Чыжак сваю справу зрабіў. У слабым святле газоўкі, якая вісела на сцяне, перада мною паўстала кранальная карцінка. Паспеўшы развязаць Юльчу, Чыжак цяпер пластом ляжаў на ложку, і адвага, якой ён набіраўся за дзве кроны, узяла над ім верх. Юльча, якая, напэўна, вырашыла, што, развязваючы, яе зноў вучаць нечаму новаму, вяроўкай, ад якой яе аслабанілі, звязвала Чыжака «казлом». Небарака Чыжак ляжаў на ложку як мех і спаў. Юльча перанесла і паскладала наўкол яго ўсіх шчанят, якіх знайшла, і цяпер шукала ў Чыжака ў галаве. Шчаняты разважліва памоўквалі — чакалі, калі дойдзе чарга і да іх. Вось пры якіх абставінах Юльча пазнаёмілася са мной... Я развязаў Чыжака, малпа мне дапамагала; потым яна ўзяла мяне за руку і нізашто не адпускала, таму я хочаш не хочаш мусіў завесці яе наверх. Там я ёй даў яблык і хлеба. З таго часу, калі б я ўмеў рабіць усё тое, што рабіла яна, Юльча не пакідала б мяне ні на хвіліну. Але я не ўмею скакаць з дрэва на дрэва, адтуль на карніз, а з карніза на дах. Акрамя таго, я заўважыў, што яна крыўдуе на мяне за тое, што я не ўмею гайдацца на падвешанай люстры.

На гэтую люстру Юльча ўскочыла ў самы першы вечар, калі з'явілася ў нас, і безвынікова спрабавала мяне спакусіць скочыць услед за ёй. Праўда, люстра ўсё роўна не ўтрымала б нас: яна сарвалася ўжо ад цяжару аднаго сабакагаловага павіяна. Вялікая люстра зляцела ўніз, газавая лямпа выбухнула полымем, успалыхнула мэбля, за ёй фіранкі і падлога. Пакуль я выклікаў па тэлефоне пажарных, Юльча ўцякла праз акно і, усеўшыся на дрэве насупраць, углядалася ў языкі полымя, што вырываліся вонкі.

Калі прыехалі пажарныя, Чыжака ім давялося з дому вынесці, таму што ён спакойненька сабе спаў. З-за Юльчы выратавальныя работы было весці цяжкавата, бо яна падбегла да пажарнай помпы і стала папераменна гушкацца на абодвух яе плячах. Тыя, хто гэта бачыў, даводзілі, што Юльча дапамагала тушыць агонь. Вельмі сумняваюся. Пазней, калі яна аднаго разу ўначы зрабіла прагулянку на Мальвазінкі і ў каплічцы на могілках гушкалася на званe, яны з такім жа поспехам маглі сцвярджаць, што Юльча пайшла званіць па тым трамвайным важатым, якога яна перад гэтым спаткала на вуліцы і ў якога сарвала шапку, ад чаго гэтага добрага чалавека схапіў паралюш. І ўсё-такі гэта было вельмі мілае стварэнне... Той раз, каб я не злаваўся, яна прынесла мне з могільніка жалезную шыльдачку з надпісам: «Тут спачывае мой любы муж. Чакай мяне!»

Калі пажар патушылі, я пайшоў з Чыжакам і Юльчай у адзіны адратаваны ад агню пакой на першым паверсе. Юльча разважна ўселася на кушэтцы і пачала павольна рваць на шматкі чыюсьці камізэльку, якую яна недзе прыхапіла ў паніцы. Камізэлька была не наша, таму мы Юльчу не чапалі.

Чыжак таксама моўчкі спакойна сядзеў за сталом, пазіраючы на Юльчу. І раптам ён прамовіў з упэўненасцю ў голасе:

— Не, сто шэсцьдзесят крон за яе зусім не многа. Я нават сказаў бы, што гэта вельмі танна.

Я даў яму па карку.

Так мы ўсе трое — я, Чыжак і Юльча з чужой камізэлькай — моўчкі прасядзелі да адзінаццаці гадзін ночы, думаючы кожны пра сваё.

Пасля адзінаццаці мы ўзялі Юльчу за рукі і завялі ў сад, у вялікую клетку, якая засталася ад страуса — яго, бедалагу, неяк уначы загрызлі пацукі. Калі мы ўжо хацелі яе замкнуць, Юльча ўсунула руку ў рот і, выцягнуўшы адтуль сталёвы кішэнны гадзіннік, падала яго мне.

Мы, нягледзячы на гэты хабар, замкнулі Юльчу, і я, падаўшы гадзіннік Чыжаку, спытаўся:

— Што вы на гэта скажаце?

— Проста дзіва! — адказаў той.— Я нізашто не змог бы так доўга трымаць гадзіннік у роце.

Гаспадар гадзінніка так і не знайшоўся, і я насіў яго яшчэ да пазалеташняга года. Гадзіннік ішоў надта дакладна і быў з боем.

З гэтага я зрабіў вывад, што ён належаў нейкаму заможнаму чалавеку, які прыйшоў паглядзець, як прыгожа гарыць наша хата.

Мала-памалу Юльча прывыкла на новым месцы. Вось толькі незалюбіла нашу эканомку Фані. Відаць, з той прычыны, што ў Фані было больш убораў, чым у яе. У нябогі Юльчы і напраўду была ўсяго адна спадніца, хоць і са шлейфам! Усё ж страшэнная беднасць... І вось аднойчы, падняўшыся наверх, Юльча адчыніла дзверы ў пакойчык паненкі Фані і абгледзела адзін з яе туалетаў. Гэта быў прыгожы новы ўбор, перакінуты праз спінку крэсла. Спярша Юльчы болей спадабалася блузка, чым спадніца. Яна нацягнула блузку на сябе, але паколькі тая вісела на ёй мяшком, паспрабавала надзець яе наадварот. Потым прасунула галаву

ў рукаў, якому давялося «раздацца», каб абноўка сядзела на малпе як след. Але палова блузкі валачылася ў яе за плячом. Тады Юльча паспрабавала зняць блузку і нацягнула другую распаласаваную частку рукава на ногі, а рэшту хітрадумна абгарнула вакол галавы, як турбан. Але і гэта ёй не спадабалася, як сцвярджаў Чыжак, які з цікаўнасцю назіраў гэтую сцэну праз акно. Галоўнае, што яго нібыта цікавіла — ці разарве Юльча і новую Фаніну спадніцу.

Чыжак прыйшоў на кухню і паведаміў пра гэта эканомцы гранічна коратка і пераканаўча:

— Паненка, паненка, яна ўжо...

— Што ўжо?

— Яна ўжо тое...

— Што тое?...

— Ды Юльча ў вашай новай сукенцы. Паўгадзіны важдалася, пакуль нацягнула. Вунь яна на псярню ідзе!

Я з'явіўся якраз у момант, калі Юльча з ганарыстым выглядам прайшла на нашу сабакарню паказацца ў новым уборы тузіну яе цікаўных насельнікаў. Яна разгульвала вакол клетак з нейкай дубінкай у руцэ. Сабакі выказвалі сваю радасць ажыўленым брэхам. Дзіва што, такое прыгожае і забаўнае відовішча! З Фанінай спадніцы Юльча зрабіла нешта накшталт тогі, велічна перакінутай цераз плячо. З другога пляча, быццам частка гусарскага менціка, звісаў перад блузкі з бліскучымі гузікамі. Палова блузкі ўтварала акуратны турбан, а ўся апранаха ў цэлым нагадвала рызы патрыярха, які пралез праз комін.

Выкрыкваючы страшэнныя праклёны, Фані рынулася за прыгажуняй патрыярхам.

Адстаўны кіраўнік багадзельні прысягаў, што ніколі ў жыцці не бачыў, каб з жанчыны была спушчана спадніца з такой хуткасцю, як на гэты раз! Бедная мадэмуазель Фані... Кінуўшыся ратаваць няшчасныя

рэшткі сваёй новай сукенкі, яна, да таго, страціла яшчэ фартух і спадніцу. На шчасце, на ёй былі дыхтоўныя споднія штаны, якія Фані ўласнымі рукамі пашыла з веласіпедных панталонаў часоў сваёй маладосці. З фартухом і спадніцай у руках Юльча спакойна пераскочыла цераз плот, перайшла вуліцу і падалася ў Кламаўскі парк. Дадому малпа і на гэты раз вярнулася позняй ноччу, але на ёй ужо нічога не было.

Толькі на Белагорскай шашы ў бок Выпіху на тэлеграфным дроце яшчэ доўга вісела чорная спадніца нашай Фані. Як паніклы баявы сцяг. А сама мадэмуазель яшчэ ў той жа дзень пайшла ад нас, пакінуўшы кароткае пісямко, у якім, не ўмеючы выказаць сваіх думак, напісала, што яе «цнатлівасць была публічна пахіснута».

III

Іншы раз, апрача радасці, мая сяброўка Юльча прыносіла мне і горкія хвіліны, таму што не магла зразумець, чаго я, уласна кажучы, ад яе патрабую. Часта, седзячы ў садзе, я прасіў яе прынесці з дому які-небудзь прадмет, а яна не разумела, як ён выглядае. Успамінаючы цяпер гэтыя даўнія падзеі, я прыходжу да пераканання, што быў недастаткова паслядоўны. Нягледзячы на сваю інтэлігентнасць, некаторыя паняцці Юльча засвойвала ўсё ж не адразу. Прызнаюся, гэта была сур'ёзная загана ў яе выхаванні. Часам адбываліся рэчы непапраўныя. Спадзяюся, аднак, што калі ў мае рукі зноў трапіць такі ж чароўны экземпляр сабакагаловага павіяна, я пастараюся, каб мы абодва паводзілі сябе разумней. Справа, бачыце, у тым, што аднойчы ў нядзелю папаўдні нас наведалі цыркавыя артысты, якія шукалі якога-небудзь надта незвычайнага звяругу.

Адразу яны вялі гутарку ў дварэ з Чыжакам, які

даў поўную волю сваёй фантазіі і прапанаваў ім напачатку нейкую вялікую, добрага нораву змяю, якую мы нібыта перадалі на выхаванне аднаму селяніну паблізу Прагі, каб яна не захварэла на сабачую чуму. Падкрэсліваю, было гэта ў нядзелю пасля абеду, калі Чыжак на дварэ пад дрэвамі меланхалічна паражніў чарговую бутэльку са свайго звычайнага паўтузіна піва.

— Ляж! — час ад часу гарлапаніў ён у бок псярні, дзе сабакі ўсіх пародаў брахалі на дачнікаў, якія цягнуліся ў пыле Белагорскай шашы. Сабакі, аднак, брахалі яшчэ мацней і агрызаліся да таго часу, пакуль Чыжак не пакідаў іх у спакоі.

Але ў гэты дзень бутэлек аказалася больш за шэсць, таму Чыжак у прысутнасці артыстаў пусціўся ў рамантыку. Я чуў, як ад няшчаснай добрай змяі з сабачай чумой ён перайшоў да аднагорбага вярблюда, якога мы адправілі ў адну сям'ю пад Пльзенем.

Артыст, што быў старэйшы, у знак згоды ківаў галавой, тады як маладзейшы безупынна паўтараў:

— Гэтага не можа быць! Я заяўляю, што гэтага не можа быць!

Але Чыжак не пераставаў распісваць нашы багацці, так што пад канец я адчуў сябе нейкай нязведанай часткай сушы, дзе пасяліліся ў велізарнай колькасці жывёліны ўсіх пародаў і відаў.

— Шаноўныя,— чуў я голас Чыжака,— у нас ёсць адзін каратканогі кенгуру меншы і адзін кудлаты, большы. І як здорава яны абодва плаваюць! А той, маладзейшы, яшчэ надта добра настаўляе вушы. Мы іх трымаем у адным запаведніку, і калі паны пажадаюць, мы ім вышлем паштоўку, у колькі абыдзецца гэтая парачка.

— Гэтага не можа быць! Я сцвярджаю, што гэтага не можа быць! — паўтараў маладзейшы пан, бадай, ужо машынальна.

— Ну, а што ў вас ёсць тут, на месцы? — спытаўся нарэшце пажылы.— Сабак мы ўжо бачылі, але яны нічога не вартыя, бо...

І тут ён абрынуў на нашу псярню знішчальную крытыку. Па-першае, яму не падабаўся свежапафарбаваны арлекінскі дог. А гаварыў жа я Чыжаку, каб ён, аздобіўшы яго тулава прыгожымі плямамі, абавязкова папырскаў сабаку сікатывам. Але Чыжак забыўся. Ранкам дог недзе трапіў пад вадасцёкавую трубу і пачаў ліняць.

У сваю чаргу маладзейшаму не спадабаўся вялізны барбос — адзін з тых, якіх мяснікі запрагаюць у драбінкі, каб развозіць тавар. Чыжак сцвярджаў, што гэта адзіны экземпляр мастыфа ва ўсёй Еўропе. Сабаку — каб зрабіць уражанне — прывязалі трыма таўшчэзнымі ланцугамі, бо мастыфы — самыя страшныя з усіх сабак і ў Чэхію да гэтага часу завезены не былі (такім чынам, абсалютна ўсё роўна, што паказваць кліентам). Малады артыст абураўся, што паказаны яму мастыф ужо зводдаля працягваў лапу і радасна віляў хвастом.

Крытыка была бязлітасная, у дадатак старэйшы, увесь час перабіваючы маладзейшага, бясконца бурчаў:

— Ну, панове, што вы нам яшчэ пакажаце?

Было відно, што, напружваючы да крайнасці іх цікаўнасць, Чыжак гне надзвычай хітрамудрую лінію.

— Яшчэ ў нас ёсць галубы,— спакойна працягваў Чыжак.

— Што-о?! — пагражальна закрычалі абодва.

І тут Чыжак урачыстым тонам абвясціў:

— Дазвольце вам, шаноўныя, рэкамендаваць сабакагаловага павіяна. Абодва яны ў садзе... Павіян і пан шэф!

Так дзякуючы Юльчы я пазнаёміўся з братамі Шнайдэр, артыстамі, што выступалі шмат у якіх цыр-

ках. У маладзейшага была вучоная свіння, якая карміла яго тры гады запар. Потым ён не меў ангажэменту, свінню з'еў і зрабіўся непаражальным факірам. Але аднойчы ён усё-такі ўмудрыўся сябе параніць, амплуа факіра закінуў і цяпер разам са старэйшым братам выступаў клоунам. Пан Шнайдэр-малодшы павёў гаворку пра тое, што ім патрэбна якая-небудзь жывёліна, якая б іх дапаўняла.

Між тым Чыжак вярнуўся з двара, дзе ў нас быў хлеў. У той дзень Юльча ў пакаранне сядзела пад замком, бо ёй нейкім чынам удалося дарвацца да раяля і разабраць яго. Праўда, не да канца, але затое з хуткасцю шмат большай, чымся гэта ўдалося б адмысловаму майстру настройшчыку.

Юльча, гэтая добрая душа, прыхапіла з сабой чорныя і белыя клавішы, і ў раялі ўтварыліся надта прыемныя прагалы. Асабіста я быў ёй за гэта ўдзячны, бо двойчы на тыдзень да нас хадзіла займацца дачушка нашага бухгалтара. Але сам бухгалтар хаваў у раялі бутэльку кантушоўкі, якую Юльча, выкарыстаўшы выпадак, не прамінула выпіць. Таму мадэмуазель Юльчу давялося прыперці на замок, каб, раз'ярыўшыся, яна яшчэ чаго-небудзь не натварыла.

Пакутлівы выгляд майго служкі, калі ён вярнуўся з хлевушка, не выклікаў асаблівай радасці. Чыжак адвёў мяне ўбок.

— Пан шэф,— амаль заплакаў ён,— напэўна, нічога не выйдзе. Насмакталася наша малпачка малачка... ад шалёнай кароўкі.

Я сказаў, каб ён прытрымаў свае дурныя каламбуры пры сабе, і хутчэй перайшоў да справы.

— Ідзіце, паспрабуйце з ёй дамовіцца,— гаварыў Чыжак з адчаем у голасе,— нізашто не хоча апранацца! Спачатку я на яе надзеў сукенку са шлейфам, але яна наверх захацела яшчэ нацягнуць свой ціролькі касцюмчык. Тады я сказаў, што калі ёй так хочацца

паказацца панам у цірольскім касцюме, то, калі ласка, чаму б і не, але спачатку я здыму з яе балёвую сукенку. Яна паслухалася, а калі на ёй ужо быў цірольскі касцюм, зноў захацела надзець свой жаночы туалет. Тады я ўзяў і распрануў яе зусім. Вось я прынёс. Хоць пакажам гэтым панам, як хораша яна апранаецца...

— Але гэта яшчэ не ўсё,— працягваў Чыжак журботна.— Тады я вырашыў — няхай паны хоць убачаць, як яна ўмее ездзіць на веласіпедзе. Прынеслі веласіпед, а Юльча на яго ўселася, выехала за вароты, махнула на другі бок і з'ехала.

— З'ехала, і ўсё,— дадаў ён прыгнечана,— і яны нізашто нам цяпер не паверацъ, што ў нас увогуле ёсць такая шэльма.

Вядома, яны нам не паверылі. Дарэмна Чыжак паказваў Юльчыну балёвую сукенку, цірольскі касцюмчык і бутэльку, з якой яна п'е.

Маладзейшы трымаў сябе са страшэнным нахабствам.

— Пад гэта мы вам ніякага задатку не дадзім! — скандаліў ён.— Вярблюд у вас недзе ў Пльзені, кенгуру ў запаведніку, а цяпер яшчэ ў дадатак да ўсяго раптам уцякае на веласіпедзе сабакагаловы павіян! І якраз тады, калі вы павінны яго нам паказаць... Вельмі дзіўны збег акалічнасцей, шаноўны!

А старэйшы ўвесь час нешта бубніў пад нос наконт жульніцтва і пад канец іранічна ўсклікнуў:

— Паны нават паказваюць бутэльку, з якой п'е павіян... Але ж гэта самая звычайная бутэлька з-пад піва!

Яны пайшлі, самымі рэзкімі словамі выказваючы сваю думку пра несаліднасць нашай фірмы. У брамцы той, што маладзейшы, азірнуўся, спыніў зусім незнаёмага чалавека і сказаў, паказваючы на мяне:

— У гэтага пана ўцёк на веласіпедзе сабакагаловы павіян!

Юльчу я дарэмна чакаў да позняй ночы. Раніцай я пачуў з хлява голас Чыжака:

— Вярнулася ўсё-такі! Куды ж ты дзела веласіпед? Не, ты мне толькі скажы, куды ты дзела веласіпед?

Юльча не прызнавалася.

IV

Седзячы на лаўцы каля хаты, я праводзіў з Чыжакам дзелавую нараду. Мой памочнік даваў справаздачу за тыдзень, падводзіў падрахунак розных няшчасных выпадкаў, якія замест лаўровага вянка вянчалі дзейнасць нашай фірмы.

— Калі ў панядзелак уцёк той паганы бульдог,— прыгадваў Чыжак,— я адразу падумаў: нічога сабе, здорава тыдзень пачынаецца!

— Праз яго, Чыжак, у нас былі вялікія непрыемнасці?

— Вядома, пан шэф. Я, калі пайшоў яго лавіць, ужо тады ведаў, што нешта здарыцца. Але ж не мог я падумаць, што прывяду чужога сабаку. У таго ж бульдога галава была ну акурат як у нашага. І злы быў страшэнна, калі я цягнуў яго ад крамы, дзе ён чакаў сваю гаспадыню. А ў газетах нават паведамленне далі, што мы крадзём сабак. Праўда, ён — пан камісар на ўчастку — гаварыў мне, што за такую памылку ўсё роўна трэба даць па носе, але толькі я хацеў бы бачыць, як ён адрозніць бульдога ад бульдога, калі не адрозніў вінаватага ад невінаватага.

Чыжак даволі практычна выцер рукавом слязу і нос адначасова.

— Я заўсёды гавару, пан шэф, калі ў панядзелак уцячэ хоць адзін сабака, то потым увесь тыдзень будуць прападаць адзін за адным. Як тады, адразу пасля гэтага, у аўторак, калматы пінчар таго інжынера. Памятаеце, ён яго да нас прывёў, каб за дзесятку ад-

вучыць кусацца. Я яму адразу сказаў, што ён нават за дваццатку не адвучыцца людзей хапаць, лепей бы яго пакінуў дома. Але ж вы, пан шэф, такі добры, чаго толькі не зробіце, каб фірма мела рэкламу! А пінчар тут жа ў аўторак змыўся. Я думаў, ён пайшоў дадому, і пазваніў пану інжынеру, што яго Боек ужо тэпае дамоў. Сёння субота, а сабака яшчэ не вярнуўся. Мы яшчэ з ім не абярэмся клопату, пан шэф, я не хачу мець з гэтым нічога агульнага; ранкам званіў пан інжынер, што, маўляў, думае, што мы яго сабаку прадалі, як сыны Іакава прадалі Іосіфа. У сераду прыйшлося закапаць палову ангорскага ката, якога зжэрлі віверы. Я ж вам гаварыў, давайце пасадзім гэтых вівер у жалезныя скрыні, а то яны прагрызуць скрыню і дабяруцца да ангорскага ката. Што яны хочуць мяса, а не толькі салатавага ліcця. Бо ў іх крыважэрнасць у вачах напісана. Калі я засоўваў ім у скрыню салату, яны зыркалі на мяне са свайго логава, аж страх браў. А такія ж малюпасенькія звярочкі. Так бы і з'еў іх за адзін раз штук пяць...

— Вы іх з'елі?

— Толькі трох, пан шэф, тых, якіх я прыстукнуў проста на каце. Астатнія чатыры ўцяклі. Мы з кучарам згатавалі іх з цыбуляй. Мяса ў іх беленькае, толькі крышку аддае дзічынай — таму, пэўна, што так дзіка накінуліся на ката. У чацвер мы ўдала прадалі парачку дэкаратыўных фазанаў. У самца не хапала некалькі пярынак у хвасце, іх выдрала такса. Я мог бы вырваць некалькі пёрак з хваста ў паўліна і прышыць іх фазану, ды ўспомніў пра вас, пан шэф,— што ж вы скажаце, калі ў суботу вернецеся дадому і ўбачыце паўліна — такога «прыгожага». І потым, я думаю, гэта была б проста несалідная здзелка. У пятніцу мы прадалі аднаго рускага харта, а адзін уцёк. Пан бухгалтар сказаў, што ў такім выпадку адно на адно выйдзе.

Значыцца, гэткі быў вынік за тыдзень маёй адсутнасці. Я ад'язджаў у Дрэздэн з намерам купіць там што-небудзь вартае з заапарка, які ліквідавалі. Мне прапанавалі за восемсот марак старога, кульгавага, аблезлага льва. Нават калі б загадаў яго абабіць новай скурай, кульгавым ён застаўся б усё роўна. Праўда, у яго было слаўнае мінулае: дзесяць гадоў назад ён расшкуматаў у адным цырку сваю ўтаймавальніцу. Але чаго ён варты цяпер? На што здатны? Хто яго сёння купіць? І ўсё ж я ў Дрэздэне сёе-тое купіў. Фараонаву мыш! Гэты звярок шмат меншы за льва. Мыш змясцілася пад паліто, і на граніцы мне не давялося плаціць пошліны. Апрача таго, з ёй мне далі ў вагоне асобнае купэ. Фараонава мыш, бачыце, вельмі няшчасная жывёлінка. Брэм залічыў яе да тхаровых драпежнікаў, а яны, як вядома, пахнуць не вельмі прыемна. Што ж ёй, бедалажцы, загадаеце рабіць?

— Паслухайце, Чыжак,— сказаў я свайму адданаму слузе,— растлумачце мне, калі ласка, чаму гэта Юльча, калі я паказаў ёй фараонаву мыш, спачатку нешта прабурчала, а праз хвіліну з'явілася з залатым пенснэ на носе? Праўда, вы гаварылі, што, пакуль мяне не было, Юльча нічога не натварыла, але ўсё ж баюся, што гэтае пенснэ азначае нешта нядобрае.

— Толькі майце ласку не палохацца,— адказаў Чыжак,— пенснэ не належыць нікому з персаналу. Гэта ў нас была баранеса Дабржэнская, прыязджала зрабіць заказ на шэсць паляўнічых сабак. А нас ёй рэкамендавала княгіня Каларэда-Мансфельд. Але калі баранеса прыехала, адразу прыбегла Юльча, ускочыла ёй на спіну і зняла з носа пенснэ. А калі мы вярнулі баранесу да прытомнасці, яна паехала і заказ забрала назад. Дзіўная баба, грэбавала пасля малпы надзець пенснэ на нос! А па мне, дык нічога страшнага не здарылася.

Чыжак зноў зарабіў у каршэнь.

V

Здараліся дні, калі Чыжак упадаў у задуменнасць. Такое заглыбленне ў сябе, як правіла, прадвяшчала вялікія падзеі. Калі ж у дадатак да гэтага ў яго абуджалася прага ведаў, то гэта немінуча прадказвала няшчасце.

Аднойчы, калі я вяртаўся дамоў, ён стаяў каля варот і, агорнуты глыбокай задуменнасцю, спытаўся ў мяне, якая гэта ёсць на вадакачцы машына, каб запампаваць ваду на такую вышыню, як стаіць наш дом. Я растумачыў яму фізічны закон сазлучаных сасудаў.

— Добра,— сказаў Чыжак,— я ўжо зразумеў: гэта вялікі напор. А ці нельга што-небудзь прыдумаць, каб спыніць ваду?

— Як гэта? — спытаўся я.

— Ды так, пан шэф. Я, разумееце, думаю, не пашкодзіла б вынайсці што-небудзь такое, каб аўтаматычна перакрываць водаправод... Калі здарыцца якое няшчасце — нехта адкруціць кран і ваду нельга спыніць. А то вельмі непрыемна, калі вада затопіць увесь дом.

Я папрасіў, каб ён хутчэй сказаў, чаму яго цікавяць такія дзіўныя рэчы.

— Не думайце, пан шэф,— гаварыў Чыжак меланхалічна,— што мне гэта ўзбрыло ў галаву проста так, ні з таго ні з сяго. Што гэта было б вельмі практычнае вынаходства, я падумаў, калі ўбачыў, як Юльча круціць водаправодны кран у калідоры на другім паверсе. Я, вядома, здагадваўся, што сілачка ў яе ёсць, але што яна адкруціць яго так хутка, нават не падумаў. Я лічыў, ёй давядзецца паваждацца даўжэй, а на самай справе не паспеў я схадзіць па кучара, каб ён таксама прыйшоў паглядзець, як Юльча ўжо адкруціла кран і ўселася на даху, на мастку каля коміна. Вы, пан шэф, ніколі ў жыцці не сказалі б, што водаправод нельга

ўтаймаваць! А як ляціць вада па лесвіцы — проста вадаспад. Унізе ў кухні лавачка паплыла. А вялікая лаўка і стол — яны цяжкія, яшчэ трымаюцца. Хоць прайшло ўжо болей за гадзіну. Кучар гаварыў, што напэўна праваліцца столь. Таму мы перабраліся ў бяспечнае месца.

Чыжак тужліва паказаў на свой чамадан каля агароджы.

Я ўстанавіў, што Чыжак усё маляваў у надта змрочных фарбах. Столь сапраўды прамокла, але непасрэдная небяспека не пагражала. У кухні столь абурылася тады, калі будаўнічая камісія пайшла ўжо — яна запэўніла нас, што ўсё ў поўным парадку. У маім пакоі столь увогуле не абвалілася; праўда, яе давялося падперці некалькімі драўлянымі слупамі. У вячэрнім поцемку гэта выглядала асабліва ветла, нібы каланада ў невялікім грэчаскім храме.

Вось толькі мэбля расклеілася, і гэта дало мне магчымасць бавіць доўгія зімовыя вечары: з расклеенага пісьмовага стала, камоды і адзежнай шафы я майстраваў зусім новы абсталюнак...

Аднак, прызнаюся, з некаторай асцярогай я ўсё ж сачыў, ці не з'явіцца зноў на твары Чыжака задуменны выраз.

Прыкладна праз месяц пасля таго, як ён перастаў загаворваць са мною пра аўтаматычную засаўку для водаправода на выпадак, калі хто адкруціць кран, я пайшоў зірнуць, ці прывёў Чыжак у парадак аднаго пудзеля, якога трэба было пастрыгчы нагала, таму што яго апанавалі блохі... Чыжак гэта вечна адкладваў, баяўся, што ўсе блохі ў часе стрыжкі пераскокнуць на яго. Дарэмна я яму ўбіваў у галаву, што блохі абавязкова паздыхаюць, калі ён пудзеля спачатку як след выкупае. Чыжак спрачаўся з усімі, што яны зноў ажывуць. Ён прыдумляў самыя фантастычныя падрабязнасці. Я нават чуў, як ён бажыўся кухарцы, што бачыў

шчупака, на якім, калі яго выцягнулі з вады, былі мільёны блох.

Нарэшце ён усё ж рашыўся пастрыгчы пудзеля на дварэ, калі дзьмуў страшэнны вецер. Чыжак тлумачыў гэта тым, што блохі — насякомыя вельмі лёгкія і вецер іх пазносіць.

Калі я падышоў да месца, адкуль чуваць быў голас Чыжака: «Не прасіся, усё роўна не дапаможа!» — на яго твары я зноў убачыў ужо знаёмы мне выраз падазронай задуменнасці. Погляд яго быў яшчэ больш сумны, чым у пудзеля, які выглядаў так, нібы толькі што вылузнуўся з уласнай скуры.

— Я думаў, скончу, пакуль вы вернецеся,— сказаў Чыжак.— Ну і справы зноў, пан шэф...

Чыжак глыбока ўздыхуў.

— Мне вось якраз прыйшло ў галаву: ці не было б лепей, калі б у малпы былі толькі дзве рукі? Чатыры рукі — гэта для малпы занадта,— вымавіў ён з меланхоліяй у голасе.— Я, вядома, і гаворкі пра гэта не павёў бы. Але толькі калі заднія рукі Юльчы паб'юцца з-за рэвальвера з пярэднімі, дык тут і да бяды недалёка. Рэвальвер жа ваш, пан шэф, але яна з ім ужо бог ведае дзе. Вельмі добры быў рэвальвер.

Я супакоіў яго, што рэвальвер быў зараджаны аднымі халастымі.

— Усё гэта цудоўна, пан шэф, але, апрача рэвальвера, яна выцягнула ў вас з тумбачкі жменю баявых патронаў і таксама засунула сабе ў кішэню.

— Што вы кажаце, Чыжак!

— Цяпер ужо нічога не папішаш, пан шэф. Яна і расфранцілася дзеля гэтага выпадку. Цэлыя паўдня была такая ласкавая і надзела ціпольскі касцюмчык. А недзе з паўгадзіны назад раптам пачала шнырыць і насіцца па доме. Заўважыў я ў акне вашага пакоя яе зялёны капялюш з пёркам, іду туды і бачу, як Юльча адчыняе тумбачку каля вашага ложка. Не паспеў

я ачомацца, як яна ўжо засоўвае ў кішэню сваіх штаноў патроны і ідзе на мяне з рэвальверам. Што мне было рабіць? Падае мне руку, я, значыцца, руку паціснуў і паляпаў яе па спіне, каб яна мне нічога не зрабіла. Юльча выбралася ў сад, пералезла цераз агароджу на вуліцу і скокнула на сцяну Кламаўскага парку. Там, напэўна, і будзе гуляць і пастрэльваць. Пакуль што яшчэ ні разу не выстраліла. Але, па-мойму, калі ўсе халастыя выпаліць, абавязкова зарадзіць баявымі. А ўжо тады нешта здарыцца,— прарочыў ён.

Між тым змерклася. Становішча было непрыемнае, а мне не прыходзіла ў галаву нічога, апрача таго што ў павіяна няма дазволу насіць зброю, а калі ён яшчэ пачне паляваць на вартаўніка ў парку, то тым больш не абярэцца непрыемнасці, бо паляўнічага білета ў яго таксама няма (абодва дакументы ляжалі каля рэвальвера ў тумбачцы).

— Майце ласку не трывожыцца, пан шэф,— сказаў Чыжак, калі я падзяліўся з ім сваімі страхамі,— дазвол і паляўнічы білет яна засунула за шчаку.

Увесь вечар Чыжак прасядзеў у мяне ў пакоі. Мы абодва маўчалі. Ужо позна ўначы мне здалося, што Чыжак пра нешта моцна думае. Перш чым я паспеў спытацца, пра што ён думае, пачуўся яго перакананы голас:

— На вашым месцы, пан шэф, я лепей бы выехаў з Прагі.

Я выправіў яго спаць і сам лёг таксама. Мне снілася, што недзе страляюць. Але гэта быў усяго толькі Чыжак, які будзіў мяне стукам у дзверы.

— Што такое, Чыжак?

— Юльча ўжо дома. Залезла ў хлеў і сядзіць там перапалоханая. Рэвальвер я знайшоў у яе ў кішэні штаноў, калі распранаў яе. У яе яшчэ цяпер валасы ад страху стаяць тарчма. На галаве і на ўсім целе. Як вожык. А ў рэвальверы не хапае аднаго патрона.

Я пайшоў паглядзець на яе. У Юльчы і сапраўды быў такі выгляд, як апісваў Чыжак. Яна скурчылася ў кутку на саломе, і калі я падышоў да яе, падала мне руку і вымавіла нешта невыразнае, як быццам «бу».

— Напэўна, яна хоча сказаць «бах»,— даў філалагічны разбор Чыжак.

Наступным днём у газетах з'явілася: «Загадкавы разбойны напад з замахам на забойства ў Кошыржах». Доўгая справаздача, над якой рэпарцёры аддзела здарэнняў папрацавалі з не абы-якой руплівасцю, даўшы ёй і іншыя назвы, накшталт: «Замах на забойства з рабункам», была асабліва цікавая падрабязнасцямі. Гаворка ішла пра лядашчага ўладальніка тытунёвай крамкі, які жыў на першым паверсе дома № 249 у Кошыржах на вуліцы «Пад Цыбулкай». Ён нёс дадому дзённую выручку за тытунёвыя тавары. Зацепіўшы ў сваім сціплым жытле печку, стары запаліў лямпу і расчыніў акно, каб праветрыць, як раптам, якраз у той момант, калі ён хацеў падкінуць у печку вугалю, нейкі чалавек ускочыў на падаконнік і выстраліў у яго.

У гэтым месцы звесткі разыходзіліся, бо добрыя пяцьдзесят працэнтаў штодзённых газет сцвярджалі, што замах на дзядулю быў зроблены ў момант, калі ён хацеў выкруціць кнот у газавай лямпе. Так ці інакш, але ўсе журналісты былі аднадушныя ў думцы, што налёт быў прадуманы і што рабаўнік выбраў час, калі астатнія жыхары дома пайшлі ў кіно. «Аднак, выстраліўшы, злачынца спалохаўся крыку сваёй ахвяры і, відаць, баючыся, што шум, выкліканы разбоем — раз акно было адчынена,— могуць пачуць прахожыя, адмовіўся ад свайго намеру і ўцёк. Пацярпелы ўладальнік тытунёвай крамкі ў суправаджэнні дворніка неадкладна накіраваўся ў паліцэйскі ўчастак, дзе належным чынам апісаў злачынцу. Налётчык быў няголены, моцнага складу цела і невялікага росту. Апрануты ў цірольскі касцюм, на галаве зялёны капялюш з пяром.

Гэта апісанне,— выказвалі спадзяванне газеты,— відаць, дапаможа ў бліжэйшы час схапіць гэтага маральна разбэшчанага суб'екта, калі толькі злачынца, разумеючы, вядома, што ў сваім нацыянальным касцюме ён занадта кідаецца ў вочы, не раздабудзе сабе іншага адзення. Сапраўды, час ужо прыняць на гарадской перыферыі больш дзейсныя меры для аховы бяспекі жыхароў!»

Адна газета, адзначу мімаходзь, скарыстаўшы выпадак, паставіла пытанне, чаму да гэтага часу не выбрукавана дарога, якая вядзе ад Кошыржскага трамвайнага парка да хатак «Пад Цыбулкай». А таксама чаму спілавалі дрэвы ў кюветах паабапал Іноніцкай шашы.

Назаўтра ў выпусках штодзённых газет, якія выходзілі пасля абеду, з'явілася наступнае паведамленне. Злачынца, які зрабіў разбойны напад у Кошыржах, схоплены.

У Празе на Дзяржаўным вакзале паліцыі ўдалося затрымаць злачынцу, які зрабіў разбойны напад у Кошыржах. Арыштаваны, імя і прозвішча Рамуальд Егерле, родам з Бальцана ў Ціролі. Хоць ён і зацята ўпіраецца, але апісанне, якое даў пацярпелы ўладальнік тытунёвай крамкі, цалкам да яго падыходзіць. Пры Егерле выяўлена невялікая сума грошай і цытра. Затрыманы сведчыць, што прыехаў у Прагу сёння раніцай праездам у Літамержыцы, дзе яго прынялі на працу ў адным начным кафэ ў якасці цытрыста. Характэрна, што ён не можа прыгадаць, у якім начным кафэ ў Літамержыцах павінен атрымаць месца. Паколькі рэвальвера пры Егерле знойдзена не было, паліцыя мяркуе, што ён яго кінуў у час уцёкаў. Рамуальд Егерле адпраўлены ў камеру папярэдняга зняволення пры крымінальным судзе ў Празе. На вочнай стаўцы з пацярпелым уладальнікам тытунёвай крамкі апошні адразу пазнаў злачынцу.

У той жа дзень вячэрнія газеты паведамілі:

Егерле, які нібыта зрабіў разбойны напад у Кошыржах, выпушчаны на волю.

Рамуальд Егерле, які падазраваўся ў тым, што ён учыніў разбойны напад у Кошыржах, давёў сваё алібі і выпушчаны на волю. У той час, калі быў зроблены напад на ўладальніка тытунёвай крамкі, ён у поездзе паміж Лінцам і Будэёвіцамі граў кандуктарам на цытры. Паліцыя зноў расследуе справу.

З таго часу мы таксама адрэкамендоўвалі Юльчу кліентам як Рамуальда Егерле.

ШКОЛА ДЛЯ СЫШЧЫКАЎ

У пачатку вайны ў Пражскае паліцэйскае ўпраўленне прыйшло распараджэнне з Вены. Згодна з ім агентаў тайнай паліцыі павінны былі ва ўсіх падрабязнасцях пазнаёміць з палітычнымі справамі, каб сышчыкам лягчэй удавалася заблытваць грамадзян у сеткі правакацыйных заклікаў. Бо ў палітычных справах пражскія сышчыкі нічагенькі не цямілі. Сышчык Завескі не ведаў, напрыклад, колькі ў Чэхіі палітычных партый, сышчык Браўн не мог адрозніць нацыянал-сацыяліста ад нацыянал-дэмакрата і дасюль лічыць, што нацыянал-сацыяліст Трнобранскі — сацыял-дэмакрат, і, калі арыштоўваў яго, дык усё гразіўся дарогаю, што паліцыя пакажа гэтым сацыял-дэмакратам па чым фунт ліха. Сышчык Фабера не мог улавіць розніцы паміж анархістам і аграрыем. Калі арыштаваў дабрадушнага анархіста Каху з Жыжкава, дык сказаў яму: «Мы вас, аграрыяў, правучым!» У сышчыка Шточаса ніяк не ўкладваўся ў галаве сэнс слова «рэ-

скрыпт». Чуў нешта ў паліцыі, быццам гэтая штука вельмі небяспечная — «рэскрыптная прамова», «рэскрыптная нарада». І вось аднойчы яго паслалі да такога аматара рэскрыптаў, дык ён прынёс у паліцыю белую паперку з нейкімі загадкавымі лічбамі: «Resorcini 0,5 g., Aqua destillata 300 g. Dr. Somojed». Няшчасны сышчык забыў слова «рэскрыпт» і ў кватэры палітычна падазронага грамадзяніна настойліва патрабаваў:

— Імем закону дайце сюды гэты рэцэпт.

Пры нябожчыку Кршыкаве не вельмі глядзелі, каб укласці ў галаву сышчыкам, якое значэнне мела бітва пры Белай гары. А гэта было вельмі важна, бо з-за тае гары час ад часу трапляла пад суд многа людзей. Пачнецца з Белай гары, а скончыцца ў краявым крымінальным судзе ў Празе. Прасцей простага.

Неяк здарылася, што сышчыка Когута паслалі ў Бржэўнава на лістападаўскія зборышчы, каб там, пасля сходу ў Грамадзянскай Бяседзе, ён сяго-таго падбіў на размову пра Белую гару і прыцягнуў у турму (для гэтага ён атрымліваў па дзве кроны на піва). Вярнуўся ён з пустымі рукамі і ў рапарце напісаў, што калі ён у гасцініцы запытаўся ў аднаго наведвальніка, які здаўся яму найбольш падазроным, што ён думае пра Белую гару, дык той адказаў, што ад Бржэўнава да яе хады тры чвэрці гадзіны, а з Мотала намнога бліжэй.

Сышчыкі тады не мелі ніякай палітычнай асветы, шмат разоў было, што яны хапалі людзей быццам бы за вялікія злачынствы, хоць такімі і не пахла. Браўн, напрыклад, данёс на нашага швейцара, што ў дзень 50-гадовага юбілею царавання Франца-Іосіфа ён у кавярні «Палата на Морані» падазрона разважаў пра Эдысона і бітву пры Ватэрлоо і гэтым выдаў сябе як чалавека палітычна ненадзейнага. Калі пазней ён, Браўн, звярнуў увагу на незвычайны дзень, швейцар

яму адказаў: «Дазвольце, але як вы, наёмны салдат, можаце думаць, што фанограф вынайшаў імператар Франц-Іосіф, калі яго вынайшаў Эдысон, пра гэта вы маглі ўчора прачытаць у «Палітычцы».

Сышчык Фабера аднойчы настукаў на мяне, быццам я, выказваючыся ў адным вінным скляпку пра ўплыў вуглякіслага газу на піва, якое падаецца ў буфеце Венскага парламента, між іншым ляпнуў, што ў Вене павінны зразумець: пакуль не будуць усюды ў Аўстрыі ўжываць бомбы [1] з вуглякіслым газам, людзі не змогуць паспытаць добрага піва.

Ужо на гэтых невялічкіх прыкладах відаць, які вэрхал панаваў у галовах пражскіх паліцэйскіх: сацыял-дэмакраты, вуглякіслы газ, бомбы, рэцэпты, рэскрыпты, Белая гара, Франц-Іосіф, Эдысон, анархісты, бітва пры Ватэрлоо і аграрыі. Вось чаму і вынікі іх вынюхвання былі проста мізэрныя. Праўда, такімі палітычнымі даносамі ўдавалася наскрэбці які месяц турмы з двума поснымі днямі, але колькі ўсё гэта каштавала намаганняў! Следчым органам было важна, каб чалавек, якога схапілі за падазроныя выказванні, не змог выкруціцца, і гэта часта ўдавалася, бо кожны невінаваты, калі бралі ў абарот, паводзіў сябе нервова, пры перакрыжаваным допыце ўрэшце блытаўся і міжволі выдаваў сябе.

Ворагу не пажадаеш такое працы!

У пачатку вайны адбылася поўная рэарганізацыя і ў паліцыі. Агентаў патрэбна было добра вышкаліць, каб яны ў чэшскіх палітычных пытаннях адчувалі сябе як рыба ў вадзе і маглі падсоўваць насельніцтву дасканала апрацаваны матэрыял, гэта значыць, каб кожны грамадзянін змог ухваліць тое, што яму плялі, расхістваючы асновы аўстрыйскай манархіі, каб следам

---

[1] Гульня слоў: у чэшскай мове «бомба» мае значэнне і шарападобнага балона для захавання газаў.

за гэтым можна было ўсклікнуць ад радасці, як той обер-камісар Хум: «Вось ты і ўліп, даражэнькі!»

Такая вось гісторыя ўзнікнення школы для сышчыкаў у Празе. Школа, аднак, не была вышэйшаю навучальнаю ўстановаю для вывучэння палітычных навук. Тут толькі распрацоўвалі розныя праблемы, як зваліць Аўстрыю, збіралі на гэты конт усе магчымыя ідэі, якія даўно драмалі ў сэрцах чэшскіх грамадзян.

Адзін з пакояў дэпартамента паліцыі адпусцілі пад чытанне лекцый. Напісалі і расклад заняткаў.

Ад 9 да 10 г. Чаму Аўстрыя павінна распасціся?

Ад 10 да 11 г. Якія можна прывесці довады за тое, каб чэшскія салдаты не ваявалі супраць сербаў і рускіх?

Ад 11 да 12 г. Як арганізоўваць тайныя таварыствы.

Ад 12 да 13 г. Самыя любімыя знявагі, якімі можна абзываць гасудара імператара і членаў царскага дома, і іншыя неасцярожныя выказванні.

Папоўдні займаліся яшчэ дзве гадзіны — з 2 да 4. Навука пра агульную правакацыю і практычныя заняткі па прыкладным вызначэнні тэрмінаў пакарання ад 2 да 15 гадоў.

Гэта выдатная праграма заняткаў стала яшчэ больш прывабнаю, калі слухачам адшкадавалі на пісьмовыя прылады па 50 крон.

Для самых тупіц былі арганізаваны вячэрнія курсы. Усё было адладжана бліскуча, усё прадумана.

Агенты паліцыі рыхтавалі ўрокі дома, у вольны час, па канспектах лекцый.

У доме сышчыка Браўна адразу ўзняўся пярэпалах. Пані Браўнава ўся ў слязах хадзіла да сваіх знаёмых і сябровак і скардзілася:

— Гэта ж падумаць толькі... Звар'яцеў мой Браўн, няйначай. Цэлы вечар зубрыць па нейкай паперцы, а

тады і пачынае выступаць: «Такім чынам, панове, зараз, пасля трохсот гадоў, наступае рашучая хвіліна, і мы мусім дзейнічаць. Аўстрыя наскрозь прагніла, дастаткова яе таўхануць, каб яна рассыпалася». Я яму кажу: «Паслухай, чалавеча, што ты там пляцеш? Калі гэта здарыцца, застанешся без хлеба». А ён як гыркне на мяне: «Гусь ты дурная, нічога не цяміш у нашай палітыцы, дык і носа не сунь». І зноў сноуе па пакоі, глядзіць у паперку і крычыць: «Ад Белай гары аж да сённяшняга дня мы маўчалі. Але цяпер не будзем. Я, панове, ні ў сербаў страляць не буду, ні ў рускіх! Вы гэтак жа думаеце? Тады давайце знаёміцца». А я хаджу ды плачу, дык ён лаецца: псую яму прамову. А нядаўна я так яму сказала: «Напрамілы бог прашу, перастань, бо пасадзяць». Дык ён зноў: ты, маўляў, нічога не разумееш, калі хочаш, дык думай, што сядзіш у тракціры, дзе вядуцца палітычныя размовы. І тут тако-ое пляснуў! Быццам наш найлітасцівейшы гасудар імператар з усёю сваёю сям'ёй даўно ці то дэгенераваў, ці то дэнатураваў. Я ўжо добра і не памятаю, як ён сказаў, а тады шэпча мне на вуха: «Створым якую-небудзь падпольную арганізацыю. Нас ужо шмат. Збяромся заўтра тут, і я вам раскажу, як трэба ў паветра цягнікі пускаць. Вы ж прыйдзеце, праўда? Дазвольце тады адрэкамендавацца...» Вось так і пакутую я са сваім дурнем ужо цэлы тыдзень. Я вельмі прашу вас, мілая пані, каб вы хоць нідзе не гаварылі, што наш пан імператар дэнатураваў. Вельмі ж мне майго хлопчыка Эмілека шкода. Не вучыць урокаў, а разявіць рот і ўсё на татачку глядзіць, як той сноўдаецца па пакоі і ўсё тлумачыць штосьці камодзе ў кутку пра пакаранні на Старамесцкай плошчы.

Эмілек і праўда не зводзіў вачэй са свайго таткі. І чым больш вылупляў вочы, тым больш падабаліся бацькавы прамовы. Гэта быў старанны хлопчык, вучань першага класа гімназіі.

Як сынок сышчыка Эмілек належаў у гімназіі да вышэйшых колаў грамадства, а прадстаўнікі яго заўсёды сядзелі на партах з краю. Ціхманы, ён ніколі не ўдзельнічаў у спрэчках сваіх таварышаў, якія пагарджалі ім, падколвалі шпількамі і абзывалі гноем.

Натуральна, што вайна абвастрыла ўсякія дыскусіі за партамі. Але Эмілек і цяпер стараўся адмоўчвацца, хоць сыны тых, каго прызвалі на вайну, хваліліся адзін аднаму, як бацькі перад ад'ездам з дому абяцалі сям'і, што, як толькі змогуць, адразу перабягуць на другі бок.

Аднойчы аўстрыйцы недзе каля Дравы ўзялі ў палон трыццаць сербаў. Імператарская канцылярыя па друку зрабіла з мухі слана: раструбіла пра вялікую перамогу на сербскім фронце, пра ўзяцце войскамі Дравы. Дырэктар гімназіі Кох, які і так абрыд усім сваімі прааўстрыйскімі настроямі, перабраў усе класы, усюды горача выказваўся перад вучнямі. Кожную прамову канчаў словамі: «Няхай жыве гасудар імператар!» Як было не радавацца такой падзеі: прагулялі цэлы ўрок.

Калі ён завітаў да першакласнікаў, то зноў выклаў усё, што да таго часу прамаўляў у іншых класах: якая магутная Аўстрыя! І як мы ўсе рады, што імператар аб'явіў вайну, якое шчасце, што ў нас такі слаўны кіраўнік. Пад канец сказаў, каб пракрычалі тры разы: «Слава Габсбургскаму роду! Слава Бацькаўшчыне! Слава імператару!»

Усе загарлапанілі, толькі Эміль Браўн, які стаяў каля самай кафедры, нават не растуліў сваіх прыгожанькіх бязгрэшных вуснаў, не далучыў свайго голасу да агульнага бязладнага рову.

Дырэктар падступіў да яго.

— Што — можа, табе зарвала, хлопча?

Эмілек адказаў, нявінна гледзячы ў вочы пану дырэктару:

— А мы не лічым гасудара імператара за свайго валадара. Мы, чэхі, ніколі нічога добрага не бачылі пад уладай Габсбургскага роду. Гэта гаворыць і чытае кожны вечар мой тата, а ён мусіць ведаць, бо служыць у паліцыі. А нядаўна ў нас была пані Фаберава і гаварыла маме, што ў паліцыі далі пану Фаберу паперку з прамоваю, што мы павінны наступіць аўстрыйскай змяі на горла. Мой тата такое таксама гаварыў нядаўна, а я павінен быў сядзець, як тыя выпівохі ў карчме, і паўтараць за ім, што аўстрыйская дынастыя — гэта зброд жулікаў.

Калі школьны вартаўнік з грознаю запіскаю ад пана дырэктара прывёў Эмілека дадому і сышчык Браўн пачуў урэшце пра сыночкаву здраду, ён засмяяўся неўласцівым яму смехам і выкрыкнуў:

— Наша сістэма сябе апраўдвае! Эміль Браўн, ад імя закону я вас арыштоўваю!

Не зважаючы на плач і лямант жонкі, ён скруціў сына і пацягнуў па вуліцы, прыгаворваючы ўсю дарогу:

— Мы вам, сацыялістам, пакажам!

Вось такія былі паліцэйскія агенты ў старой Аўстрыі. Усе гэтыя Бруты выйшлі са школы для сышчыкаў.

Запраторыўшы свайго сыночка, Браўн вярнуўся дадому і, дзіка вырачыўшы вочы, сказаў жонцы:

— Прызнавайся, што і ты верыш у дэгенераванне аўстрыйскай дынастыі!

Нябога кіўнула галавою.

— Ад імя закону я вас арыштоўваю, пані Браўнава,— узрадаваўся ён. Але паколькі яна была яго жонкаю, то завёз яе ў паліцэйскае ўпраўленне на дрожках.

Пад вечар адправіў з дому ў паліцыю і старую глухую цётку: змусіў яе пісьмова пацвердзіць, што яна з'яўляецца членам падпольнай арганізацыі, якая ўдзельнічала ў забойстве Фердынанда д'Эстэ ў Сараеве.

На другі дзень Браўн на выдатна здаў экзамены на атэстат сталасці ў школе для сышчыкаў.

Эмілек з-за таго, што быў яшчэ малады, зарабіў усяго тры гады зняволення. Для пані Браўнавай вышукалі сякую-такую палёгку і засудзілі на пяць гадоў. А глухую цётку ўпяклі на восем. Але ўсё гэта дробязь, калі параўнаць з 1200 гадамі турмы, якія прыпаяў высокаадукаваны ў палітыцы Браўн розным людзям з усіх раёнаў Прагі. І ўсяго за тры гады вайны.

ПРЫКЛАД З ЖЫЦЦЯ

Амерыканская гумарэска

— Ах, ніколі, малады чалавек,— сказаў пан Вільямс, банкір, маладому хлопцу, які сядзеў насупраць яго ў крэсле, выцягнуўшы ногі.— Ніколі, пан Гавейн, уважліва слухайце мяне і можа чаму-небудзь навучыцеся. Вы просіце рукі маёй дачкі Лоты. Гэта значыць, што вы хочаце быць маім зяцем. І ў выніку гэтага маеце інтэрас атрымаць грошы. Хвіліну назад на маё пытанне, ці ёсць у вас якія сродкі, вы адказалі, што вы бедны і маеце нейкіх там дзвесце долараў.

Пан Вільямс паклаў ногі на стол, за якім сядзеў на крэсле, і працягваў:

— Вы кажаце, што некалі я быў такім самым бедняком і не меў нават тых двухсот долараў. Я не пярэчу, але хачу вам паведаміць, што ў вашым узросце ў мяне была ўжо куды большая сума. І толькі таму, што я меў розум, якога не хапае вам. Я бачу, вы круціцеся ў крэсле, дык раю вам не хвалявацца і папярэджваю вас, што ў мяне ёсць надзейны слуга — негр. Выслухайце мяне ўважліва, і, можа, тое, што я раскажу, будзе вам добрым прыкладам.

Калі мне споўнілася шаснаццаць гадоў, я паехаў да свайго дзядзькі ў Небраску. «Каб мець грошы,— сказаў мне дзядзька,— я дазволіў лінчаванне негра на сваім участку». І негра лінчавалі на ўчастку майго дзядзькі, а калі хто хацеў прысутнічаць пры гэтым, павінен быў заплаціць даволі салідную суму, бо месца тое абгарадзілі высокім плотам. Плату збіраў я, і калі негра павесілі, я, забраўшы ўсе грошы, уцёк у той жа вечар. Павешаны негр прынёс мне шчасце. За выручаныя грошы я купіў сабе на поўначы штата ўчастак і абвясціў, што калі капаў, дык у адным месцы знайшоў золата. Участак вельмі выгадна прадаў, грошы паклаў у банк. Гэта нічога, што праз нейкі час мяне падстрэліў адзін ашуканы, бо тая куля з рэвальвера, якая перабіла косць на правай руцэ, прынесла мне амаль дзве тысячы долараў — кампенсацыю за раненне.

Як толькі паправіўся, скупіў усе акцыі рэлігійнай абшчыны на пабудову касцёлаў на тэрыторыі блаславёнай Індыяны. Мы прадавалі тады ганаровыя дыпломы па сто долараў і не пабудавалі ніводнага касцёла.

Абшчына была вымушана абвясціць банкруцтва. І абвясціла яго якраз праз тыдзень пасля таго, як іх акцыі я памяняў на касавыя ордэры за валовыя скуры, на якія якраз падскочылі цэны.

Купіў у крэдыт завод для апрацоўкі валовых скур, які прынёс мне вялікі прыбытак, бо пазней я прадаў яго за наяўныя, а купляў жа сам у доўг.

Паклаў грошы ў розныя банкі ў Канадзе, а сам абвясціў сябе банкрутам. Мяне арыштавалі, але на судзе я выступаў, як дзівак, так што судовыя дактары палічылі мяне за вар'ята і вызвалілі, арганізаваўшы сярод прысутных збор сродкаў, якіх мне хапіла на дарогу да Канады, дзе ляжалі мае грошы.

І бруклінскі багацей Гамельстан, з дачкой якога я адбыў у Сан-Францыска, мусіў даць пасаг, бо я ўвесь час пагражаў яму, што буду жыць з ёй у Сан-Францы-

ска датуль, пакуль не дам сенсацыйнай аб'явы ў газету, што яго дачка з'яўляецца маткай няшлюбнага дзіцяці.

Бачыце, пан Гавейн, які я быў, а вы ў вашым узросце дагэтуль яшчэ нічога такога не зрабілі, каб можна было меркаваць, што вы разумны чалавек.

Вы гаворыце, што выратавалі маю дачку, калі яна звалілася з лодкі ў мора. Гэта, вядома, цудоўна, але што гэта вам дало, акрамя таго, што вы, як кажаце, папсавалі свае новыя чаравікі. Вы гаворыце, што кахаеце маю дачку, але ж гэтага мала, каб я быў рад мець за зяця такога, як вы, у каго няма розуму ані.

Бачу, што вы зноў закруціліся ў крэсле, і прашу вас супакоіцца і адказаць на мае пытанні.

— Зрабілі вы хоць раз што-небудзь такое?

— Не.

— Вы багаты?

— Не.

— Просіце рукі маёй дачкі?

— Прашу.

— Мая дачка кахае вас?

— Кахае.

— І, нарэшце, маё апошняе пытанне: колькі ёсць у вас грошай пры сабе?

— Сорак шэсць долараў.

— Добра, я гаварыў з вамі цэлых паўгадзіны, вы атрымалі ад мяне парады па фінансавых пытаннях. За гэта з вас — трыццаць долараў. Долар за хвіліну.

— Дазвольце, пан Вільямс,— запратэставаў юнак.

— Ніякіх дазвольце,— сказаў з усмешкай пан Вільямс, паглядаючы на гадзіннік,— бо я атрымаю трыццаць адзін долар, як пройдзе яшчэ адна хвіліна.

І калі здзіўлены пан Гавейн заплаціў яму трыццаць долараў, пан Вільямс ветліва прапанаваў:

— А цяпер прашу пакінуць мой дом, не прымушайце мяне вас выганяць.

— А ваша дачка? — спытаўся юнак у дзвярах.

— Сваёй дачкі не аддам ніводнаму дурню,— спакойна адказаў пан Вільямс.— Пакіньце зараз жа мой дом, каб пасля не мець асалоды палічыць свае зубы.

— Добры быў бы ў мяне зяць! — сказаў пан Вільямс сваёй дачцэ, калі пан Гавейн пайшоў.— Гэты твой каханак страшэнна дурны і ніколі не паразумнее.

— Такім чынам,— адказала Лота,— няма ніякай надзеі, што ён будзе маім мужам?

— Пры такіх абставінах гэта немажліва,— вёў сваё пан Вільямс,— пакуль ён не дакажа, што на нешта здатны, можаш не спадзявацца.

І пан Вільямс расказаў сваёй дачцэ пра лінчаванне негра на ўчастку свайго дзядзькі, пра сваю гаворку з панам Гавейнам і дадаў:

— Я расказаў яму шмат павучальнага пра жыццё.

На другі дзень пан Вільямс паехаў па сваіх камерцыйных справах.

Калі ж ён праз тыдзень вярнуўся, дык на сваім пісьмовым стале знайшоў ліст:

«Глыбокапаважаны пан!

Шчыра дзякую Вам за параду, якую тыдзень назад Вы мне далі. Ваш прыклад натхніў мяне на подзвіг, і я ў Вашу адсутнасць ад'язджаю разам з Вашай дачкой у Канаду, забраўшы з Вашага сейфа ўсе Вашы грошы і каштоўныя паперы.

Ваш Гавейн».

А далей ішло:

«Мілы бацька!

Мы просім твайго бласлаўлення і адначасова паведамляем, што не маглі знайсці ключа ад сейфа, таму ўзарвалі яго нітрагліцэрынам.

Твая Лота».

КАРОТКІ ЗМЕСТ КРЫМІНАЛЬНАГА РАМАНА

«Джузэпе Бор прыязджае ў Трыест. У яго няма ні капейкі грошай, і ён выдае сябе за графа Аларыха з Айзенфельса. Размяшчаецца ў атэлі Бітарнэля, які мае прыгожую дачку Люцыю. Тая пакахала лжэграфа, але Джузэпе Бор у горадзе сустракаецца з мараком Лоранцам, які добра ведае ўсе таямніцы жыцця Бора. Ён ведае пра тое, што Бор у Рыме забіў спакусніка сваёй сястры, яшчэ трох яго памагатых. Джузэпе ахоплівае страх, і ён давярае таямніцу гаспадару атэля, з якім шчыра пасябраваў за кілішкам віна. Абодва яны вырашаюць атруціць Лоранца, запрасіўшы яго на чарку. Вось толькі з трупам што рабіць? Сваімі планамі яны дзеляцца з Люцыяй. Труп Лоранца яны завяжуць у мех, ноччу адцягнуць яго за горад у горы і скінуць у прорву. Ёсць у іх на воку такая прорва з вельмі крутым спускам. А калі раптам іх застане жандар? Люцыя будзе іх ахоўваць, і ў той момант, калі жандар саскочыць з каня, каб паглядзець, што там робіцца, Люцыя ўсадзіць яму ў сэрца кінжал. Трупы Лоранца і жандара яны кідаюць у прорву, але конь, застаўшыся без гаспадара, сваім іржаннем устрывожвае другога жандара, і зусім блізка пачуецца конскі тупат. Другога жандара Джузэпе Бор застрэліць з пісталета, і яны спакойна пойдуць у свой атэль. І ўсё, пан выдавец».

Малады чалавек, які сядзеў насупраць выдаўца крымінальных раманаў Томса, сумна пазіраў у вочы гэтаму добраму чалавеку, які ўсклікнуў:

— Гэта ўжо занадта, пан Крамскі, а што ж далей, дзе вы дзенеце той апошні труп? Вашы людзі не змогуць выйсці адтуль, бо стрэл з пісталета прыцягне ўвагу яшчэ аднаго жандарскага патруля, пачнецца смяротны бой, разумееце, малады чалавек? Астатнія ж не

ўмеюць валодаць зброяй. Страляеце ўначы, калі несяце труп, каб скінуць яго ў бездань, і ўжо забілі аднаго жандара. Гэта памылка, вялікая памылка, тут вы ўжо далі маху. Калі ваша Люцыя так добра ўпраўляецца з кінжалам, чаму б ёй і другога жандара не прышыць!

Пан Томс устаў і, абапіраючыся на стол у апусцелым кафэ, хвалюючыся, выкрыкнуў:

— Ну чаму, пытаюся ў вас яшчэ раз, і другога жандара не забіць кінжалам? Вы маглі б яму таксама ўсадзіць кінжал у сэрца, і ўсё было б скончана. Гэта, ведаеце, пане, не стасуецца з канонамі. Ну і моладзь пайшла! Я ведаў нябожчыка Хорвата, вось той умеў абыходзіцца з кінжалам! Як пачаў сваю справу ў 1900 годзе ў Германіі, дык дзейнічаў аж да 1905 года. Яго зброяй былі кінжал і атрута. Страляніна ўначы выклікае перапалох, і калі вы гэтак і далей будзеце працягваць, то што можа атрымацца, скажыце мне, калі ласка. Адны непрыемнасці. Як бацька, кажу вам, хлопец вы здольны, і думаецца мне, што яшчэ не ўсё страчана. Вы павінны выкарыстаць зручны момант і ўцякаць. Вы ж разумееце, што пасля ўсяго таго, што здарылася, вяртацца ў горад нельга. Вы павінны знайсці другую дарогу. Перш за ўсё трэба пачаць рабаваць. Вы забіваеце жанчын і дзяцей, а тую Люцыю вы вызваляеце з-пад арышту, трэба, і гэта галоўнае, выйсці на дарогу, па якой яе будуць весці, і забіць канвойнага. Я параіў бы вам ужыць гумавую палку, а ніякі не пісталет, таму што стрэл можа каго-небудзь напалохаць.

— Запэўніваю вас, больш страляць я не буду,— адказаў малады чалавек.— Дзякую вам за параду, скажыце, а ўжываць атруту можна? Якая атрута дзейнічае больш эфектыўна?

— Бачыце, я не такі вялікі спецыяліст у гэтай справе, як нябожчык Хорват. Кожная атрута пакідае свой след, які выяўляецца пры ўскрыцці. Як толькі

даходзіць да ўскрыцця, дактары тут жа знаходзяць стрыхнін. З атрутай будзьце асцярожны. Галоўным чынам атручваюць багатых сваякоў і робяць гэта спаквапя, так лепш удаецца. Каб вы не забываліся, калі заб'яце канвойнага і будзе ўжо ўсё ў парадку, тады трэба памятаць, што сучаснасць патрабуе яшчэ і абрабавання банкаў. Вартаўніка ўсыпляюць хлараформам альбо непрыкметна робяць укол курарэ. Цяжкія сейфы ўзрываюць дынамітам. А пасля можна пусціць у ход і пісталет. Тут вельмі да месца і рэвальвер і браўнінг. З імі таксама добра рабіць напад на цягнікі.

І ў розныя публічныя месцы, у тэатр, рэстаран, кафэ можна з'явіцца, а калі хто-небудзь будзе супраціўляцца і не захоча аддаць грошай, таго бязлітасна, як сабаку, застрэліце. Паўтараю, як сабаку, малады чалавек, а не ад любові да мастацтва!

Яны ўсталі і нечакана заўважылі, што вакол іх укленчылі, сціснуўшы рукі, госці, афіцыянт, хлопчык і гаспадар кафэ і з нямой пакорай просяць літасці.

СЯРОД БІБЛІЯФІЛАЎ

Нічога не ведаю страшнейшага, чым трапіць у рукі аматаркі літаратуры, што збірае ў сваім салоне бібліяфілаў і наладжвае літаратурныя сходкі, на якіх падаецца чай і на кожнага прыхільніка літаратуры прыпадае два малюсенькія бутэрброды.

Праўда, хадзіць на гэтыя літаратурныя сходкі да мадам Герзанавай я не меў ніякай патрэбы, але было крыху няёмка не прыняць запрашэння прыяцеля, якому я аднойчы зманіў, што быццам бы ў мяне ёсць арыгінальнае выданне вершаў Хафіза ў пераплёце з чалавечай скуры. Прыяцель абвясціў гэта бібліяфілам і аматарам літаратуры, а такой весткі было дастаткова:

іх мецэнатка мадам Герзанава выказала пажаданне, каб я ёй быў адрэкамендаваны.

У салоне я знайшоў дванаццаць адкрытых фізіяномій, з якіх на мяне пазірала нібыта ўся сусветная літаратура. Маё з'яўленне віталі ажыўлена, і я, чалавек, у якога ёсць вершы Хафіза ў пераплёце з чалавечай скуры, бадай, меў права на цэлых чатыры бутэрброды.

Таму я і ўзяў з падноса чатыры малюсенькія бутэрброды. Па гэтай прычыне нейкай дзяўчыне ў акулярах, якая сядзела побач са мной, не дасталося ніводнага. Яна так засмуцілася, што... пачала гаварыць пра кнігу Гётэ «Выбіральнае сваяцтва».

Гісторык літаратуры, які сядзеў насупраць, звярнуўся да мяне з пытаннем:

— Ці маеце вы гонар ведаць Гётэ?

— З галавы да ног! — адказаў я самым сур'ёзным чынам.— Ён носіць жоўтыя чаравікі на шнурках, а на галаве — карычневы фетравы капялюш. Ён наглядчык па прадуктовым падатку і жыве на Кармяліцкай вуліцы.

Бібліяфілы паглядзелі на мяне з сумным дакорам. Гаспадыня, каб прыхаваць збянтэжанасць кампаніі, спыталася:

— Вы вельмі цікавіцеся літаратурай?

— Дарагая гаспадыня,— пачаў я,— быў час, калі я чытаў надта многа. Я прачытаў «Трох мушкецёраў», «Баскервільскага сабаку» і іншыя раманы. Суседзі адкладвалі для мяне літаратурны дадатак да «Палітыкі», і потым я запар чытаў усе шэсць працягаў за тыдзень. Чытанне мяне вельмі захапляла. Напрыклад, я не мог дачакацца, ці выйдзе графіня Леонія за карліка Рыхарда, які дзеля яе стаў забойцам уласнага бацькі. А той перад гэтым застрэліў, прыраўнаваўшы, яе жаніха. Так, так, панове, кнігі робяць сапраўдныя цуды! Калі мне было зусім блага, я чытаў «Месінскага юна-

ка». У свае дзевятнаццаць гадоў ён стаў рабаўніком. Ларэнца — так яго звалі. О, як я тады чытаў! А цяпер чытаю мала. Мяне гэта болей не цікавіць.

Прыхільнікі літаратуры пабялелі, а цыбаты чалавек з дапытлівым позіркам спытаўся ў мяне сурова і лаканічна, нібыта судовы следчы:

— Заля вас цікавіць?

— Пра яго я ведаю вельмі мала,— сказаў я.— Адзінае, што я чуў,— ён загінуў у франка-прускай вайне пры асадзе Парыжа.

— А Мапасана вы ведаеце? — з нейкай дзіўнай настойлівасцю спытаўся зноў той чалавек.

— Чытаў яго «Сібірскія апавяданні».

— Вы памыляецеся! — усклікнула дзяўчына ў акулярах, якая сядзела побач са мной.— «Сібірскія апавяданні» напісалі Караленка і Серашэўскі. Мапасан жа француз!

— А я думаў, галандзец,— спакойна сказаў я.— А калі француз, то, можа, перакладзе гэтыя «Сібірскія апавяданні» на французскую.

— Ну, а Талстога вы ведаеце? — уставіла гаспадыня.

— Бачыў яго пахаванне ў кінематографе. Але такі хімік, як Талстой, заслужыў пахавання крышку лепшага.

На момант усе змоўклі. Гісторык літаратуры, які ўладкаваўся паблізу, паглядзеў на мяне налітымі крывёй вачыма і з'едліва спытаўся:

— Ну а чэшскую літаратуру вы, спадзяюся, ведаеце дасканала?

— У мяне ёсць «Кніга джунгляў». Думаю, вам дастаткова? — сказаў я шматзначна.

— Але ж ён англічанін, гэты Кіплінг,— падаў голас адзін маўклівы пан і абхапіў твар рукамі, нібыта збіраючыся плакаць.

— Пра Кіплінга я не казаў ні слова,— усклікнуў я

пакрыўджана.— Я гаварыў пра «Кнігу джунгляў» Тучака.

Тут я пачуў, як два паны, даволі гучна, каб мне было чуваць, прашапталі, што я — жывёліна.

Белы доўгавалосы юнак, скрыжаваўшы на грудзях рукі, мякка звярнуўся да мяне:

— Вы не разумееце прыгажосці літаратуры, вы, вядома, не можаце ацаніць ні стылю, ні вытанчанай канструкцыі фраз, вас нават не натхняюць вершы. Памятаеце ў Ліліенкрона тое месца, у якім за словамі адчуваецца, угадваецца краса прыроды: «Цягнуцца воблакі, лятуць сінія воблакі, лятуць і лятуць. Над гарамі, над далінамі, над поясам лясоў зялёных»?

Павысіўшы голас і абапіраючыся на плячо аматара літаратуры, які сядзеў поруч, юнак працягваў:

— А «Агонь» Д'Анунцыё? О, калі б вы чыталі гэтае цудоўнае, надзвычай дакладнае апісанне венецыянскага свята! І прытым гэты раман кахання...

Чакаючы майго адказу, ён кінуў погляд на газавы ражок і правёў рукой па лбе.

— Нешта я вас не вельмі зразумеў,— сказаў я.— Чаму, уласна, гэты Д'Анунцыё на нейкім святе ўчыніў пажар і колькі гадоў яму за гэта далі?

— Д'Анунцыё — выдатны італьянскі паэт,— нястомна тлумачыла мне дзяўчына ў акулярах.

— Дзіўна,— кінуў я.

— Ды што тут дзіўнага? — літаральна прароў пан, які не вымавіў да гэтага часу ні слова.— Вы хоць аднаго італьянскага паэта ведаеце?

Мой адказ прагучаў не без гонару:

— Ну, вядома. Рабінзон Круза.

Пасля гэтых слоў я азірнуўся па баках.

Дванаццаць аматараў літаратуры і бібліяфілаў пасівелі ў адзін момант, і дванаццаць дачасна пасівелых аматараў літаратуры і бібліяфілаў выкінулі мяне праз акно другога паверха...

ТАЙНА СПОВЕДЗІ

Балушка, гімназіст першага класа, быў хлопчыкам старанным і сумленным. Вось чаму ён яшчэ за дзень да споведзі каліграфічна запісаў усе свае грахі на лістку, які выдраў са сшытка па чэшскай мове ў суседа па парце. На наступны дзень у дзевяць гадзін, здаўшы пісьмовае заданне па арыфметыцы, ён дапісаў у пералік сваіх грахоў: «Спісваў заданне па арыфметыцы». Балушка быў хлопчыкам прыстойным, ён шчыра верыў у павучанні патэра аб тым, што ашукваць настаўнікаў — самы жахлівы грэх. Нават горш — ледзь не смяротны грэх.

— Таму што,— гаварыў ім на апошнім уроку выкладчык закону божага,— чым большы грэх, тым больш строгае і цяжкае пакаранне. Калі вы шчыра не пакаецеся ў сваіх грахах, то на Страшным судзе дарэмна будзеце енчыць; хто спісвае — пакайцеся, бо на долю вашу выпадуць адны няўцешныя слёзы і стогны.

За кожны грэх прызначаліся асобныя пакуты. Адна гадзіна ў пекле цяжэйшая за сто гадоў самых страшных пакут на зямлі. Аплачце свае грахі, не падказвайце, не спісвайце, не ашуквайце настаўнікаў сваіх, каб у Судны дзень быць сярод праведных.

— Я прашу вас, пан калега,— звярнуўся нядаўна да настаўніка закону божага выкладчык матэматыкі,— пагаварыце на бліжэйшым уроку з першакласнікамі, каб яны мяне не ашуквалі. Дадумаліся, арганізавалі калектыўнае спісванне, іх пісьмовыя работы або ўсе аднолькава добрыя, або ва ўсіх адны і тыя ж памылкі.

Настаўнік закону божага ахвотна пачаў унушаць першакласнікам, што ў Судны дзень паслухмянасць будзе каштаваць намнога вышэй за ўсе людскія хітрамудрасці. За падман даравання не будзе. Спісванне школь-

ных заданняў караецца на зямлі двойкаю і зніжэннем адзнакі за паводзіны, а на тым свеце — вечнымі пакутамі. Хто спісвае — няхай пакаецца і дасць зарок, што больш ніколі не будзе ашукваць.

Вось чаму пасля першай кантрольнай Балушка і ўнёс у спісак сваіх грахоў: «Спісваў заданне па арыфметыцы».

А ў дзесяць гадзін спісак папоўніўся яшчэ адным запісам: «З'яўляюся членам тайнага таварыства «Чортаў капыт». Калі ўжо спавядацца, дык спавядацца, выкласці ўсё і ачысціць сваю душу. А пасля пакаяння можна зноў грашыць, зноў быць членам гэтага страшнага тайнага таварыства, якое прыносіць яму столькі ўсякае выгады.

Таварыства і сапраўды было страшнае. «Мафія» нішто ў параўнанні з «Чортавым капытом». Жудасныя тайныя арганізацыі Кітая далёка ўступаюць «Чортаваму капыту», бо «Чортаў капыт» — таварыства першакласнікаў па ашукванню настаўнікаў.

Лепшыя вучні класа былі яго членамі, нават любімчыкі настаўнікаў, тыя, што насілі пісьмовыя работы выкладчыкам на дом. Адзін у аднаго спісвалі, адзін аднаму падказвалі, а калі неслі сшыткі настаўнікам, бралі з сабою чарніліцу і ручку і дзе-небудзь у пад'ездах папраўлялі памылкі ў работах.

«Чортаў капыт» раскідваў свае страшныя таемныя сеткі на ўроках латыні, чэшскай мовы, гісторыі, прыродазнаўства, матэматыкі.

Членам таварыства быў нават сын настаўніка лацінскай мовы, ён тайком сціраў у бацькавым журнале крыжыкі і іншыя непатрэбныя значкі супраць імёнаў сваіх аднакласнікаў.

Перад споведдзю, у дзесяць гадзін раніцы, у час перапынку на двары сабраліся ўсе члены таварыства, і старшыня яго Каганак, сын настаўніка латыні, абвясціў, што пасля ўрокаў усе павінны сустрэцца каля

крапасной сцяны і вырашыць, як трымаць сябе на сённяшняй споведзі.

— Будзем прысягаць на каране,— сказаў ён.

«Чортаў капыт» было таварыства магаметанскае.

Усе сабраліся і размясціліся над садам Фаліманкі. Каганак прынёс турэцкі піястр, які ўзяў з бацькавай калекцыі. Арабскія літары на манеце павінны былі замяніць каран.

— Гавары, брат мой,— вымавіў Вомар.

— Паважаныя панове,— пачаў Каганак,— сёння мы ідзём на споведзь. Спадзяюся, што сярод нас няма мярзотніка, які выдасць наша таварыства. Хто збіраецца сказаць на споведзі, што ён член таварыства «Чортаў капыт», няхай выступіць наперад, і я яго прыкончу.

— Але ж існуе і тайна споведзі,— запратэставаў Балушка, які быў першы забіяка ў класе.— Ва ўсякім выпадку я буду каяцца ў гэтым. Настаўнік закону божага не адважыцца нікому сказаць. Яму трэба на гэта атрымаць дазвол папы рымскага. А я грашыць не буду. Калі хочаш, Каганак, выходзь супраць мяне, будзем біцца.

Старшыня Каганак са злосцю плюнуў.

— Здраднік! — горача ўсклікнуў ён.— Кожны сустрэчны мае права забіць цябе, як сабаку.

— Балушка спавядаецца толькі патэру,— умяшаўся Влчык,— а без дазволу папы патэр не мае права сказаць дырэктару. Яму давядзецца з'ездзіць у Рым, і наўрад ці папа дасць дазвол. Аднойчы я чытаў у «Райскім садзе», як адзін чалавек сказаў на споведзі святому айцу, што забіў купца і што на наступны дзень з-за гэтага пакараюць невінаватага. Свяшчэннік нічым не мог дапамагчы няшчаснаму, таму што быў абавязаны захоўваць тайну споведзі. Тады ён тэлеграфаваў у Рым, але, пакуль прыйшоў адказ, невіноўны ўжо вісеў на віселіцы.

Усе ўзяліся абмяркоўваць, чаму сапраўдны забойца пайшоў не да суддзі, а да свяшчэнніка.

Балушка за яго заступіўся.

— Ён ведаў, што свяшчэннік не мае права сказаць. А суддзя загадаў бы пасадзіць яго ў турму. Я таксама, як і той разбойнік, усё выкладу на споведзі.

— І нашто табе ўсё гэта? — спытаў Петарка.

— А на тое, што я баюся пекла,— адказаў Балушка.

Усе са здзіўленнем паглядзелі на яго. Зможа паваліць Калісту, самага моцнага хлопца з другога класа, а пекла баіцца.

— Чаму ты баішся пекла?

— А ты не баішся?

— Не,— адказаў Петарка.— У мяне адзін дзядзька свяшчэннік, другі — вікарый. У крайнім выпадку яны мне памогуць. Бо раз неяк дзядзька-свяшчэннік сказаў тату: «Між іншым, пекла не такое страшнае, як яго малююць»,— і абодва зарагаталі, а тата дабавіў: «Ва ўсякім выпадку, чалавек там сядзіць у цяпле».

— Хлусня! — устаў на абарону пекла Балушка.— У «Райскім садзе» я чытаў апавяданне пра аднаго жуліка, які трапіў у пекла. Ён усё жыццё хлусіў і ніколі ў гэтым не раскайваўся. Дык яму там чэрці кожную секунду адрэзвалі язык, а ён за палову секунды адрастаў зноў. Чэрці зноў рэжуць язык, а ён зноў адстае, і яго зноў рэжуць. І так бясконца, цэлую вечнасць.

— А вочы грэшнікаў ліжуць там смярдзючыя сабакі языкамі вогненнымі,— паведаміў Ногач.— Я бачыў такую карцінку ў нас у царкве на столі. І страляюць з гармат у душы грэшнікаў, затым крэпяць іх святою вадою, закоўваюць у ланцугі і льюць у глотку панослівы гной.

— Усё гэта хлусня,— абазваўся Котва.— Адкуль у чарцей святая вада?

— Яны крадуць яе,— не здаваўся Ногач.

— Не мялі глупства,— гыркнуў на яго Котва.— Чорт баіцца святое вады.

— Не баіцца! Сам пляцеш абы-што. Хочаш біцца? Давай!

Хлапчукі сашчапіліся. Ногач паваліў Котву і, лежачы на ім, крычаў:

— Дык баіцца чорт святое вады ці не?

— Не баіцца,— адказаў пераможаны Котва.

Ногач выпусціў яго і зноў заступіўся за Балушку.

— Няхай сабе пакаецца, што ён член «Чортавага капыта».

— І возьме гэты грэх на сябе за ўсіх.

Старшыня Каганак запярэчыў: усе кляліся на каране, што не выдадуць таварыства, і калі Балушка на споведзі скажа пра яго, ён парушыць клятву.

— Не,— упарта цвердзіў Балушка.— Я католік і хрысціянін. Калі я саграшыў, павінен пакаяцца, а калі ты яшчэ што-небудзь скажаш, дам па патыліцы. Патэр не асмеліцца балбатаць пра тое, што яму гавораць на споведзі.

Настаўнік закону божага Шымачак быў злосны і выглядаў з-за кратаў спавядальні хмура і строга. Ён выпытваў, як патрашыў, і накладваў суровыя епітым'і. Прымушаў чытаць «Ойча наш» і «Багародзіцу» не менш чым восем разоў.

Дый як яму было не злавацца? Ён спавядаў пяцікласнікаў. Падышоў і апусціўся на калені пяцікласнік Ружычка.

— Верыце ў бога, Ружычка?

— Я сказаў бы, але атрымаю за гэта восем гадзін карцэра.

— Даю слова гонару — не атрымаеце.

— Ну, тады не веру.

— In nomini domini. Ва іскупленіе прачытаеце сорак разоў «Ойча наш» і ступайце, не хачу больш гра-

шыць з вамі. Думаю, што на законе божым вы праваліцеся.

Нягоднік гэты Ружычка. Аднойчы патэр Шымачак, даказваючы ў школе, што бог ёсць, дазволіў вучням дыскусію.

— Вялебны ойча,— звярнуўся да яго Ружычка,— як жа так можа быць, што бог стварыў святло ў першы дзень, а сонца толькі на трэці?

За гэтае пытанне на адкрытым дыспуце Ружычка атрымаў чатыры гадзіны карцэра і выслухаў натацыю.

А за што кара? «Не пытайся, чаго не трэба».

Цяпер настаўнік закону божага ведае напэўна: «Ружычка не верыць у бога». І ён са злосцю прызначаў епітым'і. Праходзілі клас за класам, і чым ніжэйшы быў клас, тым больш мізэрнымі былі грахі. Васьмікласнікі ўжо добра грашылі супраць шостага запавету. Тут патэру давялося наслухацца. Нават сямікласнікі, не саромеючыся і хочучы пазлаваць настаўніка закону божага, спавядаліся ў распусных выразах і ўчынках. А хто-ніхто з пяцікласнікаў нават называў і публічныя дамы. Паступова грахі драбнелі. Час ад часу чуліся прызнанні ў ананізме. Чацверакласнікі, трэцякласнікі, другакласнікі. Нарэшце прыйшлі са сваімі грахамі першакласнікі. Не слухаюць бацькоў, спісваюць урокі, брыдкасловяць, крадуць дома грошы і г. д. Пазяхаць хочацца ад такіх грахоў. Нічога такога, што бунтавала б кроў, як у гімназістаў чацвёртага класа і вышэй.

Нарэшце сярод гэтай нуды бліснуў праменьчык.

Спавядаўся Балушка...

— Прызнаюся богу ўсемагутнаму і вам, вялебны ойча, служка божы, што я з'яўляюся членам тайнага таварыства «Чортаў капыт».

— Што вы гаворыце?

— Прызнаюся богу ўсемагутнаму...— паўтарыў формулу пакаяння Балушка,— што з'яўляюся членам тайнага таварыства «Чортаў капыт».

— А яшчэ хто ўваходзіць у яго?

— Гэтага я сказаць не магу.

І працягваў:

— Прызнаюся богу ўсемагутнаму і вам, вялебны ойча, служку божаму, што я прысягаў на каране.

— Вы звар'яцелі, Балушка!

— Прызнаюся богу ўсемагутнаму і вам, вялебны ойча, служку божаму, што я не звар'яцеў.

— Балушка, я не магу вам адпусціць грахі, ідзіце да пана дырэктара і прызнайцеся яму, як прызнаваліся богу і мне!

— Не магу. Я ведаю, што і вы нічога не скажаце дырэктару, ойча вялебны.— Балушка заплакаў.

— Балушка, вы праявіце сапраўднае раскаянне, як толькі паведаміце пра ўсё пану дырэктару. У сярэдняй школе не павінна быць ніякіх тайных таварыстваў. Ідзіце, прачытайце трыццаць разоў «Ойча наш» і «Багародзіцу». А заўтра раскажаце ўсё пану дырэктару.— І, прамармытаўшы нешта, вялебны ойча сунуў Балушку для пацалунка епітрахіль.

Балушка выйшаў хістаючыся і апусціўся на калені перад алтаром.

Ён паглядзеў на сваіх сяброў. Не, ён не выдасць іх! Ні за што не выдасць! Ён нічога не скажа пану дырэктару. Вялебны ойча таксама не скажа, ён жа не можа парушыць тайны споведзі.

На другі дзень выкладчык закону божага выклікаў Балушку.

— Чаму пан дырэктар дасюль нічога не ведае?

Балушка пакруціў галавою і, набраўшыся храбрасці, адказаў:

— Вялебны ойча, гэта тайна споведзі.

— Пачакай, нягоднік! — закрычаў выкладчык.— Пойдзеш ты да дырэктара ці не?

— Ойча вялебны, не пайду, не магу я. Гэта тайна споведзі.

Небарака Балушка расплакаўся тут жа ў калідоры. З кабінета выйшаў дырэктар.

— Што здарылася? Чаму хлопчык плача? — спытаўся ён у настаўніка закону божага.

— Гэты мярзотнік не хоча прызнавацца, што з'яўляецца членам тайнага таварыства ў сваім класе,— адказаў законнік.

— Прайдзі ў кабінет,— строга сказаў дырэктар Балушку.— Разбяромся, што там такое.

І настаўнік закону божага, штурхаючы перад сабою няшчасную ахвяру тайны споведзі, дадаў:

— Вось цяпер ты, у кабінеце дырэктара, прызнаешся, якім стаў нягоднікам...

З таго часу Балушка перастаў верыць у бога.

ТРЫ МУЖЧЫНЫ З АКУЛАЙ

Наша кампанія, якая складалася з рэдактара часопіса «Свет жывёлы», з утаймавальніка змей і ўладальніка блышынага цырка Местака і з гаспадара каруселяў, амерыканскіх горак і ціра Сліўкі, правяла, без ніякага сумнення, бурную ноч. Усе мы былі людзьмі з даволі сумніўнай рэпутацыяй, і калі б мелі свае візітныя карткі, то кожны з нас павінен быў бы дадаць на тых візітках да свайго тытула, каб не выглядаць махляром, толькі адно слова «былы». Такім чынам, былы рэдактар «Свету жывёлы», былы ўтаймавальнік змей, былы гаспадар каруселяў і г. д. Сноўдаюцца ж па свеце розныя экскаралі, эксцары, дык чаму не можа быць эксуладальнік блышынага цырка.

Пад раніцу, калі мы выгналі з аднаго кафэ групу бязвінных студэнцікаў, настала заспакаенне ці хутчэй рэакцыя. Надакучылі нам і гармонік, і цытра, і пісклі-

выя жаночыя капэлы, і ванітаванне ў туалетах, і захады паліцэйскіх.

І вырашылі мы пайсці прагуляцца па Празе. Як толькі дайшлі да Доўгай вуліцы, зацікавіла нас, што ў адным магазінчыку, дзе заўсёды прадавалі марскую рыбу, персанал дадумаўся павесіць у вітрыне нейкі прадмет, які знізу да верху займаў усю вітрыну. Гэты нібыта звер быў падобны да рыбы. Утаймавальнік змей Местак выказаў меркаванне, што гэта цюлень, гаспадар каруселяў і амерыканскіх горак Сліўка сказаў, што гэта марская дзева, а я, былы рэдактар «Свету жывёлы», пайшоў у краму спытацца, што гэта за рыба.

— Гэта маладая акула,— адказалі мне.

— Прабачце, але ж гэта здыхляціна,— сказаў я, каб хоць што-небудзь сказаць.

— Чаму вам так здаецца,— здзівіўся прадавец марской рыбы,— гэту маладую акулу забілі гарматай. Не вдохла яна, разумееце. Яна замарожаная.

— Колькі за кілаграм?

— Мы акул на кілаграмы не прадаём. Гэта рэкламны экземпляр. На ноч зноў пакладзём у халадзільнік. Калі вы хочаце марской рыбы на смажанне, магу прапанаваць марскі язык, камбалу, свежую траску, а таксама інструкцыю, як гатаваць марскую рыбу.

Я купіў паўкіло камбалы і вярнуўся да сваіх яшчэ сонных супольнікаў.

— Шаснаццацімесячная акула,— сказаў я,— вылаўлена на востраве Гельгаландзе. Забіта з гарматы, калі патапіла падводную лодку. Рэкламны экземпляр. На ноч заўсёды кладуць у халадзільнік.

Былы ўтаймавальнік змей і ўладальнік блышынага цырка Местак задумаўся.

— Хадзем да «Залатой лодкі»,— паклікаў ён нас,— думаю, што з гэтай акулы можа што і выйсці.

У «Залатой лодцы» нас з маім скруткам камбалы ў піўнушку не пусцілі. Тады мы раздзялілі камбалу

двум мясніковым сабакам, якія толькі абнюхалі рыбу і нават не захацелі дакрануцца да яе, а пачалі на нас брахаць і вурчэць.

Цяпер мы ўжо маглі ісці ў піўнушку, і ў «Залатой лодцы» мы заказалі каньяку і чакалі, што скажа Местак.

— Некалькі гадоў назад,— сказаў Местак,— была ў мяне шкляная скрыня. У той скрыні быў вужака, якога я выдаваў за гібрыд маладога тыгра з удавам. Заказаў рэкламныя плакаты і вазіў іх па ўсёй Маравіі. Зарабіў на гэтай справе 500 залатых. Калі мы купім сапраўдную акулу, дык праз два тыдні зробімся мільянерамі.

Мы разам узнялі галовы і ўбачылі, што карчмар вельмі падазрона глядзіць на нас. Ён, відаць, пачуў ціхія адрывістыя словы і падумаў:

«Скрыня — рэклама — акула — вялікі прыбытак — гэта нейкае зладзейства».

Мы аднагалосна пагадзіліся, што Местак зможа сам найлепшым чынам дамовіцца з уладальнікам акулы.

Местак пайшоў. Праз гадзіну ён вярнуўся і паведаміў:

— Акула ўжо наша, разам са скрыняй. Праз хвіліну будзе тут. Усё гэта каштуе семдзесят залатых.

З таго самага моманту і пачалося наша вандраванне з акулай, якое і праз шмат гадоў я ўспамінаю з радасцю і задавальненнем.

Пастанавілі мы ездзіць з акулай толькі ў невялікія гарадкі, дзе людзі не распешчаны рознымі гастралёрамі, дзе не бачылі нічога сенсацыйнага і дзе прымуць нашу акулу ад чыстага сэрца. Дзе наша акула будзе гаварыць да іх незнаёмай музыкай жаху і жудасці, дзе выкліча шчырую цікавасць.

Першым такім гарадком былі Страконіцы. Мы прывезлі акулу проста да «Бяседы». І я адразу пайшоў у друкарню заказаць плакаты, а Местак пачаў перагаворы з гаспадаром «Бяседы». Паабяцаў таму, што ад наведвальнікаў не будзе адбою, і запрасіў паглядзець на акулу, якая ляжала ў сваёй доўгай труне на падворку.

Калі карчмар убачыў тую пачвару, ён адразу адклаў запраектаваны на сёння вечар танцаў і прапанаваў нам усю залу бясплатна.

А тым часам я ў друкарні афарміў вось такі плакат:

Пагроза паўночных мораў!

Трагедыя марскіх глыбінь!

Паважаным грамадзянам горада Страконіц прапануем паглядзець на акулу, якую вылавілі на востраве Гельгаландзе. Акула пасля жорсткай барацьбы была забіта стрэлам з гарматы ў той час, калі яна патапіла падводную лодку, з якой хацелі тарпедай узняць яе ў паветра. Цэлыя два месяца яна лютавала ў паўночных морах, была пагрозай рыбакам і параходам. У яе чэраве знойдзены астанкі капітана Трэстана, лоцмана яго вялікасці караля дацкага!

Прыводзім спіс апошніх ахвяр, праглынутых марской пачварай:

Ян і Марыя, дзеці беднага рыбака са Штральзунда,

Вільямс Борус, студэнт тэалогіі са Шлезвіга,

Уладзімір Новатны, чэшскі высланнік з Бероўна,

Джым Дэмрал, галоўны флоцкі кантралёр Вялікабрытаніі, рыцар ордэна св. Юліі, пасланнік з Лондана,

Капістран Матэвуш, канонік і біскуп наварскі і палермскі, папскі вікарый.

Агляд усяго адзін дзень, заўтра, 15 мая ў «Бяседзе» з 2 да 7 гадзін вечара.

Плата за ўваход 30 крон. Дзеці школьнага ўзросту ў суправаджэнні бацькоў плацяць палавіну.

Карацей кажучы, мы ўзаемна дапаўнялі адзін аднаго. Кожны з нас у той адказны момант быў на сваім месцы. Былы ўладальнік каруселяў, амерыканскіх горак і ціра павінен быў павесіць плакат на касцельнай браме такім мілым і прыемным спосабам, каб нікога з веруючых не абразіць. І яму зрабіць гэта дапамагаў сам дзячок. Местак тым часам пабываў у аддзеле народнай асветы і паабяцаў бясплатны ўваход на агледзіны акулы бедным старанным вучням, вылучаным панамі настаўнікамі.

А я накіраваўся ў гарадскі савет, каб асабіста запрасіць мэра горада.

Гэта быў сапраўдны паўднёвачэшскі тып дэмакрата. Ён моцна паціскаў мне руку і казаў:

— Акула? Выдатна! Я вельмі люблю акул. Не кусаецца? Мёртвая? Паглядзім на тую пачвару. Прыйду з усімі сваімі падначаленымі.

Горш было з глухаватым ксяндзом. Доўга я тлумачыў яму, што ніякія мы не вандроўныя гастралёры, пра якіх ён меў прадузятую думку.

І калі нарэшце я пераканаў яго, што ў нас толькі адна акула, ён пачаў нешта расказваць пра кіта, які праглынуў прарока Іаана. Відаць, дурной галавой ён упарта трымаўся свайго разумення, а пасля паклікаў капелана і сказаў яму:

— Мілы Францішак, ідзіце з гэтым панам, ён вам пакажа нейкага кіта.

І так у яго затрэслася бародка, як у тых Раісавых ксяндзоў-дабрадзеяў.

Капелан як абцугамі ўхапіўся за мяне, і так мы ішлі аж да плошчы, пакуль я яму тлумачыў, што гаворка ідзе пра акулу.

Капелан гаварыў нешта пра загадкі прыроды пры сутыкненні з людзьмі, з чаго вынікаў недавер да вышэйшай боскай сілы, і з радасцю развітаўся са мной.

Наведаў я і жандармерыю. Начальнік быў прагрэсіўны чалавек, ён паляпаў мяне па плячы і сказаў:

— Значыць, гледзіце, што дзе ўкрасці, лайдакі, камедыянты, цыганы.

Калі ж я сказаў яму пра акулу, ён з прафесійнай жандарскай пахвальбой паведаміў, што такіх акул ён бачыў тысячы і калі гэта будзе не акула, ён загадае ўсіх нас арыштаваць.

Адзін прафесар на пенсіі, які дажывае свой век у Страконіцах, запрасіў мяне на абед, і ўвесь час развіваў тэорыю, што дагматызм не прызнае тэорыі адноснасці. Аднак я не шкадаваў, што пазнаёміўся з тым панам. Бо нахапаўся навуковых тэрмінаў, зрабіў такія-сякія выпіскі да сваёй лекцыі перад гараджанамі адносна акул.

У дзве гадзіны ў залу «Бяседы» сабралася столькі людзей, што і яблыку не было дзе ўпасці. На эстрадзе стаяла скрыня з акулаю. Людзі падыходзілі да эстрады, як некалі хадзілі цалаваць святыя мошчы. Спярша я сказаў невялікую прадмову пра марскіх пачвар. Пасля мы збіралі добраахвотныя ахвяраванні на чучала няшчаснай акулы.

У тры гадзіны прыйшлі школьнікі разам з настаўнікамі. Памятаю, адна маленькая дзяўчынка вельмі баялася, плакала, а настаўніца сілком цягнула яе да акулы.

Гарадскі савет з'явіўся ў чатыры гадзіны. Мэр горада ахвяраваў пяць крон і не захацеў браць рэшты.

Гэта была шчаслівая гадзіна. Грошай было навалам.

Ля мёртвай акулы Местак пазнаёміўся з нейкай удавой і пайшоў да яе на ноч.

Я спаў у мэра горада, а Сліўка ў жандарскім участку, таму што ў адной карчме пабіўся з нейкім балбатуном са Скочыц, які груба абразіў нашу акулу, сказаўшы, што ніякая гэта не акула, а дэльфін, ён гэта добра ведае, таму што служыў на флоце.

Калі раніцай мы ўсе шчаслівыя сышліся ў «Бяседзе», карчмар, які яшчэ ўчора вечарам быў такі ветлівы, сустрэў нас непрыязна.

Наша акула смярдзіць! Жонка цэлую ноч не спала, раніцай мусілі паслаць па доктара. Усім блага, а памочнік з самага ранку п'е ром. Мы павінны неадкладна забраць з залы сваю пачвару і больш у «Бяседзе» не паказвацца, бо нам, камедыянтам, пераламаюць ногі.

І ён меў рацыю. З акулай за ноч адбылася фатальная змена, і распад яе цела пайшоў вельмі хутка.

Я прапанаваў акулу забальзаміраваць, і мая прапанова была прынята. Тады мы купілі пяць бутэлек адэкалону і яшчэ нейкай парфумы, выкупалі ў гэтай сумесі нашу акулу і яшчэ налілі ў сярэдзіну.

Паклалі акулу на воз і паехалі ў Вадняны.

З паляўнічага доміка нас з ёй выгналі, нягледзячы на тое, што зала сакалінага доміка нам вельмі падыходзіла сваімі параметрамі.

Прынялі нас у Народным доме, калі мы на акулу вылілі яшчэ чатыры бутэлькі адэкалону.

А потым усё пайшло вельмі хутка. Плакаты, агітацыя, шмат гледачоў. Пах ад акулы быў такі, што ў зале ўсе памлелі. Мы ўтрох таксама ледзь трымаліся на нагах, хоць з самай раніцы пілі каньяк, каб неяк дачакацца канца і вытрымаць.

Я не памятаю, хто нас, уласна кажучы, арыштаваў, але сярод ночы мы прачнуліся ў ваднянскай каталажцы. Направа спаў Местак, налева Сліўка.

Раніцай нас аштрафавалі за дзеянні супраць аховы здароўя ці за нешта падобнае.

І не былі мы на пахаванні нашай акулы. Яе пахавалі на сродкі ваднянскіх грамадзян. Закапалі нашу пагрозу паўночных мораў, як здохлую кошку. Не ведаю нават месца, дзе яна ляжыць. На яе магіле няма нават простага крыжа, нягледзячы на тое, што, паводз-

ле нашага плаката, праз яе вантробы прайшоў папскі вікарый, канонік і біскуп наварскі і палермскі, Капістран Матэвуш.

Спі салодка, мая акула.

САЛІДНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА

З Местакам, цяпер нябожчыкам, сядзелі мы на лаўцы ў парку на Карлавай плошчы.

Местак, гаспадар блышынага цырка, быў не ў гуморы, бо прыйшоў да вываду, што няма сэнсу дрэсіраваць блох. Не так даўно яго блышыны цырк пацярпеў катастрофу. Адзін п'яніца, упэўнены, што ўсё гэта махлярства, убіўся ў буду і, нават не праверыўшы свайго падазрэння, пасек скрынкі з цыркам. Дрэсіраваныя блохі апынуліся на волі і збавіліся ад цягання малых, мікраскапічных папяровых вазкоў. Таксама быў знішчаны бінокль.

На самым дне скрыні застаўся ляжаць расплясканы труп блышынага самца, першакласнага артыста, які быў душой цырка. Местак пяшчотна называў яго Францішкам. Самец быў апазнаны праз павелічальнае шкло. Менавіта ў яго не хапала адной нагі, што было адной з цыркавых таямніц. Такім артыстам адрывалі нагу, каб яны надта не скакалі і не парушалі гармоніі блышынага цырка.

Ля трупа артыста засталася адна-адзіная блыха з пераламанымі нагамі, яна была ўпрэжана ў перакулены вазок.

— Я думаў,— уздыхнуў Местак,— што яе вылечу, але нічога не выйшла. Пепіта чахла. І тады я, нарэшце, раздушыў яе.

Местак расказваў пра каханне Пепіты і Францішка, як той заўсёды вёў яе ў танцы, на здзіўленне малым блышанятам.

— Ніколі ў жыцці,— гаварыў Местак,— я больш не ўбачу такога інтэлігентнага стварэння. Цяперашняе пакаленне блох дэгенераванае. Блохі падурнелі. Сталі някемлівыя. Можа, у нас з'явілася новая блышыная раса. Нядаўна я купіў у аднаго работніка старамесцкага прытулку поўную бутэлечку блох, але ні адна з іх нічога не вартая. Былі ў мяне блохі і з паліцэйскага ўчастка, з некалькіх дзіцячых дамоў, былі блохі з пансіяната «Шчаслівы дом», з пансіяната Элішкі Краснагорскай, блохі з папраўчага дома, з некалькіх казармаў, блохі з ламбардаў, блохі з некалькіх атэляў, з Каралінума і Кліменцінума, блохі з Вышэйшай жаночай школы і Прамысловага Саюза, з Эмаўзскага касцёла — і ўсе тыя блохі былі няздольнымі стварэннямі. Праўда, я знайшоў дзве-тры блыхі, якіх можна было нават назваць таленавітымі. Але ж яны былі лайдакі. Не вабіла іх кар'ера. Уцяклі, не зважаючы на тое, што іх чакалі і поспех і слава. Новае, маладое блышынае пакаленне ніколі не зробіць таго, што маглі Францішак або Пепіта. Няма такіх слоў, каб расказаць пра іх вартасць, імі можна толькі захапляцца.

Зноў нас апанавала меланхолія, і перад нашымі вачыма ўсплыло трыумфальнае шэсце блышынага цырка па Чэхіі, Маравіі, з нядоўгім заездам у Венгрыю, адкуль нас вытурылі венгерскія жандары, убачыўшы ў блышыным цырку прыхаваную панславянскую прапаганду.

У некаторых гарадах Маравіі нам устаўляла палкі ў колы духавенства.

Ксёндз у Гельштыне, якога я пайшоў запрасіць на прадстаўленне нашага блышынага цырка, сказаў мне:

— Я не магу сваім прыхаджанам рэкамендаваць ваша пачынанне, не блаславёнае богам, бо дрэсіраваць блох супярэчыць чалавечай прыродзе. У сярэдневяковых манастырах, як піша абат Анзэльм, блохі павінны былі па начах кусаць манахаў, не даючы ім спаць,

каб яны не забываліся і ўдзень і ўночы славіць бога.

— Дык вы лічыце блох святымі стварэннямі? — сказаў я.— Тады я магу запэўніць вас, што ў нашым цырку якраз нашчадкі тых самых блох, якія кусалі Ісуса ў Віфліемскім хляве.

Той раз я з ім пабіўся, накаўціраваў яго, але ўсё ж мы з блышыным цыркам вымушаны былі хавацца ў гарах, бо ксёндз нацкаваў на нас усю акругу, аж да самай Валахіі.

Хвіліну прыемных успамінаў перапыніў Местак:

— Калі чалавек цярплівы і энергічны, то ён абавязкова пераможа людское глупства. Трэба толькі ўмець за ўсё ўзяцца з галавой. Справа не ў тым, што чалавек намалюе качку, а ў тым, каб упэўніць людзей, якія ідуць паглядзець на яе, што гэта зусім не качка, а, скажам, ягуар. Правалілася адна справа, бярыся за другую, трэцюю...

— Людзі, што бараны,— цягнуў ён сваю філасофію,— чым больш дурноты альбо глупства, тым хутчэй людзі лезуць у кішэню, каб толькі ўбачыць гэты шэдэўр. Людзям хочацца сюрпрызаў. Як вы мяркуеце?

— Я думаю,— сказаў я,— што ёсць вельмі мала разважлівых людзей. Хто мае свой пункт гледжання, той не пойдзе глядзець на ўсялякае глупства. Нашы прадстаўленні наведвала публіка, якая верыла, што ўбачыць усё, што мы ім паабяцалі паказаць. Памятаеце ж нашага кажана, якога мы злавілі ў Богдальцы, а выдавалі за лятучага яшчара з Аўстраліі? І ўсе нам плацілі, каб толькі ўбачыць яго. Альбо памятаеце, як людзі біліся перад нашай будай за білеты, каб толькі ўбачыць маладога ўдава, які задушыў у Індыі англійскага каралевіча? А быў гэта ўсяго толькі малады вужака. А ўспомніце, колькі было народу, калі Пепічак Ванак выступаў у ролі арангутанга з вострава Барнэа?

— Ну і жулік быў,— пацвердзіў Местак,— як гэта

я не памятаў бы яго. Перад тым апошнім прадстаўленнем ён дамагаўся ад нас дваццаці крон, не хацеў за пятнаццаць крон і яду быць арангутангам. А зарабляў хлопец і добрыя грошы, і садавіну, і цукеркі, якія людзі кідалі яму ў клетку. Усе прысмакі хаваў у кут, а вечарам, калі мы зачынялі буду, ён ішоў да гандляркі насупраць і прадаваў усё. Таму я і не хацеў набаўляць яму ганарару. Ён раззлаваўся і ў час прадстаўлення зацягнуў песню «А ў полі дарожанька». Што тут было! Тады нас і вытурылі з Табара. Больш нам пашанцавала з мумійай англійскага караля Рычарда III, а была гэта толькі скручаная авечая скура. Глядзець на яе хадзілі амаль паўгода. Вы яшчэ пра тую скуру загадкава гаварылі: «Тут мы бачым аднаго з самых вялікіх і грозных выродкаў, якія калі-небудзь сядзелі на троне. Гэты кароль нягоднік купаўся ў крыві незлічоных злачынстваў, гэта ён уразіў самога Шэкспіра сваёй крыважэрнасцю. Вось гэтая каралеўская пачвара цяпер засушана, і мы маем магчымасць паказаць гэтую мумію паважанаму грамадству».

— А потым Рычарда III,— сказаў я,— канфіскаваў адзін начальнік акругі.

— Але ж гэта сведчыць пра тое,— рэзюмаваў Местак,— што ўсё магчыма ў жыцці. Іду ў заклад, што большая частка чалавецтва жыве ашуканствам розных гатункаў. Усё залежыць толькі ад таго, што прыдумаць новае, каб паказаць гледачам. Паказытаць ім нервы. Так задурыць галаву, каб кожны сам рабіў нам рэкламу. Паказаць ім нешта такое.

— Пачакайце з тым паказам нечага такога,— сказаў я, крэслячы на пяску розныя загагуліны,— навошта нешта такое. Давайце далей. Вы мяне разумееце. Нічога не трэба паказваць.

— Ну хоць які каменьчык,— азваўся ўмольна Местак,— заўсёды трэба нешта паказваць.

— Ніякіх каменьчыкаў,— сказаў я цвёрда,— гэта

глупства. Старая школа. Я вам кажу, што мы наогул нічога не будзем паказваць. І гэта будзе самым сапраўдным дзівам. Вы гаворыце: «Ну хоць які каменьчык», гэта ўжо было. Тады гаварылі: «Гэты каменьчык з Марса». Гледачы мелі ўражанне, што нешта такое яны ўбачылі, хоць і не здзівіліся. А вось калі яны зусім нічога не ўбачаць, тады здзіўленне будзе поўнае. Глядзіце.

Я ўсё крэсліў лініі на пяску.

— Наш балаган будзе круглы, прасторны. Без вокан, без шклянога даху. Там павінна быць зусім цёмна. Двое дзвярэй, завешаных занавескамі. Адны, куды публіка будзе ўваходзіць, другія — адкуль выходзіць. Вялікі плакат: «Найвялікшы сюрпрыз на свеце! Незабыўнае ўражанне! Толькі для мужчын! Уваход жанчынам і дзецям забаронены! Вайскоўцам скідка 50 %!»

Упускаць будзем па адным праз невялікі інтэрвал. Я стаю на вуліцы і заклікаю ахвотнікаў, прадаю білеты. Вы знаходзіцеся ў балагане, у цемры. І як толькі ўвайшоў грамадзянін, вы хапаеце яго за порткі і за каўнер і праз заднія дзверы, без слоў, выкідаеце вон. Невялікая плата за ўваход, і ўбачыце, што ніхто не пашкадуе. Ручаюся, што людзі жадаюць адзін аднаму толькі благога, а таму будуць рабіць нам добрую рэкламу, падбіваючы іншых паглядзець на той д'ябальскі цуд. Наша справа будзе трымацца на псіхалагічнай аснове.

Местак з хвіліну вагаўся, праўда, не наконт заснавання новага атракцыёна, але як яго лепш удасканаліць.

— Было б няблага,— сказаў ён праз хвіліну,— каб яшчэ і дубцом разок-другі... Вось ад гэтага было б яшчэ большае ўражанне.

З гэтай прапановай яго я не згадзіўся. Бо выйшла б затрымка з пропускам наведвальнікаў. Уся працэдура павінна адбывацца вокамгненна. Толькі чалавек увай-

шоў у цемру, і ён ужо на дварэ; няма часу на роздум. У гэтым уся соль. Прадпрыемства сапраўды саліднае! Мы не абяцаем нікому нічога такога, чаго не можам паказаць. Абяцаем дзіва і слова сваё трымаем. Ніхто не зможа сказаць, што мы ашукалі яго.

* * *

Наша саліднае прадпрыемства прыцягнула страшэнную ўвагу. Свой стан мы разбілі спярша ў Бенешаве, дзе былі найлепшыя ўмовы. Вайскоўцы і цікаўная публіка. Я надрукаваў плакат, які адпавядаў надпісам на нашым балагане:

Пікантна!
Толькі для мужчын!
Надзвычайнае ўражанне!
На ўсё жыццё запомніце наш атракцыён!
Ніякага шарлатанства!
Праўдзівасць гарантуем!

Уваходная плата 20 гелераў, плакаты, таямніца пікантнага ўражання для дарослых мужчын прыцягнулі да нашага балагана і цывільных і вайскоўцаў.

У натоўпе стаялі таксама і шаснаццацігадовыя падлеткі, якія на маё запытанне, колькі ім гадоў, адважваліся адказаць, што сорак альбо пяцьдзесят, абы толькі трапіць у балаган.

Працу распачалі мы а шостай. Першы быў тоўсты пан, які тут прачакаў ужо цэлую гадзіну, каб з маланкавай хуткасцю прайсці праз наш балаган і апынуцца зноў на вольным паветры з другога боку.

Я чуў, як ён гаварыў да грамады: «Надзвычайна, схадзіце паглядзіце!»

Я не памыліўся ў псіхалогіі натоўпу. Выштурхнутыя рабілі нам добрую рэкламу. За паўтары гадзіны праз умелыя Местакавы рукі прайшло некалькі со-

цень дарослых мужчын. Некаторыя з іх па другім і нават трэцім разе траплялі ў рукі Местака. На іх тварах мы бачылі радасць і задавальненне. Мы заўважылі, што многія прыводзілі з сабой знаёмых і жадалі ім ад шчырага сэрца пазнаёміцца з надзвычайным уражаннем.

* * *

Дзе чорту не пад сілу, пашлі туды раённага начальніка. Ён прыйшоў пасля паловы восьмай.

— У вас ёсць дазвол? — спытаўся ў мяне ля ўваходу.

— Калі ласка, праходзьце,— сказаў я.

У цемры балагана паміж раённым начальнікам і Местакам адбылася кароткая сутычка. Раённы начальнік, з абавязку службы, адчайна лаяўся перад «д'ябальскім уражаннем», але нарэшце вылецеў праз заднія дзверы да вясёлага натоўпу.

Пасля прыйшлі жандары, апячаталі наш балаган, а нас павялі ў суд, дзе інкрымініравалі нам замах на дзяржаўную асобу і адкрыты гвалт.

— Ніколі ў жыцці я не буду больш засноўваць ніякіх салідных прадпрыемстваў,— сказаў мне Местак, калі мы з камфортам разлягліся на нарах,— з сённяшняга дня буду жыць толькі ашуканствам.

CHI VA PIANO, VA SANO [1]

Найлепшым сведчаннем таго, як кіраўніцтва дзяржаўных дарог клапоціцца пра хуткія чыгуначныя зносіны паміж Прагаю і Ілавам, з'яўляецца трагічны выпадак, які перажыла сям'я Дэсартаў з Ілава.

[1] Цішэй едзеш, далей будзеш *(італ., заўв. аўтара).*

Муж і жонка Дэсарты пажаніліся зусім нядаўна. Яму было дваццаць пяць гадоў, а ёй дзевятнаццаць. Яны шчыра кахалі адно аднаго і заўсёды раз на тыдзень хадзілі пехатой з Ілава ў Прагу, каб там накупляць чаго трэба. Аднаго дня здарылася так, што яны — жанатыя ўжо тры месяцы — у Празе пасварыліся, і малады Дэсарт, не паслухаўшы адгавораў сваіх сяброў, купіў білет, які даваў яму права на праезд у вагоне трэцяга класа цягніком, што меўся адысці з Францішкава вакзала да Ілава. Яго маладая жонка пайшла пехатою дахаты і ўжо пасля паўдня была дома.

Прайшло два тыдні, а пан Дэсарт усё не прыязджаў. Але вялікай бяды ў тым не было, бо пад вечар чатырнаццатага дня цягнік, які вёз пана Дэсарта, адгрукаўшы два кіламетры, велічна праязджаў між Вінаградамі і Вршовіцамі.

Мінулі яшчэ тры тыдні. Жандармерыя марна шукала пана Дэсарта па ўсёй Чэхіі.

Яшчэ праз тыдзень пані Дэсартава перастала плакаць і з тае прычыны, што нейкі Цэтлаўскі стаў ёй вельмі сімпатычны як шчыры яе суцяшальнік, зрабіла праз наступныя шэсць тыдняў захады, каб пан Дэсарт быў абвешчаны памерлым.— А цягнік з панам Дэсартам поўным ходам шыбаваў ад Вршовіц да Богдалецкага тунеля.

Пакуль суд разгледзеў заяву няшчаснай пані Дэсартавай, прайшлі тры месяцы. Цягнік з панам Дэсартам ужо праскочыў Богдалецкі тунель.

Тым часам Цэтлаўскі перасяліўся да адзінокай пані Дэсартавай, і якраз у той самы дзень, калі праз год пасля свайго загадкавага знікнення пан Дэсарт быў прызнаны за мёртвага, нарадзіла няшчасная пані здаровенькіх блізнятак, з якіх адно было падобнае да пана Цэтлаўскага, а другое да яе.

А цягнік з панам Дэсартам, мужна змагаючыся з сустрэчным ветрыкам і моцна сапучы, нёсся да Крчска-

га лесу. Калі адолелі так пяцьсот метраў, заблыталіся вусы пана Дэсарта, якія ўжо вылазілі праз акно вагона, у восі паравоза, і дзеля хуткасці руху трэба было падаць заяву ў міністэрства чыгунак, каб пану Дэсарту дазволілі падстрыгчы вусы.

Пакуль міністэрства задаволіла просьбу, блізняткі Дэсартавай-Цэтлаўскай навучыліся хадзіць і гаварыць.

Калі яны пайшлі ў школу, цягніку з панам Дэсартам заставалася да Крчы ўсяго шэсцьсот метраў.

У школе дзеці добра паспявалі, і залежала ад волі бацькоў, вучыцца ім далей ці авалодваць якім-небудзь рамяством.

А пан Дэсарт са шчаслівай усмешкай праязджаў Крчы.

Хлопцаў пані Дэсартавай-Цэтлаўскай паслалі ўсё-такі вучыцца. Яны вучыліся выдатна і дайшлі да выпускных экзаменаў. У дзень паспяховага сканчэння экзаменаў цягнік з панам Дэсартам уляцеў на станцыю Браніцы. Хлопцы вывучалі юрыдычныя навукі, і калі здалі трэці дзяржаўны экзамен, ссівелы машыніст цягніка, які вёз пана Дэсарта, мог з гонарам усклікнуць: «Праехалі пятнаццаць кіламетраў!»

Адзін юрыст заняўся адвакацтвам, а другі — юстыцыяй. Калі першы адчыніў кантору, другога якраз прызначылі памочнікам суддзі ў акруговым судзе ў Ілаве, дзе першы пачаў займацца адвакацкай практыкай. Абодва, што трэба сказаць з вялікай да іх пашанай, рэгулярна хадзілі на магілу сваіх бацькоў, якія памерлі дзесяць гадоў назад.— А цягнік з панам Дэсартам быў ужо ў Завісці.

Абодва Дэсартавы-Цэтлаўскія знайшлі сабе спадарожніц жыцця і амаль адначасова справілі хрысціны сваіх першынцаў, калі цягнік з панам Дэсартам велічна абагнуў Влтаву і перад Яравам раптам спыніўся, бо наляцеў на жука-рагача. Мужнаму жуку ўсё абышлося простым перапалохам, але паравоз быў сапсаваны

настолькі, што, пакуль яго сяк-так адрамантавалі, народныя ўнукі пана Дэсарта пайшлі ў школу.

Пасля ўжо пайшло лягчэй, і пакуль цягнік шыбаваў ад Вранава далінаю да Ілава, унукі пана Дэсарта, дзякуючы атрыманым у спадчыну здольнасцям, здалі выпускныя экзамены на выдатна.

Яны адслужылі ў арміі, вывучалі медыцыну, хадзілі дахаты з Прагі на канікулы, лічачы гэта за шпацыр, і цягніку з панам Дэсартам было ўжо да станцыі Ілава ўсяго пяцьдзесят метраў, як раптам пан Дэсарт у запале закрычаў: «К чорту! Калі ўжо я нарэшце прыеду?!» Цягнік адразу спыніўся, пазбягаліся кандуктары і дрыготкімі галасамі пачалі ўпрошваць пана Дэсарта не гарачыцца, але тут ён так разбушаваўся, што разбіў шыбу ў акне і аднаму старэнькаму кандуктару даў у карак сваёю маршчыністаю рукою. Пасля таго ўжо ехалі толькі дзень і ноч і на станцыі здалі пана Дэсарта жандарскаму патрулю. А цяпер, дарагія чытачы, просім падрыхтаваць насоўкі, каб паплакаць над вялікай трагедыяй, якую наканаваў лёс сям'і Дэсартаў.

Пан Дэсарт, на сваё здзіўленне, апынуўся ў акруговым судзе ў Ілаве за псаванне чужой маёмасці. І адразу службовай асобы, гэта значыць кандуктара.

Судзіў яго народны сын і абараняў ex offo [1] другі народны сын. Пры разборы справы даведаліся ўсе трое, якія яны блізкія сваякі, і з неспадзяванай радасці і жалю ўсіх траіх адразу хапіў удар. Бедныя ўнукі пана Дэсарта, калі даведаліся пра гэтую драму, павесіліся на паравозе, які прывёз ім няшчаснага народнага дзеда.

---

[1] Па абавязку *(лац.)*.

СПРОБА НАЛАДЗІЦЬ БЕЗАЛКАГОЛЬНУЮ ВЕЧАРЫНКУ, АБО ВЕЧАРЫНКА ПА-АМЕРЫКАНСКУ

I

Самым сумным прыкладам таго, да чаго даводзіць п'янства, з'яўляецца вядомы біблейскі персанаж Хам, які апынуўся перад справядлівым судом за амаральны ўчынак у адносінах да свайго бацькі Ноя.

Але таксама ведаю я і іншыя выпадкі, напрыклад, як п'яны ксёндз з Інтэрлакена пайшоў служыць святую абедню ў споднім або як мой сябар Славік, напіўшыся, з'еў у заалагічным садзе маладую ядавітую кобру, такое мілае змяінае стварэнне.

Гэтыя, а таксама іншыя прыклады і прывялі чалавецтва да думкі пра пагібельнае дзеянне алкаголю. Амерыка зрабіла ў гэтым кірунку першы крок і прынятай забаронай алкаголю паказала ўсяму свету, як вынайсці зручнейшы спосаб абыходзіць сухі закон.

З'явіўся так званы сухі закон, і пад уціскам забароны продажу алкагольных напіткаў людзі, якія век не пілі, зрабіліся самагоншчыкамі, а ўтрымальнікі бараў і розных салонаў махлярамі.

«Віскі і брэндзі!» — гэты дэвіз, які сёння віруе над усёй Амерыкай, як на крылах ляціць з Нью-Йорка ў Сан-Францыска, з Канады аж у Мексіку.

На гэтай неабсяжнай прасторы сёння мільёны джэнтльменаў у мільёнах бараў чакаюць, пакуль да іх падыдзе ўтрымальнік бара, уліе ім у раскрыты рот кілішак віскі і атрымае грошы. У Амерыцы і сёння тое самае робіцца. Продаж алкагольных напіткаў у бутэльках забараняецца паліцэйскім распараджэннем, нават калі б гэта была самая маленькая бутэлечка.

А ў бары джэнтльмену варта толькі раскрыць рот, і кілішак будзе ўліты.

У нас, у Чэхаславакіі, ніхто, ні Імператарская медыцынская акадэмія, ні Армія выратавання не разумее, што найлепшым падарункам чалавецтву можа быць забарона продажу алкагольных напіткаў.

Забарона продажу алкаголю нараджае злачынасць, бо нездарма ж сёння ў Амерыцы больш за семдзесят тысяч чалавек сядзіць у турмах за недазволены продаж гарэлкі, ды і крымінальная статыстыка Амерыкі на першым месцы ў свеце.

У нас, аднак, алкагалізм мае глыбокія гістарычныя карані, ён абапіраецца на прывілеі нашых каралёў, на іх загад паўсюль варыць піва, каб народ піў яго. Славутая Дэсанка і тая нарэшце нядаўна купіла спіртзавод.

Што нам Імператарская медыцынская акадэмія! У нас сёння лічыцца так: калі піва 8°, дык кожная выпітая шклянка лепш за тры-чатыры кілішкі. Шклянка дзесяціпрацэнтовага піва замяняе два, а дванаццаціпрацэнтовага адзін кілішак.

Усялякія брашуры Імператарскай медыцынскай акадэміі пра цвярозасць трох грошаў не вартыя, таму што газеты і рэкламы прапануюць лікёры сямідзесяціпрацэнтовыя, а колькі прыгожых назваў маюць лікёры! «Рэж яго!», «Паспрабуй!»

II

Нельга сказаць, каб горад, у якім рабілася спроба наладзіць вечарынку непітушчых, або вечарынку паамерыканску, быў больш распушчаны за іншыя гарады ў рэспубліцы. Алкаголікі там паводзілі сябе так, як і алкаголікі ў іншых месцах, і, як і ўсюды, там на пяць цвярозых трапляўся адзін п'яны і на кожных трох жыхароў штодзённа прыпадала бутэлька гарэлкі. Як і ў кожным іншым горадзе з такім самым насельніцтвам,

тут можна было ўбачыць ноччу тузін п'яных на зямлі, а днём два-тры валяліся на тратуары.

Таксама нельга сказаць, каб у гэтым горадзе ўночы крычалі больш, чым у якім іншым, і больш скандалілі. Тут і там нехта некага па п'янцы аддубасіў, але ж так было паўсюль.

Таму і выклікала вялікую сенсацыю ў горадзе чутка, што адна жанчына, якая пасля смерці свайго мужа прыехала з Амерыкі на радзіму, хоча наладзіць вечарынку непітушчых па-амерыканску. Вечарынка наладжвалася ў рэстаране пана Вашаты.

Бедны пан Вашата мусіў паставіць у зале сто дваццаць крэслаў, восемдзесят чайных кубкаў, чай заварваць будзе сама амерыканка разам з жонкай галоўнага чыгуначнага кантралёра, бо тая ўсім сэрцам успрыняла ідэю наладжвання вечарынкі, відаць, таму, што не было ў яе жыцці дня, каб пан галоўны кантралёр не прыходзіў уначы дадому не п'яны, але ж вясёлы.

Муж той амерыканкі быў адным з зачынальнікаў руху супраць п'янства ў Алабаме і галоўным прапаведнікам нейкай рэлігійнай секты.

Плакаты, якія амерыканка заказала ў друкарні, былі ў чорнай рамцы, падобныя да некралога.

Вечарынка непітушчых.
Вечарынка без алкаголю па-амерыканску.
Ганьба п'яніцам!
Алкаголь ператварае вобраз божы ў вобраз неразумнага звера!
9 красавіка ў рэстаране пана Вашаты пагуляеце без алкаголю.
Пачатак у 7 гадзін вечара.
У праграме:
Уступнае слова пані Піцкноўн,
якая родам з нашага горада.

Розныя гульні.
Грамадзян бясплатна частуем чаем.
Прыходзьце ўсе і вы самі ўпэўніцеся,
што лепш: вечарынка з гарэлкай альбо без яе!

Калі са зместам плаката пазнаёмілася насельніцтва, у горадзе пачалося хваляванне, падагрэтае выказваннем старога ляснічага ў адстаўцы пана Поліўкі: «Не для рэстарана такая вечарынка, няхай яны разам са сваім чаем коцяцца ў чыстае поле».

Капельмайстар Воржак быў больш катэгарычны і ў прывакзальным рэстаране ўрачыста аб'явіў: «Я пайду туды, але ж і набяруся там, як жаба гразі».

Такі намер быў і ў большасці гараджан. Над вечарынкай навіслі чорныя хмары.

III

Пані Піцкноўн зрабіла кароткую прадмову, якая выклікала ў зале рэстарана надзвычайнае хваляванне. Сабралася тут шмат народу, прыйшлі і старыя п'яніцы і іх жонкі, каб паглядзець на рэакцыю сваіх мужоў.

Пані Піцкноўн добра памятала, як яе нябожчык муж прапаведаваў старым лайдакам з Захаду кідаць піць віскі і больш гарнуцца да бібліі.

У сваёй прамове пані Піцкноўн ужывала амерыканізмы, якія гучалі, як адмысловая лаянка. І гэтак жа далікатна яна абвясціла, што кожны, хто п'е — жарабец, пры гэтым палова жонак схіліліся да сваіх мужоў і шапталі ім: «Бачыш, я табе даўно тое самае казала».

Яна прывяла некалькі прыкладаў з жыцця амерыканскіх п'яніц, якія праз свае дурныя паводзіны трапілі на электрычнае крэсла.

Некаторыя памкнуліся пакінуць залу і падацца ў піўнушку выпіць чаго-небудзь, але былі спынены жонкай галоўнага кантралёра, тая не з-за страху, а з сум-

лення вартавала выхад, але некалькі паноў усё ж такі злаўчыліся выскачыць праз акно ў агародчык, адтуль у піўнушку.

Потым, калі ўсе мужчыны былі перавыхаваны, пані Піцкноўн скончыла сваю прамову і абвясціла, што праграма вечарынкі працягваецца. Наступным нумарам праграмы — гульні. Яна падасць знак, а потым па свістку пачынаем. З кішэні выцягнула свісток, якім карыстаюцца на футбольных матчах.

Першая гульня была такая: дамы ўтвараюць вялікае кола, а паны — кола ўсярэдзіне, абодва колы рухаюцца ў процілеглым напрамку, пры гэтым паны падаюць руку дамам.

Але пакуль абодва колы былі састаўлены і прыведзены ў рух, здарылася непрыемнасць: два ўдзельнікі гульні так набраліся ў піўнушцы, што, падаючы руку даме, зваліліся. Іх жонкам давялося завесці іх зноў у піўнушку.

У час кароткага перапынку паміж гульнямі выдаваліся ўзнагароды найбольш актыўным барацьбітам з п'янствам. Удзельнікі такімі тэмпамі лілі ў сябе, якіх яшчэ горад не бачыў. Пакуль справа дайшла да новай гульні, адзін пан, які за дзень выпіў не менш як чатыры куфлі піва, патрабаваў яшчэ паўбутэлькі, каб пахмяліцца, і, напіўшыся, ледзь не спаліў на двары свінушнік. Там ён усё паліў запалкі і шукаў уваходу ў залу.

Другая гульня была жартоўнай. На стале на талерку паклалі дзесяць гарошын. Умова такая: узяць на нож гарошыну і данесці яе на другі канец залы на калені пані Піцкноўн.

Тыя, у каго было яшчэ трохі розуму ў галаве, пачалі забаўляцца. Падыходзілі да стала, рабілі безнадзейныя спробы ўтрымаць на нажы хоць адну гарошыну, аж пакуль нарэшце пан Пексідар, ён быў хітрэйшы за астатніх і нападпітку, неўпрыкмет не плюнуў

на нож; тады ён лёгка сабраў усе дзесяць гарошын з талеркі і занёс у другі канец залы на калені пані Піцкноўн, пры гэтым выцер нож аб яе сукенку.

У невялікім антракце, калі жонка галоўнага чыгуначнага кантралёра разносіла ў маленькіх кубачках дамам чай з кавалкам кексу, аплачаныя самаахвярнай арганізатаркай, паны, пасля радаснага поклічу пана Пексідара: «Цяпер мы пойдзем да мулы», запоўнілі піўнушку.

Радасна свяціліся іх вочы, і чым далей, тым болей ім усё падабалася, нават наступны нумар амерыканскіх гульняў быў прыняты імі з вялікай радасцю.

Калі ўсе, нават тыя, каго нельга было адарваць ад стала, бо ў іх падгіналіся калені, зноў сабраліся разам у зале, пані Піцкноўн свіснула, быццам аб'яўляючы афсайд на футбольным полі, і крыкнула: «Усім панам выйсці», што было прынята з шалёнымі воклічамі ўдзячнасці.

Прысутныя дамы, калі мужчыны выйшлі, кідалі жэрабя. Тая, што выцягнула найменшы нумар, павінна была ўлезці ў мех, які завязалі і паставілі на стале ў зале; потым запрасілі развесялелых мужчын, якім належала выйграць гэты прыз.

Першая стаўка была дваццаць гелераў. Даму ў мяху выйграў ляснічы ў адстаўцы, калі стаўка дайшла да дзесяці крон шасцідзесяці гелераў. Выявілася, што пан ляснічы ў адстаўцы выйграў за такі непамерны ўзнос ледзь жывую спалоханую бабулю — жонку паштмайстра, якая прывяла на вечарынку сваю ўнучку; ёй, на зайздрасць усім дамам, выпаў першы нумар.

Пан ляснічы ў адстаўцы разлютаваўся, спачатку збялеў, потым зрабіўся чырвоны як рак, выцягнуў гадзіннік з камізэлькі, засунуў яго ў кішэню штаноў, скінуў пінжак і камізэльку, пасля зноў усё ўсцягнуў на сябе і сярдзіта крыкнуў: «Не трэба мне!»

Усе з напружаннем чакалі, што будзе далей, але нічога не здарылася.

Пан Поліўка, ляснічы ў адстаўцы, пагардліва плюнуў, сказаў: «Падлы!» — і з гонарам пайшоў у піўнушку, дзе зноў паўтарыў пану Вашату свой стары вывад: «Не, такая вечарынка не робіць гонару рэстарану, хай яны са сваім чаем коцяцца ў чыстае поле».

Мужчына, які ледзь не спаліў свінушніка, быў такі задаволены, што сваёй жонцы, якая падтрымлівала яго ў крэсле, каб не зваліўся, мармытаў: «Цяпер толь-толь-ль-кі я ўба-ба-чыў, ведаю, як гэ-гэ-та-та до-до-б-брбра бы-бы-быць не-не-не-пітушчым».

На гэта жонка яго адказала: «Ніколі і падумаць не магла, што дажыву да такой публічнай ганьбы».

Потым пані Піцкноўн зноў абвясціла афсайд і сваім грубым мужчынскім голасам загадала:

— Усім дамам выйсці!

Да дам далучылася добрая палавіна мужчын, каб яшчэ лепш раскаштаваць лікёр у рэстаране пана Вашаты.

З астатнімі пані Піцкноўн засталася ў зале.

Гэтая прыстойная дама так захапілася сваёй супрацьалкагольнай справай, што нават не заўважала, што праз увесь той час рабілася вакол яе. Абкружаная грамадкай паноў, толькі ў той момант, калі ў залу зноў улез ляснічы ў адстаўцы пан Поліўка разам з капельмайстрам Воржакам, які ў карчме «Ля вакзала» абвясціў: «Я пайду туды, але ж набяруся там, як жаба гразі», гэтая ідэальная дама раптам заўважыла, што адбываецца нешта нядобрае. Толькі яна хацела даць параду, як правесці аукцыён паноў, як абодва, Поліўка і Воржак, хістаючыся, падышлі да яе і загарлапанілі, што аж вокны зазвінелі, куплеты старой песні «Дайце веры, дайце веры, мы былі ў Ярамеры...».

Пані Піцкноўн раптам адчула, што пан Поліўка асядлаў яе калені, і гушкаецца, і спявае: «Гушкі, гуш-

кі, гушкі, хадзем на падушкі — як памрэш, не аджывеш, я знайду другую...»

Капельмайстар Воржак ушчыкнуў яе за шчаку, выцягнуў з галавы шпільку і пачаў калупацца ў зубах. Потым яшчэ яна адчула, як нехта ўліў ёй у рот гарэлкі і нехта ўшчыкнуў за нагу.

Пасля прыйшлі дамы, якім было загадана выйсці з залы, і зруйнавалі ўсё ў памяшканні, як пасля вялікага царкоўнага свята.

IV

Пан Вашата, нягледзячы на шкоду, апісаную ў канцы папярэдняй часткі, публічна заяўляе, што благі абсталюнак карчомных памяшканняў можна палепшыць толькі наладжваннем вечарынак для непітушчых і амерыканскіх гульняў.

НАВАГОДНІ ВЕЧАР НЕПІТУШЧЫХ

Не ведаю, як так сталася, што старшыня таварыства непітушчых Ворачак, яго намеснік Бэк і член Машак вырашылі, што трэба адзначыць надыход Новага года, вядома ж, не парушаючы статута і мэты таварыства. Пазней высветлілася, што яны выклікалі членаў таварыства і даручылі ім хадзіць па вуліцах і прапагандаваць ідэі таварыства непітушчых.

Члены таварыства яшчэ і сёння адмаўляюцца, але ж у паліцэйскім пратаколе, складзеным на гэтых трох непітушчых у паліцэйскім участку, напісана, што яны расказалі, як ад добрага намеру прапагандаваць свае чыстыя безалкагольныя ідэі яны вечарам пайшлі на вуліцы, каб праз усю навагоднюю ноч быць апосталамі такой асветнай місіі, як прапаганда цвярозасці.

Таму, як толькі выйшлі на вуліцу, пан старшыня Ворачак спытаўся ў першага ж паліцэйскага, ці не будзе ён такі ласкавы і не скажа, дзе ўбачыць п'яных.

Гэта было ў шэсць гадзін вечара.

Паліцэйскі здзіўлена паглядзеў на яго і сказаў:

— І не сорамна вам, налізаліся з самай раніцы.

— Але ж, дазвольце!

— Нічога не дазволю, яшчэ адно слова, і я вас адпраўлю на ўчастак.

— Дзякую.

— Глядзіце ж, папярэджваю.

Непітушчыя маркотна пайшлі далей і на рагу Жытняй вуліцы заўважылі двух мужчын, якія пляліся ў бок плошчы. І тут усе разам падумалі, што тыя ідуць пэўна ў нейкі прытон, і вырашылі ісці за імі.

Ісці далёка не давялося, бо тыя заўважылі іх і пусціліся наўцёкі, кінуўшы пакунак.

Пан Бэк разгарнуў пакунак, і яны ўбачылі дзве пары ботаў. Тым часам каля іх ужо сабраўся натоўп, і нейкі нехлямяжы мужчына адной рукой схапіў пана Бэка за руку, а другой махаў перад тварам і крычаў, што ён добра ведае, як без ботаў таму беднаму зімой...

Пасля пан Машак пачуў: «Дай яму добра»,— і гэта было знакам да нападу на трох апосталаў, якія ўжо адступалі да дамоў і нарэшце ўбеглі ў нейкую карчму, і гаспадар замкнуў за імі дзверы.

На ўсякі выпадак карчмар спытаўся, чым ён можа паслужыць.

Яны агледзеліся і, як на грэх, убачылі на невялікіх бочачках: «Д'ябал з ромам», «Жытняя з ромам», «Слівянка І», «Слівянка ІІ» — надпісы абступалі іх з усіх бакоў.

— Што-небудзь без алкаголю,— выціснуў з сябе пан Машак.

— За пяць ці за дзесяць? — спытаўся, усміхаючыся, карчмар.

— За дзесяць.

Ён наліў усім і адвярнуўся, а пан Ворачак першы паспытаў і засумняваўся: здаецца, тут ёсць градусы.

— Не хвалюйцеся, якія там градусы, гэта старая польская кунтушоўка.

— Прабачце, але ж гэта подласць.

— Якая подласць, п'яніца ты. Увесь дзень цягаецеся па шынках, што ўжо за вамі людзі ходзяць, а цяпер хочаце тут паскандаліць. Добра ж вы сустракаеце Новы год, а цяпер — вон!

Калі яны дружна выскачылі з карчмы на вуліцу, натоўп патроху разышоўся.

Старшыня таварыства непітушчых пахіснуўся на лесвіцы перад алкагольным прытонам, а ў гэты час якраз прайшоў нейкі пан з дамай.

Ён пачуў, як той сказаў: «Паглядзі, Ганна, на гэтага п'яніцу, гэта нейкі пан Ворачак з першага аддзялення нашага банка. Быў такі прыстойны чалавек, а цяпер паводзіць сябе так брыдка».

— Прабачце, пан,— падступіў да яго спалоханы пан Ворачак,— дазвольце сказаць, пан дырэктар, гэта памылка; нашым жаданнем, маім і маіх прыяцеляў, наадварот, ёсць прапаганда ідэй непітушчых, і якраз сёння, калі народ памылкова лічыць, што Новы год трэба сустракаць абавязкова гарэлкай.

Паліцэйскі, які раней разганяў натоўп перад уваходам у манапольку, падышоў да пана Ворачака і строга сказаў:

— Я доўга сачу за вамі; прапаную вам апошні раз нікога не чапаць, інакш за п'янства апыніцеся на нарах.

Як мокрыя куры, яны ціха адышлі, і пан Ворачак усё даводзіў сваім прыяцелям, што гэта памылка высветліцца, пан дырэктар зразумее іх жаданне наконт мэты таварыства непітушчых.

Яны завярнулі за рог вуліцы, а кунтушоўка стукала ў галаву, і яны гаварылі пра нейкія памылкі, пра забойствы і раптам побач пачулі гукі гармоніка, якія даляталі з рэстарана.

— Вось тут і ёсць тое месца, якога мы шукаем,— сказаў старшыня,— мы ім асцярожна растлумачым, як паводзіць сябе, як яны пакрысе становяцца быдлам.

Яны ўвайшлі ў рэстаран і заказалі содавай. Агледзеліся. Дзве жанчыны сядзелі на каленях у двух хлапцоў, выгляд іх якраз адпавядаў песні, якую хорам спявала ўся кампанія: «Ходзяць там фраеры нечасаныя».

Як толькі песня скончылася, пан Машак раптам устаў і цвёрдым голасам, відаць ад уздзеяння кунтушоўкі, сказаў:

— Прабачце, калі ласка, але ж вы сапраўднае быдла.

Наогул, ён меў рацыю, бо калі б тых трох непітушчых кінулі б у рымскім цырку вядзьмаркам, дык і тады за такі кароткі час, што пабылі тут як апосталы цвярозасці, яны б так не выглядалі.

Без капелюшоў, расхрыстаныя, як пасля барацьбы з мядзведзем, з распухлымі тварамі, беглі яны па вуліцы і забеглі ў адзін атэль, каб хоць крыху падправіць свой туалет. Але і тут знайшлі такую самую кампанію, як і хвіліну назад, і, баючыся, каб зноў такога не здарылася, каб ніхто не звярнуў увагі на іх выгляд і не адчуў іх высакародных ідэй, на пытанне, чаго яны жадаюць, папрасілі піва.

Афіцыянт, малады прыгожы хлапец, з хвіліну раіўся з гаспадаром, а пасля падышоў да стала і сказаў, што нічога ім не налье, бо яны і так ужо добра налізаліся.

— Гэта памылка,— даводзіў свой высакародны прынцып пан Машак,— наадварот, маім і маіх таварышаў жаданнем ёсць прапаганда цвярозасці, асабліва сёння, калі людзі...

Ён не дагаварыў, бо гаспадар схапіў яго за каўнер і пацягнуў да дзвярэй.

— Убірайцеся адсюль! Я не дазволю вам сапсаваць вечар!

Пасля Машака, калі ён быў ужо за дзвярыма, гаспадар вярнуўся па пана Бэка, і той апынуўся за дзвярыма, а потым разам з афіцыянтам вытурыў старшыню таварыства непітушчых пана Ворачака, які быў уцёк на кухню, дзе ламаў рукі і крычаў:

— Гэта ж, прабачце, забойства!

І калі яны апынуліся на вуліцы, з апухлымі тварамі, без каўняроў у падраных гарнітурах, рашучасці, каб пайсці ў паліцыю і там давесці інспектару, што «іх мэтай з'яўляецца прапаганда цвярозасці, што яны апосталы новай культуры», у іх не хапіла.

А тут паліцэйскі інспектар сказаў сваё важкае слова вартавому, які быў на пасту:

— Усіх іх у каталажку, няхай праспяцца...

І тут дзверы ізалятара адчыніліся і зноў зачыніліся. Скончылася вялікая трагедыя апостальскай місіі, і вельмі сумна было, калі вясёлай і бурлівай навагодняй ноччу прачнуўся пан Ворачак на нарах і раздушаным клапом накрэмзаў на сцяне:

— Няма прарокаў у дзяржаве.

І гэта была праўда. Да таго ж усе тры праз тыдзень атрымалі лісты ад таварыства непітушчых, дзе паведамлялася аб яго ліквідацыі.

У пастанове не было нічога пра кунтушоўку, бойку і нары.

ПЕРАД ВЫХАДАМ НА ПЕНСІЮ

Выкладчык прыродазнаўства Вотруба сустрэў сваю вучаніцу — былую выхаванку жаночага ліцэя — паненку Гансгіркаву. Гэтая сустрэча зусім не ўзрадавала

педагога, бо Гансгіркава была далёка не выдатніца ў прыродазнаўчых навуках. На ўроках заалогіі яна блытала афрыканскага слана з індыйскім, на занятках па мінералогіі заўсёды гаварыла замест «актаэдр» «актаван» [1]. Не выяўляла яна ніякай цікавасці і да найпрасцейшых і ніжэйшых арганізмаў, а калі аднаго разу выкладчык Вотруба папрасіў яе ў лабараторыі паказаць, ці правільна яна спісала з дошкі хімічную формулу раданістага калію, ён — які жах! — убачыў такі запіс:

$Карал_3Н$ $Рыхард_5Н$

Іншымі словамі, яна прызначала спатканне Каралу ў 3, а Рыхарду ў 5 гадзін.

Нарэшце, выплыла напаверх, што аднойчы ў нядзелю яна не магла прысутнічаць на набажэнстве з-за таго, што выступала ў нейкім непрыстойным кабарэ і спявала там розныя шансанеткі пад псеўданімам Лілі Віці.

Гэта быў страшэнны ўдар па прэстыжы ліцэя. На допыце ў дырэкцыі, калі ёй сказалі, што ў яе надта кароткія спадніцы як на выхаванку старэйшага класа ліцэя, яна адказвала з дзівосна прастадушнай бесцырымоннасцю, а ў адказ на прапанову паказаць свой рэпертуар праспявала фрывольную шансанетку, суправаджаючы яе выразнымі рухамі. Вынік гэтага выступлення выхаванкі шостага «Б» быў куды менш прывабны: законанавучыцель самлеў і перакуліў чарніліцу на дырэктара. Нарада педагогаў уяўляла сабой вельмі сумную карціну.

Выкладчык Вотруба галасаваў за выключэнне Гансгіркавай абедзвюма рукамі.

Толькі адзін член педагагічнага савета, няштатны выкладчык, пачаў быў нешта гаварыць пра юную бяз-

---

[1] Актаэдр — васьмігранні к, актаван — васьмікласні к.

думнасць, але замест слова «бяздумнасць» ужыў слова «распуста». Пасля гэтага і ён падпісаў прысуд.

Да рашэння пра выключэнне з ліцэя Гансгіркава паставілася зусім спакойна.

У дзвярах яна паказала важным педагогам язык, а калі Вольная асацыяцыя артыстаў кабарэ наладзіла чарговае выступленне, на афішах красавалася: «Сярод іншых выступае Лілі Віці-Гансгіркава, былая выхаванка жаночага ліцэя». На прадстаўленні прысутнічалі маладыя члены педагагічнага савета і атрымалі вымову за парушэнне правілаў добрапрыстойнай навучальнай установы. Хоць пасля гэтага нічога больш не было, але выкладчык чэшскай мовы, які раней ад няма чаго рабіць перакладаў урыўкі з індыйскіх паэтаў, кінуў гэты занятак і, раздаўшы заданні выхаванкам, пачаў складаць на сваіх уроках легкадумныя песенькі.

Рыфмы самі прыходзілі яму ў галаву, калі ён бачыў гэтулькі ўсмешлівых дзявочых твараў, бо дзяўчаты працавалі над сачыненнем «Значэнне рамёстваў у Чэхіі ў сярэднія вякі» страшна нядбайна.

Прайшло ўжо даволі шмат часу пасля выключэння Гансгіркавай, і пра яе амаль перасталі ўспамінаць. Тут нічога ўжо нельга было змяніць: Гансгіркава стала вядомай актрысай кабарэ.

— Дзіўна,— гаварыў толькі часам дырэктар,— што яна стала славутасцю, яна ж не ведала аорыста і ні аднаго няправільнага грэчаскага дзеяслова.

А выкладчык Вотруба звычайна дадаваў:

— І афрыканскага слана не адрознівала ад індыйскага.

І вось цяпер ён сустрэў яе ў вагоне трамвая. Яна бесцырымонна падсела да пана Вотрубы і падала яму маленькую ручку, такую маленькую, што Вотруба нават падумаў: «Такая далікатная ручка выдатна справілася б з прэпаратамі для мікраскопа».

Яму здалося нават, што з'яўленне гэтай элегантнай дамы ў трамваі выклікала сенсацыю сярод пасажыраў. Нейкім прыемным пахам, водарам тонкіх духоў веяла ад яе.

«Та-а-к,— падумаў Вотруба,— духі — гэта рэчывы, якія дзейнічаюць на нашы органы нюху і ўзбуджаюць прыемныя адчуванні. Пахі дзеляцца на натуральныя і штучныя. Натуральныя могуць быць як раслінага, так і жывёльнага паходжання».

Пакуль яна сакатала, ён звярнуў увагу на футра вакол яе шыйкі.

«Футра падобнае,— вырашыў ён,— да падробленага бабра. Мажліва, што гэта нейкае млекакормячае з сям'і сумчатых. Калі я не памыляюся, гэта тасманскі вамбат. Як жа ён называецца па-лацінску?»

— Phascolomys! — моцна вымавіў Вотруба, звяртаючыся да сваёй прыгожай суседкі, якая ўвесь час паўтарала:

— Ах, якая прыемная неспадзяванка, мы гэтак даўно не бачыліся? Што ж вы парабляеце?

— Phascolomys! — адказаў ён.— Ах, pardon, я хацеў сказаць, што мае вучаніцы даюць мне столькі клопату. А ваша аднакласніца, паненка Машынава, працуе ў нас няштатным выкладчыкам. Яна напісала такую цудоўную дысертацыю пра стужачных глістоў.

— Яна ж і сама заўсёды была страшэнна худая,— абыякава кінула паненка Гансгіркава.— А як маецца пан Коўтнер? Я чула, што ён звар'яцеў.

— Калега проста ператаміўся,— паспешна адказаў пан Вотруба.— Мы хацелі з ім удвух пакончыць з Мендзялеевым.

Нейкі пасажыр, што сядзеў насупраць, спалохана ўтаропіўся на Вотрубу.

— Так,— гаварыў той далей,— мы хацелі на падставе найноўшых даследаванняў пра вісмут абвергнуць Мендзялеева з яго табліцай. Прызнаюся, мы сталі на

няправільны шлях. Вісмут застаецца вісмутам. Назавіце яго хімічны сімвал, паненка.— «Такая самая няўвага, як і раней»,— уздыхнуў ён, калі Гансгіркава нічога не адказала, не перастаючы ўсміхацца.— Вы без прычыны ўсміхаецеся. Хімічны сімвал вісмуту — Bi. Якія злучэнні вісмуту вы ведаеце? Ах, pardon, выбачайце, я заўсёды думкамі са сваімі вучаніцамі.

— Як гэта прыемна чуць ад вас! — сказала яна, жмурачыся, што здалося педагогу крыху дзіўным, але не зрабіла на яго дрэннага ўражання.

— У мяне наогул цяпер шмат спраў,— сказаў ён, прыязна паглядаючы на яе.— Я займаюся пытаннямі анабіёзу некаторых відаў жывёлы. Як вам вядома, паненка, жабы ўпадаюць у зімовую спячку, ад якой яны прачынаюцца вясной, калі з'яўляецца магчымасць зноў вольна рухацца. Летась, калі я наведаў Егіпет з навуковымі мэтамі, у пошуках грызуна тушканчыка егіпецкага я выпадкова сутыкнуўся з анабіёзам пры ўскрыцці аднаго пахавання ў пірамідзе: са склепа выскачыла жаба. Я ведаю шмат якія віды егіпецкіх жаб, і тут мне прыйшло ў галаву, што, можа, гэта адна з тых біблейскіх жаб, якія ў часы Іосіфа Цудоўнага так назалялі Егіпту. Магчыма, што яна была яшчэ старэйшая і адносілася да эпохі першых фараонаў, пры якіх яна залезла ў склеп у пірамідзе і прабыла тысячагоддзі ў стане анабіёзу, вельмі падобнага да спячкі. Жаба ва ўзросце чатырох тысяч або шасці тысяч гадоў!

Усе навокал засмяяліся.

— Мы можам выйсці,— сказаў ён, разгубіўшыся.— Вам куды?

Калі яны выйшлі з вагона, паненка Гансгіркава заўважыла, што лепей за ўсё зайсці куды-небудзь павячэраць. Яна сказала гэта з такой мілай усмешкай, што выкладчык Вотруба прапанаваў пльзенскі рэстаран, куды ён не раз хадзіў у маладосці, як быў яшчэ прак-

тыкантам. Седзячы з прыгожай дамай за рэстаранным столікам, нейкі час ён моўчкі глядзеў перад сабою, потым, быццам яго падганялі нейкія дакоры сумлення, загаварыў пра тое, што калісьці гарматы вылівалі з бронзы.

— Восем працэнтаў волава, столькі вось марганцу і астатняе медзь,— завёў ён сяброўскую размову.— Цвёрдасць сплаву была 98,75 кілаграма на квадратны міліметр, пругкасць — 2,5 працэнта.

Тут падалі цялячыя ныркі з бульбай.

— Глядзіце, паненка,— гаварыў ён, пазіраючы на Гансгіркаву незвычайна прыязна.— У Паўднёвай Амерыцы абарыгены робяць гарнір да цялячых нырак не з бульбы, а з ядомых клубняў расліны, так званай «ульёка», або «мельюка», якая належыць да сям'і партулакавых.

— Вы былі надта слабыя ў батаніцы. Вельмі шкада!

Ён сказаў гэта так мякка і сумна і паглядзеў на яе так жаласна, што не ўзнікала ніякага сумнення, як усё гэта кончыцца і што цяпер самая пара былой вучаніцы пана Вотрубы знайсці спосаб яго развесяліць.

Гэтая справа была ёй звыклай. Яна прапанавала пайсці ў кабарэ. Пад раніцу выкладчык учыніў вялікі скандал у бары пры кабарэ. Ён ледзь не збіў кійком аднаго пана, які аказаўся сябрам паненкі Лілі Віці-Гансгіркавай. Пры гэтым Вотруба крычаў:

— Выбірайцеся адгэтуль, васпане, гэта мая былая вучаніца. Я выкладчык ліцэя Ёзаф Вотруба!

Потым ён упаў у стан поўнага здранцвення, які так захапляў яго ў жаб.

Прачнуўся ён позняй раніцай, спазніўшыся на ўрокі, успомніў усё, што адбылося, і падаў прашэнне на выхад на пенсію, зрабіўшы гэты рашучы крок пасля дзівосных прыгод са сваёю былой вучаніцай, якую выключыў з навучальнай установы.

БУРЖУЙ РАМЗЭЛІК

З панам Рамзэлікам я пазнаёміўся не ў бальшавіцкай Расіі. Пан Рамзэлік наогул не ведаў, што я быў у Расіі. Ён і не падумаў, што я савецкі камісар, а мае сумленныя карыя вочы выклікалі ў яго давер да мяне. Мы пазнаёміліся тады, як я выйшаў на невялікім прыпынку ў лесе і спытаўся ў пана Рамзэліка, як дайсці да Баланава. Пан Рамзэлік павольна павярнуў галаву і сказаў:

— Я з Баланава.

Бязлітасна паліла сонца, і я падаўся ў цянёк да пана Рамзэліка. Хутка я ўжо ведаў яго анкетныя дадзеныя, а праз паўгадзіны быў яго прыяцелем. Яшчэ праз паўгадзіны ён запрасіў мяне да сябе на вілу, і мы выправіліся ў дарогу.

— Вось старая здзівіцца, што не дачакаўся яе. Бачыце, яшчэ нічога такога ніколі не здаралася, але ж хто ведае. Калі ў чалавека залаты ланцужок матляецца, на галаве цыліндр, адразу відаць, што чалавек гэты пан. Кожны ведае, што ў мяне ёсць віла. Адзіная на ўвесь Баланаў. Таму я ніколі не іду праз лес адзін. Гэта небяспечна. Вось і загадваю жонцы сустракаць мяне. А калі б яна не прыйшла, ды і вас не спаткаў выпадкам, то адзін не пайшоў бы, застаўся б на прыпынку. Вось было б ёй. Праз гадзіну ідзе цягнік на Ілава. Купіў бы білет да Ілава. Там бы пайшоў на пошту і паслаў тэлеграму: «Старая, я ў Ілаве». Пасля пайшоў бы ў шынок і сядзеў бы там, аж пакуль яна не прыехала б па мяне. Я не баязлівец. Не. На віле ў мяне ёсць стрэльба, зараджаная. І калі б прыйшлі бальшавікі, я бараніў бы свой маёнтак і страляў бы датуль, пакуль гэтыя галадранцы не паўцякалі б. У палітыцы я разбіраюся як ніхто іншы. Паглядзіце на царскую Расію. Што было? І што сёння? А таму і кажу: «Старая, ідзі мне насустрач. Я адзін лесам не пайду».

— І што ж ваша жонка? Вы не баіцеся, што якінебудзь бандыт перастрэне яе ў тым гушчары?

— Але, прабачце,— усміхнуўся пан Рамзэлік.— Каму баба патрэбна? Баба і ёсць баба. А да таго ж яна выбягае ў лес у чатыры гадзіны раніцы. Нібыта па грыбы. Хоць яны нам і не патрэбныя, у нас жа віла, ёсць свінні, дзве казы, адзення на некалькі тысяч, бялізны на тысячы, золата, серабро. Ёсць поле, гаспадарка, курэй трымаем, ну, а віла — цудоўная будыніна з верандай. На адзін бок пакой і кухня і на другі бок пакой і кухня. Там жывуць кватаранты. Праўда, гэта такая галота, але жанчына сумленная і ведае, як сябе паводзіць. Прыйдзе да мяне ў майстэрню і так ветліва папросіць: «Гаспадар, зрабіце ласку, адрамантуйце мне боцікі». Або пойдзе да жонкі на кухню: «Гаспадыня, паспрабуйце малін, нядорага каштуе». Наогул да людзей тут ставяцца няроўна. Пражаніна паважаюць. А на мяне востраць зуб, бо я з Галяшовіц, а тут маю вілу. Ведаеце, каб я прадаў вілу, дык да самай смерці ні мне, ні старой не давялося б пальцам варухнуць. Трыццаць тысяч чыстых было б. Толькі каб тыя грошы плацілі як раней. А ўсяму віной сацыялісты. Каб іх не было, ого-го! Падносак трыццаць крон, набойка пяць крон. Чалавек мог бы жыць, куранят есці смажаных, вараных, печаных. Але ж не. Схаўрусаваліся з сялянамі, ніхто працаваць не хоча, за яечка просяць пяцьдзесят крэйцараў, за ўсё плаці, за каву, за воцат, за ўсялякае глупства. Шпікулянты і бальшавікі! Адзін аднаму нічога не зробіць. Дабрадзейства вымерла. І любоў да блізкага! Сіраты ніхто не прыгрэе. Але на буржуя кожны плюне. А хто ж пасля таго пагрому ўзяў сірату ў Баланаве, хлапчука, што служыў у селяніна Хампейза?

Хто, селянін ці, можа, сацыяліст?

Не, ён не быў ні селянінам, ні сацыялістам. Быў гэта буржуй, гаспадар. Гэта быў я, пан Рамзэлік. Узяў

сірату. Падвёў да варштата і сказаў: «Не на мяне ты будзеш рабіць, а на сябе. Працуй. Паглядзі на мяне. Я вечна тут не буду. Паглядзі на маю старую, на пані Рамзэлікаву. І яна не вечная. Дык будзь старанны і пільнуйся. Насі ваду, пасві коз, збірай у лесе дровы, хадзі па траву. Усё гэта ты будзеш рабіць дзеля сябе. Ці буду я мець што з таго? Не буду. Бо я мог жа ўзяць сабе парабка, даць яму тых дзесяць — дваццаць залатых. Нічога б са мной не зрабілася. Але што было б з табой? Загінуў бы ты ў багне, задушыўся б у хвалях сацыялізму. Працуй сам на сябе. Глядзі, віла што той палац, свінні ў хляве, дзве казы. Добра іх даглядай. Ці калі табе так было? Вырасцеш, убярэшся ў сілу, будзеш сапраўдным мужчынам. Не прападзеш на свеце». Але, пане дабрадзею, гэта не аплацілася. Думаеце, Лойза ўдзячны мне і ласкай плаціць за ласку? Гультай. Як у чатыры раніцы будзіш яго, каб ішоў па грыбы, плача. Аб адзінаццатай уначы яму яшчэ хочацца есці. Ён бы ішоў у куток з поўным жыватом. Ніякага ўяўлення пра гігіену. Пераборлівы. Наша бульбачка яму ўжо прыелася. Такая бульбачка! Шаноўны пан, я да смерці люблю бульбу. Таму яна ў нас кожны дзень. А не таму, што няма чаго далікатнейшага, не. Дзе там! Падносак трыццаць крон, набойка пяць крон, дзве казы ў хляве. Малака досыць. Грыбоў прынясе Лойза. Дроў хапае, іх Лойза наносіць, запаліць у грубцы, жывот пагрэем, і сірата пагрэецца каля нашага агеньчыка. Хоць мы і з горада, а ўстаём рана. У чатыры гадзіны, разам з жаўрукамі. Каб той хлопец меў добры прыклад. Часам гадзіннік падвяду, каб Лойза раней паспеў у лес. Вядома ж, на світанні грыбоў больш збярэш. Хто рана ўстае, таму пан бог дае. Толькі ж я і мая старая не такія ўжо і раннія птушкі. Нам ужо не так лёгка рана ўстаць. Але што з таго. Пасля яшчэ трохі прыкархнём. Мы ж людзі старыя, ды яшчэ з горада. Ужо нам цяжка мяняць звычкі. Але ж мы працавітыя людзі. Ста-

рая дапамагае сялянам на полі і на дварэ. Калі-нікалі пашле за сябе Лойзу. Хлапец малады, сілы больш. Ды злуецца хлопец, злуецца. Нічога не застаецца, як збыць яго, дармаеда, каму-небудзь. Але хто яго возьме на зіму. Разлянуецца зусім, распусціцца. Такое маладое цела павінна выпрацавацца. А зімой я нічым не магу дапамагчы гэтаму. Бо самім няма чаго рабіць. Коз дагледзіць служанка, я ў яе не пытаюся, падабаецца ёй гэта ці не. Больш ёй няма дзе жыць. Вось і рада, што не выкідаем яе з тых дзвюх свяцёлак.

Чалавек жа мог зрабіць з іх салон, купіў бы піяніна, пісьмовы стол, радыёлу. Але навошта? Няхай гаротная жанчына мае добры пакой. Ёй і ў сне не снілася на старасці жыць у віле.

Мы выйшлі на ўзлесак. Прыгожая вёсачка паўстала перад намі. Дагледжаныя сядзібы, прыгожыя дамкі. Пан Рамзэлік рукой паказаў на адзін дамок на другім канцы вёскі:

— Вунь там наша віла. Ні ў кога больш тут вілы няма, толькі наша.

Ён забыўся, што запрашаў мяне на вілу, і сардэчна паціснуў мне руку. Мы развіталіся. Я стаяў на ўзлеску і глядзеў на пана Рамзэліка. Не бачыў я, як матляўся яго ланцужок, але цыліндр яго бліскаў на сонцы.

Ён звярнуў за рог, а я пайшоў у карчму. Мяне сагравала думка, што я забяспечыў у лесе ахову пана Рамзэліка, буржуя і дабрадзея.

УДАЛЫ САЛДАТ ШВЕЙК ВУЧЫЦЦА АБЫХОДЗІЦЦА З ПІРАКСІЛІНАМ

Хто дагэтуль нічога не ведае пра ўдалага салдата Швейка, таму, магчыма, будзе цікавая гэтая характарыстыка прыстойнага салдата. Удалы салдат Швейк хоча служыць у войску аж да скону. І пры гэтым так

усім адурыў галаву, гаворачы, як яму хочацца служыць гасудару імператару аж да апошняга ўздыху, што начальства вырашыла дэмабілізаваць яго. Пагадзіцца з такім рашэннем ён не мог і з усяе сілы супраціўляўся. І калі ўжо рашэнне было падпісана, ён уцёк з бальніцы. Дэзерціраваў, каб мець магчымасць служыць гаспадару імператару аж да апошняга ўздыху.

Праз два тыдні ён вярнуўся ў казарму і адрапартаваў: «Маю гонар давесці да вашага ведама, што я ўцёк, каб і надалей служыць у войску». Гаварыў ён гэта са сваёй звычайнай пачцівай усмешкай на дабрадушным круглым твары і, як заўсёды, ласкава пазіраў у вочы вайсковаму начальству.

Жаданне яго задаволілі: ён атрымаў паўтара года, а як і пасля гэтага ён настойліва дамагаўся служыць гасудару імператару і нічога з ім не маглі зрабіць, залічылі яго ў арсенал 104-га палка.

Але ўдалы салдат Швейк не з баязлівага дзесятка. Жыў ён у асобным бараку побач з дынамітам, экразітам і піраксілінам, дзе набіваў тарпеды гэтымі рознымі рэчывамі, і па ўсім наваколлі разносіўся яго спеў:

Ах П'емонт, П'емонт!
Ты краіна панская.
Разам з табой да д'ябла паляцела
Уся апора міланская.
Гоп, гоп, гоп!

І апора ўся,
І чатыры масты,
Выстаўляй, П'емонт,
Мацнейшыя фарпосты —
Гоп, гоп, гоп!

Я ж вам пасылаў
Цэлы полк уланскі,
Вы яго згубілі
Ля варот міланскіх —
Гоп, гоп, гоп!

За гэтай цудоўнай песняй, якая рабіла ўдалага салдата Швейка львом, ішлі не горшыя песні пра кнедлікі велічынёй з чалавечую галаву, якія ўдалы салдат Швейк паглынаў з вялікім імпэтам.

І так ён жыў, задаволены сваім лёсам, сам-насам з піраксілінам, у асобным арсенальным бараку. Ды тут аднойчы з'явілася інспекцыя, якая правярала барак за баракам, ці ўсё там у парадку.

Увайшоўшы ў барак, дзе ўдалы салдат Швейк вучыўся абыходзіцца з піраксілінам, яны ўбачылі па воблаку тытунёвага дыму, якое плыло са Швейкавай люлькі, што ўдалы салдат сапраўды бясстрашны ваяка.

Убачыўшы начальства, Швейк устаў і, згодна са статутам, выняў люльку з рота і паклаў яе збоку каля сябе, каб недалёка было працягваць руку па яе, якраз ля адчыненага сталёвага чана з піраксілінам. І, стоячы на «смірна», адрапартаваў:

— Маю гонар паведаміць, што ўсё ў парадку. Нічога новага не здарылася.

У жыцці бываюць такія моманты, калі ўсё залежыць ад прысутнасці духу.

Самым кемлівым аказаўся палкоўнік. Над піраксілінам ужо віўся дымок, і тады ён сказаў:

— Швейк, можаце курыць!

Гэтае рашэнне было самае правільнае, бо значна лепш, калі люлька будзе ў роце, а не ў піраксіліне.

— Слухаюся, пан палкоўнік,— адказаў Швейк. Ён быў надзвычай дысцыплінаваны салдат.

— А цяпер, Швейк, шагам марш на гаўптвахту!

— Асмельваюся далажыць, што гэта немагчыма. Згодна з загадам я мушу знаходзіцца тут да шасці гадзін, пакуль мяне не зменяць. Ля піраксіліну заўсёды павінен нехта быць, каб не здарылася няшчасця!

Інспекцыя трухам-трухам падалася ў каравульнае памяшканне, каб паслаць па Швейка канвой.

Канваіры хоць неахвотна, але ж пайшлі.

Прыйшоўшы да барака, дзе ўдалы салдат Швейк сядзеў ля піраксіліну і курыў сваю люльку, малодшы унтэр-афіцэр крыкнуў:

— Швейк, мярзотнік, кідай праз акно сваю люльку і выходзь.

— І не падумаю. Раз пан палкоўнік загадаў мне курыць, дык буду курыць да самай смерці.

— Вылазь вон, шэльма!

— Не вылезу, асмелюся далажыць. Цяпер чатыры гадзіны, а змена толькі ў шэсць. Да шостай я павінен быць тут ля піраксіліну, каб не здарылася якога няшчасця. Я наконт гэтага дбай...

Скончыць слова ён не паспеў. Магчыма, вы чыталі пра тую трагедыю ў арсенале, пасля якой была абвешчана нацыянальная жалоба ў Аўстрыі. За якія-небудзь тры чвэрці секунды ўвесь арсенал, барак за бараком, узляцеў у паветра.

Пачалося з таго барака, дзе ўдалы салдат Швейк вучыўся абыходзіцца з піраксілінам. Над тым месцам узняўся курган бэлек і жалезнага лому, якія зляцеліся сюды адусюль, каб аддаць свой апошні доўг мужнаму Швейку, які не баяўся піраксіліну.

Тры дні працавалі на руінах сапёры, складаючы галовы, тулавы, рукі і ногі, каб пану богу на страшным судзе было лягчэй разабрацца з чынамі і беспамылкова раздаць узнагароды. Скажу вам, гэта была сапраўдная галаваломка.

Тры дні і дзве ночы разбіралі яны курган над магілай Швейка, а на трэцюю ноч, калі дабраліся да дна кургана, раптам пачулі прыемны голас:

І апора ўся,
І чатыры масты,
Выстаўляй, П'емонт,
Мацнейшыя фарпосты!
Гоп, гоп, гоп!

Пры святле ліхтарыкаў яны рабілі праход, ідучы на голас:

Я ж вам пасылаў
Цэлы полк уланскі,
Вы яго згубілі
Ля варот міланскіх —
Гоп, гоп, гоп!

Нарэшце святло ліхтарыка наткнулася на невялікую пячорку, утвораную з жалязякаў і бэлек, дзе ў куточку сядзеў удалы салдат Швейк. Ён устаў, выцягнуў з рота люльку і адрапартаваў:

— Маю гонар далажыць: нічога не здарылася. Усё ў поўным парадку!

Яго выцягнулі з гэтага пекла, і ўдалы салдат Швейк, апынуўшыся перад афіцэрам, ізноў далажыў:

— Усё ў поўным парадку, толькі папрашу, каб прыслалі змену: шэсць гадзін даўно прайшло. А таксама прашу заплаціць мне звышурочныя за той час, што я знаходзіўся на пасту.

Мужны салдат быў адзіным з усяго арсеналу, хто перажыў тую катастрофу.

Вечарам у афіцэрскім клубе была наладжана невялікая вечарынка ў яго гонар. Удалы салдат Швейк, абкружаны афіцэрамі, чарку за чаркай куляў у рот, і яго круглы твар зяяў ад шчасця.

Назаўтра яму выплацілі звышурочныя за тры дні, як на вайне, а праз тры дні яму прысвоілі званне капрала ды яшчэ і ўзнагародзілі вялікім сярэбраным медалём.

Упрыгожаны медалём і капральскімі зорачкамі на пагонах, ён ля варот трэнцкіх казармаў сустрэўся з афіцэрам Кноблахам. Убачыўшы пачцівую дабрадушную ўсмешку на круглым твары Швейка, афіцэр здрыгануўся:

— Гэта ты, галаварэз!

Усміхаючыся, Швейк адказаў:

— Маю гонар далажыць, што я навучыўся абыходзіцца з піраксілінам.

І з пачуццём уласнай годнасці пакрочыў у двор, да сваёй роты.

У той самы дзень дзяжурны афіцэр прачытаў салдатам загад ваеннага міністэрства аб арганізацыі пры арміі паветраных войск і зварот да ўсіх, хто жадае ўступіць у гэтыя часці.

Удалы салдат Швейк выступіў наперад і заявіў:

— Дазвольце далажыць, я ўжо быў у паветры, справа мне знаёмая, і таму жадаю паслужыць гасудару імператару ў паветраных войсках.

Праз тыдзень удалы салдат Швейк быў адпраўлены ў паветраную авіяцыю, дзе пачаў сваю новую службу гэтак жа разважна, як і ў арсенале, пра што гаворка будзе далей.

КАМЕНДАНТ ГОРАДА БУГУЛЬМЫ

Калі мне на пачатку кастрычніка тысяча дзевяцьсот васемнаццатага года рэвалюцыйны ваенны савет «левобережной группы в Симбирске» паведаміў, што я прызначаны камендантам горада Бугульмы, я запытаўся ў старшыні Каюрава:

— А вы на сто працэнтаў ведаеце, што Бугульма ўжо ўзята?

— Дакладных звестак не маем,— адказаў ён,— моцна сумняваюся, што яна ўжо цяпер у нашых руках, але пакуль вы прыедзеце туды, спадзяюся, што будзе так.

— А суправаджаць мяне хто-небудзь будзе? — пацікавіўся я ціхім голасам.— І яшчэ адно: як я дабяруся ў тую Бугульму і дзе, уласна кажучы, яна знаходзіцца?

— Суправаджаць вас будуць, атрымаеце дванаццаць салдат; а што датычыць другога, паглядзіце на карту. Вы думаеце, што ў мяне толькі адзін клопат — ведаць, дзе знаходзіцца ваша нейкая няшчасная Бугульма?

— Яшчэ адно пытанне, таварыш Каюраў: калі я атрымаю грошы на дарогу і на выдаткі?

Ён пляснуў рукамі, пачуўшы такое пытанне.

— Вы звар'яцелі! Па дарозе ж будуць вёскі, там вас накормяць і напояць, а на Бугульму накладзяце кантрыбуцыю...

Унізе, у вартавым памяшканні, мяне чакала мая каманда. Дванаццаць статных хлопцаў — чувашы, якія вельмі слаба ведалі рускую мову, так што ніяк не маглі растлумачыць, мабілізаваныя яны ці добраахвотнікі. Па іх жыццярадасным і грозным выглядзе можна было меркаваць, што гэта хутчэй добраахвотнікі, гатовыя на ўсё.

А калі я атрымаў свае паперы з бязліччу паўнамоцтваў, дзе выразна падкрэслівалася, што ад Сімбірска аж за Бугульму кожны грамадзянін павінен мне дапамагаць як толькі можна, я сеў са сваёй экспедыцыяй на параход, і мы ехалі па Волзе і па рацэ Каме аж да Чыстапаля.

Па дарозе не было ніякіх асаблівых прыгод, толькі адзін чуваш з маёй світы ўпаў у нецвярозым стане з палубы і ўтапіўся. Засталося ў мяне іх адзінаццаць. У Чыстапалі, калі мы сышлі з парахода, адзін чуваш падрадзіўся дастаць фурманкі і больш не вярнуўся. Іх засталося дзесяць, і ад іх я з цяжкасцю даведаўся, што таму чувашу, які знік, адсюль да яго дому, да Монтазма, кіламетраў сорак і ён пайшоў паглядзець, што робяць яго бацькі.

Калі ж нарэшце пасля доўгіх роспытаў у тутэйшага насельніцтва я ўсё-такі запісаў, дзе тая Бугульма знаходзіцца і як нам туды трапіць, астатнія чувашы знай-

шлі фурманкі, і па гразкіх, жахлівых дарогах таго краю мы паехалі на Крачалгу, Еланова, Москава, Гулукова, Айбашава. Усё гэта вёскі, населеныя выключна татарамі, а ў Гулукове жывуць чарамісы [1] і татары разам.

З той прычыны, што чувашы, якія прынялі хрысціянства каля пяцідзесяці гадоў назад, і чарамісы, якія яшчэ дагэтуль паганцы, страшэнна варагуюць, у Гулукове здарылася маленькая непрыемнасць. Мае чувашы, узброеныя да зубоў, агледзеўшы вёску, прывалаклі да мяне старасту Даўледбая Шакіра, які трымаў у руцэ клетку з трыма белымі вавёркамі. Адзін чуваш, што ведаў рускую мову найлепш, звярнуўся да мяне з такім тлумачэннем:

— Чувашы праваслаўныя адзін, дзесяць, трыццаць, пяцьдзесят гадоў — чарамісы паганцы, свінні.

Вырваўшы з рукі Даўледбая Шакіра клетку з белымі вавёркамі, ён гаварыў далей:

— Белая вавёрка — гэта іх бог — адзін, два, тры багі. Гэты чалавек свяшчэннік, скача з вавёркамі, скача, моліцца ім. Ты яго ахрысціш...

Чувашы выглядалі гэтак грозна, што я загадаў прынесці вады, пакрапіў Даўледбая Шакіра, мармычучы незразумелыя словы, і потым адпусціў яго.

Чарамісіх багоў мае малойцы пасля разабралі, і магу ўсіх запэўніць, што з чарамісіка бога вельмі добры суп.

Потым мяне яшчэ наведаў мясцовы мусульманскі мула Абдулгалей і выказаў радасць з той прычыны, што мы гэтых вавёрак з'елі.

— Кожны павінен у нешта верыць,— сказаў ён,— але ў вавёрак — гэта свінства, яны скачуць сабе з дрэва на дрэва, а калі ў клетках, дык гадзяць там, вось дык пан бог.

---

[1] Чарамісы — ранейшая назва марыйцаў.

Ён прынёс нам многа смажанай бараніны і трох гусей і запэўніў нас, што, калі чарамісы ўначы ўзнімуць бунт, усе татары будуць з намі.

Нічога не здарылася, бо, як казаў Даўледбай Шакір, які прыйшоў перад нашым ад'ездам уранні, вавёрак у лесе поўна. Нарэшце мы праехалі Айбашава і ўвечары без усялякіх прыгод былі ў Малой Пясочніцы, рускай вёсцы за дваццаць вёрст ад Бугульмы. Мясцовае жыхарства было надзвычай добра інфармавана пра тое, што дзеецца ў Бугульме. Белыя пакінулі горад без бою тры дні назад, савецкія войскі стаяць на другім баку горада і баяцца ўвайсці, каб не трапіць у пастку.

У горадзе безуладдзе, а гарадскі галава чакае з усім кіраўніцтвам ужо два дні з хлебам і соллю, каб прывітаць таго, хто ўвойдзе ў горад.

Я паслаў першым таго чуваша, які найлепш ведаў рускую мову, а раніцай мы рушылі на Бугульму.

Каля самага горада насустрач нам ішоў незлічоны натоўп. Гарадскі галава нёс на падносе бохан хлеба і соль у місцы.

У сваёй прамове ён выказаў спадзяванне, што я злітуюся над горадам. Я адчуваў сябе Жыжкам [1] перад Прагай, асабліва калі ўбачыў у працэсіі маленькіх школьнікаў.

Адрэзаўшы скібку хлеба і пасыпаўшы яе соллю, я падзякаваў і выступіў з доўгай прамовай. Націск рабіў на тое, што я не прыйшоў вяшчаць нейкія лозунгі, не, мая мэта — спакой, мір, парадак. Урэшце я пацалаваў старасту, падаў руку прадстаўніку праваслаўнага духавенства і накіраваўся ў ратушу, дзе мне былі адведзены пакоі для гарадской камендатуры.

Потым я загадаў расклеіць загад нумар 1 наступнага зместу:

---

[1] Жыжка Ян — адзін з правадыроў чэшскага вызваленчага руху гусітаў.

Грамадзяне!

Дзякую вам усім за цёплую і шчырую сустрэчу і пачастунак хлебам і соллю. Захоўвайце заўсёды старадаўнія славянскія звычаі, я нічога не маю супраць іх, але, калі ласка, пры гэтым не забывайцеся, што я прызначаны камендантам, у якога ёсць і свае абавязкі.

Таму прапаную вам, дарагія сябры, здаць усю зброю ў ратушу, у пакой камендатуры горада, заўтра да 12 гадзін дня. Не пагражаю нікому, але вы ведаеце, што горад у стане аблогі.

Адзначаю яшчэ, што павінен быў накласці на горад кантрыбуцыю, і абвяшчаю, што горад ніякай кантрыбуцыі плаціць не будзе.

Подпіс.

На другі дзень а дванаццатай гадзіне плошча запоўнілася ўзброеным людам. Прыйшло, напэўна, больш за тысячу чалавек з вінтоўкамі, нехта цягнуў нават кулямёт.

Нас адзінаццаць знікла б у гэтай паводцы ўзброенага люду, але яны ішлі здаваць зброю. Здавалі доўга, да вечара, пры гэтым кожнаму я падаў руку і сказаў некалькі прыемных слоў.

Уранні я загадаў надрукаваць і расклеіць загад нумар 2:

Грамадзяне!

Дзякую ўсяму жыхарству Бугульмы за дакладнае выкананне загаду нумар 1.

Подпіс.

Я пайшоў спакойна спаць у той дзень, не падазраючы, што нада мной павіс дамоклаў меч у выглядзе Цвярскога рэвалюцыйнага палка.

Як я сказаў, савецкія войскі стаялі на другім баку Бугульмы, прыкладна пятнаццаць вёрст на поўдзень,

і не адважваліся ўвайсці ў горад, асцерагаючыся пасткі, але нарэшце атрымалі загад з Сімбірска ад Рэвалюцыйнага Ваеннага Савета любой цаной узяць Бугульму і забяспечыць такім чынам базу для савецкіх войскаў, што праводзілі аперацыі на ўсход ад Бугульмы.

І вось так таварыш Ерахімаў, камандзір Цвярскога рэвалюцыйнага палка, ішоў у тую ноч абкладаць і браць Бугульму, калі я ўжо трэці дзень у страху божым быў камендантам горада і ўладарыў на радасць усіх слаёў грамадства.

Цвярскі полк, «уварваўшыся» ў горад, страляў залпамі ў паветра і, праходзячы па вуліцах, натыкнуўся на супраціўленне толькі з боку майго патруля — двух чувашоў. Яны, разбуджаныя на варце каля брамы камендатуры горада, не хацелі пусціць у ратушу таварыша Ерахімава, які з рэвальверам у руцэ на чале палка ішоў браць яе.

Чувашоў захапілі ў палон, а Ерахімаў зайшоў у маю канцылярыю і спальню.

— Рукі ўгору! — сказаў ён, ап'янелы ад перамогі, настаўляючы на мяне рэвальвер.

Я рахмана падняў рукі.

— Хто вы такі? — запытаўся камандзір Цвярскога палка.

— Камендант горада.

— Ад белых ці ад савецкіх войскаў?

— Ад савецкіх. Ці магу я апусціць рукі?

— Можаце, але прашу вас неадкладна, паводле ваеннага права, перадаць мне кіраванне горадам, бо я ўзяў Бугульму.

— Але я быў прызначаны,— запярэчыў я.

— Такое прызначэнне ні шэлега не варта. Спачатку трэба заваяваць яго.

— Ведаеце што,— сказаў ён праз хвіліну велікадушна,— я вас прызначаю сваім ад'ютантам. Калі вы

не згодзіцеся, я загадаю вас праз пяць хвілін расстраляць.

— Я нічога не маю супраць таго, каб быць вашым ад'ютантам,— адказаў я і клікнуў свайго вестаўога: — Васіль, пастаў самавар, пап'ём чаю з новым камендантам горада, які толькі што ўзяў Бугульму.

У зямной славы кароткі век.

АД'ЮТАНТ КАМЕНДАНТА ГОРАДА БУГУЛЬМЫ

Першае, што я зрабіў, гэта вызваліў сваіх двух палонных чувашоў і пайшоў дасыпаць: мне ж не даў выспацца пераварот у горадзе. Апоўдні я прачнуўся і выявіў, што, па-першае, усе мае чувашы зніклі, пакінуўшы ў маім боце запіску даволі незразумелага зместу: «Таварыш Гашак. Шмат дапамогі шукаць вакол то там, то тут. Таварыш Ерахімаў башка-кхава (галава далоў)»; па-другое, што таварыш Ерахімаў з самай раніцы пацее над складаннем свайго першага загаду жыхарству Бугульмы.

— Таварыш ад'ютант,— звярнуўся ён да мяне,— як вы думаеце, гэтак будзе добра?

Ён узяў з кучы папер — гэта былі праекты загадаў — ліст з закрэсленымі радкамі і пастаўленымі над імі словамі і стаў чытаць:

«Да ўсіх грамадзян Бугульмы! Сённяшнім днём пасля падзення Бугульмы я ўзяў на сябе кіраванне Бугульмой. Былога каменданта за няздатнасць і баязлівасць здымаю з пасады каменданта і прызначаю яго сваім ад'ютантам. Камендант горада Ерахімаў».

— Гэтым усё сказана,— пахваліў я,— а што вы думаеце рабіць далей?

— Найперш,— адказаў ён паважна і ўрачыста,— загадаю мабілізаваць коней, потым расстраляю гарадскога галаву, а з буржуазіі вазьму дзесяць заложнікаў і адпраўлю ў зняволенне да канца грамадзянскай вайны. Пасля зраблю ўсеагульны о б ы с к у горадзе і забараню вольны гандаль. На першы дзень гэтага будзе дастаткова, а заўтра прыдумаю нешта яшчэ.

— З вашага дазволу,— сказаў я,— нічога не маю супраць мабілізацыі коней, але рашуча пратэстую супраць расстрэлу гарадскога галавы, які прывітаў мяне хлебам і соллю.

Ерахімаў ускочыў:

— Вас вітаў, але да мяне яшчэ не прыйшоў...

— Гэта можна выправіць,— сказаў я,— пашлём па яго.

Я сеў за стол і напісаў:

Камендатура горада Бугульмы
Нумар 2891
Действующая армия

Гарадскому галаве Бугульмы!

Загадваю Вам неадкладна прыйсці з хлебам і соллю паводле старога славянскага звычаю да новага каменданта горада.

Камендант горада Ерахімаў
Ад'ютант Гашак

Падпісаўшы гэта, Ерахімаў дадаў: «Іначай будзеце расстраляны, а ваш дом спалены».

— На афіцыйных дакументах,— сказаў я Ерахімаву,— нельга нічога такога дапісваць, бо тады яны несапраўдныя.

Я перапісаў гэта ў першапачатковым выглядзе і даў Ерахімаву падпісаць, каб потым перадаць вестаовому.

— Далей,— тлумачыў я Ерахімаву,— рашуча пярэчу супраць таго, каб дзесяць буржуяў былі зняволе-

ны да канца грамадзянскай вайны, бо гэта можа вырашаць выключна рэвалюцыйны трыбунал.

— Рэвалюцыйны трыбунал,— паважна сказаў Ерахімаў,— гэта мы. Горад у нашых руках.

— Вы памыляецеся, таварыш Ерахімаў, што такое мы? Нас мізэрна мала, усяго двое. Камендант горада і яго ад'ютант. Рэвалюцыйны трыбунал прызначаецца Рэвалюцыйным Ваенным Саветам Усходняга фронту. Вам хацелася б, каб вас паставілі да сценкі?

— Ну добра,— з уздыхам абазваўся Ерахімаў,— але ўсеагульны вобыск у горадзе нам жа ніхто не можа забараніць.

— На падставе дэкрэта ад 18 чэрвеня гэтага года,— адказаў я,— усеагульны вобыск можа быць праведзены толькі са згоды мясцовага рэвалюцыйнага камітэта альбо савета. Раз такі яшчэ не існуе, пакінем гэта на пасля.

— Вы анёл,— пяшчотна сказаў Ерахімаў,— без вас я загінуў бы, але з вольным гандлем мы ўсё-такі павінны скончыць.

— Большасць тых,— тлумачыў я,— што вядуць гандаль і ездзяць на базары, з вёскі, гэта мужыкі, якія не ўмеюць ні чытаць, ні пісаць. Найперш яны павінны навучыцца грамаце, а потым змогуць чытаць нашы загады і зразумець, у чым справа. Найперш мы павінны навучыць непісьменнае жыхарства чытаць і пісаць, зрабіць так, каб яны разумелі тое, чаго мы ад іх хочам, а потым можам выдаваць загады хоць бы і пра мабілізацыю коней. Скажыце мне, таварыш Ерахімаў, чаму вам так хочацца правесці мабілізацыю коней? Ці не хочаце вы ператварыць пешы рэвалюцыйны Цвярскі полк у конны дывізіён? Ведаеце, што на гэта ёсць «инспектор по формированию войск левобережной группы»?

— Зноў ваша праўда, таварыш Гашак,— сказаў Ерахімаў з уздыхам,— што мне рабіць?

— Вучыце люд Бугульмінскага павета чытаць і пісаць,— адказаў я,— а што да мяне, то я пайду паглядзець, ці не вычвараюць вашы малойцы чаго-небудзь і ці добра яны размешчаны.

Я пайшоў і стаў хадзіць па горадзе. Цвярскі рэвалюцыйны полк паводзіў сябе належным чынам. Нікога не прыціскаў, пасябраваў з жыхарствам, піў сабе чай, яму варылі «пеле-меле», капусту, боршч, а ён дзяліўся сваёй махоркай і цукрам з гаспадарамі; карацей кажучы, усё было ў парадку. Я вырашыў завітаць і ў Малую Бугульму, дзе размясціўся першы батальён палка. І там знайшоў тую ж ідылію. Пілі чай, елі боршч і паводзілі сябе добра. Я вярнуўся позна вечарам і на рагу плошчы ўбачыў толькі што наклеены плакат, на якім было:

У с я м у ж ы х а р с т в у
Б у г у л ь м ы і п а в е т а!

Загадваю, каб усе жыхары горада і павета, што не ўмеюць чытаць і пісаць, навучыліся гэтаму на працягу трох дзён. Хто пасля гэтага тэрміну будзе прызнаны непісьменным, той будзе расстраляны.

Камендант горада Ерахімаў

Калі ж я прыйшоў да Ерахімава, ён сядзеў са старастам горада, які прынёс, апрача хлеба і солі, што былі акуратна раскладзены на стале, і некалькі пляшачак літоўскай гарэлкі. Ерахімаў быў у гуморы, абдымаўся са старастам і крычаў да мяне:

— Чыталі, як я паслухаўся вашай парады? Сам пайшоў з тым у друкарню, а на загадчыка нацэліў рэвальвер: «Зараз жа друкуй, галубок, а не — дык я цябе, сукін сын, застрэлю на месцы». Трасецца, сваляла, трасецца, чытае, трасецца яшчэ болей, а я бух у столь... І надрукаваў, цудоўна надрукаваў. Умець чытаць і пісаць — важная справа! Потым выдасі за-

гад, усе чытаюць і, вядома, усе шчаслівыя. Праўда, стараста? Выпіце, таварыш Гашак!

Я адмовіўся.

— Будзеш піць ці не? — крыкнуў ён.

Я дастаў рэвальвер і стрэліў у пляшку з літоўскай гарэлкай, а потым, цэлячыся ў свайго шэфа, сказаў з націскам:

— Ты зараз жа пойдзеш спаць ці...

— Ужо іду, галубок, душачка, іду, я проста так. Павесяліцца, пагуляць «маленько».

Я завёў Ерахімава спаць, паклаў яго, а вярнуўшыся да старасты, сказаў яму:

— На першы раз вам дарую, бяжыце дадому і цешцеся, што так лёгка з гэтага выкруціліся.

Ерахімаў спаў аж да дзвюх гадзін наступнага дня. Калі прачнуўся, то паслаў па мяне і, няпэўна пазіраючы мне ў твар, сказаў:

— Мне здаецца, што ты мяне хацеў учора застрэліць.

— Але,— адказаў я,— хацеў такім чынам апярэдзіць падзеі, зрабіць тое, што з вамі зрабіў бы рэвалюцыйны трыбунал, калі б даведаўся, што вы, камендант горада, напіліся.

— Галубок, але ж вы нікому не кажыце, я больш не буду. Буду вучыць людзей грамаце...

Увечары прыйшла першая дэпутацыя мужыкоў з Карлагінскай воласці. Шэсць баб ва ўзросце ад шасцідзесяці да васьмідзесяці гадоў і пяць дзядкоў такога самага веку.

Яны паваліліся мне ў ногі: «Не губі нашых душ, татачка, «батюшка», за тры дні чытаць і пісаць не навучымся, галава не варыць, збавіцель наш, злітуйся над воласцю».

— Загад несапраўдны,— сказаў я,— усё зрабіў гэты дурань, камендант горада Ерахімаў.

Уначы прыйшло яшчэ некалькі дэпутацый, але

ўранні ўжо былі ўсюды расклеены плакаты і пасланы ў павет таксама. Змест плакатаў быў такі:

У с я м у ж ы х а р с т в у
Б у г у л ь м ы і п а в е т а!

Аб'яўляю, што я зняў каменданта горада, таварыша Ерахімава, і зноў заняў сваю пасаду. Такім чынам яго загад № 1 і загад № 2, які датычыцца ліквідацыі непісьменнасці на працягу трох дзён, несапраўдныя.

Камендант горада Гашак

Я мог сабе гэта дазволіць, бо ў горад уначы прыбыў Петраградскі кавалерыйскі полк, які прывялі на Ерахімава мае чувашы.

ПАЦЁМКІНСКІЯ ВЁСКІ

Ад слаўных дзён Бугульмы прайшло ўжо восем сутак, а пра Петраградскі конны полк не было ні слыху ні духу. Таварыш Ерахімаў, які пасля апошняй аферы старанна наведваў мяне, штодня выказваў цвёрдую ўпэўненасць, што петраградская кавалерыя перайшла на бок ворага, і прапаноўваў: 1. Аб'явіць іх здраднікамі рэспублікі. 2. Паслаць у Маскву тэлеграму з апісаннем акалічнасцей іх ганебнага пераходу. 3. Стварыць рэвалюцыйны трыбунал фронту і паставіць перад ім начальніка тэлеграфнага аддзела петраградскай кавалерыі, бо той павінен ведаць, што дзеецца. А калі не ведае, паставіць яго ўсё роўна, бо ён з'яўляецца начальнікам сувязі.

Таварыш Ерахімаў у сваёй лаянцы быў надзвычай дакладны. Прыходзіў раніцай у восем гадзін і лаяўся да паловы дзесятай, потым ішоў, а тады з'яўляўся зноў з лаянкай у дзве гадзіны і не спыняўся да чатырох.

Увечары прыходзіў і за чаем аж да дзесяці-адзінаццаці гадзін лаяў петраградцаў нанова.

Пры гэтым ён хадзіў, апусціўшы галаву, па канцылярыі і меланхалічным тонам дадаваў:

— Гэта жахліва, такая ганьба для рэвалюцыі. Тэлеграфуем, звяжамся непасрэдна з Масквой!

— Усё будзе добра,— суцяшаў яго я.— Прыйдзе час, калі ты ўбачыш, таварыш Ерахімаў, што петраградцы вяртаюцца.

Тым часам я атрымаў тэлеграму ад Ваеннага Рэвалюцыйнага Савета фронту: «Падайце колькасць палонных. Апошняя тэлеграма пра вялікую перамогу пад Бугульмой не зусім зразумелая. Петраградскую конніцу пашліце пад Бугуруслан да Трэцяй арміі. Паведаміце, ці ўсё выканалі вы, што было ў апошняй тэлеграме. Паведаміце таксама, колькі нумароў выдалі вы агітацыйнай газеты на татарскай і рускай мовах. Назва газеты. Пашліце кур'ера з падрабязным апісаннем сваёй дзейнасці. Цвярскі рэвалюцыйны полк пашліце на зручныя пазіцыі. Складзіце зварот да салдат белай арміі, каб пераходзілі да нас, і дайце раскідаць з аэрапланаў. Кожная хіба або невыкананне паасобных пунктаў караецца паводле законаў ваеннага часу».

Услед за гэтай я атрымаў яшчэ адну тэлеграму: «Кур'ера не пасылайце. Чакайце інспектара Усходняга фронту з начальнікам палітычнага аддзела Рэвалюцыйнага Ваеннага Савета і членам Савета таварышам Марозавым, якія пасланы з усімі паўнамоцтвамі».

Таварыш Ерахімаў якраз быў са мной. Прачытаўшы апошнюю тэлеграму, я падаў яе Ерахімаву, каб паглядзець, якое ўражанне зробіць на яго вестка пра такую страшную інспекцыю, ён жа хацеў яе.

Было відаць, што ў ім адбываецца цяжкае душэўнае змаганне. Гэткая магчымасць адпомсціць мне, паздзекавацца з мяне. Бляск радаснай усмешкі, які ў першы момант з'явіўся на яго твары, праз хвіліну знік

і змяніўся выразам заклапочанасці і душэўнай пакуты.

— Прапаў ты, галубок,— з сумам сказаў ён,— страціш буяную галаву.

Ён хадзіў па канцылярыі і спяваў мне тужлівым голасам:

Галава ты мая маладзецкая,
Ах, ці доўга насіць мне цябе.

Потым сеў і гаварыў далей:

— На тваім месцы я ўцёк бы ў Мензелінск, потым у Осу, з Осы ў Перм, і шукай ветру ў полі! Перадасі мне камандаванне горадам і фронтам, а я ўжо ўсё прывяду да ладу.

— Думаю,— сказаў я,— што мне няма чаго баяцца.

Ерахімаў з сумненнем свіснуў:

— Няма чаго баяцца! Ты мабілізаваў коней? Не мабілізаваў. У цябе дзе-небудзь ёсць заложнікі з мясцовых жыхароў? Няма. Ты наклаў на горад кантрыбуцыю? Не. Пасадзіў контррэвалюцыянераў? Не пасадзіў. Ці знайшоў ты наогул якога-небудзь контррэвалюцыянера? Не знайшоў. А цяпер яшчэ скажы мне: ты загадаў расстраляць хоць аднаго папа або купца? Не. Ты загадаў расстраляць былога прыстава? Таксама не. А былы гарадскі галава жывы ці мёртвы? Жывы. Вось бачыш, а ты яшчэ кажаш, што табе няма чаго баяцца. Кепскія твае справы, мой дружа.

Ерахімаў устаў, хадзіў па канцылярыі і зноў спыніўся:

Галава ты мая маладзецкая,
Ах, ці доўга насіць мне цябе...

Ён схапіўся за галаву і, пакуль я спакойна пазіраў, як прусы аж кішэлі на цёплай сцяне каля печы, стаў бегаць ад акна да акна, а адтуль да дзвярэй, хапаючыся за галаву і бядуючы:

— Што рабіць, што рабіць? Прапаў ты, галубок. Страціш буяную галаву.

Пабегаўшы так хвілін пяць, ён бездапаможна сеў на крэсла і сказаў:

— Ды тут нічога не зробіш. Калі б ты хоць мог сказаць, што ў цябе поўная турма. Але каго ты там маеш? Нікога. Калі б ты хоць мог сказаць інспекцыі, што спаліў які-небудзь двор, дзе хаваліся контррэвалюцыянеры. Але ты не можаш сказаць нічога, зусім нічога. Нават вобыску ў горадзе не рабіў. Я, шчыра кажу, люблю цябе, але ты ў мяне на вельмі кепскім рахунку.

Ён устаў, падперазаўся рэменем, засунуў за яго рэвальвер і каўказскі, даўжынёй паўметра, кінжал, падаў мне руку і запэўніў мяне, што хоча дапамагчы мне, і хоць не ведае як, але, безумоўна, што-небудзь прыдумае.

Пасля таго як ён пайшоў, я паслаў тэлеграму ў Сімбірск у адказ: «Колькасць ваеннапалонных удакладняецца. Рухомасць фронту і нястача картаў не даюць магчымасці падрабязна апісаць перамогу пад Бугульмой. Інспектары пераканаюцца на месцы. Выданне газет на татарскай і рускай мовах звязана з цяжкасцямі. Няма татарскіх наборшчыкаў, мала рускіх літар, белыя забралі з сабой друкарскія машыны. Калі ў Бугульму прыбудзе авіяцыйны парк, змагу загадаць раскідаць з аэрапланаў адозву да белай арміі. Пакуль што мы сядзім без аэрапланаў. Цвярскі рэвалюцыйны полк у рэзерве, у горадзе».

Я спаў сном праведніка, а ўранні прыйшоў Ерахімаў і сказаў, што прыдумаў нешта, каб уратаваць мяне, што гэтым яны займаліся ўсю ноч.

Ён павёў мяне за горад да былой цагельні, дзе я знайшоў вартавых з пятай роты Цвярскога рэвалюцыйнага палка, якія сталі з прымкнутымі штыкамі і, як

толькі хто ехаў паблізу, крычалі на яго: «Едзь налева, сюды нельга!»

Пасярод таго месца мяне чакала вялікая неспадзяванка. Тры свежыя магілы. На кожнай слупок і дошчачка з надпісам. На першай магіле: «Тут пахаваны былы прыстаў. Быў расстраляны ў кастрычніку 1918 як контррэвалюцыянер». На другой магіле: «Тут пахаваны поп. Быў расстраляны ў кастрычніку 1918 за контррэвалюцыю». На трэцяй магіле: «Тут спачывае гарадскі галава. Быў расстраляны за контррэвалюцыю ў кастрычніку 1918».

Мае ногі трэсліся, і таварыш Ерахімаў падтрымліваў мяне, калі я вяртаўся ў горад.

— За ноч мы паспелі ўсё зрабіць,— сказаў Ерахімаў,— я ж абяцаў, што дапамагу табе, каб ты мог нешта паказаць інспектарам, калі яны прыедуць. Доўга не мог нічога прыдумаць, каб табе дапамагчы, ажно нарэшце выдумаў гэтую шутку. Хочаш іх убачыць?

— Каго? — запытаўся я са страхам.

— Ну, гэтага папа, старасту і прыстава,— адказаў Ерахімаў.— Усе яны ў мяне сядзяць у свінарніку, а калі скончыцца інспектаванне, я іх адпушчу дадому. Не думай, што нехта здагадаецца пра гэта. Да магіл ніхто не можа падысці. Мае малойчыкі трымаюць язык за зубамі, а ты можаш перад інспекцыяй нечым пахваліцца.

Я паглядзеў на яго. У профіль яго рысы нагадвалі мне Пацёмкіна. Я пайшоў упэўніцца, ці праўду ён кажа. Пераканаўся, што Ерахімаў не маніў. Са свінарніка чуўся бас папа, які спяваў нейкія вельмі сумныя псалмы з рэфрэнам: «Госпадзі, памілуй, госпадзі, памілуй».

І я ўспомніў пра пацёмкінскія вёскі.

АПАВЯДАННЕ ПРА ПАРТРЭТ ІМПЕРАТАРА ФРАНЦА-ІОСІФА І

У Младай Баляславе жыў пан Пецішка і меў там магазін пісьмовых прылад. Ён паважаў законы і спрадвеку жыў насупраць казармаў. У дні нараджэння імператара і іншыя вялікія святы Пецішка вывешваў на сваім доме чорна-жоўты сцяг і пастаўляў афіцэрскаму клубу папяровыя рознакаляровыя ліхтарыкі. Ён збываў партрэты Франца-Іосіфа ў яўрэйскія шынкі младабаляслаўскай акругі і ў паліцэйскія ўчасткі.

Ён з радасцю б збываў іх і ў школы, але партрэты не адпавядалі памерам, якія зацверджаны земскім школьным саветам. Аднойчы ў акруговай управе земскі школьны інспектар сказаў яму:

— Вельмі шкадую, пан Пецішка, але ж вы хочаце нам падсунуць імператара шырэйшага і даўжэйшага, чым прадпісана пастановай земскага школьнага савета за дваццатага кастрычніка 1891 года. Пастанова прадугледжвае імператара больш сціплых памераў. Канкрэтна, сорак восем сантыметраў у даўжыню і трыццаць шэсць у шырыню.

А ваш імператар мае пяцьдзесят у даўжыню і сорак у шырыню. Вы гаворыце, што ў вас сабралася дзве тысячы партрэтаў нашага манарха. І не думайце, што вам удасца спіхнуць нам такі хлам. Ваш імператар — тавар дрэннай якасці і вельмі кепска надрукаваны. Можна падумаць, што яго вялікасць ніколі не расчэсваў свае барады, на нос яму наляпалі многа чырвонай фарбы і да ўсяго ён яшчэ і крывы.

Збянтэжаны гэтай размовай, Пецішка дома сказаў жонцы:

— Мы так уліплі з гэтым старым манархам.

Усё гэта адбывалася яшчэ перад вайной. Карацей кажучы, дзве тысячы партрэтаў імператара віселі на карку ў пана Пецішкі. Калі ж пачалася вайна, Пецішка

ка дужа ўзрадаваўся, у яго з'явілася надзея пазбавіцца ад гэтага хламу. Ён павесіў у сваім магазіне партрэты крыважэрнага старога і аб'яву: «Продаж па агульнадаступных цэнах. Імператар Франц-Іосіф I — за пятнаццаць крон». Прадаў шэсць штук. Пяць партрэтаў купілі для казармаў, каб гэты літаграфічны вобраз апошняга Габсбурга натхняў рэзервістаў у салдацкіх буфетах, і адзін купіў стары Шымр, уладальнік тытунёвай крамкі. Гэты аўстрыйскі патрыёт вытаргаваў партрэт за дванаццаць крон і яшчэ абазваў Пецішку рабаўніком.

Вайна ішла, а на імператара як і раней не было попыту, і пан Пецішка кінуўся ў аддзелы рэкламы газет і часопісаў. Ён надрукаваў аб'явы ў «Народнай палітыцы» і ў «Голасе народа»:

«У цяперашні суровы час у кожнай чэшскай хаце павінен вісець партрэт нашага шматпакутнага манарха за 15 крон».

Але замест заказаў пан Пецішка атрымаў позву ў акруговую ўправу, дзе яму зрабілі заўвагу, каб надалей у аб'явах ён не ўжываў слоў «суровы час» і «шматпакутны», а замест іх, каб пазбегнуць непрыемнасці, пісаў «славуты час» і «перамаганосны».

Тады Пецішка надрукаваў у газетах такі тэкст: «У наш славуты час у кожнай чэшскай хаце павінен вісець партрэт нашага перамаганоснага манарха за 15 крон». Але і гэта было дарэмна.

Ён толькі атрымаў некалькі непрыстойных лістоў, у якіх ананімныя аўтары настойліва раілі яму павесіць партрэт у тым месцы, куды цар ходзіць пешкі. Мала таго, Пецішку зноў паклікалі ў акруговую ўправу, дзе чыноўнік парэкамендаваў яму больш уважліва сачыць за зводкамі імперскай канцылярыі, дзеля таго каб аб'явы адпавядалі сучаснаму моманту.

— Рускія ў Венгрыі, узялі Львоў і стаяць ужо пад Перамышлем. Усё гэта нельга назваць славутым часам,

пан Пецішка. Гэта падобна да жарту, насмешкі, іроніі. Глядзіце, каб за такія аб'явы не апынуцца ў Градцы перад палявым судом!

Пан Пецішка паабяцаў, што будзе больш уважлівы, і склаў яшчэ адну аб'яву: «Пятнаццаць крон ахвотна ахвяруе кожны чэх, каб павесіць у сваёй хаце нашага старога манарха». Мясцовая прэса адмовілася надрукаваць гэтую аб'яву.

— Чалавеча,— сказаў яму адзін адміністратар,— вы што, хочаце, каб нас усіх расстралялі?!

У роспачы пан Пецішка вярнуўся дахаты.

У каморцы ззаду магазіна ляжалі пачкі партрэтаў імператара. Пан Пецішка таўхануў іх нагой і сам спалохаўся свайго ўчынку. Ён баязліва азірнуўся навокал і супакоіўся толькі тады, калі ўпэўніўся, што ніхто яго не бачыў.

У задуменні ён пачаў абтрасаць пыл з пачак і заўважыў, што некаторыя партрэты заплеснелі. Недалёка ад іх у каморцы сядзеў чорны кот. Няцяжка было здагадацца, хто развёў гэтую макрэдзь. Каб адвесці ад сябе падазрэнне, кот заваркатаў. Пан Пецішка шпурнуў венікам у дзяржаўнага злачынцу, і той змоўк. Уладальнік магазіна пісьмовых прылад уварваўся ў хату і накінуўся на жонку:

— Паскуднага ката трэба выкінуць вон! Хто ж цяпер захоча купіць імператара, апаганенага гэтай бессаромнай брыдой? Заплеснелы імператар. Давядзецца сушыць яго, каб ён праваліўся!

Пасля абеду пан Пецішка крыху паспаў, пакуль жонка сядзела ў магазіне, але сон не прынёс палёгкі. Яму прыснілася, што па чорнага ката прыйшлі жандары і іх абодвух вядуць пад канвоем у ваенны суд. Пасля яму здалося, што і ката і яго прыгаварылі да смяротнай кары і ката ўжо збіраюцца павесіць. А ён, Пецішка, у прысутнасці суддзі брыдка лаецца. Ён закрычаў і прачнуўся і ўбачыў ля сябе жонку.

— О, божухна, што ты такое крычыш,— хвалявалася яна,— а каб хто пачуў...

І засмучаная жанчына пачала расказваць, як хацела прасушыць імператара ў садку, але нейкія галадранцы пачалі шпурляць у партрэты камянямі і папрабівалі іх на рэшата.

Выявіліся і яшчэ страты. На адзін імператараў партрэт, які сушыўся на лужку, паселі куры і пакінулі там змесціва сваіх страўнікаў, размаляваўшы лапамі бараду імператара ў зялёны колер. Два партрэты хацеў з'есці мяснікоў сенбернар, неразумны шчанюк, які ніколі не чуў пра параграф 63 Улажэння аб пакаранні. Аднак гэта было ў яго ў крыві. Яго матка год назад трапіла на скуралупню за тое, што зжэрла на плацы сцяг 36-га палка.

Пан Пецішка прыйшоў у роспач. Вечарам у карчме ён увесь час заводзіў размову пра тавары па зніжаных цэнах і пра тое, колькі клопату ён мае з імператарам. І з усяе яго гаворкі вынікала, што венская ўлада з недаверам ставіцца да чэхаў толькі таму, што яны не купляюць у фірме Францішка Пецішкі ў Младзе Балеславе партрэтаў манарха за пятнаццаць крон.

— Не стойце за цану, прадавайце іх танней,— сказаў яму карчмар на развітанне.— Цяпер нядобры час. Гарэйшак прадае паравы млын на трыста крон дзешавей, чым летась, тое самае зрабіце і вы з імператарам.

Пасля гэтага пан Пецішка напісаў такі плакат і павесіў яго ў вітрыне магазіна: «У сувязі з эканамічным крызісам прадаецца вялікая партыя па-майстэрску выкананых партрэтаў імператара замест пятнаццаці крон па дзесяць крон».

І зноў у магазіне было ціха. Знаёмы гандляр віном пацікавіўся, як ідуць справы з імператарам.

— Кепска,— адказаў пан Пецішка,— ніхто і не пытае.

— Раю вам,— па-змоўніцку сказаў яму гандляр віном,— пакуль не позна, пастарайцеся збыць іх за любую цану.

— Пачакаю яшчэ,— адказаў пан Пеціпка.

А на партрэты не пераставаў садзіцца нягоднік чорны кот. За паўтара года ўся кіпа імператаравых партрэтаў да самага нізу пакрылася цвіллю. Аўстрыякі выехалі з Чэхіі, становішча ў Аўстрыі было кепскае. Усе іх намаганні былі кату пад хвост.

Тады пан Пеціпка ўзяў аловак і паперу і падлічыў, што разбагацець ён усё роўна не разбагацее, але калі прадаваць партрэт па дзве кроны, дык на кожным экземпляры ён заробіць адну крону.

І ў вітрыне побач з партрэтам імператара з'явілася новая рэклама:

«Прадаецца стары манарх за дзве кроны замест пятнаццаці».

Уся Млада Баляслава ў той дзень прыходзіла да магазіна, каб упэўніцца, як катастрафічна ўпалі акцыі дынастыі Габсбургаў.

А ўначы да пана Пеціпкі прыйшлі жандары, і ўсё пакацілася, як камень з гары. Магазін зачынілі, пана Пеціпку арыштавалі і судзілі ваенным судом за парушэнне грамадскага спакою і цішыні. Таварыства ветэранаў выключыла яго са сваіх членаў.

Пана Пеціпку прыгаварылі да трынаццаці месяцаў турэмнага зняволення. Яму маглі даць пяць гадоў, але ўлічылі яго ўдзел у баях за Аўстрыю пад Кустоцай.

А пачкі партрэтаў імператара захоўваюцца ў дэпазіце ваеннага суда ў Тэразіне і чакаюць часу свайго вызвалення, калі пасля распаду Аўстрыйскай імперыі які-небудзь прадпрымальны бакалейшчык пачне загортваць у іх сыркі.

ПАКУТЫ ЛІТАРАТАРА

Сёння адносіны да літаратараў намнога лепшыя, чым да вайны. Паспяваенны літаратар, калі старанна працуе і многа не траціць, кожны дзень мае столькі грошай, што можа выкупіць сваю норму мукі, хлеба, цукру, тытуню, і яшчэ ў яго застанецца, каб раз на месяц дазволіць сабе схадзіць у тэатр. Калі ён не п'е гарэлкі, а лічыць найлепшым ласункам віно і даспадобы яму ром, дык у яго ёсць магчымасць сёння атрымаць усё гэта ў доўг, бо і ў гэтым кірунку адносіны змяніліся, і літаратары карыстаюцца сёння большым даверам і павагай, чым да вайны.

Раней адносіны былі інакшыя, прывяду некалькі прыкладаў.

Калісьці выходзіў у Празе часопіс «Вясёлая Прага», у ім я змяшчаў свае гумарэскі. За тры гумарэскі дзве кроны, якіх заўсёды чакалі некалькі галодных прагных ратоў.

Аднойчы, калі я прынёс шэсць гумарэсак, выдавец адмовіўся заплаціць мне чатыры кроны і прапанаваў заключыць умову. Я павінен напісаць дваццаць гумарэсак, за якія ён мне заплаціць наперад, але не грашыма, а таварам. Ён якраз збіраўся раздаць падпісчыкам у якасці прэміі партыю гадзіннікаў. (У той час у краме яны каштавалі дзве кроны.) Больш чым дзве кроны за адзін гадзіннік ён не налічыць, але я адразу змагу забраць з сабой чатырнаццаць гадзіннікаў, і адзін гадзіннік ён мне набаўляе, таму што інакш цяжка палічыць.

Падпісаў я ўмову на дваццаць гумарэсак і забраў з выдавецтва чатырнаццаць гадзіннікаў.

Мяне чакаў адзін малады чалавек, які пісаў вершы (пяць радкоў за два гелеры).

— Ну і што ты будзеш з імі рабіць? — сказаў непрактычны паэт, поўны ідэалаў, бо ў той час жылі яшчэ ідэалісты.

— Прадам у карчме.

Малады паэт пачырванеў.

— Ну, а калі нам не пашанцуе прадаць іх у карчме,— сказаў я,— будзем прадаваць у шынках.

— Я з вамі не пайду прадаваць,— прагаварыў ён,— вы ж добра ведаеце, што я член аб'яднання маладых літаратараў «Сірынкс».

— Добра,— сказаў я,— прадаваць вы не будзеце, а толькі будзеце хадзіць са мной.

І мы пайшлі. Найперш прыйшлі да Прымасаў, там заўсёды збіраліся мяснікі з сярэбранымі цяжкімі гадзіннікамі. Адзін сказаў, што ён купіў бы, але толькі сярэбраны, і, пакуль глядзеў наш гадзіннік, перакруціў спружыну. За прычыненую шкоду ён прапанаваў нам два куфлі піва. Пасля гэты гадзіннік з перакручанай спружынай мы прадалі аднаму пану за трыццаць крэйцараў, і ён заявіў, што ўсё роўна гэта падобна на крадзеж.

Потым пайшлі мы насупраць да Шэнфлока, адкуль нас выгналі, бо падумалі, што мы жулікі і не маем дазволу на продаж.

Схадзілі мы і ў «Курынае вока» на Вінаградах, дзе прадалі адзін гадзіннік за восемдзесят крэйцараў нейкаму студэнту, які свой гадзіннік заклаў у ламбард і чакаў прыезду бацькі.

Хадзілі мы хадзілі па Вінаградах, і ніхто больш не купляў. Дайшлі да пятага квартала, які быў яшчэ ў славе перад сваім выміраннем, і там у адным шынку нехта ўкраў у нас два гадзіннікі.

У другім прытоне да нас падышоў мужчына ў кепцы, спытаўся, адкуль мы. Пасля выцягнуў блакнот, паглядзеў у яго і сказаў:

— Так, усё сходзіцца.

Пасля ўзяў нас за каўняры і пацягнуў у паліцэйскі ўчастак, дзе мы і заначавалі, таму што выдаўца, які даў мне гадзіннікі, не было дома.

Калі ж нас нарэшце на другі дзень вызвалілі, бо выдавец пацвердзіў нашу бязвіннасць, ён высакародна выкупіў у мяне астатнія гадзіннікі, за паўцаны, г. зн. па пяцьдзесят крэйцараў за штуку.

І калі даваў мне гэту нязначную суму, рашуча напомніў:

— Не забудзьцеся пра дваццаць гумарэсак!

А як праз некалькі дзён я прынёс яму дзве гумарэскі, ён, праўда, менш рашуча, але напомніў:

— Не забывайцеся, за вамі яшчэ васемнаццаць гумарэсак!

Ён і сёння іх чакае.

Або другі выпадак. Тоўсты часопіс, рэч ваша ўжо надрукавана. Вы па сваёй наіўнасці думалі, што адразу атрымаеце грошы, як толькі прыйдзеце і скажаце:

— Учора надрукавана маё апавяданне, я прыйшоў па ганарар.

Але там няма то аднаго, то другога, і вам кажуць: «Прыйдзіце заўтра!»

І калі нарэшце ўжо ў касе трэба атрымаць 5 крон і 22 гелеры, вам даюць шэсць крон і патрабуюць рэшты, а ў вас іх няма, дык касір глядзіць на вас, як на бандыта. Ён забірае шэсць крон назад і крычыць на вас: «Прынясіце мне дробныя!» — і вы ідзяце па Празе шукаць 78 гелераў, каб атрымаць свае 5 крон і 22 гелеры.

А сёння, я ж кажу, намнога лепш.

Не лепш было і з выдавецтвам. Вам плацілі за аркуш 32 кроны, а калі вы прасілі авансу, дык цыркалі па кроне. Не саромеліся і тады, калі ў вас з'явілася шалёнае жаданне выбраць ганарар кнігамі, адпускаць іх па прадажнай цане. Вядома, пры продажы кніг вы траціліся 66 працэнтаў свайго ганарару, і пры тым усім яны так клапаціліся пра вас, што вам гаварылі:

— Бачыце, мы б далі вам грашыма, але баімся, што вы іх адразу распусціце і тады ў вас зусім нічога не будзе.

Калі ты хацеў атрымаць сякі-такі аванс пад свой твор, то мусіў нашта зманіць. Абставіны прымушалі літаратара з-за такіх адносін маніць, выдумляць розныя байкі, і толькі маральная ўстойлівасць не прыводзіла чалавека на Панкрац.

Аднойчы я захацеў атрымаць 25 крон авансу пад сваю кніжку і прыдумаў вось што: я папрасіў свайго сябра Густава Р. Апачэнскага, вядомага паэта, схадзіць у выдавецтва з пісьмом: «Шматпаважаны пан! На мяне наехаў аўтамабіль і пераламаў мне нагу. Прашу выдаць мне авансам за маю кніжку 25 крон».

Сябар вярнуўся без грошай, але з рэзалюцыяй: «Растлумачце, навошта патрэбныя тыя 25 крон».

Я адказаў:

«На выдаткі ў сувязі з перавозкай мяне дадому».

Ён вярнуўся з адказам:

«Хуткая дапамога» перавязе вас бясплатна».

Я напісаў:

«Хуткая дапамога» возіць толькі ў бальніцу. А я дамагаўся лячэння дома, таму яна паехала».

Апачэнскі вярнуўся задаволены. Прынёс 10 крон, а на маёй запісцы рэзалюцыю: «Дзесяць крон хопіць».

Гэта былі часы, поўныя барацьбы, яны ўжо належаць гісторыі. Але адзін выпадак, які з'яўляецца водбліскам старых часоў, не дае мне спакою і сёння.

Цяпер я выдаю некалькі кніжак. (Я не хвалюся, але гэтыя кнігі мне надта падабаюцца.)

Адну кнігу — «Прыгоды ўдалага салдата Швейка ў сусветнай вайне» — выдаю за ўласны кошт і рэкламую яе ў правінцыі. Адзін пан быў такі добры, што паабяцаў мне адвезці кнігу ў Будэёвіцы і там прапанаваць гандлярам. Пра сваю агітацыйную працу ён напісаў мне ліст, вось урывак з яго:

«І вось я прыйшоў да пана Сваткі, а ён мне кажа, што ў яго ўжо ёсць нумар часопіса з Прагі і ён вельмі рады, што даведаўся, дзе пан Гашак, таму што пан

аўтар Гашак у 1915 годзе, 21 красавіка, у Будзёвіцах, дзе служыў як вольнапісаны, перад сваім ад'ездам на вайну падпісаў умову, што будзе пасылаць пану Сваткy свае ваенныя гумарэскі і абавязваецца на працягу дзесяці гадоў нікому больш іх не даваць. Ён ведае, што пан Гашак быў у палоне і, вядома, тады пісаць не мог, але ж цяпер, калі ён тут, павінен быў бы стрымаць слова, на падставе гэтага ён справу перадасць адвакату, каб патрабаваць кампенсацыі. Ён вельмі здзіўлены, што пан Гашак забыўся на тое, што дзесяць гадоў ён не мае права даваць свае творы нікому, акрамя яго, Сваткі. Альбо можа быць, што яму гэта ўсё роўна і ён быццам і не ведае, што мы перанялі ў Аўстрыі тыя самыя законы, якія існуюць цяпер. І параіў мне, каб я ўсялякую рэкламу кінуў, бо ўсё будзе канфіскавана...»

Вяртаецца гадзіннікавая гісторыя...

За нейкіх пяцьдзесят крон, за якія вольнапісаны 21 красавіка 1915 года, як Фаўст, даў падпіску на дзесяць гадоў. І асоба, якой я даў гэту падпіску, ахоўвала мяне ў найгоршай баявой сітуацыі.

А цяпер з дапамогай адваката ідзе па маю душу. Нават святая вада мне не дапаможа...

ЯК Я СУСТРЭЎСЯ З АЎТАРАМ МАЙГО НЕКРАЛОГА

За пяць-шэсць гадоў свайго побыту ў Расіі я некалькі разоў быў забіты і замучаны рознымі арганізацыямі і асобамі.

Вярнуўшыся на радзіму, я даведаўся, што тройчы быў павешаны, двойчы застрэлены, а аднойчы — чацвертаваны дзікімі бунтаўнікамі кіргізамі каля возера Кале-Ішала.

Нарэшце я быў насмерць праколаты ў лютай бойцы з п'янымі матросамі ў адной адэскай карчме. Гэта і мне здаецца самым праўдападобным.

І не толькі мне, але і майму добраму сябру Колману, які, здабыўшы відавочца маёй бясслаўнай і гераічнай смерці, напісаў пра ўсю гэтую, такую непрыемную мне, падзею артыкульчык у сваю газету.

Аднак ён не задаволіўся тым маленькім паведамленнем. Ягонае добрае сэрца прымусіла яго напісаць пра мяне некралог, які я прачытаў неўзабаве пасля свайго прыезду ў Прагу.

Ён вельмі тонка аблаяў маю памяць, упэўнены, што мёртвыя не ўстаюць з магілы.

Каб пераканаць Колмана, што я жывы, я пайшоў шукаць яго, і так узнікла гэтае апавяданне.

Нават По, майстар жахаў і страхаў, не мог прыдумаць больш кашмарнай тэмы...

Аўтара майго некралога я знайшоў у адным пражскім шынку якраз а дванаццатай гадзіне, калі шынкі зачыняюцца на падставе нейкага каралеўскага ўказа за 18 красавіка 1856 года.

Ён пазіраў на столь. Са сталоў сцягвалі залітыя абрусы. Я падсеў да яго і ветліва сказаў:

— Прабачце, тут не занята?

Ён і далей разглядаў на столі нейкую кропку, якая так зацікавіла яго, і лагічна адказаў:

— Калі ласка, але якраз зачыняюць; думаю, вам не нальюць.

Я ўзяў яго за руку і павярнуў да сябе. Хвіліну ён моўчкі пазіраў на мяне, а потым нарэшце вымавіў ціхім голасам:

— Дык вы не былі ў Расіі?

Я засмяяўся:

— Вы мяне ўсё-такі пазналі? Я быў забіты ў Расіі ў адной таннай карчме ў лютай бойцы з п'янымі матросамі.

Ён збялеў:

— Вы... вы...

— Але,— сказаў я з націскам,— я быў забіты ў карчме ў Адэсе матросамі, а вы напісалі пра маю смерць некралог.

Ён ціха спытаўся:

— Вы чыталі, што я пісаў пра вас?

— Безумоўна, некралог вельмі цікавы, адно трохі недарэчны. І пры гэтым незвычайна доўгі. Нават пану імператару, калі ён памёр, не далі столькі радкоў. Яму ваша газета прысвяціла 152 радкі, а мне — 186, па 35 гелераў за радок (як мізэрна плацілі раней журналістам!), што складае 55 крон 15 гелераў.

— Чаго вы, уласна кажучы, хочаце ад мяне? — запытаўся ён.— Хочаце тыя 55 крон і 15 гелераў?

— Пакіньце сабе гэтую суму,— адказаў я,— мёртвыя не бяруць ганарару за некралог пра сябе.

Ён зноў збялеў.

— Ведаеце што,— сказаў я нязмушана,— давайце заплацім і заглянем у якое-небудзь іншае месца. Хачу правесці гэты вечар з вамі.

— Ці нельга было б зрабіць гэта заўтра?

Я глянуў на яго.

— Афіцыянт! — клікнуў ён.

На рагу я паклікаў рамізніка, загадаў аўтару майго некралога сесці, а рамізніку сказаў магільным голасам:

— Завязіце нас на Альшанскія могілкі!

Аўтар майго некралога перахрысціўся. Доўга цягнулася цішыня, якую парушалі толькі лясканне пугі ды фырканне коней.

Я нахіліўся да свайго суседа:

— Вам не здаецца, што недзе ў цішыні жыжкаўскіх вуліц [1] завылі сабакі?

---

[1] Жыжкаў — раён Прагі.

Ён здрыгануўся, устаў у фіякры і сказаў, заікаючыся:

— Вы сапраўды былі ў Расіі?

— Забіты ў адэскай карчме, у бойцы з п'янымі матросамі,— суха адказаў я.

— Езус Марыя,— азваўся мой сусед,— ды гэта страшней за «Вясельную кашулю» Эрбэна [1].

Зноў запанавала пакутная цішыня. Недзе сапраўды завылі сабакі.

Калі мы апынуліся на Страшніцкай шашы, я загадаў свайму спадарожніку, каб ён заплаціў рамізніку. Мы стаялі ў цемры на Страшніцкай шашы.

— Ці няма тут якога-небудзь рэстарана? — бездапаможна і жаласліва загаварыў да мяне аўтар майго некралога.

— Рэстарана? — Я засмяяўся.— Зараз пералезем цераз сцяну на могілкі і пагаворым дзе-небудзь на надмагільным камені пра гэты некралог. Лезьце першы і падайце мне руку.

Ён моўчкі падаў мне руку, і мы саскочылі ўніз на могілкі. Пад намі затрашчалі кіпарысы. Вецер меланхалічна шумеў паміж крыжоў.

— Я далей не пайду,— сарвалася з губ майго сябра.— Куды вы хочаце мяне зацягнуць?

— Зараз,— весела сказаў я, падтрымліваючы яго,— мы пойдзем паглядзець магілу старой пражскай мяшчанскай сям'і Банэпіяні. Зусім закінутая магіла ў першым аддзяленні, шосты рад каля сцяны. Закінутая ад таго часу, калі ў ёй пахавалі апошняга патомка, якога прывезлі ў 1874 годзе з Адэсы, дзе ён быў забіты матросамі ў бойцы ў адной таннай карчме.

Мой спадарожнік перахрысціўся яшчэ раз.

Калі ж мы нарэшце селі на надмагільны камень,

---

[1] Эрбэн К. Я.— чэшскі фальклярыст, збіраў і выдаваў чэшскія народныя казкі.

які хаваў прах апошніх патомкаў пражскіх мяшчан Банэпіяні, я далікатна ўзяў аўтара свайго некралога за рукі і ціхім голасам завёў гаворку:

— Дарагі сябра! У сярэдняй школе паны настаўнікі вучылі нас прыгожаму, высакароднаму закону: «Пра мёртвых нічога, апрача добрага». А вы стараліся пра мяне, мёртвага, пісаць як найгоршае. Калі б я пісаў пра сябе некралог, то напісаў бы, што ніводная смерць не прынесла гэтулькі смутку, як смерць пана такога і такога. Напісаў бы, што найлепшай рысай нябожчыка пана пісьменніка была дзейсная дабрыня, любоў да ўсяго, што з'яўляецца святым для чыстых душ. А вы напісалі, што памёр лайдак і камедыянт. Не плачце! Бываюць моманты, калі сэрца перапоўнена жаданнем напісаць пра мёртвых самае светлае, згадаць самае прыгожае, што было ў іх жыцці, а вы напісалі, што нябожчык быў алкаголік.

Аўтар майго некралога яшчэ мацней заплакаў, яго плач тужліва ляцеў у цішыні могілак і губляўся недзе ўдалечыні каля Яўрэйскіх печаў.

— Дарагі сябра,— сказаў я з націскам,— не плачце, цяпер ужо нічога не пераробіш...

Сказаўшы гэта, я пералез цераз сцяну могілак, пабег да брамніка, пазваніў і паведаміў яму, што, вяртаючыся з начной звышурочнай работы, пачуў на могілках за сцяной першага аддзялення нейкі плач.

— Гэта, мабыць, якісьці ўдавец замнога дзербалызнуў,— цынічна адказаў брамнік,— мы адправім яго працверазіцца.

Я чакаў за рогам. Праз якіх дзесяць хвілін убачыў, як вартаўнікі вялі з могілак аўтара майго некралога ў паліцэйскі ўчастак.

Ён упіраўся і крычаў:

— Гэта сон ці ява? Ведаеце, панове, «Вясельную кашулю» Эрбэна?

ДУШАЧКА ЯРАСЛАВА ГАШАКА РАСКАЗВАЕ

ЯК Я ПАМЕРЛА

Калі маё цела застрэлілі ў Будзёвіцах за дзяржаўную здраду, якую мы разам у белай гарачцы ўчынілі, адляцела я, чыстая душачка Яраслава Гашака, на неба. Магчыма, вы памятаеце таго мілага маладога чалавека. Ён любіў кайзера, пісаў рознае глупства і меў ружовы твар. Ён заўсёды карыстаўся адэкалонам і любіў мускус. Але гэта цяпер не мае значэння.

Аднойчы ён сказаў нешта такое, з чым ніхто не згадзіўся. Тады абвінавацілі ў дзяржаўнай здрадзе і застрэлілі гэтага найлаяльнейшага мужчыну. Варта было б называць яго ахвярай, а гаварылі як пра асуджанага. Ды што там, і тое і другое пачынаецца літарай «а». І таму я была зусім спакойная, радасна ўзнімалася і спявала «ля-ля, ля-ля, ля-ля, ля-ля».

Калі ўзнялася ўжо даволі высока, зрабіла над зямлёю непрыстойны ўчынак. Без усялякай крамольнай думкі, так проста, ад свавольства.

Мая радасць была вялікая, але нядоўгая. Перад брамай божай канцылярыі стаяла вялікая чарга. Я паглядзела, ці нельга дзе прыткнуцца наперадзе, каб хутчэй адчуць усе радасці раю, але тут мяне за каўнер схапіла ваенная паліцыя. Гэта было нешта сярэдняе паміж архангелам і чэшскім паліцэйскім.

— Душа, не мудрагель,— сказаў мне нябесны прывід.— Ану паказвай свае дакументы!

Ніякіх дакументаў у мяне не было, і я нясмела пачала тлумачыць.

— Маю гонар далажыць,— сказала я, стаўшы па стойцы «смірна»,— хвіліну назад мяне застрэлілі ў Будзёвіцах. І я не ведала, што трэба было ўзяць там пацверджанне.

Нябесны вартавы нахмурыўся:

— Каму вы байкі расказваеце? Я не сёння на свет нарадзіўся. Стаю тут з тае пары, як анёлы парушылі дысцыпліну. У час патопу я нёс службу ў прыёмным пакоі. Прапускаў у рай бязвінных. І стары і малы прайшлі праз браму каля мяне. Я бачыў Арлеанскую дзеву. Вось ім бы ты мог расказаць сваю гісторыю. Прапускаў Напалеона. Думаеш, я сёння нарадзіўся на свет?

Кепска ты прыдумаў з тымі Будэёвіцамі. Думаеш, што я не ведаю геаграфіі? Я ж бачу, што ты з таго «галубінага народу», які ўвесь час бунтуе. Відаць птушку па палёце. Але ж гэта не той народ, каб з-за яго нашаму брату рабіць звышурочную работу. І кожны смаркаты анёл скажа, што ля Будэёвіц гэтым часам не было ніякага фронту. Тут табе не санаторый. Марш назад у страявыя.

Пры жыцці я належала чалавеку, які паважаў найвышэйшую ўладу і законы і які толькі з п'янай галавы мог дазволіць сабе не падпарадкавацца ім, за што і быў пакараны. Пры жыцці я ніколі не мела ніякіх адносін да паліцыі. Таму і пасля смерці я паслухмяна павярнулася і паляцела назад у Будэёвіцы. На месцы пакарання я знайшла сваё мёртвае цела і з сумам з'ядналася з ім у чэшскага пехацінца.

Пехацінец быў прыстойны чалавек. Больш трымаўся кухні, здзіўляў кухара сваімі энцыклапедычнымі ведамі і наганяў на яго жах. Еў ён за дваіх. Піў за траіх. Спаў за чатырох. Нарэшце па волі божай загінуў на рускім фронце. Як толькі я ўпэўнілася, што ён мёртвы, сумная ўселася на яго рэчавы мяшок. Зноў была вольная, як гаворыцца, разведзеная са сваім целам. І зноў аніякага дакумента. Здарылася ж гэта ў чыстым полі. Пры святле месяца я ўбачыла, што да нас набліжаецца чалавек. Гэта быў ксёндз. Ён збіраў рэчы і паперы мёртвых. Я ўсцешылася была, што цяпер ён, напэўна,

зафіксуе і зацвердзіць маю смерць, але ён, калі падышоў да нас бліжэй, раптам плюнуў і вылаяўся: «Праклятае жыццё» і пайшоў прэч. Маё цела ашклянелымі вачамі глядзела ў неба. Я заплакала. Ніхто мне не паверыць, што я памерла. Не было адвагі зноў з'яўляцца перад брамай неўміручасці. Тады я зноў улезла ў свайго пехацінца, каб дачакацца новага, больш прыдатнага выпадку для сваёй смерці.

На шчасце, цела маё хутка ап'янела і загінула ў бойцы з п'янымі маракамі.

Відаць, было гэта недзе ля мора, калі ўлічыць тут прысутнасць маракоў. (Мора-мор-марак.)

Пакінула я свой труп і пайшла шукаць якога-небудзь дакумента аб сваёй смерці. Гэтым разам я ўжо дзейнічала па сістэме і нарэшце ў адной чэшскай газеце знайшла некралог на сябе. Гэта быў фельетон, і там пра маё цела было толькі ўсё найгоршае. Паводле чэшскай прымаўкі: «Пра мёртвых альбо нічога, альбо толькі благое». Пры жыцці я таксама любіла чапляцца да людзей і гаварыць сваім блізкім што-небудзь з'едлівае. Прынцыпова, але чаплялася толькі да жывых. Крытыкавала востра і смяялася з усяго, з чым сустракалася ў грамадстве. Я не чапала бруднай бялізны. Не было мне справы да таго, што ў пана Н. Н. былі каханкі і тут і там. Мне хапала таго, што гэты пан гаварыў.

У пасмяротнай нататцы, прамове, якую прысвяціў мне сапраўдны мой сябар, мяне абзывалі алкаголікам і эквілібрыстам у жыцці. Нават і слова такое падабралі ў рыфму — шашак [1], «Гашак-шашак». Так мяне абзывалі змалку на вуліцы, яшчэ і ў школу не хадзіла. Таму цяпер мне гэта зусім не абыходзіла.

У нататцы я спадзявалася сустрэць далей і такое: «Яраславе, г...о плыве па Влтаве», бо так мне ў мала-

---

[1] Ш а ш а к *(чэшск.)* — блазен, паяц.

досці крычалі, але ў некралогу гэтага не было. Было там толькі, што ў нашага Гашака пухлыя дзіцячыя рукі. Адразу ж паглядзела, ці не забыліся пра бруд пад пазногцямі і калі я апошні раз мыла ногі, але і гэтыя гістарычныя факты засталіся нявысветленымі.

Апоўначы я ўбілася ў каморку пісьменніка, які напісаў гэты шэдэўр. Ён у ботах ляжаў на ложку і задаваў такога храпака, што можна было з яго вяроўкі віць. Хацелася мне даць яму разок, каб у яго пляткарскім роце (а мая далікатная душачка ўжыла іншы выраз: «У паклёпніцкім смярдзючым роце») не засталося ніводнага зуба.

Толькі таму, што я была мёртвая, з некралогам у кішэні, а маё цела са складзенымі пульхнымі рукамі ляжала ва Уладзівастоку, з тым сябрам нічога не здарылася.

З фельетонам у саване я зноў ляцела на неба. Такой чаргі ўжо не было. Перад брамай чуваць была толькі руская мова. Я ўспамінаю старога Ваню ў кепачцы і яго словы: «Вучыце рускую мову».

Душачка, што стаяла ля мяне, спыталася:

— Откуда ты?

— Из Владивостока.

— Большевик или доброволец?

— И большевик и доброволец, как тебе больше нравится,— адказала я дыпламатычна, не дарэмна ж некалі вучылася ў акадэміі.

— И что случилось с тобой? Чрезвычайка?

Я асцярожна дастала свой некралог і з пачцівай усмешкай падала яго той, што пыталася.

— Читайте.

Душачка прачытала, пакруціла галавой і выцягнула з кішэні кавалак хлеба ў зашмальцаванай газетнай паперы. Яна паднесла мне паперу да вачэй і засмяялася:

— Дык мы землякі. Я — Кудзелька з Вршовіц. Жыў там насупраць Баўраў. Прачытай вось.

Я нясмела паглядзела на скрутак. Скрутак быў невялікі, якраз такі, які мне маці давала з сабою ў школу, а жонка ў рэдакцыю. Пахнуў ён тытунём і салам. Той хлопец забяспечыў сябе ў апошнюю дарогу. Мае вочы наткнуліся на загаловак: «Расказ пра несапраўдную смерць Яраслава Гашака». Там гаварылася, што Яраслаў Гашак хоць і напіўся, але ж гэта было не апошні раз. Мая смерць абвяргалася. У мяне затрэсліся калені, як бароды ў Раісавых герояў. І рынулася я роўненька ва Уладзіваток. Яшчэ паспела пачуць, як душачка з Вршовіц сказала: «Цьфу, і такое пра чалавека скажуць. Відаць, добры фрукт, што ў газетах пішуць».

Знямелая, я прытулілася да свайго цела. Яно добра-такі ўжо смярдзела. Паглядзела я на свой высокі лоб і прыгожы нос, і жаль мяне агарнуў, што ў некралогу напісалі толькі пра рукі.

Слёзы паліліся з вачэй, і мусіла я высмаркацца ў саван. Плакала я ад таго, што п'яныя маракі пасеклі маё цела. Я гаварыла:

— Нябесны пан бог, кожны ж мае пасля смерці спакой, толькі я не маю! А быў жа такі прыстойны пан гэты пан Гашак. Так мы добра разумелі адно аднаго, так слаўна жылі.

Так пагаравала я, узяла на спіну сваё тройчы мёртвае цела і пайшла з ім у белы свет. На першым рагу ўбачыла загад. Як прачытала, адразу ж зразумела, што гэта пра мяне і пра тое, што нясу на спіне. Тады я скінула сваю ношку пад загад, а сама села насупраць пад ігрушу і пачала чакаць канчатковага рашэння. Даволі хутка мяне застрэлілі і павесілі за дзяржаўную здраду. Але на гэты раз я атрымала афіцыйны дакумент (чэшска-нямецкі, а не нямецка-чэшскі), і нарэшце пусцілі мяне за браму неўміручасці.

У браме ў мяне спыталіся:

— Кім была, што рабіла?

Пачырванела я, схіліла галаву і сказала:

— У трыццаць пяць гадоў мела ўжо 18-гадовы стаж плённай працы. Да 1914 года сваімі фельетонамі, гумарэскамі, апавяданнямі запаўняла ўсе чэшскія часопісы. Мела шырокае кола чытачоў. Часта ўвесь нумар гумарыстычнага часопіса займала адна, прыкрываючыся рознымі псеўданімамі. Але чытачы мяне заўсёды пазнавалі. Наіўна думала, што я сапраўдны пісьменнік.

— Карацей. Кім была сапраўды?

Загналі мяне ў тупік. Тады я намацала ў кішэні некралог і неўпапад гаркнула:

— Прабачце, алкаголікам з пульхнымі рукамі.

— Адкуль родам?

— Мылавары, раён Глубокі.

— Калі нарадзілася?

— У 1883-м.

І тады за мной зачынілася брама неўміручасці.

ПІСЬМЕННІК, ГРАМАДЗЯНІН, БАЕЦ

Калі ў невялікае берлінскае кафэ, дзе звычайна збіраліся пісьменнікі, мастакі і акцёры, прынеслі вестку, што памёр Яраслаў Гашак, першы апамятаўся вядомы публіцыст Эган Эрвін Кіш. «Лухта! Яроўшак зноў абдурвае ўвесь свет... Колькі разоў ужо паміраў Гашак? Гэта дзесятая яго смерць. Ярда не можа памерці так рана. І ўвогуле, ён ніколі не пакіне гэтага свету — ён бессмяротны».

Словы Эрвіна Кіша былі прарочыя.

Той, кім пагарджалі і з каго кпілі, на каго паклёпнічалі і вылівалі бруд, хто быў «самым найвялікшым здраднікам» і ворагам «дэмакратычнай Чэхаславакіі», стаў сёння бадай што самым вядомым у свеце чэшскім пісьменнікам. Вызваліўшыся з-пад «апекі» прадажных буржуазных эстэтаў, якія доўгі час фальсіфікавалі творчасць пісьменніка, зводзячы яе да ўзроўню прымітыву і лубка, творчы геній Яраслава Гашака раскашуе цяпер у арэоле ўсенароднага прызнання і любові.

Яраслаў Гашак прыйшоў у чэшскую літаратуру ў час абвастрэння сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу ў Аўстра-Венгрыі. Бурлівыя падзеі 1897 года, рэвалюцыя 1905 года ў Расіі, што рэхам прайшла па ўсёй Заходняй Еўропе, масавы рух за дэмакратызацыю палітычнага ладу, рост нацыянальна-вызваленчай барацьбы прыгнечаных славянскіх народаў, настроі шавінізму і мілітарызму як вынік агрэсіўнай палітыкі кіруючых класаў Аўстра-Венгрыі, якія ў вайне бачылі адзін з найлепшых сродкаў пераадолення ўнутрыпалітычнага крызісу, стваралі атмасферу зменлівасці і няпэўнасці. Краіна жыла прадчуваннем гібелі старога свету.

Выспяванне сатырычнага таленту Яраслава Гашака — імклівае, упэўненае — якраз і абумоўлівалася магутнай хваляй нацыянальна-вызваленчага і сацыяльнага руху.

Не менш важныя былі і акалічнасці суб'ектыўнага характару. Цяжкія выпрабаванні, якія выпалі на долю будучага пісьменніка: бацькава смерць, бясхлеб'е — далі яму вострае сацыяльнае чуццё. Багаты жыццёвы вопыт набыў Я. Гашак з вандровак па Славакіі, Галіцыі, Венгрыі, Германіі, Аўстрыі, Швейцарыі, дзе, сустракаючыся з сялянамі, пастухамі і такімі, як ён, бадзягамі, убіраў у сябе сокі народнай мудрасці і дасціпнасці.

Першыя творы, надрукаваныя пісьменнікам у семнаццаць гадоў, мелі выразную адзнаку песеннага і казачна-анекдатычнага фальклору, вызначаліся даволі тонкім пранікненнем аўтара ў народную псіхалогію.

У літаратурным жыцці тагачаснай Чэхіі моцнымі былі ўплывы эстэцтва і індывідуалізму. Аднак з самага пачатку Я. Гашак супрацьстаяў ім. Сацыяльная актыўнасць і жывы характар збліжаюць маладога пісьменніка з анархістамі. Яго прывабілі вонкавы радыкалізм анархізму, пашырэнне гэтай палітычнай плыні ў самых розных сацыяльных слаях краіны. Я. Гашак вядзе агітацыйную работу сярод гарнякоў на поўначы Чэхіі, распаўсюджвае лістоўкі, выступае з пракламацыямі, супрацоўнічае ў анархічных выданнях. Як за «асабліва небяспечным анархістам» у гэты час за ім пачынаюць сачыць, некалькі разоў яго арыштоўвае паліцыя.

Праніклівасць і сацыяльная дальнабачнасць у хуткім часе памаглі Я. Гашаку разгледзець бесперспектыўнасць анархічных метадаў барацьбы, і ўрэшце ён парывае з гэтай плынню. Але сувязь з палітычным рухам у краіне не прайшла ў пісьменніка бясследна. Яго апавяданні і фельетоны становяцца больш публіцыстычнымі, набываюць выкрывальны характар. Пэўныя змены адбываюцца і з формай мастацкіх твораў. Веданне народнага жыцця, іронія, дакладнасць апісання дапаўняюцца тут лаканізмам, стылёвай строгасцю, гратэскам.

Такому зруху ў мастацкай практыцы Яраслава Гашака адпавядаў і характар таленавітага сатырыка — цэльны, бескампрамісны, з'едлівы.

Бліскуча характарызуе асобу Я. Гашака палітычны фарс, разыграны ім у 1911 годзе. Напярэдадні выбараў у аўстрыйскі парламент сярод сталых наведвальнікаў адной пражскай кавярні Я. Гашак стварыў «Партыю памяркоўнага прагрэсу ў межах закону» — карыкатуру на чэшскія палітычныя партыі, якія ўладам не рабілі клопату. Былі напісаны праграма і маніфест партыі, разгорнута перадвыбарная кампанія. Як кандыдат у дэпутаты пісьмен-

нік выступаў з парадыйнымі прамовамі, разыгрываў з сябрамі спектаклі, поўныя дасціпнасці, палітычных намёкаў і двухсэнсоўнасці. На вокнах кавярні вывешваліся лозунгі: «Калі вы выбераце нашага кандыдата, абяцаем прыняць меры супраць землетрасення ў Мексіцы», «Тое, што вы чакаеце ад Вены, вы можаце атрымаць і ад нас», «Хай будзе больш строгасці ў адносінах да беднякоў» і інш.

Фармальна прычапіцца да «партыі» паліцыі не было за што, і ў дзень выбараў у парламент кандыдатура Я. Гашака атрымала... каля 40 галасоў.

Да першай сусветнай вайны Я. Гашак надрукаваў каля 1000 нарысаў, апавяданняў і фельетонаў, у якіх дасціпна высмеяў аўстрыйскі дзяржаўны апарат, палітыку буржуазных партый, антынародную мараль і культуру, духавенства; паказаў цяжкі народны лёс ва ўмовах нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту.

Прызваны ў 1915 годзе ў армію, Я. Гашак прав сем месяцаў здаецца ў палон рускім, дзе ў хуткім часе распачынае напружаную грамадска-палітычную дзейнасць. Ён друкуецца ў «Чэхаславане» — органе «Саюза чэхаславацкіх таварыстваў у Расіі», вярбуе палонных чэхаў у легіён, едзе эмісарам на фронт. З перамогай Савецкай улады на Украіне, сведкам якой быў сам пісьменнік, Я. Гашак парывае з чэшскімі легіёнамі (яны сталі на шлях контррэвалюцыі) і едзе ў Маскву, дзе ў сакавіку 1918 года ўступае ў Чэхаславацкую камуністычную секцыю ВКП (б) і ў Чырвоную Армію.

Далейшы лёс пісьменніка звязаны з палітаддзелам Пятай арміі, з якой ён прайшоў слаўны 1000-вёрставы шлях ад Бугульмы да Іркуцка. Гашак працуе з чужаземнымі ваеннапалоннымі, рэдагуе газеты, друкаваныя на чэшскай, нямецкай, венгерскай, сербскай і нават бурат-мангольскай мовах, выступае на мітынгах і сходках, займаецца адміністрацыйнай работай. Не спыняе пісьменнік і сваёй літаратурнай дзейнасці. Акрамя лістовак і шматлікіх артыкулаў у армейскіх газетах, Я. Гашак піша фельетоны і апавяданні, аб'ектам сатыры якіх становяцца белагвардзейцы, контррэвалюцыйная буржуазія, інтэрвенты.

Франтавыя творы пісьменніка — шматлікія, разнапланавыя — сведчылі пра карэнны пералом у светапоглядзе Я. Гашака: са стыхійнага бунтара ён вырас у камуніста, які свядома паставіў свой талент на службу рэвалюцыі. Сатыра яго стала канкрэтная і бязлітасная, іронія замянілася сарказмам.

Сваю службу ў Чырвонай Арміі Яраслаў Гашак закон-

чыў начальнікам чужаземнага палітаддзела Пятай арміі і члена Іркуцкага гарсавета. У снежні 1920 года разам з жонкай Аляксандрай Гаўрылаўнай Львовай ён вяртаецца на радзіму.

На другі дзень пасля з'яўлення Гашака ў Празе газета «Трыбуна» пад крыклівым загалоўкам паведаміла, «што былы вядомы пражскі гуляка і анархіст, а цяпер бальшавік Яраслаў Гашак вярнуўся ў Чэхаславакію».

Пачалося ганенне на пісьменніка.

Хворы, пакінуты многімі сябрамі і знаёмымі, Я. Гашак пражыў пасля вяртання на радзіму два гады і пятнаццаць дзён (Я. Гашак памёр 3 студзеня 1923 года). За гэты кароткі час, апрача апавяданняў і фельетонаў, быў напісаны велізарны па аб'ёме раман «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка», які, на жаль, не закончаны.

Задуманы як вострая шматпланавая сатыра на мілітарызм, на ўвесь паразітычны буржуазны лад з яго сацыяльнымі інстытутамі і мараллю, раман Я. Гашака вырас з усяго папярэдняга жыццёвага і творчага вопыту пісьменніка, з чэшскай нацыянальнай гісторыі. Удалы ваяка Швейк, гэтаксама як француз Кала Бруньён, рускі Васілій Цёркін, якія ўвасобілі ў сабе найлепшыя рысы нацыянальнага характару, стаў сімвалам неўміручасці народнага духу і яго велічы. Швейк і хітры, і наіўны, ён бязлітасна іранічны і ў той жа час бездапаможна шчыры і адкрыты, у ім спалучаны нейкая дзіцячая дураслівасць і сапраўды народная мудрасць. Ён — увасабленне свядомасці самога народа. Як сказаў пра яго Юліус Фучык — «...Швейк — тып грамадскі, а не кніжны, ён існаваў і да Гашака, існаваў бы і без Гашака. Заслуга Гашака менавіта ў тым, што ён змог геніяльна яго разгледзець у жыцці і паставіць у такое становішча, у якім выявіліся ўсе галоўныя рысы яго характару».

«Прыгоды ўдалага ваякі Швейка» сталі першым раманам чэшскай літаратуры, перакладзеным на беларускую мову. Беларускаму чытачу імя Я. Гашака вядома таксама па кнізе «Цвёрдая скура», адрасаванай дзецям.

Зборнік апавяданняў «Госць у хату», куды ўключаны найбольш вядомыя творы гэтага жанру, выходзіць у год стогадовага юбілею выдатнага сатырыка.

Тамара Кароткая

ЗМЕСТ

Мая споведзь 3
Пераклаў Павел Марціновіч

Як Балушка навучыўся маніць 7
Пераклала Вольга Крайко

Калекцыянер аб'яў 12
Пераклала Вольга Крайко

Амстэрдамскі гандляр чалавечынай 16
Пераклала Ліна Каўрус

Дабрачыннасць 19
Пераклала Ліна Каўрус

Пра шчырую дружбу 22
Пераклаў Павел Місько

Я вару яйкі ўсмятку 30
Пераклала Вольга Крайко

Як я ўшываў гузік у штаны 32
Пераклала Вольга Крайко

Ананімнае пісьмо 36
Пераклала Ліна Каўрус

Як прыдумаць назву 38
Пераклала Вольга Крайко

Гід для чужаземцаў 48
Пераклала Вольга Крайко

Сіротка і яе таемная маці 54
Пераклаў Павел Марціновіч

Чаган-курэнскае апавяданне 62
Пераклала Вольга Крайко

Госць у хату 67
Пераклаў Алесь Мажэйка

Як паводзіць сябе дома, на вуліцы, ва ўстановах, у магазінах, у тэатрах, на аэраплане і на футбольных матчах 75
Пераклаў Павел Міська

Нямецкія астраномы 81
Пераклала Ліна Каўрус

Гісторыя з трыма кронамі 85
Пераклаў Янка Шпак

Змена прозвішча 90
Пераклаў Павел Міська

Жыццёвыя парады 94
Пераклала Вольга Крайко

Судовы працэс па справе Хама, сына Ноя 100
Пераклала Вольга Крайко

Фіялетавы гром 106
Пераклала Вольга Крайко

Як я рэдагаваў часопіс «Далягляды чэшскіх жанчын і дзяўчат» 109
Пераклала Вольга Крайко

Размова з цэнзарам 114
Пераклала Вольга Крайко

Мужчына і жанчына ў шлюбе 118
Пераклала Вольга Крайко

Як пан Мазуха помсціў за свой зняважаны мужчынскі гонар 124
Пераклаў Валянцін Рабкевіч

Пра паліцэйскага сабаку і жончыну здраду . . . 127
Пераклала Ліна Каўрус

Што-ніштo пра судовых экспертаў 131
Пераклаў Павел Марціновіч

Непрыстойныя календары 135
Пераклала Вольга Крайко

Спадчына Францішка Шафранка 138
Пераклала Вольга Крайко

Сумная гісторыя з катом 143
Пераклаў Валянцін Рабкевіч

Дарагая мая сяброўка Юльча 146
Пераклаў Алесь Мажэйка

Школа для сышчыкаў 169
Пераклаў Павел Міська

Прыклад з жыцця 176
Пераклала Вольга Крайко

Кароткі змест крымінальнага рамана 180
Пераклала Вольга Крайко

Сярод бібліяфілаў 182
Пераклаў Алесь Мажэйка

Тайна споведзі 186
Пераклаў Павел Міська

Тры мужчыны з акулай 193
Пераклала Вольга Крайко

Саліднае прадпрыемства 200
Пераклала Вольга Крайко

Chi va piano, va sano 206
Пераклала Ліна Каўрус

Спроба наладзіць безалкагольную вечарынку, або Вечарынка па-амерыканску 210
Пераклала Вольга Крайко

Навагодні вечар непітушчых 217
Пераклала Вольга Крайко

Перад выхадам на пенсію 221
Пераклала Ліна Каўрус

Буржуй Рамзэлік 227
Пераклала Вольга Крайко

Удалы салдат Швейк вучыцца абыходзіцца з піраксілінам 230
Пераклала Вольга Крайко

Камендант горада Бугульмы 235
Пераклаў Павел Марціновіч

Ад'ютант каменданта горада Бугульмы 241
Пераклаў Павел Марціновіч

Пацёмкінскія вёскі 246
Пераклаў Павел Марціновіч

Апавяданне пра партрэт імператара Францa-Іосіфа I . 251
Пераклала Вольга Крайко

Пакуты літаратара 256
Пераклала Вольга Крайко

Як я сустрэўся з аўтарам майго некралога . . . 260
Пераклаў Павел Марціновіч

Душачка Яраслава Гашака расказвае 265
Пераклала Вольга Крайко

Пісьменнік, грамадзянін, баец. *Тамара Кароткая* . . 271

Пераклады зроблены з наступных выданняў:

Jaroslav Hašek. Moje zpověď. Československý spisovatel, Praha, 1968.

Jaroslav Hašek. Dekameron humoru a satiry. Československý spisovatel, Praha, 1972.

Jaroslav Hašek. Zrádce národa v Chotěbořı. Československý spisovatel, Praha, 1962.

Jaroslav Hašek. Praha ve dne i v noci aneb týden mezi dacany. Československý spisovatel, Praha, 1973.

Jaroslav Hašek. Reelní podnik. Československý spisovatel, Praha, 1977.

Jaroslav Hašek. Trampoty pana Tenkrata. Odeon, Praha, 1973.

Апавяданні «Ананімнае пісьмо» і «Перад выхадам на пенсію» перакладзены з выдання:
Гашек Я. Собр. соч.: В 5-ти т. М.: Правда, 1966, т. 4, 5.

Гашак Я.
Г 24 Госць у хату: Апавяданні. Пер. з чэш./[Уклад. А. Мажэйкі; Паслясл. Т. Кароткай]. Мн.: Маст. літ., 1984.— 279 с., 1 л. партр.— (Б-ка замеж. прозы).

У пер.: 1 р. 20 к.

У кнігу ўвайшлі апавяданні славутага чэшскага сатырыка і гумарыста Яраслава Гашака (1883—1923), напісаныя ў розныя перыяды яго творчасці.

Г 4703000000—004 / М 302(05)—84 168—83

ББК84.4Че
И(Чехосл)

БИБЛИОТЕКА ЗАРУБЕЖНОЙ ПРОЗЫ

Ярослав Гашек
ГОСТЬ В ДОМ
Рассказы

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар *Л. І. Каўрус*. Мастак *Ю. М. Цюрын*. Мастацкі рэдактар *Л. Я. Прагін*. Тэхнічны рэдактар *Г. П. Тарасевіч*. Карэктар *Л. Т. Калюжная*.

ІБ № 1788
Здадзена ў набор 30.03.83. Падп. да друку 09.11.83. Фармат 70×100 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 11,29+0,08 укл. Ум. фарб.-адб. 11,65. Ул.-выд. арк. 12,20. Тыраж 12 000 экз. Зак. 3485. Цана 1 р. 20 к.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Яраслаў Гашак